

ПАМЯТЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ПАМЯЦЬ

ГОМЕЛЬСКІ РАЁН

У 2 кнігах

Кніга 2-я

МІНСК
БЕЛТА
1998

УДК 947.6
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.К.КІСЯЛЁЎ (галоўны рэдактар выдавецкага цэнтра БЕЛТА),
М.З.БАШЛАКОЎ, Т.А.КАРАСІК, А.Л.ПЕТРАШКЕВІЧ, І.А.ПРОЦКІН, В.А.САБКО

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

В.А.САБКО (старшыня камісіі), А.І.БАКАРАС, В.С.БАРАНАЎ, І.К.БРУХАВЕЦКІ,
В.І.ЖАЛЯЗНЯК, У.У.КАЗЛОЎ, М.А.КАН, Т.А.КАРАСІК, А.В.КАРЧЭЎСКІ,
М.В.КОСТАЧКА, П.Ф.МАРОЗАЎ, М.Д.РЫЧКОЎ, Л.І.ШУРХАВЕЦКАЯ,
І.Г.ШЫЦІКАЎ, Ф.І.ШЭРМАН

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

А.Л.ПЕТРАШКЕВІЧ (кіраўнік цэнтра), М.З.БАШЛАКОЎ,
У.І.ЛЕМЯШОНАК, Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА

Укладальнікі:
М.З.БАШЛАКОЎ, Т.А.КАРАСІК

Мастак
Э.Э.ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В.А.РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-6302-10-2

© БЕЛТА, 1998

Мемарыял савецкім воінам-вызваліцелям і воінам-землякам у в. Урыцкае.

Канец верасня 1943 г.	**Пачаліся баі за вызваленне Гомельскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**
27 верасня 1943 г.	**Вызвалены першыя населеныя пункты раёна Займішча, Будзішча, Пракопаўка, Чарацянка, Макаўе, Маркавічы.**
28 верасня 1943 г.	**Вызвалены населеныя пункты раёна Баштан, Каралін, Кустарны, Краўцоўка, Церуха, Студзёная Гута, чыгуначныя станцыі Зябраўка, Церуха.**

Родныя краявіды.

10 кастрычніка 1943 г. — **Вызвалена Навабеліца.**

11—17 кастрычніка 1943 г. — **У выніку жорсткіх баёў за авалоданне Сожскім плацдармам вызвалены населеныя пункты Новыя Дзятлавічы, Чырвоная Даліна, Раманавічы, Улукаўе, Сеўрукі, Чонкі, Якубоўка. У баях вызначыўся малодшы сяржант А.Дз.Валогін, якому пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.**

Кастрычнік — 1943 г. — **Савецкія войскі поўнасцю ачысцілі ад акупантаў левабярэжную частку раёна да р. Сож і стварылі плацдарм для наступлення на Гомельскім напрамку.**

Куток Грабаўскага парку.

26 лістапада 1943 г.	Вызвалены г. Гомель, населеныя пункты Прысна, Лапаціна, Касцюкоўка, Яроміна, Давыдаўка, Бабовічы, Сасноўка.
27 лістапада 1943 г.	Тэрыторыя Гомельскага раёна поўнасцю вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
Снежань 1943 г.	Пачатак аднаўленчых работ на тэрыторыі раёна. Адноўлена дзейнасць Гомельскай і Навабеліцкай машынна-трактарных станцый. Пачаліся заняткі ў 41 школе раёна, дзе навучаліся 1400 вучняў.

Вёска Грабаўка. Тут жывуць перасяленцы з чарнобыльскай зоны.

10 снежня 1943 г.	**У раёне дзейнічала 50 калгасаў з 52 даваенных. Налічвалася 1040 коней, 1819 кароў, 67 свіней, 36 авечак.**
31 снежня 1943 г.	**З Масквы ў Навабеліцу прыбыў спецыяльным цягніком урад Беларусі, дзе ён знаходзіўся да вызвалення Мінска.**
	У клубе запалкавай фабрыкі «Везувій» адбылося ўрачыстае пасяджэнне сесіі Гомельскага аблвыканкома і гарвыканкома, прысвечанае 25-годдзю ўтварэння БССР.
21—24 сакавіка 1944 г.	**У Навабеліцы ў клубе запалкавай фабрыкі «Везувій» адбылася VI сесія Вярхоўнага Савета БССР.**

Гомельская раённая паліклініка ў Навабеліцы.

25 сакавіка 1944 г.	З Навабеліцы пачала весці перадачы зноў створаная радыёстанцыя імя Саўнаркома БССР.
1945 г.	У раёне працавалі 63 школы, у якіх навучаліся 7903 вучні.
1946 г.	У раёне налічваліся 23 трактары.
1950—1952 гг.	Праведзена ўзбуйненне калгасаў. 57 маламоцных калгасаў аб'яднаны ў 17 буйных калектыўных гаспадарак.

Вучні Маркавіцкай школы — члены школьнага лясніцтва (арганізавана ў 1996 г.).

1959 г.	Створана міжкалгасная будаўнічая арганізацыя (Міжкалгасбуд).
1962 г.	Старэйшаму мастацкаму калектыву раёна — Прыбыткаўскаму хору —прысвоена званне народнага.
Красавік 1962 г.	Раённая газета «Трыбуна хлебароба» пачала выходзіць пад назвай «Маяк».
23 красавіка 1962 г.	Да раёна далучаны Аздзелінскі, Старабеліцкі, Целяшоўскі, Цярэніцкі сельсаветы, р.п. Бальшавік.

У Сурганаўскім цэнтры развіцця дзіцяці.

15 студзеня 1964 г.	**Да раёна далучаны Рудня-Марымонаўскі і Шарпілаўскі сельсаветы.**
18 студзеня 1965 г.	**Да раёна далучаны Глыбоцкі, Грабаўскі, Маркавіцкі і Пракопаўскі сельсаветы.**
1968 г.	**Выйшла аповесць Івана Сяркова «Мы з Санькам у тыле ворага».**

Традыцыйны жаночы касцюм. Гомельскі раён.

1975 г.	У в. Прыбар адкрыта прафтэхвучылішча № 185.
Студзень 1975 г.	Уступіла ў строй птушкафабрыка «Рассвет» (в. Пясочная Буда).
1976 г.	Ансамблю народных інструментаў Гомельскага РДК прысвоена званне народнага.
1984 г.	Паэту Анатолю Грачанікаву прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларусі.

Народны ансамбль «Радзімічы» Гомельскага раённага Дома культуры.

26 красавіка 1986 г.	На Чарнобыльскай АЭС адбылася аварыя, вынікі якой закранулі і Гомельскі раён.
1986—1988 гг.	У раёне пасялілася каля 1,5 тысячы перасяленцаў з чарнобыльскай зоны.
1986 г.	Выйшла кніга народнага пісьменніка Беларусі І.П.Шамякіна «Карэнні і галіны», у якой распавядаецца пра гомельскія мясціны.
1987 г.	Выйшла другое выданне кнігі ўспамінаў Героя Сацыялістычнай Працы К.Т.Мазурава «Незабываемое».

Народны ансамбль «Скарыначка» Урыцкага Дома культуры.

1990 г. — **Вучонаму Г.В.Штыхаву прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларусі.**

Пачатак 1990-х гадоў. — **У раёне 44 дашкольныя ўстановы, 22 сярэднія, 16 няпоўных сярэдніх і 13 пачатковых школ, 3 прафтэхвучылішчы.**

1991 г. — **У раёне 7 участковых бальніц, 11 урачэбных амбулаторый, 38 фельчарска-акушэрскіх пунктаў.**

Для заняткаў фізкультурай і спортам было 35 спартзалаў, 40 футбольных палёў, 22 стралковыя ціры і іншыя спартыўныя збудаванні.

Набярэжная р. Сож на ўскраіне Гомеля.

Канец 1992 г.	**У раёне налічвалася 26 сялянскіх і фермерскіх гаспадарак з агульнай плошчай 608 гектараў.**
1993 г.	**У в. Урыцкае ўзведзена праваслаўная царква Раства Багародзіцы.**
1994 г.	**Асобным выданнем выйшла паэма Міхася Башлакова «Лілея на цёмнай вадзе», прысвечаная чарнобыльскай трагедыі.**

Цвіце Брылёўскі сад.

1996 г. Дзіцячы садок у в. Яроміна стаў пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Садок года». На яго базе ў 1997 г. створаны Сурганаўскі цэнтр развіцця дзіцяці.

Красавік 1997 г. Здадзены новы двухпавярховы будынак Грабаўскай сярэдняй школы на 292 вучні.

Лістапад 1997 г. Упершыню на Беларусі і ў краінах СНД пры Каранёўскай эксперыментальнай базе Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ўведзена ў дзеянне эксперыментальная лабараторыя па вырошчванні грыбоў на адходах дрэваапрацоўчай вытворчасці. Праектная магутнасць лабараторыі 5 тон грыбоў за год.

Да чытача

Другая кніга гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Гомельскі раён» ахоплівае перыяд з 1943 г. да нашых дзён. Хроніка расказвае пра подзвіг воінаў Чырвонай Арміі, якія вызначыліся пры вызваленні раёна, і пра землякоў, што мужна змагаліся з ворагам на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Асобна вылучаны раздзел спісаў ахвяр вайны: загінуўшых партызан, падпольшчыкаў, мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору, воінаў-землякоў, што загінулі ці прапалі без вестак.

Значная частка кнігі адведзена пасляваеннаму перыяду гісторыі раёна. Прыводзяцца звесткі пра тых, хто вызначыўся ў працы: ардэнаносцаў, заслужаных работнікаў Беларусі, вядомых землякоў (дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, вучоных, людзей творчых прафесій і г.д.) — усіх, хто праславіў Гомельскі раён і пакінуў тут пра сябе добрую памяць. Не засталася па-за ўвагай і чорная старонка сучаснай гісторыі Гомельшчыны — Чарнобыльская трагедыя.

Гісторыка-дакументальная хроніка была б няпоўнай без апісання багатай матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Гомельскага раёна. Ёй прысвечаны асобны раздзел кнігі, які завяршаецца кароткай гісторыяй населеных пунктаў.

Пры напісанні кнігі выкарыстаны шматлікія матэрыялы з архіваў Гомеля, Мінска, Масквы, Санкт-Пецярбурга, з разнастайных кніг, часопісаў і газет, успаміны ўдзельнікаў і сведак гістарычных падзей.

Раённая камісія па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі і выдавецкі цэнтр БЕЛТА выказваюць шчырую падзяку ўсім, хто прымаў удзел у рабоце над кнігай і яе выданні.

ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА



1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

Вызваленне

Восенню 1943 г. Чырвоная Армія дабілася новых перамог над вермахтам. Пасля разгрому нямецка-фашысцкіх войскаў на Курскай дузе, а потым і на Левабярэжнай Украіне яна разгарнула буйнейшае стратэгічнае наступленне, у выніку якога на шырокім фронце ад Лоева да Днепрапятроўска выйшла да Дняпра.

Паспяхова разгортвалася наступленне савецкіх войскаў на цэнтральным напрамку. Тут войскі Цэнтральнага фронту* прарвалі шэраг абарончых рубяжоў праціўніка і выйшлі да ўсходніх раёнаў Беларусі. Раніцай 25 верасня часці 65-й арміі на ўчастку Карповічы — Уборкі фарсіравалі р. Сноў і авалодалі в. Гарадок Церахоўскага раёна Гомельскай вобласці, а 27 верасня, прасунуўшыся з баямі на 25 кіламетраў, вызвалілі раённы цэнтр Церахоўка і ўступілі на тэрыторыю Гомельскага раёна.

Сярод першых вызваліцеляў была група воінаў (12 чалавек) на чале з парторгам 1-га батальёна 685-га стралковага палка 193-й стралковай Чырванасцяжнай дывізіі малодшым лейтэнантам І.В.Цымбалам. Воіны гэтай групы першымі пераправіліся ў раёне вёсак Макаўе і Пракопаўка цераз р. Церуха і ў кароткім баі знішчылі кулямётны разлік ворага, чым садзейнічалі паспяховаму наступленню свайго батальёна. Асабліва воіны гэтай групы вызначыліся ў баях на подступах да р. Сож. Уначы 29 верасня яны на поўдзень ад в. Шарпілаўка на працягу сутак адбівалі шалёныя контратакі гітлераўцаў. За суткі воіны-смельчакі знішчылі да роты гітлераўцаў, захапілі 6 кулямётаў, 2 мінамёты і ўтрымлівалі рубеж да падыходу галоўных сіл палка.

Правафланговая 37-я гвардзейская стралковая Чырванасцяжная дывізія прарвала абарону праціўніка і да канца дня 28 верасня авалодала шэрагам населеных пунктаў, у тым ліку Грабаўка, Баштан, Церуха, чыгуначная станцыя Церуха і прыпынак Дзікалаўка. У баях за гэтыя населеныя пункты

---

* Цэнтральны фронт 2-га фарміравання быў створаны 15.2.1943 г. на базе скасаванага Данскога фронту. Паводле рашэння Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання ад 20.10.1943 г., Цэнтральны фронт быў перайменаваны ў Беларускі.

асабліва вызначыўся кулямётчык 118-га гвардзейскага стралковага палка гвардыі малодшы сяржант Аляксандр Дзмітрыевіч Валогін. Пры фарсіраванні р. Сож ён у ліку першых пераправіўся на процілеглы бераг і кулямётным агнём забяспечваў фарсіраванне ракі падраздзяленнямі палка. Адважна змагаўся малодшы сяржант за Новыя Дзятлавічы і Чырвоную Даліну, дзе і загінуў у жорсткім баі. Яму пасмяротна прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Пахаваны А.Дз.Валогін у брацкай магіле ў в. Церуха.

У вельмі цяжкіх умовах давялося змагацца на Сожскім плацдарме, асабліва за апорны пункт Старыя Дзятлавічы, байцам і камандзірам 354-й стралковай дывізіі. Яны агнём аўтаматаў і кулямётаў, у рукапашных схватках адбівалі ў гітлераўцаў правы бераг ракі.

Пасля перагрупоўкі ў пачатку кастрычніка асноўных сіл 65-й арміі ў міжрэччы Сожа і Дняпра вялі баявую дзейнасць толькі злучэнні 19-га стралковага корпуса 65-й арміі. Гітлераўцы артылерыйска-мінамётным агнём спрабавалі скаваць сілы корпуса, але панеслі вялікія страты і вымушаны былі адступіць да в. Рудня-Марымонава.

Паспяхова рухаліся наперад войскі 48-й арміі, якія наступалі непасрэдна на Гомель. Найвялікшы поспех спадарожнічаў тут злучэнням 42-га стралковага корпуса і некаторым іншым часцям. У ноч на 17 кастрычніка яны авалодалі вёскамі Раманавічы, Улукаўе, Якубоўка, а раніцай чыгуначным вузлом і прыгарадам Гомеля — Навабеліцай, а таксама вёскамі Сеўрукі, Чонкі, падышлі да р. Сож і ачысцілі ўсходні бераг ад фашысцкіх акупантаў каля вёсак Якубоўка і Скіток.

Да гэтага часу на поўдзень ад в. Скіток выйшлі да Сожа і фарсіравалі яго злучэнні 29-га корпуса і часці 194-й стралковай дывізіі. Пры фарсіраванні ракі, захопе плацдармаў на заходнім беразе імкліва дзейнічалі часці 102-й стралковай Далёкаўсходняй Ноўгарад-Северскай Чырванасцяжнай дывізіі. Першым у дывізіі пераправіўся цераз Сож радавы 76-га стралковага Усурыйскага палка В.Чыстоў. Ён уварваўся ў траншэю гітлераўцаў і агнём свайго аўтамата прыкрываў роту, якая фарсіравала раку.

Да 9 кастрычніка 194-я стралковая дывізія выйшла пасля маршу да р. Сож у тым месцы, дзе ў яе ўпадае р. Вуць. 10 кастрычніка, паводле загаду камандуючага 48-й арміі, свае пазіцыі дывізія здала суседзям, а яе часці пераправіліся на заходні бераг Сожа і ўключыліся ў наступленне на Гомель. Праціўнік, замацаваўшыся на паўднёвай ускраіне в. Бабовічы, бесперапынна атакаваў. У гэтых баях асабліва вызначыліся камсамольцы роты 616-га стралковага палка, дзе камсоргам быў радавы С.Казін.

Упартае супраціўленне аказвалі гітлераўцы і войскам 63-й арміі, якія наступалі ў напрамку вёсак Пакалюбічы і Лапаціна. Баі за гэтыя вёскі і шашэйную дарогу Ветка—Гомель не ўціхалі ні днём ні ноччу. Часці 307-й і 41-й стралковых дывізій адбівалі шматлікія варожыя контратакі, якія часам даходзілі да рукапашных схватак.

Такім чынам, у кастрычніку 1943 г. савецкія войскі цалкам ачысцілі ад акупантаў ўсю левабярэжную частку Гомельскага раёна да р. Сож і стварылі моцны плацдарм для рашаючага наступлення на Гомельскім напрамку. Першай вызваленай тэрыторыяй Гомельскага раёна стала яго паўднёвая частка — Шарпілаўскі і Рудня-Марымонаўскі сельсаветы.

У гэты час войскі Беларускага фронту ва ўзаемадзеянні з партызанамі вызвалілі г. Добруш. 10 кастрычніка занялі Навабеліцу. Праз некалькі дзён сюды прыбыло

кіраўніцтва Гомельскай вобласці і Гомельскага раёна. Пачаліся першыя аднаўленчыя работы ў вызваленай частцы раёна.

Вайна набывала ўсё больш жорсткі характар. У ноч з 5 на 6 лістапада 1943 г. стралковыя і танкавыя часці імкліва фарсіравалі р. Сож у раёне в. Хальч, захапілі плацдарм у гэтым месцы і ўтрымлівалі яго на працягу 10 дзён. Раніцай 16 лістапада артылерысты 96-й стралковай дывізіі 11-й арміі з пазіцый на левым беразе Сожа, каля Веткі, в. Тарасаўка адкрылі знішчальны агонь па ўмацаваннях гітлераўцаў на правым беразе р. Сож на поўнач ад Гомеля. Абарона нямецкіх войскаў тут была прарвана, і пасля жорсткіх баёў часці нашых войскаў, зламаўшы супраціўленне ворага, вызвалілі вёскі Хальч, Старое Сяло, Новае Жыццё, Пакалюбічы, Лапаціна, Касцюкоўка і перарэзалі чыгунку Гомель—Жлобін.

16 лістапада 1943 г. часці 65-й арміі фарсіравалі Дняпро на ўчастку Лоеў—Радунь.

Пасля фарсіравання Дняпра і вызвалення г. Лоеў злучэнні і часці арміі павярнулі ўздоўж ракі ў паўночна-заходнім напрамку, стварыўшы тым самым пагрозу гітлераўцам у Рэчыцы — пад сур'ёзным ударам апынуліся войскі, якія знаходзіліся ў міжрэччы Сожа і Дняпра. Баючыся акружэння, нямецкае камандаванне пачало адводзіць свае часці за Дняпро.

У выніку ўпартых пяцідзённых баёў заваяваны плацдарм: 13 кіламетраў углыбіню і 18 — па лініі фронту, прарвана першая паласа абароны праціўніка, і войскі 65-й арміі выйшлі да другога добра ўмацаванага абарончага рубяжа, так званых наддзвінскіх пазіцый.

У ночь на 20 кастрычніка камандуючы Беларускім фронтам генерал арміі К.К.Ракасоўскі аддаў загад 65-й арміі часова, да атрымання рэзерваў, наступленне спыніць і стойка ўтрымліваць заняты плацдарм.

З прыбыццём свежых карпусоў (65-я армія мела ў гэты час у сваім складзе дзевяць карпусоў, у тым ліку два танкавыя і два кавалерыйскія, што рэдка сустракалася ў гады Вялікай Айчыннай вайны) арміі была пастаўлена новая задача — перайсці ў наступленне на правабярэжжы Дняпра ў паўночна-заходнім напрамку. Аднак у перыяд падрыхтоўкі войскаў да маючых адбыцца дзеянняў гітлераўцы сканцэнтравалі ў іх паласе чатыры пяхотныя і дзве танкавыя дывізіі і нанеслі па часцях арміі шэраг моцных удараў. У сувязі з гэтым пачатак наступлення быў перанесены.

10 лістапада пасля магутнай артылерыйскай падрытоўкі войскі арміі хутка рушылі наперад. Пры актыўнай падтрымцы партызан Гомельскага злучэння 18 лістапада вораг быў выбіты з Рэчыцы.

З вызваленнем Рэчыцы для гітлераўцаў стваралася пагроза страты Гомеля. Камандаванне 2-й нямецкай арміі, выконваючы загад Гітлера, вырашыла ўтрымліваць горад любой цаной. Яно ўзмацніла гарнізон рэшткамі дывізій, што былі разбіты ў Рэчыцы, сцягнула сюды вялікую колькасць артылерыі і танкаў.

22 лістапада пачалі наступленне войскі правага крыла Беларускага фронту сіламі 50-й і 3-й армій. 25—26 лістапада яны вызвалілі Прапойск (Слаўгарад), Карму, Журавічы і выйшлі да Дняпра ў раёне Новага Быхава, ахопліваючы Гомель з поўначы.

Паспяховае наступленне 65-й арміі з паўднёвага захаду, 50-й і 3-й армій у напрамку з поўначы стварыла пагрозу поўнага акружэння нямецкіх войскаў у Гомелі і значна аслабіла іх супраціўленне ў горадзе. У ноч на 26 лістапада 217-я стралковая Унечская і 96-я стралковая

дывізіі 11-й арміі атакавалі нямецкія пазіцыі на паўночна-ўсходняй ускраіне Гомеля. Адначасова з паўднёвага ўсходу ў горад уварваліся часці 4-й стралковай Бежыцкай дывізіі, 115-га ўмацаванага раёна 11-й арміі і 102-й стралковай Далёкаўсходняй Ноўгарад-Северскай Чырвонасцяжнай дывізіі 48-й арміі. Раніцай 26 лістапада пасля жорсткіх баёў г. Гомель — першы абласны цэнтр Беларусі — быў вызвалены.

З паведамлення Савецкага інфармацыйнага бюро за 26 лістапада 1943 г.: «Войскі Беларускага фронту ў выніку паспяховага наступлення і смелага абыходнага манеўра сёння, 26 лістапада, авалодалі буйным абласным цэнтрам Беларускай ССР — горадам і чыгуначным вузлом Гомель...

Паміж рэкамі Сож і Дняпро, у раёне Гомеля, нашы войскі з баямі занялі населеныя пункты Прысна, Лапаціна, Касцюкоўка, Яроміна, Давыдаўка, Бабовічы, Сасноўка, Баравая, Аляксандраўка, Капань...» (Сообщения Советского информбюро. М., 1947. Т.5. С.258.)

На наступны дзень былі вызвалены астатнія вёскі Гомельскага раёна.

Дваццаці злучэнням і часцям, якія найбольш вызначыліся пры вызваленні горада, загадамі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ад 26 снежня 1943 г. і Наркамата абароны СССР ад 27 мая 1944 г. нададзены ганаровыя найменні «Гомельскіх».

У.І.Лемяшонак, Ф.П.Стальмашок.

* * *

Адразу ж пасля вызвалення Гомеля апоўдні 26 лістапада ў горад прыбылі прадстаўнікі абкома КП(б)Б і аблвыканкома Ф.В.Жыжанкоў і С.М.Лебедзеў і прыступілі да аднаўлення савецкай улады ў горадзе і раёне, якія ляжалі ў руінах, былі амаль поўнасцю спустошаны і разрабаваны гітлераўцамі. З гэтага дня для гамельчан скончылася цёмная ноч фашысцкай акупацыі і пачалася вялікая стваральная праца па аднаўленні разбуранай вайной народнай гаспадаркі, наладжванню нармальных умоў для жыцця людзей.

Назаўсёды ў памяці народнай застанецца гераізм байцоў Чырвонай Арміі і апалчэнцаў, якія абаранялі Гомель у жніўні 1941 г. Іх імёны высечаны на пастаментах помнікаў, абеліскаў, увекавечаны на мемарыяльных дошках, у назвах вуліц. Гэта імены апалчэнцаў: А.І.Казіміра ва, Н.К.Казунова, С.Р.Шуцкага, І.В.Саўчанкі, Д.С.Зязеліна, Я.М.Снегірова, В.І.Залужнага, М.Рамановіча, І.Лімантава, С.Бялова, Падлобнікава, А.Кужалева, М.М.Кунцэвіча, Р.Школьнікавай і іншых. Гэта яны на працягу шасці сутак на лініі Пакалюбічы — Калініна (Сямёнаўка) стрымлівалі гітлераўцаў на подступах да Гомеля, трымалі абарону на поўнач да горада.

З пачатку вайны звыш 200 тысяч жыхароў Гомелышчыны ўліліся ў рады Чырвонай Арміі. Сярод іх былі тысячы жыхароў Гомельскага раёна. Абараняў Маскву, Ленінград, змагаўся ў Савецкім Запаляр'і жыхар в. Іванаўка Фёдар Іванавіч Літвінаў. Пад Мазыром сустрэў вайну ўраджэнец в. Грабаўка Іван Антонавіч Латышаў. У 1943 г. за ўдзел у наладжванні пераправы цераз р. Сож і штурм фашысцкіх умацаванняў на яе правым беразе радавы 87-га асобнага сапёрнага батальёна 140-й стралковай дывізіі І.А.Латышаў быў узнагароджаны ордэнам Славы Ш ступені. У баях на тэрыторыі Заходняй Украіны за падрыў моста і затрыманне руху праціўніка Іван Антонавіч узнагароджаны ордэнам Славы II ступені. За баі на подступах да Львова сапер І.А.Латышаў быў узнагароджаны ордэнам Славы I ступені. Пасля вайны поўны кавалер ордэна Славы жыў і працаваў у саўгасе «Рассвет».

У баях з фашыстамі пад г. Маздок загінуў завуч Клімаўскай няпоўнай сярэдняй школы Віктар Місюк. Настаўніца гэтай жа школы Антаніна Шаўчэнка служыла ў эвакашпіталі. Яе ратны шлях у гады вайны адзначаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За адвагу».

Праз усю вайну прайшоў калгаснік з калгаса «Чырвонагвардзеец» Павел Тарасавіч Слесарэнка. Яму давялося не толькі вызваляць родную Гомельшчыну, Прыбалтыку, але і ваяваць на Далёкім Усходзе, прымаючы ўдзел у разгроме мілітарысцкай Японіі.

Ад Масквы да Берліна прайшоў дарогамі вайны ўраджэнец в. Зябраўка Якаў Адамавіч Траццякоў. Мужнасць і адвага воіна ў баях за вызваленне Гомельшчыны былі адзначаны ордэнамі Славы III ступені. У баях пры прарыве абароны праціўніка ў раёне Аўгустава і на подступах да Берліна Я.А.Траццякоў быў узнагароджаны ордэнамі Славы II і I ступеней.

Праз тры вайны прайшоў жыхар в. Дзятлавічы Пётр Аляксандравіч Чарноў. У полі была ўручана павестка брыгадзіру паляводчай брыгады ў суровым 1941 г. Ён спазнаў горыч адступленняў і страх фашысцкага палону, наступальныя баі і радасць Перамогі. А пасля вайны зноў працаваў у роднай вёсцы.

Абараняў Маскву, удзельнічаў у Курскай бітве, вызваляў родную Беларусь, штурмаваў Берлін ураджэнец в. Старая Беліца М.Гапонаў.

Курсантам Смаленскага артылерыйскага вучылішча сустрэў вайну жыхар в. Шарпілаўка Р.А.Горленка. Франтавыя шляхі правялі яго праз Беларусь і Украіну, Венгрыю і Чэхаславакію да Германіі. Шэсць баявых узнагарод, атрыманых за гады вайны, упрыгожылі грудзі воіна-артылерыста. Пасля вайны ён быў частым госцем у роднай школе, расказваў пра гераізм тых дзён маладому пакаленню.

Палітруком роты стаў 22 чэрвеня 1941 г. ураджэнец в. Сасноўка В.Я.Холапаў. Ваяваў пад Ельняй, абараняў Маскву, фарсіраваў Днепр, вызваляў Рэчыцу і Гомель. Пасля вайны доўга працаваў у родным раёне.

Толькі трое засталіся жывымі з жыхароў в. Галавінцы, якія былі мабілізаваны ў армію восенню 1943 г. Гэта Я.З.Цітоў, С.Лемяшкоў і А.Заяц. Большасць аднавяскоўцаў загінулі пры вызваленні Рэчыцы. Самым удачлівым з гэтай троіцы лічыць сябе Ягор Захаравіч Цітоў. Ён быў толькі раз лёгка паранены, а прайшоў праз усю Беларусь, Польшчу і закончыў вайну ва Усходняй Прусіі. За вызваленне Беларусі грудзі воіна-мінамётчыка ўпрыгожыў першы ордэн Чырвонай Зоркі. Аб баях ва Усходняй Прусіі напамінаюць медалі «За ўзяцце Кёнігсберга» і «За баявыя заслугі». Пасля вайны Цітоў працаваў у родным калгасе.

У 1943 г. пасля вызвалення раёна добраахвотнікам пайшоў у Чырвоную Армію ўраджэнец вёскі Чонкі Іван Сцяпанавіч Зайцаў. Вызваляў родную Беларусь і Польшчу, ваяваў на нямецкай зямлі. Незадоўга да канца вайны недалёка ад г. Кюстрын, прыкрываючы баявых сяброў, ён паўтарыў подзвіг А.Матросава. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 31 мая 1945 г. яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Баявы шлях ад Падмаскоўя да Берліна прайшоў лётчык-знішчальнік ураджэнец пас. Ільіч Міхаіл Іванавіч Семянцоў. На яго ліку было 270 баявых вылетаў, 12 збітых варожых самалётаў асабіста і 9 у групавых баях. За мужнасць і ўзорнае выкананне задач камандавання на Закаўказскім, Паўднёвым і другіх франтах М.І.Семянцоў быў узнагароджаны многімі баявымі ордэнамі і медалямі. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 28 верасня 1943 г. яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. 12 лютага 1945 г. у баях на Берлінскім напрамку капітан М.І.Семянцоў загінуў смерцю героя, прыкрываючы свайго баявога таварыша.

Ф.М.Стралец.

У перадваенныя гады жыў і працаваў у ваенным гарадку Лешчынец Гомельскага раёна Фёдар Міхайлавіч Стралец. У пачатку вайны ён пайшоў на фронт, быў кулямётчыкам. Фёдар Міхайлавіч удзельнічаў ў абароне і вызваленні шматпакутнай зямлі Беларусі. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях пад Мінскам у 1944 г., яму пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У пасляваенныя гады намеснікам старшыні калгаса імя XXIII з'езда КПСС, сакратаром яго партыйнага камітэта, старшынёй Яроменскага сельсавета працаваў Герой Савецкага Саюза Дзякаў Іосіф Іванавіч. У 19 гадоў ён скончыў курсы камандзіраў, служыў начальнікам пагранзаставы, з баямі прайшоў ад Падмаскоўя да Чэхаславакіі, удзельнічаў у вызваленні Віцебска, Гродна. За мужнасць і адвагу яму 23 сакавіка 1945 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. 548 жыхароў з в. Яроміна ўдзельнічалі ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі. 243 з іх не вярнуліся з фронту. 340 аднавяскоўцаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Яромінцы па праву ганарацца знакамітымі землякамі — братамі Шамко, стаўшымі генераламі Савецкай Арміі, кавалерам ордэна Славы III і II ступеней Пятром Іосіфавічам Сусікавым, ардэнаносцамі А.Д.Чахоўскім, П.Г.Чайковым, М.І.Гарбузовым, М.Я.Агароднікавым і інш.

З першых дзён удзельнічаў у баявых дзеяннях ураджэнец в. Глыбоцкае капітан Крукаў Васіль Дзмітрыевіч. Ён ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, 1-м Украінскім і іншых франтах, быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны I і II ступеней. 15 ліпеня 1944 г. воін-артылерыст загінуў каля с. Пегіхвосты Валынскай вобласці. Толькі ў 1975 г. узнагароды героя былі ўручаны яго жонцы Ганне Адамаўне і дачцэ Ніне Васільеўне на вечнае захоўванне, на памяць аб мужнасці і гераізме бацькі і мужа.

У Цярухскім школьным музеі ёсць экспазіцыя аб аднавяскоўцы Іване Ануфрыевічу Сабко. Старшым лейтэнантам у суровым 1941 г. ён абараняў Маскву, пазней капітанам ваяваў на Харкаўскім напрамку. Загінуў І.А.Сабко ў званні маёра вясной 1943 г.

У в. Папкова Сухініцкага раёна Калужскай вобл. 21 снежня 1941 г. напаткаў лёс Зоі Касмадзям'янскай ураджэнку в. Яроміна Ларысу Васільеву. Землякі назвалі адну з вуліц роднай вёскі яе імем.

Адважнымі партызанскімі падрыўнікамі былі Наля Максімаўна Каратkевіч з в. Яроміна і Ірына Іларыёнаўна Цімашэнка з в. Даўгалессе.

Памяць аб гераічных справах падпольшчыка, ураджэнца в. Бабовічы І.Шылава ўвекавечана ў назве адной з вуліц г. Гомель.

Згодна рашэнню Цярэніцкага сельсавета вуліца в. Іванаўка названа імем Праскоўі Хамянковай, якая тут нарадзілася і вырасла, змагалася ў радах народных мсціўцаў. У 1942 г. яна была схоплена фашыстамі і закатавана разам са сваёй маці.

Адважна змагаўся з гітлераўцамі ў партызанскім атрадзе на Жытоміршчыне жыхар в. Даўгалессе Дзмітрый Міхайлавіч Жырны. За час баявых дзеянняў дыверсійнай групай з удзелам Дзмітрыя Міхайлавіча пушчана пад адхон 12 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай. Пасля вызвалення ў складзе дзеючай арміі ён дайшоў да Кёнігсберга. Пяццю баявымі ўзнагародамі быў адзначаны ратны шлях партызана і воіна.

Паўсюдна — на фронце і ў тыле ворага — змагаліся з фашысцкімі захопнікамі ўраджэнцы і жыхары Гомельскага раёна. Тысячы ўраджэнцаў іншых рэгіёнаў былога Савецкага Саюза прымалі ўдзел у вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і склалі тут свае галовы.

Зямля Гомельскага раёна шчодра паліта крывёю сыноў і дачок усіх народаў былога Савецкага Саюза. На яго тэрыторыі пахаваны 4565 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Іх імёны ўвекавечаны на помніках і абеліскаў на брацкіх магілах, якія густа пакрываюць тэрыторыю Гомельшчыны.

На брацкай магіле в. Пясочная Буда золатам высечаны словы: «Тут пахаваны экіпаж самалёта, які загінуў у 1944 г. у баях за Радзіму — камандзір палка палкоўнік Крыўцоў М.А., штурман маёр Салаў І.І., стралок-радыст Паўлаў М.А.» Хто гэтыя людзі? М.А. Крыўцоў — ураджэнец Крыварожскай, І.І.Салаў — Калужскай, а М.А. Паўлаў — Архангельскай абласцей. Першае баявое хрышчэнне яны атрымалі каля воз. Хасан, другое — на р. Халкін-Гол і трэцяе — у суровы 1941 г. у Прыбалтыцы. Вайна звяла іх у адзін экіпаж пры вызваленні Гомельшчыны. Яны ўдзельнічалі ў знішчэнні жывой сілы і тэхнікі ворага пры вызваленні Гомельскага раёна і Гомеля. Пры бамбардзіроўцы чыгуначнага вузла Калінкавічы паўтарылі подзвіг капітана Гастэлы. Аднапалчанам удалося знайсці астанкі герояў і пахаваць у вёсцы, дзе тады стаяў 54-ы бамбардзіровачны полк.

У брацкай магіле, побач з шашой, каля в. Калініна Цярэшкавіцкага сельскага Савета пахаваны сын шорскага народа, ураджэнец Кемераўскай вобласці Міхаіл Міхайлавіч Куюкаў, які 30 верасня 1943 г. удзельнічаў у ўтрыманні плацдарма на беразе Сожа каля в. Скіток. Быў паранены, але поле боя не пакінуў. Тут і загінуў. 15 студзеня 1944 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР за здзейснены подзвіг М.Куюкаву прысвоіў званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна. 24 лістапада 1943 г. яму споўнілася б 19 гадоў.

У вёсцы Церуха ёсць вуліца, якая носіць імя Аляксандра Дзмітрыевіча Валогіна. Яго прах пакоіцца ў брацкай магіле ў вёсцы. За мужнасць і гераізм, праяўленыя пры фарсіраванні рэк Дзясна і Сноў, а таксама ў баях на тэрыторыі Гомельшчыны, ураджэнец Самарскай вобласці гвардыі малодшы сяржант А.Аз.Валогін быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза пасмяротна.

Гарыць вечны агонь на брацкай магіле на плошчы Працы ў Гомелі. На адной з мармуровых пліт высечаны словы «Падпалкоўнік Ф.В.Лебядоўскі». Сын украінскага народа, ураджэнец Адэсы падпалкоўнік Ф.В.Лебядоўскі ўдзельнічаў у абароне Сталінграда, змагаўся на Курскай дузе. Полк пад яго камандаваннем вызначыўся ў баях за вызваленне вёсак Пакалюбічы, Яроміна, пасёлка Касцюкоўка і Гомеля, дзе і загінуў герой.

У цэнтры в. Пакалюбічы ў брацкай магіле пакоіцца прах парторга роты лейтэнанта Памялова Міхаіла Паўлавіча, які сваім асабістым прыкладам натхняў салдат на подзвіг пад час вызвалення вёскі 23 лістапада 1943 г.

У ліпені 1943 г. на тэрыторыю Гомельскага раёна быў скінуты паветраны дэсант, які нечаканым ударам знішчыў варожы гарнізон у в. Жаробнае (Чкалава) на беразе р. Сож. Перапалоханыя гітлераўцы ўцяклі і з в. Бабовічы. Але праз некаторы час яны апамяталіся і, сабраўшы вялікія сілы, павялі наступленне на дэсантнікаў. Савецкія воіны адышлі да берага ракі і, схаваўшыся за прыбярэжнымі камянямі, больш за суткі вялі цяжкі бой. Сілы былі няроўныя. Мужныя воіны змагаліся да апошняй кроплі крыві і палі смерцю герояў.

Праз 24 гады вучнямі Бабовіцкай сярэдняй школы на адным з камянёў на беразе р. Сож быў знойдзены надпіс:

«24.VII.43 г. Бывай Радзіма. Я паміраю, але не здаюся. Сяргееў Іван Сямёнавіч».

І.С.Сяргееў, 1923 г. нараджэння, ураджэнец Наўгародчыны. Вучыўся, затым працаваў шахцёрам на шахце «Коксавая» ў Кузбасе. Адтуль у чэрвені 1942 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію. Маці героя, Усціння Васільеўна Сяргеева, у жніўні 1943 г. атрымала паведамленне: «Паветраны стралок малодшы сяржант Сяргееў Іван Сямёнавіч, выконваючы баявое заданне, не вярнуўся на базу, прапаў без вестак». Але сэрца маці працягвала чакаць сына. І толькі гэта знаходка на беразе Сожа расказала маці, што яе сын не проста прапаў без вестак, а загінуў як герой, змагаючыся за свабоду Айчыны.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на розных франтах і ў тыле ворага мужна змагаліся каля 12 тысяч жыхароў Гомельскага раёна. 5345 з іх аддалі свае жыцці за свабоду і незалежнасць Айчыны, у тым ліку 44 партызаны і падпольшчыкі.

Гады «гаспадарання» гітлераўцаў на тэрыторыі раёна прынеслі яго жыхарам вялікія страты і пакуты. Фашысты знішчылі 972 мірных жыхароў, спалілі 101 вёску, з іх 6 аднавіліся, спалілі і зруйнавалі 5077 жылых дамоў, 62 школы, 49 медыцынскіх, адміністрацыйных і культурна-асветніцкіх устаноў, вывезлі ў нямецкае рабства 1866 чалавек.

Пасля вызвалення патрэбны былі вялікія намаганні, самаадданая праца жыхароў раёна, каб аднавіць разбураную акупантамі народную гаспадарку, наладзіць людзям нармальныя ўмовы жыцця, аказаць дапамогу фронту ў хутчэйшым дасягненні Перамогі.

У.Ф.Эсмантовіч, Т.У.Язэпава.

Дакументы сведчаць

СА ЗВОДАК САВЕЦКАГА ІНФАРМБЮРО ЗА 1943 ГОД

За 27 верасня.

На Гомельском направлении наши войска, продолжая развивать успешное наступление... заняли более 230 населенных пунктов, среди которых... крупные населенные пункты... Маковье, Марковичи.

28/IX-1943, № 229 (8222)

За 28 верасня.

На Гомельском направлении наши войска, продолжая развивать наступление, заняли... крупные населенные пункты... Терюха, Гута... Александровка и железнодорожные станции... Зябровка, Терюха.

29/IX-1943, № 230 (8223)

За 30 верасня.

На Гомельском направлении наши войска продолжали наступление и заняли... крупные населенные пункты... [среди которых] Ивановка...

I/X-1943, № 232 (8225)

За 1 кастрычніка.

На Гомельском направлении наши войска заняли... крупные населенные пункты... [среди которых] Федоровка.

2/X-1943, № 233 (8226)

За 2 кастрычніка.

На Гомельском направлении наши войска заняли... крупные населенные пункты... Николаевка... Залесье.

2/X-1943, № 233 (8226)

За 10 кастрычніка.

На Гомельском направлении наши войска, сломив сопротивление противника... заняли населенные пункты... Головинцы... Климовка и железнодорожные станции... [среди которых] Кореневка.



Байцы Чырвонай Арміі вядуць агонь па праціўніку на подступах да Гомеля. 1943 г.



Камень з развітальным надпісам І.С.Сяргеева. Знойдзены ў маі 1967 г. каля в.Бабовічы на беразе р. Сож.

12/X-1943, № 241 (8234)

За 11 кастрычніка.

На Гомельском направлении наши войска... на левом берегу реки Сож заняли [населенные пункты] Романовичи, Якубовка, Севрюки.

12/X-1943, № 241 (8234)

За 13 кастрычніка.

На Гомельском направлении наши войска форсировали реку Сож и ведут бои непосредственно перед Гомелем. Противник артиллерийско-минометным огнем и контратаками пытался сковать наступающие советские части, но понес большие потери и был вынужден отступить. Бойцы Н-ского соединения уничтожили свыше батальона гитлеровцев. Захвачено 14 орудий, 68 пулеметов и 3 артиллерийских склада. На другом участке бойцы Н-ской части, с боями продвигаясь вперед, уничтожили свыше 500 немецких солдат и офицеров. Захвачены трофеи и пленные.

14/X-1943, № 243 (8236)

ДАНЯСЕННЕ НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТАДДЗЕЛА 22-й АРТЫЛЕРЫЙСКАЙ ГОМЕЛЬСКАЙ ЧЫРВАНАСЦЯЖНАЙ ДЫВІЗІІ РГК МАЁРА ВЕНЬЯМІНАВА ПАМОЧНІКУ НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТУПРАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ ПАДПАЛКОЎНІКУ НАСАЧОВУ АБ ВОІНАХ, ЯКІЯ ПА-ГЕРОЙСКУ ЗАГІНУЛІ Ў БАЯХ ЗА ГОМЕЛЬ

1. Гвардии майор Головацкий Григорий Матвеевич, заместитель командира полка по политчасти 13 легкоартиллерийской бригады 22 Артиллерийской Гомельской Краснознаменной дивизии РГК. Рождения 1914 г., белорус, образование среднее, член ВКП(б) с 1939 г. Призван в РККА Логойским РВК Минской области осенью 1936 г., уроженец г. Минска.

В дни ожесточенных боев за Гомель т. Головацкий в связи с выходом из строя командира полка принял командование полком на себя и успешно руководил артиллерийским огнем. Под руководством майора Головацкого батареи полка отлично действовали по уничтожению огневых точек и живой силы противника, чем способствовали прорыву сильно укрепленной полосы обороны противника на р. Сож. Гв. майор т. Головацкий погиб на боевом посту 12 декабря 1943 г., сраженный осколком вражеского снаряда.

Тов. Головацкий похоронен в г. Гомель, Советская ул., Сад пионеров. В похоронах приняли участие общественные организации гор. Гомеля и горком ВЛКСМ.

2. Ст. лейтенант Ландышев Александр Алексеевич, командир 6 батареи 316 ЛАП 13 ЛАБр. Рождения 1907 г., русский, образование среднее, член ВКП(б) с 1927 г. Призван в РККА Хрустальским РВК Ивановской обл. осенью 1941 года. Уроженец гор. Барнаул Алтайского края.

Тов. Ландышев в период боев за Гомель мужественно руководил вверенной ему батареей, часто находился в боевых порядках пехоты и метким артиллерийским огнем уничтожил живую технику врага. Батарея ст. лейтенанта Ландышева отличилась в боях в районе Хальч — Старое Село. Вражеская пуля оборвала жизнь волевого и мужественного командира 18 ноября 1943 г. Тов. Ландышев похоронен в г. Ветка.

3. Старшина Сергеева Мария Алексеевна — санинструктор дивизиона 59 тяжелопушечной артиллерийской бригады. Рождения 1923 г., член ВЛКСМ с 1940 г. В РККА призвана Коломенским РВК Московской области. Уроженка с. Корбчеева Коломенского р-на Московской обл.

Комсомолка Мария Сергеева в боях с немецко-фашистскими захватчиками при форсировании р. Сож проявила личную отвагу, мужество и геройство. Не раз рискуя жизнью, она появлялась на огневых позициях, наблюдательных пунктах и под сильным огнем противника оказывала медицинскую помощь раненым.

Только в день своей гибели санинструктор Сергеева оказала медицинскую помощь 20 бойцам. 18 ноября 1943 года в момент перевязки раненых в районе Хальч г. Сергеева погибла смертью героя. Похоронена в с. Хальч Гомельской области.

Гвардии майор Головацкий, ст. лейтенант Ландышев, старшина Сергеева достойны того, чтобы их память была увековечена общественными организациями г. Гомеля.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 233. Воп. 2374. Спр. 237. Л. 219–220.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

Урад Беларусі ў Навабеліцы

Пасля вызвалення Гомеля ўрад Беларусі і ЦК КП(б)Б прынялі рашэнне перабазіравацца з Масквы на родную зямлю, у вызваленую ад ворага Навабеліцу, каб больш аператыўна кіраваць пачаткам адраджэння народнай гаспадаркі, разбуранай нямецка-фашысцкімі захопнікамі, барацьбой партызан, падпольшчыкаў і ўсяго насельніцтва, якія яшчэ знаходзіліся на акупіраванай тэрыторыі.

Дзеля гэтага ў Маскве быў сфарміраваны спецыяльны цягнік, які 31 снежня 1943 г. у 16 гадзін прыбыў у вызвалены Гомель (Навабеліцу). У самім Гомелі размясціцца ўрадавым установам не было магчымасці, таму што фашысты пры адступленні ўзарвалі чыгуначны і шашэйны масты праз Сож і разбурылі ўсе пад'язныя пуці да станцыі Гомель. Акрамя таго, сам горад быў амаль поўнасцю разбураны гітлераўцамі. Таму для размяшчэння ўрадавых устаноў больш падыходзіла Навабеліца, у якой разбурэнні былі меншыя.

У гэты ж дзень 31 снежня 1943 г. у 20 гадзін у Навабеліцы ў клубе запалкавай фабрыкі «Везувій» адкрыўся ўрачысты сход абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. На ім з дакладам выступіў першы сакратар ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнка. Удзельнікі ўрачыстага пасяджэння прынялі Зварот да беларускага народа, у якім заклікалі жыхароў вызваленых раёнаў, партызан, падпольшчыкаў і ўсё насельніцтва гарадоў і вёсак рэспублікі, якое яшчэ знаходзілася пад фашысцкай акупацыяй, аддаць усе сілы і сродкі для паскарэння перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пасля афіцыйнай часткі сіламі беларускіх артыстаў і ансамбля песні і танца Беларускага фронту быў дадзены вялікі канцэрт, які закончыўся каля 3 гадзін ночы 1 студзеня 1944 г.

Увесь апарат урада Беларусі размясціўся ў будынку туберкулёзнай бальніцы, якая знаходзілася недалёка ад Навабеліцы. Апарат ЦК КП(б)Б — у памяшканні гарадской бальніцы. Першы сакратар ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнка заняў невялікі будынак заводаўпраўлення. Тут жа знаходзіліся яго памочнікі і тэхнічныя супрацоўнікі. Беларускі штаб партызанскага руху — у доме адпачынку «Чонкі». Месцам правядзення ўсіх масавых мерапрыемстваў заставаўся клуб запалкавай фабрыкі «Везувій».

У Навабеліцы ўрад Беларусі і ЦК КП(б)Б заставаліся да вызвалення сталіцы Беларусі — Мінска — 3 ліпеня 1944 г.

У.І.Лемяшонак.

Радыёстанцыя імя Саўнаркома БССР у Навабеліцы

25 сакавіка 1944 г. упершыню прагучалі пазыўныя зноў створанай радыёстанцыі імя Саўнаркома БССР, якая пачала вяшчаць з Навабеліцы. Пачатак работы яшчэ адной радыёстанцыі на вызваленай беларускай зямлі ў Навабеліцы (у Маскве працягвала працаваць радыёстанцыя «Савецкая Беларусь», пазыўныя якой упершыню прагучалі ў эфіры 1 студзеня 1942 г.) значна пашырыў магчымасці больш усебаковага паказу мужнай барацьбы беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, мабілізацыі ўсіх яго сіл і сродкаў на хутчэйшы і поўны разгром ворага.

У праграму вяшчання радыёстанцыі штодзённа ўключаліся «Апошнія паведамленні», перадачы для партызан і насельніцтва акупіраваных раёнаў рэспублікі, гутаркі і выступленні кіраўнікоў партыйных і савецкіх арганізацый Беларусі, перадавікоў вытворчасці, дзеячаў культуры, воінаў Чырвонай Арміі і партызан. Рэгулярна вяліся перадачы «На франтах Айчыннай вайны», «На вызваленай беларускай зямлі». Штодзённа ішлі ў эфір літаратурныя, літаратурна-музычныя перадачы, канцэрты і сярод іх — любімыя песні партызан па іх заяўках. Праз радыёстанцыю перадаваліся матэрыялы для падпольнага друку на акупіраванай тэрыторыі. Часта перад мікрафонам выступалі партызаны, што прыбывалі з варожага тылу ў Беларускі штаб партызанскага руху, які размяшчаўся ў Чонках, дзеячы навукі, літаратуры, культуры Беларусі. Такія выступленні знаходзілі

жывы водгук, уздымалі маральны дух у жыхароў рэспублікі, партызан, падпольшчыкаў. Перадачы радыёстанцыі з хваляваннем слухалі ў вызваленых раёнах і на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

У.І.Лемяшонак.

Яны вызвалялі наш край у лістападзе 1943...

У складзе 11-й арміі генерал-лейтэнанта І.І.Федзюнінскага ў вызваленні абласнога цэнтра і раёна г. Гомель удзельнічала 4-я Бежыцкая ордэна Суворава стралковая дывізія, якой камандаваў палкоўнік Д.Д.Вараб'ёў. Многія яе воіны склалі тут свае галовы. Мясцовыя жыхары свята шануюць памяць пра іх. Шмат пісьмовых успамінаў пра восеньскія дні таго далёкага 1943 г. разам з фотаздымкамі іх аўтараў захоўваецца ў музеі баявой і працоўнай славы Красненскай сярэдняй школы. Гэтыя дакументы сталі бясцэннымі рэліквіямі. Вялікая заслуга ў гэтым настаўніка гісторыі Міхаіла Аронавіча Кана, які стварыў музей, узначаліў пошукавую работу, арганізаваў сустрэчы з былымі франтавікамі, вызваляўшымі в. Краснае і іншыя населеныя пункты раёна, вёў перапіску з імі. У маляўнічым альбоме пад назвай «Яны вызвалялі наш край», які прысвячаецца воінам 4-й стралковай дывізіі, сабраны пісьмы старшыні савета ветэранаў гэтай дывізіі Барыса Пятровіча Лебедзева з г. Ціхвін Ленінградскай вобласці.

Вось некаторыя вытрымкі з аднаго з іх:

«У ноч на 3 лістапада 1943 г. часці 4-й Бежыцкай стралковай дывізіі, якая знаходзілася ў раёне Навабеліцы, занялі абарону па ўсходнім беразе р. Сож і каля вусця Іпуці. Пасля падрыхтоўкі раніцай 12 лістапада мы зрабілі спробу фарсіраваць Сож супраць паўднёвай ускраіны Гомеля. Але, як толькі лодкі і плыты спусцілі на ваду, лавіна артылерыйска-мінамётнага агню абрушылася на нашы дэсантныя падраздзяленні. Запрацавалі да таго невядомыя нам варожыя кулямётныя кропкі. Вада закіпела ад куль і асколкаў. Адразу было разбіта некалькі лодак і плытоў, і мы вымушаны былі заняць ранейшыя пазіцыі.

На наступны дзень, выбраўшы больш зручную мясцовасць, часці дывізіі зноў пачалі фарсіраванне ракі і дабіліся поспеху. Пры магутнай артылерыйскай падтрымцы і пад прыкрыццём актыўных дзеянняў штурмавой авіяцыі перадавыя роты 101-га стралковага палка маёра Д.Е.Шапарэнкі зачапіліся за заходні бераг, захапілі каля Пахом'ева манастыра невялікі плацдарм і павялі баі за яго расшырэнне. Падраздзяленні іншых часцей, якія да таго часу пераправіліся цераз раку вышэй, павялі наступленне на в. Пакалюбічы. 220-ы стралковы полк маёра М.П.Маісеенкі ў гэты час рухаўся на вёскі Валатава і Прудок. Праціўнік аказваў жорсткае супраціўленне і неаднаразова пераходзіў у контратакі. Цяжкія і ўпартыя баі не спыняліся ні ўдзень ні ўначы.

Да зыходу 25 лістапада Гомель апынуўся ў паўкальцы войскаў 11-й арміі, і гітлераўцы пачалі адводзіць з горада свае часці, пакідаючы моцныя заслоны. Збіўшы іх, часці нашай дывізіі на досвітку 26 лістапада ўступілі ў разбураны і палаючы Гомель. Першымі ў горад увайшлі падраздзяленні 39-га і нашага, 220-га стралковага, палкоў. На будынку гарадской электрастанцыі ўзвіўся чырвоны сцяг. Яго ўзняў яфрэйтар Міхаіл Іванавіч Васільеў з 39-га палка падпалкоўніка В.Д.Кісялёва.

У той жа дзень, не затрымліваючыся ў горадзе, часці дывізіі перайшлі да праследавання праціўніка. Ачысцілі ад фашыстаў вёскі Краснае, Новая Мільча, Урыцкае і іншыя. За тры дні наступлення вызвалілі таксама Целяшы, Цярэнічы, Івольск і многія іншыя населеныя пункты Гомельскага і Буда-Кашалёўскага раёнаў...

За вызваленне Гомеля і вёскі Краснае я быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

У адным з успамінаў Б.П.Лебедзеў засяродзіў увагу на доўгіх і ўпартых баях за в. Пакалюбічы, якая была ключом да Гомеля. Паведаў ён і пра сувязіста Мікалая Андрэевіча Ларкова, партызана і франтавіка. Ён, студэнт Гомельскага музвучылішча, быў у партызанскім атрадзе імя Варашылава падрыўніком. Пасля вызвалення Гомеля стаў сувязістам 101-га палка 4-й стралковай дывізіі.

Ёсць у музеі і матэрыялы пра земляка — жыхара в. Краснае Івана Георгіевіча Фралова, былога кулямётчыка 4-й Бежыц-

кай стралковай дывізіі. Баявое хрышчэнне атрымаў ён на Дняпры каля Стрэшына, зведаў жорсткія, кровапралітныя баі пад Жлобінам. Бой 23 лютага 1944 г. за станцыю Мормаль аказаўся для І.Г.Фралова апошнім — тут ён атрымаў цяжкае раненне.

Матэрыялы музея апавядаюць і пра многіх іншых воінаў, якія ў радах дывізіі вызвалялі населеныя пункты раёна. Адрасы іх самыя розныя. Кулямётчык Іван Пятровіч Ручко з Бранскай вобласці, які ўдзельнічаў у вызваленні Пакалюбіч, на сцяне рэйхстага напісаў: «Мы з Унечы. Старшы сяржант Іван Ручко». Пётр Фёдаравіч Кухараў з Запарожжа абясшкодзіў за вайну 5000 мін і іншых выбуховых прыстасаванняў. Ён, камандзір узвода 7-га асобнага сапёрнага батальёна, дэмабілізаваўся ў званні капітана. «Мы былі першымі салдатамі, якія ўвайшлі ў Гомель і ваша сяло», — піша ён у сваіх успамінах.

Кулямётчык старшы сяржант Міхаіл Паўлавіч Баёўкін расказаў пра наступленне на Пакалюбічы. Раніцай пад моцным артылерыйскім агнём праціўніка падраздзяленні фарсіравалі Сож. У мокрым абмундзіраванні савецкія воіны з поймы ракі пайшлі на вёску, дзе на ўзвышшы ў немцаў была моцная абарона. Змагацца давялося доўга і з вялікімі стратамі. Былі дні, калі ад двухбаковай артылерыйскай кананады дрыжэла зямля, а ў паветры днямі знаходзіліся дзесяткі нашых і нямецкіх самалётаў, якія адзін за адным факеламі падалі на зямлю. У атакі байцы ўзнімаліся 18 дзён запар. Значна большая частка ўдзельнікаў тых баёў засталася ляжаць назаўсёды ў пакалюбіцкай зямлі... Кулямётчыку Баёўкіну споўнілася 18 гадоў у кастрычніку 1943 г. на фронце. Быў цяжка паранены, стаў інвалідам 2-й групы.

Пра неаднаразовыя спробы пад шквальным агнём гітлераўцаў авалодаць вёскамі Прудок, Пакалюбічы, пра вялікія ахвяры ў тых баях апавядае былы кулямётчык 101-га стралковага палка Сцяпан Пятровіч Цясцяны.

Нельга без хвалявання чытаць успаміны франтавікоў, якія ў Вялікую Айчынную вайну вызвалялі Гомельшчыну і прайшлі разам з 4-й стралковай дывізіяй цяжкі баявы шлях да Перамогі.

І.І.Пічукоў.

Лічылі загінуўшым

Тяжелые бои с гитлеровцами вели наступающие советские войска на подступах к Гомелю в ноябре—декабре 1943 г. Фашистское командование любой ценой старалось удержать этот крупный железнодорожный узел, цеплялось за каждый населенный пункт, использовало водные преграды.

Особенно тяжелые схватки разгорелись за деревню Поколюбичи, что в 12 километрах от города. Несколько раз она переходила из рук в руки, пока нашим войскам не удалось окончательно там закрепиться. О героизме советских солдат и офицеров рассказывают участники и очевидцы событий тех дней. А еще многочисленные памятники и обелиски в честь тех, кто отдал жизнь за Отчизну.

Один из таких памятников — на окраине города. Четыре надгробные плиты повествуют о том, что здесь покоятся останки 137 солдат и офицеров, павших за освобождение города. На мраморе одной из них выбиты фамилии рядовых Е.Т.Шумеева, Я.Т.Шумеева, С.Т.Шумеева.

«Не братья ли?» — высказали догадку сотрудники областного краеведческого музея. Кто они, эти трое?

И полетели в разные уголки страны запросы, письма, началась переписка с участниками войны. И вот, наконец, в многочисленной почте конверт с письмом из города Бахчисарая Крымской области. Прислал его Яков Тихонович, — один из трех Шумеевых. О себе рассказал следующее.

Родился в деревне Огляды на Брянщине. У него было четверо братьев — Ефим, Степан, Леон, Николай. Когда напали фашисты, все встали на защиту Родины. Леон и Николай погибли в боях за освобождение города Жлобина.

Ефим и Степан служили в 101-м стрелковом полку 4-й Бежицкой стрелковой дивизии. В ноябре 1943 г. они вместе форсировали Сож, вели кровопролитные

бои с фашистами. При освобождении деревни Поколюбичи смертью храбрых пали Ефим и Степан. Яков из пулемета косил фашистов за троих. От взрыва вражеского снаряда получил контузию и тяжелое ранение.

Товарищи посчитали рядового Я.Т.Шумеева убитым. Так и появилась рядом с именами погибших братьев его имя. Яков Тихонович после поправки участвовал еще во многих боях с фашистами. Но ранение, тяжелая болезнь дали о себе знать: воин стал инвалидом.

Так сложилась нелегкая судьба братьев Шумеевых. Пять похоронок пришло в деревню на Брянщине. Не выдержали такого удара престарелые родители. Их не застал в живых вернувшийся домой единственный из пяти братьев — Яков.

На мемориальной плите против его фамилии теперь будет выбито слово — «жив».

Н.Луковский.
Правда. 1980. 6 жн.

Вызваляў родную вёску

Жыхар пас. Чырвонае Селішча Зябраўскага сельсавета Мінчанка Васіль Цімафеевіч у 1939 г. служыў на Далёкім Усходзе. Калі ў 1942 г. стварылася цяжкае становішча на Заходнім фронце, шмат вайскоўцаў пачалі прасіцца добраахвотнікамі на фронт. У іх ліку быў і В.Ц.Мінчанка. Ён марыў убачыць сваю Радзіму, сваю вёску, вызваленую ад ворага. З баямі дайшоў да Гомельшчыны. Вызваляў Насовічы, ст. Зябраўка, пас. Чырвонае Селішча. Калі яго вайсковая часць падышла да пасёлка, Васіль пайшоў у разведку. Побач бацькоўская хата, у якой знаходзіліся фашысты, а ў садзе стаялі іх гарматы і білі па размяшчэнні савецкіх войскаў. І ён выклікаў агонь савецкай артылерыі на свой дом, на варожыя гарматы. Фашысты заўважылі савецкіх разведчыкаў, але тыя пад моцным агнём здолелі схавацца. Першым у свой пасёлак уварваўся В.Ц.Мінчанка. Сваю сям'ю ён не знайшоў — бацька і брат хаваліся ў лесе, а маці, брата і дзвюх сясцёр акупанты пагналі на захад. Паглядзеў старшына на згарэлы дом, пакляўся яшчэ мацней помсціць фашыстам.

Васіль Цімафеевіч удзельнічаў у вызваленні Гомеля, дайшоў да Дняпра. А далейшы яго шлях прыпыніла цяжкае раненне. Старшына ўзвода коннай разведкі В.Ц.Мінчанка 1 лютага 1944 г. памёр ад ран і пахаваны ў брацкай магіле ў в. Мядзведаў былога Парыцкага раёна.

Яго бацькі разам з паведамленнем аб смерці сына атрымалі ад камандавання часці пасведчанні на яго баявыя ўзнагароды — ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

Н.А.Гурэвіч.

Адважныя артылерысты

З успамінаў былога ўдзельніка вызвалення Гомельшчыны Паўла Мікалаевіча Буйневіча

Это было 20 ноября 1943 г. Воины батареи и расчета, в котором я был вторым номером, сражались отважно. Большими усилиями нам удалось освободить деревни Юрковичи, Шерстин и подойти к Присно. Враг подтянул свежие силы и стал отчаянно контратаковать. Утром 21 ноября, где-то около 10 часов, в воздухе появилось до 300 немецких самолетов. Они обрушили на наши позиции бомбы. Вслед за этим пошли в атаку наземные войска противника. На нашу батарею устремилось десять вражеских танков. Советские артиллеристы не растерялись. Ведя огонь прямой наводкой, мы подбили головной танк — он загорелся, остальные открыли огонь по нашей батарее, а затем повернули обратно. Но вражеская пехота продолжала атаку. Нависла угроза над батареей — гитлеровцы пытались прорваться на огневые позиции и захватить орудия. Мы встретили врага огнем из личного оружия.

Не могу не вспомнить о личной храбрости командира батареи капитана Серкова, который своим примером, умением и отвагой воодушевлял воинов. В ходе этого ожесточенного боя из 47 артиллеристов в строю осталось только три человека.

В период с 21 по 24 ноября мы приводили себя в порядок, а 26 ноября перешли в наступление в направлении Поколюбичи, участвовали в освобождении Гомеля.

За эти бои меня наградили орденом Красной Звезды.

Друкуецца па кн.: В грозные годы. Воспоминания участников борьбы против немецко-фашистских оккупантов на территории Гомельской и Полесской областей. Мн., 1973. С. 73.

Дакументы сведчаць

З ІНФАРМАЦЫІ СТАРШЫНІ ГОМЕЛЬСКАГА РАЙВЫКАНКОМА БЕЛЯКОВА САКРАТАРУ АБКОМА КП(б)Б Ф.В.ЖЫЖАНКОВУ

5 снежня 1943 г.

За время своего «хозяйствования» немецкие захватчики разграбили и уничтожили все колхозное имущество.

Весь колхозный рогатый скот, свиней, оставшихся не эвакуированных, немцы забрали сразу при вступлении в район.

Перед отступлением немцы выгоняли из сел и деревень все население, после чего солдаты, получив полную свободу действий, ходили по домам и забирали у крестьян одежду и обувь, ценные вещи, а все, что не могли забрать наиболее ценное и нужное в хозяйстве, особенно всякого рода аппараты и сельхозмашины, нужные колхозам, ломалось или сжигалось.

Спрятанный крестьянами в ямах хлеб также откапывался, частью забирался, а что не могли взять с собой, смешивали с землей или обливали горючим и сжигали. После этого грабежа и разбоя немцы выгоняли весь колхозный скот и поджигали сразу целые деревни. С имевшихся в районе до войны 10 270 крестьянских дворов сожжено немцами 4256 дворов.

Кроме того, в некоторых селах, как например Бобовичи, Чкалово, Михальки, Стукачевка и другие, все разграблено, во всех домах остались только одни стены, все остальное — двери, полы, потолки, окна — изъято и употреблено для устройства дзотов и блиндажей.

Под угрозой расстрела гитлеровцы приказывали всему населению эвакуироваться в немецкий тыл, однако большинство населения, узнав о приближении Красной Армии, разбежалось по лесам и болотам и таким образом избежало фашистской неволи.

Однако не всем таким образом удалось спасти свою жизнь.

Часть населения, не успевшее скрыться в лес, были убиты на месте, при попытке к бегству, или угнаны в фашистский тыл.

Из 6425 человек, угнанных в немецкий тыл, многие теперь уже найдены убитыми или сожжены.

По далеко не полным данным, имеющимся в райисполкоме, всего по Гомельскому району на сегодняшний день обнаружено трупов убитых и сожженых мирных жителей района 525 человек. Кроме того, на территории Гомельского сельского района обнаружены могилы с трупами мирного населения, убитых немецкими оккупантами: по шоссе Гомель — Речица около 1000 трупов, там же на седьмом километре в лесу квартал № 17 — 4000 трупов, в Прибытковском сельсовете у лагеря русских военнопленных.

Люди уничтожались самым зверским и беспощадным образом. В пос. Веселое Поле Урицкого сельсовета фашистские изверги согнали в баню все мужское население, бросив туда 2 гранаты и затем подожгли ее. По рассказам очевидцев, это была жуткая и потрясающая картина. Многие из них, будучи раненными, с пылающей одеждой пытались убегать, но ни одному человеку убежать не удалось, все 18 человек были добиты и сожжены. В Романовичском сельсовете в мелиоративном рву обнаружено 37 трупов, из них 10 детей, на телах которых медосмотром не обнаружено никаких травматических повреждений, что указывает на то, что эти дети были брошены в ров и закопаны живьем.

В Климовском и Прибытковском сельсоветах зверски убиты 36 человек стариков и старух, имевших по 70 и более лет, и детей, которые не могли двигаться за обозом.

Председатель исполкома Беляков
Секретарь исполкома Сорокин

Дзяржаўны архіў грамадскіх арганізацый Гомельскай вобласці. Ф. 144. Воп. 1. Спр. 5. Л. 68—76.

Мінёры ішлі на прарыў

З успамінаў удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Міхаіла Савельевіча Тулупава

Пасля заканчэння Рагачоўскага настаўніцкага інстытута я прыехаў у Навабеліцу. Тут у 1938 г. даў першыя ўрокі вучням чыгуначнай сярэдняй школы № 8 (цяпер СШ № 31 г. Гомель). І ад таго першага вераснёўскага званка 52 гады свайго жыцця прысвяціў выхаванню падрастаючага пакалення.

Але ў пачатку педагагічнага шляху мне давялося часова пераквалiфікавацца, бо грымнула Вялікая Айчынная вайна. Яна заспела мяне ў вёсцы Шарпілаўка літаральна на другі дзень пасля прыезду ў водпуск з горада Слоніма, дзе я прапрацаваў інспектарам райана. Доўга не раздумваючы, пайшоў у ваенкамат. Папрасіў накіраваць на фронт, бо я вызваляўся ад мабілізацыі як работнік чыгункі.

Мяне накіравалі ў 240-ы стралковы полк, які знаходзіўся ў Навабеліцы. Там прысвоілі званне старшыны і прызначылі намеснікам палітрука роты.

Неўзабаве атрымаў баявое хрышчэнне на роднай Гомельшчыне. Тады, у самым пачатку вайны, воінам нашага палка разам з іншымі часцямі ўдалося выбіць ворага з Рагачова. Але сілы былі няроўныя. У адным з баёў на тэрыторыі Прапойскага (цяпер Слаўгарадскага) раёна Магілёўскай вобласці я атрымаў цяжкае асколачнае раненне. Здарылася гэта 12 ліпеня 1941 г.

Пасля шпіталяў зноў трапіў на фронт. Абараняў Маскву, камандаваў узводам мінёраў. Удзельнічаў у контрнаступленні пад Нара-Фамінскам. Тады, у канцы 1941-га, і атрымаў сваю першую ўзнагароду — медаль «За баявыя заслугі».

Небяспечная і рызыкоўная прафесія мінёра, асабліва ў баявой абстаноўцы. Не злічыць, колькі тысяч варожых мін давялося абясшкодзіць воінам нашага ўзвода, каб праклaсці воінам шлях для наступлення. Не лягчэй было і ставіць міны пад агнём праціўніка, які пагражаў прарывам на тым ці іншым участку фронту. Аднойчы я асабіста ўстанавіў 300 мін.

Пасля баёў на Смаленшчыне ў канцы 1943 г. разам з батальёнам зноў ступіў на родную беларускую зямлю. Вярнуўся на Магілёўшчыну, дзе быў паранены ў першы месяц вайны. Ад ракі Проня прайшоў на захад праз усю Беларусь да польскай граніцы.

Жыхары в. Пакалюбічы сустракаюць савецкіх воінаў. 23 лістапада 1943 г.

Асабліва запомнілася наступальная аперацыя, у час якой узвод, якім я камандаваў, суправаджаючы пяхоту, дзейнічаў сумесна з палком самаходных гармат. Салдаты выяўлялі і знімалі мінныя загароды на дарогах, палях і ў лясах. Тады пяхота пры падтрымцы самаходак прарвала дзве лініі варожай абароны, а на трэцяй атака захлынулася. Камандзір артылерыстаў, падпалкоўнік Сегядзін, прыняў дзёрзкі план — у адным месцы прарвацца палком на самаходках у тыл немцаў. З кожнай батарэяй ішлі на прарыў і мінёры. Сам я знаходзіўся разам з камандзірам палка на яго самаходнай артылерыйскай установцы. Імклівы і адчайны рэйд удаўся. Полк перарэзаў шашу Магілёў — Орша, утрымліваў і кантраляваў яе трое сутак, перакрыўшы рух варожых войскаў. Прарыў гэты быў такім нечаканым для немцаў, што яны палічылі нашы самаходкі сваімі. У час гэтай ашаламляльнай аперацыі былі знішчаны 100 нямецкіх аўтамашын, а мінёры парвалі 120 кіламетраў тэлефоннай сувязі. Пра той подзвіг самаходчыкаў-артылерыстаў і мінёраў падрабязна расказала тады франтавая газета. Усе яны атрымалі баявыя ўзнагароды, у тым ліку і я ўдастоіўся ордэна Чырвонай Зоркі.

Пасля вызвалення Беларусі былі новыя баі ўжо на тэрыторыі Польшчы. У снежні 1944 г. медыкі прызналі мяне нягодным да страявой службы ў сувязі з тым цяжкім раненнем, якое атрымаў на 21-ы дзень вайны. Пасля камісавання мяне перавялі ў запасны полк рэзерву на пасаду старшыны роты.

А ў лістападзе 1945 г. я дэмабілізаваўся

М.С.Тулупаў.

і прыехаў да сям'і ў Шарпілаўку. Вярнуўся да любімай справы.

Пяць гадоў займаў пасаду загадчыка Лоеўскага райана. А потым працаваў паслядоўна дырэктарам сярэдніх школ у вёсках Старыя Дзятлавічы, Пакалюбічы, Церуха Гомельскага раёна. У 1958 г. скончыў завочна Гомельскі педінстытут. А пасля прызначэння пенсіі па ўзросце яшчэ доўга выкладаў рускую мову ў Галавінскай СШ. І толькі калі пераваліла за 70, я, інвалід Айчыннай вайны II групы, развітаўся з педагагічнай справай.

Апрача названых узнагарод маю ордэн Айчыннай вайны I ступені, шэраг медалёў, у тым ліку «За абарону Масквы», «За працоўную доблесць», а таксама нагрудны знак «Выдатнік народнай асветы». У якасці дэлегата ўдзельнічаў у Першым рэспубліканскім з'ездзе настаўнікаў.

У Міхаіла Савельевіча вялікая сям'я — чацвёра дзяцей, 8 унукаў і 3 праўнукі. Абедзве дачкі па прыкладу бацькі працуюць настаўніцамі.

Запісаў І.І.Пічукоў.

Подзвіг сокалаў

Вёска Пясочная Буда, што за 20 км ад Гомеля. У цэнтры яе брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На мемарыяльнай пліце золатам высечаны словы: «Тут пахаваны экіпаж самалёта, які загінуў у 1944 г. у баях за Радзіму, — камандзір палка палкоўнік Крыўцоў М.А., штурман маёр Сомаў І.І., стралок-радыст Паўлаў М.А.». На працягу некалькіх гадоў юныя следапыты Пясочнабудскай школы і сярэдняй школы № 6 г. Калінкавічы, а таксама навуковыя супрацоўнікі Гомельскага краязнаўчага музея збіралі матэрыялы аб членах экіпажа, адшуквалі аднапалчан герояў, вывучалі архіўныя дакументы, знаходзілі адрасы і пісалі іх блізкім. У выніку гэтага пошуку раскрылася яшчэ адна хвалюючая старонка з летапісу бессмяротнага подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У канцы 1943 — пачатку 1944 г. паблізу

вёскі Пясочная Буда на палявым аэрадроме базіраваўся 54-ы бамбардзіровачны авіяполк 16-й паветранай арміі. Адсюль лётчыкі вылятали бамбіць ваенныя аб'екты гітлераўцаў у раёнах Калінкавіч, Мазыра, Жлобіна, Бабруйска і іншых.

12 студзеня 1944 г., калі войскі Беларускага фронту ажыццяўлялі Калінкавіцка-Мазырскую аперацыю, эскадрыллі бамбардзіроўшчыкаў 54-га авіяпалка нанеслі магутны ўдар па чыгуначнаму вузлу Калінкавічы. Там скапілася многа эшалонаў праціўніка з войскамі, тэхнікай, боепрыпасамі. На чале палка ляцеў экіпаж яго камандзіра падпалкоўніка Крыўцова М.А. Нашы самалёты яшчэ не паспелі легчы на баявы курс, як на іх шляху паўстала сцяна агню варожых зенітных батарэй.

Імкнучыся перашкодзіць атацы савецкіх пікіруючых бамбардзіроўшчыкаў, 8 нямецкіх знішчальнікаў накінуліся на вядучы самалёт Крыўцова. Флагманскі стралок-радыст Паўлаў адбіў атаку. Смела манеўруючы сярод агню, Крыўцоў і Сомаў вялі самалёт на цэль. Пры першым заходзе магутны бомбавы ўдар быў абрушаны на эшалоны ворага. Узарваліся вагоны з боепрыпасамі. У груды металу ператварыліся танкі, гарматы.

Яшчэ адзін заход на станцыю, і тут левы матор Крыўцова загарэўся. Экіпаж мог яшчэ выратавацца пры дапамозе парашутаў.

Але крылатыя сокалы выбралі іншы шлях.

Яны паравялі палаючую машыну ў піке і накіравалі на платформы з гітлераўскай тэхнікай. Раздаўся яшчэ адзін выбух — апошні. Так загінулі героі.

У кнізе генерал-палкоўніка авіяцыі А.Г.Рыкава «Рыцары пятага акіяна» ёсць такія радкі: «Савецкія воіны вызвалілі Калінкавічы 14 студзеня, у той жа дзень мы накіравалі туды каманду на пошукі астанкаў загінуўшых. Сярод разбітых вагонаў і дагараючых дошак знайшлі нарэшце астанкі іх абгарэлых цел і прывезлі на аэрадром Пясочная Буда, дзе стаяў тады 54-ы бамбардзіровачны полк...

На свежай магіле быў устаноўлены наспех збіты з дошак абеліск з надпісам: «Тут пахаваны камандзір палка падпалкоўнік М.А.Крыўцоў, штурман палка маёр І.І.Сомаў, стралок-радыст старшына М.А.Паўлаў і іншыя воіны, якія па-геройску загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне».

Вызначыўся на Гомельшчыне

А.Дз.Валогін нарадзіўся 8 кастрычніка 1924 г. у с. Пячэрскае (цяпер г. Акцябрск Куйбышаўскай вобласці). Герой Савецкага Саюза (15.1.1944). Працаваў токарам механічнай майстэрні асфальтавага завода. У 1942—1943 гг. курсант Тамбоўскага кулямётнага вучылішча. З 8 жніўня 1943 г. на фронце. Гвардыі малодшы сяржант А.Дз.Валогін вызначыўся ў баях за г. Дзмітраўск-Арлоўскі. Загінуў 17.10.1943 г. пры фарсіраванні р. Сож у раёне в. Чырвоная Даліна.

Імем А.Дз.Валогіна названа вуліца на радзіме.

Застаўся назаўсёды маладым

У вёсцы Церуха, што на Гомельшчыне, на самым прыгожым месцы, дзе шапочуць сосны, бачна, як на высокім пастаменце бронзай адлівае фігура смуткуючага салдата. Тут знайшлі свой вечны пакой тыя, хто аддаў жыццё за вызваленне Гомельскага раёна ад фашысцкіх захопнікаў. Тут пахавана шмат вайскоўцаў розных нацыянальнасцей, але лёс у іх быў аднолькавы — смерцю сваёй усталяваць на зямлі жыццё, мір, шчасце.

Тут у пасляваенныя гады былі перапахаваны астанкі Героя Савецкага Саюза гвардыі малодшага лейтэнанта Аляксандра Дзмітрыевіча Валогіна. Яго імя загадам міністра абароны СССР яшчэ ў 1944 г. навечна занесена ў спіс асабовага складу першай роты гвардзейскага палка.

Аляксандру Валогіну ішоў дзевятнаццаты год, калі яго прызвалі ў армію. У 1943 г. трапіў на фронт у 114-ы полк 37-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Вось вытрымка з характарыстыкі камандзіра часці, у якой служыў А.Дз.Валогін: «У баях за

горад Дзмітраўск-Арлоўскі са станкавага кулямёта знішчыў 75 нямецкіх салдат і афіцэраў і першым уварваўся ў траншэі праціўніка, тым самым забяспечыў выкананне задачы, пастаўленай батальёну. З 8 жніўня 1943 г. т. Валогін знішчыў 145 нямецкіх салдат і афіцэраў, разлік супрацьтанкавай гарматы, два разлікі кулямётаў праціўніка». Гэта толькі некалькі старонак з баявога жыцця героя.

У баях Аляксандр быў паранены. Пасля шпіталя зноў у родным палку працягваў свой шлях на захад.

37-я дывізія з наступальнымі баямі крочыла ў міжрэчча Дзясны і Сожа. На яе шляху пралягала рака Сноў. Адным з першых, выкарыстаўшы рыбацкую лодку, на заходні бераг пераправіўся Валогін. Ён разам з напарнікам трапным агнём падтрымліваў пераправу батальёна. Калі плацдарм быў пашыраны і ўсталявалася адноснае зацішша, камандзір палка К.В.Палякоў падпісаў дакумент аб прадстаўленні кулямётчыка А.Дз.Валогіна да звання Героя Савецкага Саюза, а Валогін з баявымі сябрамі працягваў біць фашыстаў. Званне Героя Савецкага Саюза яму было прысвоена 15 студзеня 1944 г. Але ён ужо не даведаўся аб гэтым.

В.Дз.Вятошкін.

Ад ракі Сноў полк пайшоў да Сожа. Шлях быў цяжкі. Вораг жорстка супраціўляўся. Свой апошні бой Валогін прыняў 17 кастрычніка 1943 г. каля в. Чырвоная Даліна. Ветэран 37-й дывізіі У.Х.Пірашэнка ўспамінаў: «Не ўдалося нам тады адразу ўзяць выгадны рубеж. Рашылі ў атаку пайсці пад вечар. Ворагі адкрылі шалёны агонь. У тым баі вызначыўся і быў смяротна паранены мой аднапалчанін А.Валогін. Імклівы, валявы, адчаянна храбры воін з берагоў Волгі загінуў на беразе Сожа. Было яму тады ўсяго 19 гадоў.

Н.А.Гурэвіч.

Нашы землякі — героі

ВЯТОШКІН Віктар Дзмітрыевіч, нарадзіўся 10 мая 1925 г. у в. Новая Мільча Гомельскага раёна. Поўны кавалер ордэна Славы.

У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1943 г. Удзельнік вызвалення Беларусі, Польшчы, баёў у Германіі. Камандзір мінамётнага разліку, сяржант Вятошкін вызначыўся пры фарсіраванні Вісла, Одэра і ў баі на подступах да Эльбы. 5 мая 1945 г. з мінамётным разлікам знішчыў 5 агнявых кропак ворага, што садзейнічала выхаду палка на Эльбу.

Віктару споўнілася шаснаццаць гадоў, калі скончылася мірнае жыццё і ён з бацькамі апынуўся на часова акупіраванай ворагам зямлі.

Восенню 1943 г., калі Гомельшчына была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Віктар адразу пайшоў на фронт. Свой баявы шлях ён пачынаў мінамётчыкам у 82-й стралковай дывізіі. Удзельнічаў у баях за вызваленне Магілёва, Рагачова, Быхава, Сакела.

У пачатку 1945 г. Віктар Вятошкін атрымаў першы ордэн Славы III ступені за фарсіраванне Вісла і пашырэнне плацдарма да падыходу нашых войскаў.

А між тым савецкія войскі ўжо набліжаліся да Одэра. За фарсіраванне ракі і праяўленую пры гэтым мужнасць нашаму земляку быў уручаны ордэн Славы II ступені.

Давялося яму ўдзельнічаць і ў напружаных баях па акружэнні берлінскай групоўкі гітлераўцаў і выхадзе на Эльбу.

За заключныя аперацыі Вялікай Айчыннай вайны Віктар Дзмітрыевіч быў прадстаўлены да ордэна Славы I ступені. Аднак пра гэтую ўзнагароду ён не ведаў. Толькі праз 25 гадоў яна знайшла героя. Віктар Дзмітрыевіч стаў поўным кавалерам самага славутага салдацкага ордэна.

У 1950 г. Віктар Дзмітрыевіч

І.І.Дзякаў.

І.С.Зайцаў.

дэмабілізаваўся, вярнуўся да дому і адразу ўладкаваўся на фабрыку «Палесдрук». Спачатку працаваў рэзчыкам паперы, механікам. З 1963 г. займаўся цынкаграфіяй, авалодаў прафесіяй фатографа.

Вайсковая загартоўка, дысцыпліна-ванасць дапамаглі яму хутка стаць высокакваліфікаваным майстрам сваёй справы. Да яго баявых узнагарод далучыліся працоўныя, галоўная з іх — ордэн Леніна ў 1977 г.

Зараз В.Дз.Вятошкін на пенсіі.

Н.А.Гурэвіч.

ДЗЯКАЎ Іосіф Іванавіч, нарадзіўся 4 красавіка 1903 г. у г. Гомель. Герой Савецкага Саюза (1945). З рабочых. Член КПСС з 1931 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. З 1942 г. на Заходнім, Цэнтральным, 3-м Беларускім, 1-м Украінскім франтах. У чэрвені 1944 г. у Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці парторг батальёна старшы лейтэнант Дзякаў першым падняўся ў атаку. Салдаты, натхнёныя яго прыкладам, авалодалі варожымі траншэямі, у рукапашнай сутычцы знішчыў 15 гітлераўцаў. 15.7.1944 г. у баях за Гродна замяніў параненага камандзіра роты і на чале падраздзялення адным з першых уварваўся ў горад. Пасля вайны на партыйнай рабоце, працаваў старшынёй Яромінскага сельсавета. Памёр 11.1.1984.

ЗАЙЦАЎ Іван Сцяпанавіч, нарадзіўся 9 кастрычніка 1926 г. у в. Чонкі Гомельскага раёна. Герой Савецкага Саюза (1945). Вызначыўся 16 красавіка 1945 г. у баі за ст. Вербіг (Германія). Цяжка паранены, закрыў сваім целам амбразуру дзота, кулямётны агонь якога стрымліваў наступленне савецкіх воінаў. Пахаваны ў г. Костшын (Польшча).

Калі пачалася вайна, юнаку не было яшчэ і 15 гадоў. Бацька пайшоў на фронт, а юнаку ў ваенкамаце сказалі: «Падрасці яшчэ».

Іван сваімі вачыма ўбачыў усё тое, што прынеслі фашысты на нашу зямлю: слёзы, кроў, смерць савецкіх людзей, разбураныя гарады і вёскі.

На фронт ён трапіў пасля вызвалення вёскі ад гітлераўцаў. Першае баявое хрышчэнне радавы Зайцаў атрымаў у наступальных баях на 3-м Украінскім фронце. Юнак з Чонак бачыў спустошаныя гітлераўцамі гарады і вёскі Украіны, Малдавіі, Польшчы...

Летам 1944 г. ён стаў сяржантам, камандзірам стралковага аддзялення. Неўзабаве быў паранены. Дні лячэння ў шпіталі цягнуліся марудна. Хацелася туды, дзе змагаліся баявыя сябры. І ён дабіўся свайго: са шпіталя выпісваецца датэрмінова. Вясной 1945 г. І.Зайцаў зноў на фронце. Удзельнічае ў баях на тэрыторыі Германіі. Ішлі апошнія дні вайны. Жорсткі бой за нямецкую станцыю Вербіг, каля горада Кюстрын. У ноч на 16 красавіка 1945 г. камандзір стралковага батальёна загадаў роце аўтаматчыкаў штурмам авалодаць двухпавярховым будынкам на ўскраіне горада. Заданне было цяжкае. Фашысты жорстка супраціўляліся, усе падыходы да дома прастрэльваліся. Адну з штурмавых груп узначаліў сяржант І.Зайцаў. Шлях уперад перакрываў дот. Калі Зайцаў і яго падначаленыя кінуліся ў атаку, па іх з паўпадвальнага акна ўдарыў кулямёт, а з другога паверха затрашчалі аўтаматы. Зайцаў загадаў двум байцам знішчыць варожы кулямёт. Але ледзь яны адарваліся ад зямлі, адзін з іх быў забіты, другі — цяжка паранены. «За мной, наперад!» — крыкнуў І.Зайцаў, кінуўся да дота, а за ім — байцы яго аддзялення. Аўтаматныя і кулямётныя чэргі прыціснулі салдат да зямлі. Іван кінуў адну за другой дзве гранаты. Яны разарваліся ля самай амбразуры. Кулямёт змоўк, але толькі на кароткі час. Неўзабаве агнявая кропка ворага зноў ажыла. Фашысцкая куля востра абпаліла левую руку І.Зайцава. «І тады камандзір аддзялення І.Зайцаў са звязкай гранат папоўз да дота, — успамінае генерал

В.С.Антонаў у кнізе «Шлях да Берліна». — Праціўнік, выявіўшы храбраца, які набліжаўся да дота, сканцэнтраваў на ім кулямётны агонь. Забіты таварышы, цяжка паранены сам Ваня, скончыліся гранаты. Заставалася адзінае выйсце. І сабраўшы апошнія сілы, са словамі «За Радзіму» ён кінуўся насустрач вогненнаму смерчу, на амбразуру».

Подзвіг І.Зайцава, здзейснены на вачах шматлікіх воінаў, надаў ім новыя сілы. Байцы штурмавых груп дружна пайшлі ў атаку. І вось на даху будынка з'явілася чырвонае палотнішча сцяга. Баявую задачу савецкія воіны выканалі.

Радзіма высока адзначыла подзвіг І.С.Зайцава. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 31 мая 1945 г. яму пасмяротна было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Мінулі гады. На старой Саксонскай дарозе, у польскім горадзе Касцюшын, каля магілы героя стаіць абеліск.

У Чонках, на сцяне акуратнага дома № 93, дзе нарадзіўся Ваня і жыла яго маці Настасся Клімаўна, устаноўлена мемарыяльная дошка. У Гомелі яго імем названа вуліца. Яго імя прысвоена пасажырскаму цеплаходу Беларускага рачнога параходства. Ён назаўсёды залічаны членам брыгады хімічнага завода. На будынку СПТУ № 56 будаўнікоў у яго гонар установлена мемарыяльная дошка. Яго імя стала вядома ўсёй краіне, а подзвіг героя навечна ўвайшоў у летапіс гісторыі Айчыннай вайны.

Н.А.Гурэвіч.

БАЛАДА АБ САЛДАЦЕ

Вёска ціхая Чонкі,
Вецер восеньскі звонкі
Вербалоззе цалуе,
Ля абрыву — сасонкі.
І расказваюць сосны
Зімы, восені, вёсны,
Гасцінцы і хаты
Пра вясковага хлопца,
Пра вясёлага хлопца,
Пра героя-салдата.
Як у чорны той год
Нашы войскі на ўсход
Адступалі,
Як нямецкія боты,
Фашысцкія боты
Еўропу тапталі.
Як ён лесам блукаў,
Партызанаў шукаў,

І.А.Каўшараў.

Як на захад пайшоў,
Як упаў за мяжой.
Горад Кюстрын стаіць.
Над магілай шуміць
Тапалінае лісце.
Людзі! Сёстры, бацькі!
Хто ляжыць тут такі?
Паглядзіце.
Мой зямляк, гамяльчанін,
Тут пахаваны.
Чулі, людзі?
Хай жа болей ніколі
Такога не будзе.

К. Калінаў.

КАЎШАРАЎ Іван Акімавіч, нарадзіўся 28 кастрычніка 1911 г. у в. Глыбоцкае Гомельскага раёна, Герой Савецкага Саюза (1941). Скончыў Ваенна-паветраную акадэмію (1945). Удзельнік савецка-фінляндскай вайны (1939—1940). У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Ленінградскім, 1-м Беларускім франтах, штурман эскадрыллі лёгкабамбардзіровачнага авіяпалка, начальнік штаба авіяпалка, лейтэнант. Зрабіў 157 баявых вылетаў па знішчэнні самалётаў на варожых аэрадромах, жывой сілы на пярэднім краі, танкаў і чыгуначных эшалонаў. Да 1961 г. служыў у Савецкай Арміі, падпалкоўнік. Ганаровы грамадзянін г. Ціхвін Ленінградскай вобласці.

Адна са старонак у летапіс гісторыі Айчыннай вайны ўпісана нашым земляком І.А.Каўшаравым.

У баях на Волхаўскім фронце толькі з 7 верасня па 7 снежня 1941 г. лётчык І.А.Каўшараў здзейсніў 99 баявых вылетаў, наносіў удары па пазіцыях праціўніка ў раёне г. Ціхвін.

Першая авіяэскадрылля, у якой Іван

М.І.Семянцоў.

Акімавіч быў штурманам, свой першы баявы вылет здзейсніла 22 чэрвеня 1941 г. «Калі эскадрылля падляцела да зададзенага раёна, — успамінаў пазней Іван Акімавіч, — адкрылася відовішча: усе дарогі забіты варожымі танкамі, артылерыяй, мотапяхотай, цыстэрнамі з гаручым. Эскадрыллі авіяпалка скінулі 270 авіябомбаў. У выніку было знішчана 10 танкаў, 29 аўтамашын і да 300 фашыстаў».

Як цяжкі бой запомніўся І.А.Каўшараву і дваццаць сёмы вылет, калі полк страціў 25 працэнтаў самалётаў. На Ленінградскім фронце Іван Акімавіч 127 разоў вадзіў авіяэскадрыллю ў бой. На Сінявінскім участку варожыя знішчальнікі атакавалі савецкія самалёты. Бамбардзіроўшчык Каўшарава загарэўся. Давялося садзіцца прама ў балота. З абпаленым тварам Іван Акімавіч на дзесяць дзён папаў у санчасць. За гэты бой І.А.Каўшараў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Аднойчы разведка данесла, што на аэрадроме Лёзна знаходзіцца каля 100 варожых бамбардзіроўшчыкаў. «Надвор'е было нялётнае. Воблакі прыціскалі нас да зямлі, — успамінае І.А.Каўшараў. — Мне давялося за секунды прыняць аптымальныя рашэнні, каб вывесці групу да цэлі. Пры першым жа заходзе шэраг самалётаў ворага запылалі, аэрадром зацягнула дымам. Пры другім заходзе агнём ахапіла бензазапраўшчыкі. Па звестках партызан былі знішчаны 21 і выведзены са строю 29 самалётаў ворага.

У гэты час гітлераўцы ўзнялі 8 знішчальнікаў МЕ-109 з прыфрантавога аэрадрома і перахапілі нашу эскадрыллю. Завязаўся жорсткі паветраны бой. Фашысцкія знішчальнікі рынуліся ў атаку на вядучага. Наш самалёт быў падбіты. Камандзір пасадзіў машыну на лясной паляне. Экіпаж выбраўся з палаючага самалёта. Па глыбокім снезе мы накіраваліся ў лес. На трэцюю ноч дайшлі да адной вёскі, але нас папярэдзілі, што там знаходзіліся немцы. Мы абышлі гэты населены пункт і пакрочылі далей. Нарэшце, выйшлі да сваіх».

За гэты бой І.А.Каўшараву прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза.

Высокую ўзнагароду Іван Акімавіч атрымаў у Крамлі. Пасля атрымання ўзнагароды да яго падышоў карэспандэнт газеты «Правда» і прапанаваў падпісаць зварот воінаў-беларусаў да сваіх землякоў, партызан і партызанак, усіх працоўных Беларусі, якія апынуліся на часова акупіраванай фашыстамі тэрыторыі.

«Да цябе, наш народ-волат, звяртаюцца сыны твае, воіны-беларусы, — гаварылася ў гэтым дакуменце. — Дзень і ноч мы жывем думкай пра вас, пра родную зямлю. Яна стогне пад пятой акупантаў. Мы клянёмся, што ні крыві, ні жыцця свайго не пашкадуем у барацьбе за сваю справу, за разгром фашысцкіх катаў. Знішчым ненавіснага ворага, назаўсёды ачысцім зямлю ад гітлераўцаў...».

Баявы шлях нашага земляка прайшоў праз Украіну, ваяваў на Ленінградскім фронце, удзельнічаў у Берлінскай аперацыі.

Н.А.Гурэвіч.

СЕМЯНЦОЎ Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся 26 верасня 1917 г. у пас. Ільіч Гомельскага раёна. Герой Савецкага Саюза (1943). У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941 г. Удзельнік баёў у Данбасе, на Каўказе, Курскай дузе, Украіне, Польшчы, Германіі. Намеснік камандзіра эскадрыллі знішчальнага авіяпалка, старшы лейтэнант. З чэрвеня 1941 г. па ліпень 1943 г. зрабіў 270 баявых вылетаў, удзельнічаў у 69 паветраных баях, збіў асабіста 12 самалётаў праціўніка, 9 у групе. Двойчы тараніў варожыя самалёты: у канцы 1942 г. каля г. Эліста, увосень 1943 г. пры наступленні на Кіеў. Загінуў у баі 12 лютага 1945 г. Імя Міхаіла Іванавіча Семянцова напісана на будынку Гомельскага авіяклуба ДТСААФ, у якім вучыўся герой.

Яго імем названа вуліца ў пас. Ільіч.

Ва Улукаўскім сельсавеце, за маленькай рачулкай Іпуць, ёсць пасёлак Ільіч, дзе прайшлі юнацкія гады жыцця Героя Савецкага Саюза Міхаіла Іванавіча Семянцова.

У свой час яго бацька быў зволены з механічных майстэрань Кіеўскага арсенала за рэвалюцыйную дзейнасць і пераехаў на Беларусь. Міхаіл хадзіў у Навабеліцкую школу, а потым працаваў у прыгарадным калгасе «Камсамол Гомельшчыны» (зараз саўгас «Бярозкі»). Адсюль ён у 1938 г. пайшоў у Чырвоную Армію, скончыў Адэскую ваенную школу. Стаў лётчыкам. Вайну сустрэў на Беларусі.

У адным з красавіцкіх нумароў газеты «Правда» (1945) быў змешчаны нарыс «Наша авіяцыя над Одэрам». Там ёсць такія радкі: «Шасцёрка лепшых знішчальнікаў пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза М.І.Семянцова знішчыла сем самалётаў ворага!» Шлях да гэтага подзвігу ў нашага земляка быў доўгі і цяжкі. З першых дзён верасня 1941 г. Міхаіл Семянцоў удзельнічаў у абароне Радзімы. За ўдзел у баях за Маскву ў снежні 1941 г. узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У ліпені 1941 г. адважны лётчык у адным баі збіў два варожыя самалёты, але і яго машына была падбіта. Пасадзіць яе не ўдалося: параненага лётчыка са зломанай рукой падабралі танкісты і адправілі ў шпіталь. Некалькі месяцаў правёў Міхаіл на шпітальным ложку. Пасля выхаду са шпіталя ён вярнуўся ў свой полк, дзе яго чакала яшчэ адна ўзнагарода — ордэн Чырвонага Сцяга.

Ішлі цяжкія баі на Арлоўска-Курскай дузе. Міхаіл Семянцоў амаль штодзённа ўдзельнічаў у іх. У адзін з паветраных баёў са сваім вядомым Качатковым уступілі ў бой з шасцю «месершмітамі». Бой быў жорсткі. Самалёт Качаткова атрымаў пашкоджанне. Сябра не змог падтрымаць свайго вядучага. Міхаілу Семянцову давялося біцца аднаму з групай варожых знішчальнікаў, з якіх два ён збіў.

Восень 1943 г. Нашы войскі выйшлі да р. Дняпро. Цяжкія баі ішлі на задняпроўскіх плацдармах. Экіпажы васьмі самалётаў ЛА-5 атрымалі загад: прыкрыць нашы наземныя часці. У раёне, дзе знішчальнікі павінны былі баражыраваць, прыйшлося ўступіць у бой з 19 варожымі самалётамі. Ні адна бомба не ўпала на пазіцыі савецкіх войскаў. У саставе васьмёркі быў і самалёт М.Семянцова. Ён храбра змагаўся і, калі скончыліся боепрыпасы, пайшоў на таран варожага бамбардзіроўшчыка. Самалёт быў падбіты, але і машына М.Семянцова атрымала моцныя пашкоджанні. У непрытомнасці трапіў Міхаіл зноў у шпіталь. Праз некалькі месяцаў Герой Савецкага Саюза капітан Семянцоў вярнуўся ў свой полк. А наперадзе былі яшчэ два цяжкія гады вайны. Шлях на захад для Міхаіла прайшоў у баку ад родных мясцін. На подступах да Берліна капітан Семянцоў камандаваў эскадрылляй знішчальнікаў.

12 лютага 1945 г. група самалётаў ПЕ-2 з 80-га гвардзейскага палка вылецела на бамбардзіроўку варожага аэрадрома каля горада Нейсе. «Петляковых» суправаджала шасцёрка знішчальнікаў, якіх вёў Герой Савецкага Саюза Міхаіл Семянцоў.

Да варожага аэрадрома эскадрылля бамбардзіроўшчыкаў падышла без перашкод. Лётчыкі, разгарнуўшыся ў баявы строй, пачалі бамбіць узлётную паласу і стаяўшыя на полі самалёты. Менавіта ў гэты час на бамбардзіроўшчыкаў накінуліся фашысцкія знішчальнікі. Шасцёрка «лавачкіных» уступіла з імі ў бой. Першая атака ворага была адбіта. У гэты момант Міхаіл заўважыў, што яго баявы сябра, ураджэнец Беларусі Герой Савецкага Саюза Евель Бялявін, у небяспецы: у хвост яго самалёта заходзіў «месершміт». Міхаіл накіраваў свой знішчальнік наперарэз ворагу і, разумеючы, што можна не паспець, вынік паядынку вырашаюць долі секунды, паласнуў па фашысцкім самалёце чаргой з дальняй дыстанцыі. Гэта чарга прашыла «месершміт». Той успыхнуў і паляцеў на зямлю. Сябра выратаваны. Але на самалёт героя ззаду накінуліся два «месершміты». Семянцоў не паспеў выйсці з атакі, і яго машына была расстраляна фашыстамі. Ніхто і нічым не мог дапамагчы баявому сябру... Ён жыў і загінуў героем.

Н.А.Гурэвіч.

ТРАЦЦЯКОЎ Якаў Адамавіч, нарадзіўся 23.10.1916 г. у в. Зябраўка Гомельскага раёна. Поўны кавалер ордэна Славы. Працаваў трактарыстам у калгасе. З ліпеня 1941 г. на Заходнім, Бранскім,

Я.А.Тращякоў.

Цэнтральным, Беларускім, 2-м і 1-м Беларускіх франтах. Камандзір гарматы старшына Я.А.Тращякоў вызначыўся ў баях на тэрыторыі Беларусі, Польшчы, Германіі. 23.12.1943 г. у баі за в. Казловічы Калінкавіцкага раёна гарматным агнём знішчыў 3 бліндажы, дзот, 5 кулямётных кропак і каля 2 узводаў пяхоты ворага; 14.1.1945 г. у час прарыву абароны праціўніка ў раёне г. Аўгустаў (Польшча) замяніў камандзіра ўзвода і з гармат знішчыў дзот, кулямёт і каля ўзвода варожай пяхоты. 20.4.1945 г. у баях на подступах да Берліна знішчыў гармату праціўніка і падавіў агонь мінамёта.

Жыў у в. Белаярава Мазанаўскага раёна Амурскай вобласці. Памёр у 1995 г.

Ад Масквы да Берліна прайшоў з баямі Якаў Адамавіч...

У снежні 1943 г. нашы войскі вялі ўпартыя баі на тэрыторыі Калінкавіцкага раёна. Мужнасць і адвага старшыны Тращякова ў баях за вызваленне Гомельшчыны былі адзначаны ордэнам Славы III ступені.

Студзень 1945 г. Жорсткія баі разгарнуліся ў раёне польскага горада Аўгустаў. Разлік Тращякова выкаціў гармату на лёд ракі Нараў. Цяжка было рухацца наперад: пад нагамі воінаў і коламі гарматы ламаўся лёд. Страляючы на хаду па кулямётных кропках ворага, разлік гарматы дасягнуў супрацьлеглага берага. Артылерысты хутка ўстанавілі гармату ў адбітым ад немцаў акопе і адкрылі агонь. 14 студзеня ў час прарыву абароны праціўніка Я.Тращякоў замяніў загінуўшага камандзіра ўзвода і прамой наводкай знішчыў дзот, кулямёт і да ўзвода салдат праціўніка. Гэта дазволіла нашым войскам уклініцца ў абарону ворага і захаваць важны плацдарм. За гэты подзвіг Тращякоў быў узнагароджаны ордэнам Славы II ступені.

20 красавіка 1945 г. жорсткія баі ішлі на подступах да Берліна. У гэты дзень наш адважны зямляк-артылерыст правёў апошні пераможны бой з ворагам. Яго разлік падавіў агонь нямецкага мінамёта, знішчыў гармату і больш за 20 салдат і афіцэраў ворага. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў гэтым баі, Якава Адамавіча ўзнагародзілі ордэнам Славы I ступені. Так ён стаў поўным кавалерам ордэнаў салдацкай доблесці і геройства.

Пасля вайны наш зямляк па закліку партыі паехаў на асваенне зямель Далёкага Усходу. Многа гадоў працаваў механізатарам, брыгадзірам.

Першы танкавы таран

Яскравую старонку ў летапіс Вялікай Айчыннай вайны ўпісалі нашы землякі — браты Міна, Елісей, Канстанцін Крычаўцовы, што з вёскі Барок Урыцкага сельсавета.

Калі пачалася вайна, 44-я танкавая брыгада, у склад якой уваходзіў экіпаж братоў Крычаўцовых, дыслацыравалася пад Беластокам. Першы бой танкісты прынялі 22 чэрвеня 1941 г. Яны выканалі загад — падтрымаць агнём пагранічную заставу. Браты добра ведалі мясцовасць, іх танк першым вырваўся наперад і першым адкрыў агонь па варожай пяхоце. Гітлераўцы ў паніцы пачалі адпаўзаць. Пагранічнікі, якіх такая дапамога натхніла, сталі праследаваць праціўніка. Але тут пачуўся гул матораў, з гаю, што быў непадалёку, пачалі выпаўзаць пачвары з чорнымі крыжамі на брані, танкісты налічылі каля 20 варожых танкаў. Свае машыны танкісты паспелі замаскіраваць і чакалі прыбліжэння ворага. Неўзабаве на полі бою гарэлі, як свечкі, 8 нямецкіх танкаў, 2 з іх спынілі браты Крычаўцовы. Але перавага была на баку ворага. Упарта змагаліся танкісты разам з часцямі 10-й арміі за кожны рубеж, аднак вымушаны былі адыходзіць.

26 чэрвеня 1941 г. Ішоў чацвёрты дзень вайны. Каля чыгуначнай станцыі Лапы, што

пад Беластокам, разгарэўся жорсткі танкавы бой. Калі на ўзлессі з'явіліся фашысцкія танкі, экіпаж братоў Крычаўцовых адзін з першых уступіў у бой. Камандзір танка, старэйшы брат Канстанцін, старшына, падаваў дакладныя каманды. Сярэдні брат Міна, механік-вадзіцель, старшы сяржант, умела манеўрыраваў. Малодшы, Елісей, сяржант, метка страляў па ворагу. Браты першым жа снарадам знішчылі галаўны танк. Але тут у іх машыну трапіў варожы снарад, і яна загарэлася. Пылаючы танк не спыніўся, а, наадварот, развіў большую хуткасць і ўрэзаўся ў цяжкі фашысцкі танк. Гэта быў апошні бой братоў-герояў і першы ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны танкавы таран.

Хто яны, дзе і як выхоўваліся браты-патрыёты? Аб гэтым расказала іх сястра, Вольга Георгіеўна Крычаўцова, былая настаўніца, зараз пенсіянерка, якая жыве ў в. Барок Урыцкага сельсавета, у бацькоўскай хаце.

— Мы выраслі ў многадзетнай сям'і, шасцёра сыноў ды тры дачкі. Бацька, Георгій Трафімавіч, быў для свайго часу чалавекам адукаваным, да рэвалюцыі і пасля яе працаваў настаўнікам, захапляўся музыкай, сам вывучыў нотную грамату, быў рэгентам царкоўнага хору, за што быў звольнены з настаўніцкай пасады. Калі ўступіў у калгас, працаваў садоўнікам. Сям'я была дружная, працавітая. Браты добра вучыліся ў школе, мелі музыкальныя здольнасці, атрымалі музычную адукацыю, умелі маляваць, актыўна ўдзельнічалі ў мастацкай самадзейнасці.

Да прызыву ў Чырвоную Армію (1939) Канстанцін скончыў 4 курсы музвучылішча, Міна быў студэнтам другога курса кансерваторыі ў Мінску, Елісей перайшоў на другі курс Гомельскага музычнага вучылішча. Як здарылася, што трох братоў праводзілі на вайсковую службу ў адзін дзень — 17.11.1939 г., і апынуліся яны ў адным экіпажы? Калі старэйшых братоў прызвалі на абавязковую службу, малодшы адмовіўся ад адтэрміноўкі, пажадаў добраахвотна служыць разам з братамі. А бацька звярнуўся да маршала Цімашэнкі з лістом, у якім прасіў міністра абароны, каб яго трох сыноў прызвалі на тэрміновую службу ў Чырвоную Армію ў танкавую часць і далі магчымасць служыць у адным экіпажы. Просьба бацькі была задаволена. І ўжо праз 2 дні браты былі ў Калузе, у 44-й легкатанкавай брыгадзе. Там і склалі адзіны танкавы экіпаж.

Родныя бачылі братоў апошні раз дома, калі іх часць стаяла ў ваенным гарадку Ляшчынец, што пад Гомелем, і яны прыходзілі дадому ў звальненне.

30 сакавіка 1941 г. танкавыя часці з Гомеля былі пераведзены ў Заходнюю Беларусь пад Беласток. Там і сустрэлі вайну.

Былі яны вясёлыя, добрыя, дружныя, вельмі працавітыя, сціплыя. Загінулі маладымі. Вельмі шкада, што так і не ведаем, дзе пахаваны. Доўга шукала, усюды пісала. Знайшла тых, хто ведаў братоў, прыслалі ўспаміны аб іх. А дзе іх магіла, так і не знайшла, — цяжка ўздыхнуўшы, закончыла Вольга Георгіеўна свае ўспаміны.

Браты Крычаўцовы. Злева направа: Елісей, Міна, Канстанцін.

Няма, на жаль, магілы герояў, помніка на ёй, але ёсць нязгасная памяць родных, таварышаў па зброі, удзячных нашчадкаў. У в. Барок ёсць адзіная вуліца, і яна носіць імя братоў Крычаўцовых. Іх гераічны подзвіг адлюстраваны ў экспазіцыі краязнаўчага музея Гомельскай вобласці. У музычным вучылішчы імя Сакалоўскага ёсць куток памяці братоў, дзе захаваліся іх ноты.

Т.А.Карасік.

Старонкі франтавых біяграфій

ДУСЯ АКУЛАВА

Ёсць недалёка ад Гомеля в. Маркавічы. Тут у 1928 г. нарадзілася Дуся Акулава.

Калі ў в. Маркавічы размясціўся шпіталь, Дуся прыйшла туды дапамагаць раненым чырвонаармейцам. Кіраўніцтва шпіталя бачыла імкненне яе дапамагчы медработнікам, бачыла, колькі цеплыні, энергіі прыкладае дзяўчынка, каб аблегчыць пакуты параненых, — таму быў аддадзены загад аб залічэнні Дусі ў штат работнікаў шпіталя.

Неаднойчы, сціснуўшы губы ад болю і горычы, бачыла дзяўчына воінаў, якія паміралі ад ран.

Цяжкія дні адступлення, сотні бяссонных начэй каля ложкаў параненых. Асабліва складанай была пераправа шпіталя цераз Днепр каля в. Радуль. Колькі прыйшлося вытрымаць неакрэплым дзявочым плячам!

Пад Бабруйскам размясціліся ў палатках. У час жорсткага бою аперацыі рабілі тут жа, пад артылерыйскім абстрэлам.

І вось баі ідуць пад Варшавай. Ні дзён ні начэй адпачынку! Медработнікі падалі з ног, а раненых прыбывала ўсё больш і больш. Чуліся словы Дусі: «Пацярпі, родны!»

І гэтак да Берліна. Вайна для яе скончылася ў Патсдаме. Вярнулася Акулава Еўдакія Сцяпанаўна ў родныя Маркавічы з трыма ўрадавымі ўзнагародамі.

ЛАРЫСА ВАСІЛЬЕВА

З фотакарткі глядзіць прыгожая, зусім юная дзяўчына, жыццё якой абарвалася ў семнаццаць гадоў. Адважная беларуская разведчыца нарадзілася ў вёсцы Яроміна Гомельскага раёна. Дзяўчыну вызначалі працавітасць, дапытлівасць. Яна шмат чытала, іграла на музычных інструментах, адначасова з агульнаадукацыйнай скончыла музычную школу. Вясной 1941 г. Ларыса, скончыўшы курсы медсясцёр, прыязджае ў Маскву і пачынае працаваць у дзіцячай паліклініцы № 15. Але хутка пачалася вайна. Восенню 1941 г. становішча Савецкай краіны было асабліва цяжкае. Гітлераўскія полчышчы рваліся да Масквы. ЦК камсамола звярнуўся з заклікам да моладзі Масквы — устаць на абарону сталіцы. І адна з першых адгукнулася на яго Ларыса. Але ў ваенкамаце ёй адмовілі ў просьбе адправіць на фронт: ёй не было 18 гадоў. Яна адказвала, што спартсменка, умее страляць, кідаць гранаты, можа ўвогуле рабіць усё, што патрабуецца ад чырвонаармейца. У адказ чула, што можа трапіць у рукі фашыстаў, і тады — звярствы, пыткі, пакутлівае пакаранне. Адказ быў адзін: «Вытрымаю ўсё». Так пачаўся нядоўгі, але яркі баявы шлях. Ларыса выехала на фронт 5 кастрычніка 1941 г. Трапіла ў разведгрупу. Днём і ўначы ішлі жорскія баі на падыходзе да Масквы. Група разведчыкаў, сярод якіх знаходзілася і Ларыса, перадавала ў штаб фронту каштоўныя разведданыя аб праціўніку. У кароткія перапынкі паміж баявымі заданнямі яна расказвала баявым сябрам аб сваёй вёсцы Яроміна, што на Гомельшчыне, лепш якой няма ва ўсім свеце.

Вось якой запомнілася Ларыса сваім аднапалчанам, якія добра яе ведалі.

Смірнова Н., былы баец атрада, зараз выкладчык МГУ: «У суровыя дні восені 1941 г., калі вораг знаходзіўся ў некалькіх дзесятках кіламетраў ад Масквы, быў створаны наш камсамольска-маладзёжны атрад. У нашым атрадзе, які налічваў больш за 100 байцоў, былі тры семнаццацігадовыя дзяўчыны: Валя Ізмайлава — маленькая, вясёлая; Ларыса Васільева — шэравокая прыгажуня з-пад Гомеля і я. Усе мы прыйшлі ў атрад добраахвотна.

14 студзеня 1942 г. мы выехалі на выкананне чарговага задання. 21 студзеня ўпершыню за шмат дзён спыніліся ў вёсцы Папкова. Але адпачыць прыйшлося

нядоўга. «Фашысты наступаюць», — крыкнуў хтосьці ў акно нашага дома. Аказалася, гітлераўцы акружылі нас, завязаўся няроўны бой. Па глыбокім снезе мы з Ларысай кінуліся да параненага байца, які нерухома ляжаў непадалёку ад шляху. Над нашымі галовамі свісталі кулі. А па дарозе на вялікай хуткасці ішоў на нас фашысцкі танк. Ларыса кінула гранату. Асколкам нямецкай міны я была паранена і страціла прытомнасць. Аб трагічным лёсе Ларысы я даведалася толькі праз шмат гадоў пасля вайны».

В.І.Румянцава — баец атрада, зараз урач, працуе ў Маскве.

Вось што яна расказала: «Ларыса трапіла ў групу, якой камандаваў старшы лейтэнант А.Бойчанка. Дзяўчына падабалася ўсім сваёй жыццярадаснасцю, чуласцю, дабрынёй. Яна стала душой атрада. 21 студзеня 1942 г. група А.Бойчанкі накіроўвалася ў варожы тыл. Каля вёскі Папкова Сухініцкага раёна раптоўна сустрэліся з эсэсаўскай танкавай часцю. Завязаўся няроўны бой. Ларыса была паранена разрыўной куляй у бядро. Перамагаючы боль, яна падпаўзла да варожага танка і кінула гранату, якая ўзарвалася, але не нанесла танку шкоды. Потым яна кінула другую гранату ў фашыстаў, што беглі да яе. І адразу над яе галавой прагучала кулямётная чарга. Яна бегла, кульгаючы на параненую нагу. Варожая куля падкасіла яе. Фашысты схапілі параненую дзяўчыну. Раніцай яны вывелі скалечаную дзяўчыну на снег і на вачах у мясцовых жыхароў кінулі пад старой ракітай. Яна жыла яшчэ некалькі гадзін, сыходзячы крывёю. Труп яе на працягу некалькіх дзён ляжаў на сцяжынцы, немцы не давалі пахаваць».

Вясной, пасля вызвалення вёскі Папкова, Ларысу Васільеву пахавалі байцы Чырвонай Арміі ў брацкай магіле ў в. Брынь, дзе ўзведзены манумент дзяўчыне-воіну, нашай зямлячцы.

Усяго семнаццаць вёснаў сустрэла Ла-

Да 50-годдзя САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ

«Возможно всех запомнить.
Сердцем вспомнить своих.
Это нужно — не хорошим,
Это надо — живым».
(Р. Рождественский «Реквием»).

Імя — Ларыса. Прозвішча — Васільева. Партыйнасць — член ВЛКСМ. Дата нараджэння — 27 студзеня 1925 года. Дата смерці — 21 студзеня 1942 года.

Ларысе Васільевай... Імя яшчэ аднаго героя, што толькі нядаўна стала вядомым. Імя, якое кожны з нас павінен ведаць без хвалявання, бо яшчэ і яшчэ раз адчуваецца: якая ж сіла патрэбна была ў Ларысы ў тыя цяжкія часіны, каб прама сказаць фашыстам такія словы: «Сярод русіх няма здраднікаў. Мы не здаёмся! Але і ні адна фашысцкая гадзіна не выдасць жывой з нашай зямлі».

Як жа ўсё атрымалася?

У тую вясну

Ранняй вясной 1941 года на Гомельскім вакзале адбываліся праводы. Жыхарка вёскі Яромна, жонка памёршага ў 1936 годзе ўдзельніка грамадзянскай вайны Міхаіла Васільева маці чатырох дзяцей Кацярына Данілаўна Васільева праводзіла дачку, васьмікласніцу Ларысу да цёткі ў Маскву. Усведамляя пагалузкі, пакідаючы дзяцінства пляжу, зайздросціла позіркі маладзейшых сяброў... І вось поезд крануўся з месца і, набіраючы разгон, імкнецца па бліскучых рэйках...

Масква закаляла дзяўчыну. Яшчэ б! Яна ж ні разу дагэтуль не была тут. Шматпавярховыя будынкі, жвавая аўтамабільку... І самае цікавае — метро. Выехала, сядзе на адной станцыі і едзе, едзе. Цёмныя тунелі чаргуюцца з чароўна аформленымі станцыямі, якія зусім нечакана з'яўляюцца перад вачыма і гэтак жа нечакана знікаюць, як у казцы.

Крыху пагасціўшы ў сталіцы, Ларыса паступіла на працу ў адну з медсанчастак установ. Адначасова стала хучыцца друкаваць на машынцы. І праз дзі месяцы з невялікім акцэнтам напісець, даладзей, падручаваць такое пісьмо дадому:

«Добры дзень, дарагая і любая мамачка, Валя, Танюша і Лідачка! Пісьмо ваша атрымала ў надзелю. Дарэчы, што дагэта не пісала. Я працую з 8 часоў (красавіка — **заўв. аўтараў**). Пакуль усё добра. 20-га атрымала першую палучку. 68 рублёў. З іх 30 рублёў аддала за тое, што хучылася друкаваць не мінаюцы... У чэрвені а наград ці змагу прыехаць, трэба спачатку яшчэ што-небудзь зарабіць. Прывітанне ўсім. Ларыса. Масква, 6 ўлі».

«У чэрвені я наград ці змагу прыехаць». Гэтая фраза з пісьма Ларысы стала прарочай. Так, не толькі ў чэрвені — нікалі яна не змагла больш пабачыць родных месцін. Фашысцкія банды перашкодзілі ёй у гэтым, яны адабралі ў яе самае дарагое — жыццё. І вось як гэта адбылося...

Чорныя дні наступілі

— Сення ў 4 гадзіны раніцы нямецка-фашысцкія войскі вераломна, без аб'яўлення вайны, напалі на нашу Радзіму...

Голас дыктара змешчае спакойны. Спакойнай змешчае і Ларыса. Яна яшчэ не ўсім разумее тую трагедыю, якая пачалася ў гэты ясны чэрвеньскі ранак, трагедыю, якая адбіра ў дружнай савецкай сям'і мільёны людзей...

«Што рабіць? Куды памчацца?» — задавала Ларыса сабе пытанні. Ды ў неразбярысці была падстава. Яна ж — камсамолка, савецкі чалавек. Значыць, рашэнне можа быць толькі адно — змагацца з ворагам.

Але ў Цэнтральным райваенкамаце горада Масквы вырашылі інакш: 16-гадовых на вайну прызываць. Нікаго ўгаворы не дапамаглі.

Некалькі месяцаў заставаліся на сваёй рабоце. Толькі цяпер была санінструктарам. Перавязвала параненых, якіх, па меры таго, як фронт набліжаўся да Масквы, станавілася ўсё больш. Чытала ім пісьмы ад родных і блізкіх.

Але час Ларысы настаў. Восенню пачалі фарміравацца рабочыя батальёны. Прыпісаўшы сабе год (бо і ў гэтыя батальёны 16-гадовых не бралі), яна трапіла на фронт. Прапанова райвенкама Чырвонага крыла загадчыку шаблонікі была недвухсэнсоўнай: «Райком Чырвонага Крыжа прапануе выязджаць ад работы і хрэбець раніцы недаступны Ягненковай З. А. і сандружынніцы Васільевай Л. М. як найлепшаных у рады рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі. Так Ларыса апынулася ў прошпанкавай роце. Яе, як і іншых, фарміравалі райваенкаматы. Праз некалькі дзён, што прайшлі ў зборах, фатаграфаванні, пасяджэннях родных і блізкіх, Ларыса разам са сваімі сябрамі — Марыяй Маркінай, Галінай Рэбрык, Валянцінай Іванайлавай і іншымі атрымлівала першае баявое задание.

За тры месяцы іх было многа. І ў тым, што немцы былі разгромлены пад Масквой ушчэнт, немалая заслуга рабочых батальёнаў, заслуга і гэтых дзяўчат.

У другой палове студзеня ў вёсцы Папкова (іх многа расіцаюць па Калужскай вобласці) разгарнуліся далейшыя падзеі. Сяброўкі іх былі і дзесяцігадовая жыхарка вёскі Аня Данілкіна, цяпер ужо Ганна Емяльянаўна і адна з сяброўак Ларысы — Валянціна Іванайлава, зараз настаўніца Папкоўскай школы Каткова... Яны, а таксама настаўнікі і вучні Папкоўскай і Яромінскай школ дапамагалі нам разгарнуць маленькі тых незабыўных дзён, малюнак падзеяў. Ларысы — савецкай дзяўчыны, якая крочыла ў бессмяротнасць.

Імя яму — подзвіг

Той студзеньскі ранак 1942 года быў марозным. Снегу напаліла — ні прайсці, ні праехаць. Атрад лыжнікаў, сярод якіх была і Ларыса, адпачываў пасля пераходу ў вёсцы Папкова. Раптам пачуліся стральбіна, загрукатала зямля. І ў вёску сталі ўварвацца фашысцкія танкі. Гэта немцы, сарабуючы вырвацца з акружэння, ашалела рынуліся разбіваць сваю сцяну. Атрад заняў абарону, і пачалася сыроткая бойка з злавіраным ворагам.

Да дому, дзе ў падвале знаходзілася некалькі чалавек з атрада, набліжаецца магутны «Тыгр», за ім — другі, трэці. Толькі пераўзысці ён з домам, як адтуль паляцелі гранаты. Тыя закруціўся на месцы. На дапамогу яму паспяшаўся другі. Тады з дома выскачыла дзяўчына ў форме чырвонаармейца і кінулася наперарэз танкам. У адно імгненне ён быў падбіты і другі «Тыгр». Але фашысты, якія выбраліся з першага танка, скалолі дзяўчыну. Гэта была Ларыса.

Гітлераўцы хацелі сілу. Застаўшыся ў жывых сяброўак Васільевай выхаваць вёскі перакрануці ў цывільнае адзенне і ўначы перапраўлі да сваіх. А Ларыса...

Немцы прыйшлі ве ў дом Данілкіных. Усю сям'ю выгналі і пачалі дапытваць дзяўчыну.

— Хто ты ёсць? — сярдзіта маршчыць белабрысы афіцэр.

Маўчанне.

— З якой часці?

Маўчанне.

Лётні кінжк і дзе вярнулі намінуліся на Ларысу. У адзін момант здзім яе з ног і пачалі кінчадна біць, таптаць вялізнымі кавенымі ботамі, цалюючы ў твар.

Кінжк — вярнулі адступіў. Зноў пытанне. Зноў з'явіўся Ларысы ніводнага гука. Зноў кінжк і фашысты з новай сілай кідаюцца на дзяўчыну...

Раніца змянілася днём, дзень — вечарам, вечар — ноччу. У Ларысы ўсё спалолася ў адзін суцэльны кашмар. Пытанні, бясконцыя пытанні. І ўсе яны — без адказаў. А потым боль ва ўсім целе, а потым пераломана рука, а потым выбітыя абодва зубы, а потым непрытомнасць, у час якой нічога не бачыць і нічога не адчувае.

Вядро халоднай вады і зноў пытанне. У адказ толькі скрыгат зубамі, якія ашчэ ўцалелі, і жудасны, спавядальны позірк на катаў. Змяніліся тыя двое фашыстаў, бо на нагах уже не трымаліся ад стомленасці. А допыт працягваўся.

— Раздзець яе! — раз'юшаным голасам загаў афіцэр. Праз мінуту-другую перад вачыма гітлераўцаў прадстала дзіночае цела ў сцэльных крывавіцах.

— Будзеш адказваць?

— Будзе! — хутчэй выдыхнула, чым сказала Ларыса.

— Ну!

Яна падышла бліжэй да афіцэра і, сабраўшы ўсе сілы, выкрыкнула: «Сярод русіх няма здраднікаў. Мы не здаёмся! Але і ні адна фашысцкая гадзіна не выдасць жывой з нашай зямлі!»

А потым плюнула гітлераўцу ў твар.

Стала шпацыра. Афіцэр выцягнуў з кішэні насавую хусцінку, прыціснуў рукаві вышэй тыцу і падобрыў бліжэйшы, падышоў да Ларысы.

— Мы табе будзем рабіць ўколы.

Зноў кінжк і некалькі гукаў упіліся ў павітрэ, а ў спіну — выбіў прыклад аўтамата. Яшчэ нешта памкнула Ларыса, а потым разарвўся страл. Перпы яна ўпаў, а тыя, што былі вакол, так і не адважыліся прыблізіцца да нерухомага цела, былі ўжо за чужанкі не жанчыны.

Фашысты выкінулі акрываўленае труп на двор і для большай упэўненасці прабілі яшчэ некалькі стралаў па ім цэлы. А потым, адыходзячыся, падпалілі ў хляў. Выбухаючы гітлераўцы пакідалі ў дыме...

Калі вызвалілі вёску, цела Ларысы было пахавана ў брацкай магіле ў трох кіламетрах ад сяла Папкова, у вёсцы Брынь. Там яно ляжыць і зараз.

* * *

Імя — Ларыса Прозвішча — Васільева. Дата нараджэння — 27 студзеня 1925 года. Дата смерці — 21 студзеня 1942 года.

Дзень 21 студзеня, апошні ў жыцці Ларысы, стаў днём нараджэння не ворагу, ворагу нашай зямлячкі, дзяўчыны з Яромінa.

Схіліце галовы, пакаленні, перад светлай яе памяццю!

І. СЛЯПЦОЎ.
(Наш пазататны карэспандэнт).
К. КАЛІНАЎ,
супрацоўнік газеты «Маяк».

НА ЗДЫМКУ: Ларыса Васільева. Лістапад 1941 года.

Старонка газеты "Маяк" з нарысам пра Л.Васільеву.

рыса Васільева. Народ не забыў подзвіг бясстрашнай камсамолкі. Настаўнікі і вучні Папкоўскай школы пісалі маці Ларысы, Кацярыне Данілаўне: «Подзвіг Вашай слаўнай дачкі, камсамолкі Ларысы, ніколі не будзе забыты нашым народам. Ён стаіць побач з подзвігам Зоі Касмадзям'янскай. Многіх дзяўчат і жанчын у вёсцы Папкова завуць Ларысамі ў гонар Ларысы, якая геройскі загінула ў баі з нямецкімі захопнікамі». Імем патрыёткі названа вуліца ў яе роднай вёсцы Яроміна. Фотакартка і дакументы Ларысы знаходзяцца ў экспазіцыі абласнога краязнаўчага музея. У 1967 г. маці Ларысы Кацярына Данілаўна зрэзала галіну ракіты, пад якой памерла яе дачка, і прывезла дадому. У Яроміне яна пасадзіла галінку ў агародчыку свайго дома. І прыжылася руская ракіта на беларускай зямлі. Зараз гэта галінка стала прыгожым дрэвам.

Н.А.Гурэвіч.

ФЁДАР МАКСІМАВІЧ ЗАЙЦАЎ

Нарадзіўся ў 1915 г. у в. Сеўрукі ў мнагадзетнай сям'і. Вучыцца як след не давялося. У сярэдзіне 1930-х гадоў Фёдара прызвалі ў армію. Трапіў у асобны сапёрны батальён.

Незадоўга перад канцом службы яго накіравалі на курсы павароў. Атрымаўшы гэтую спецыяльнасць, служыў у вайсковым падраздзяленні непадалёку ад Гомеля. Там і застала яго вайна. Неўзабаве Зайцава адправілі на фронт. Стаў старшы сяржант сапёрам стралковага палка. Абяскоджваў міны, наводзіў масты і пераправы, узводзіў умацаванні, выконваў іншую нялёгкую вайсковую работу. Быў і сувязным-разведчыкам.

У 1943 г. хтосьці з камандзіраў успомніў, што Фёдар Максімавіч яшчэ да вайны скончыў курсы повараў, а такі чалавек якраз спатрэбіўся. Давялося воіну змяніць зброю на прылады кухара. Пачаў ён кашаварыць на палявой кухні.

Але ж на вайне не бывае лёгкіх прафесій. Фёдар Максімавіч успамінае, як пад свіст куль і снарадаў цягнуў на сабе тэрмасы з няхітрым салдацкім харчам на перадавую, як не раз глядзеў смерці у вочы... і не было выпадку, каб па яго віне байцы засталіся галоднымі.

На якой бы пасадзе ні служыў наш зямляк, ён з гонарам выконваў воінскі абавязак. Прымаў удзел у жорсткіх бітвах на Украіне, фарсіраванні Дняпра і ў многіх іншых. Дзень Перамогі сустрэў у Чэхаславакіі.

Фёдар Максімавіч узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі» і «За адвагу», атрымаў ён і нямала падзяк камандавання.

Аднак у 1945 г. вайна для Зайцава не скончылася. Давялося яшчэ змагацца з бандамі, якія арудавалі ў заходніх раёнах краіны пасля выгнання фашыстаў.

Толькі восенню 1946 г. салдат вярнуўся у родныя Сеўрукі.

ІВАН АНДРЭЕВІЧ КОТАЎ

Жыхары вёскі Грабаўка добра ведаюць Івана Андрэевіча Котава. Юнаку яшчэ не споўнілася шаснаццаці гадоў, а ён ужо са зброяй у руках у верасні 1943 г., добраахвотнікам уступіўшы ў дзеючую армію, мужна змагаўся з ворагам у разведаддзяленні. Хутка малады баец стаў камандзірам гарматы 8-й Панфілаўскай дывізіі на 2-м Прыбалтыйскім фронце. За добра распрацаваную і ўмелую разведвальную аперацыю і дастаўку «языка» быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, потым за ўмелыя баявыя дзеянні — ордэнам Чырвонай Зоркі і іншымі ўзнагародамі.

Цяжкае раненне прымусіла яго на час прыпыніць удзел у баявых аперацыях і лячыцца ў шпіталі, дзе ён і сустрэў доўгачаканую вестку аб Перамозе.

У жніўні 1945 г. Іван Андрэевіч вярнуўся ў родныя мясціны, каб аднаўляць разбураную гаспадарку. Свой працоўны шлях ён пачаў з пасады фізрука ў Цярухскай школе. У 1953 г. былога франтавіка, сумленнага, працавітага, калгаснікі калгаса «Сацыялізм» абралі намеснікам старшыні калгаса. Шмат гадоў запар яго выбіралі старшынёй Студзенагуцкага сельсавета (цяпер Цярухскі). Стаўшы пенсіянерам, ветэран вайны і працы не адышоў ад спраў. Ён займаўся пытаннямі кормавытворчасці ў саўгасе. Як і ў маладыя гады, на гэтых пасадах у поўнай меры праявілася яго імкненне прыносіць людзям як мага больш карысці. І зусім невыпадкова яго абралі старшынёй савета ветэранаў вайны і працы Цярухскага сельсавета.

Н.А.Гурэвіч

ВАСІЛЬ ДЗМІТРЫЕВІЧ КРУКАЎ

Тры ўзнагародныя лісты былі адшуканы ў Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Лаканічна іх радкі паведамляюць аб подзвігах і гераічнай гібелі нашага земляка капітана Васіля Дзмітрыевіча Крукава. У першым лісце сказана:

«В.Дз.Крукаў на фронце Айчыннай вайны з першых яе дзён. Мае два раненні. У сакавіку ў наступальных баях яго батарэя дзейнічала выдатна. 31 сакавіка 1943 г. у баі за в. Куземкі тав. Крукаў, будучы параненым, не пакінуў поля бою, а працягваў кіраваць агнём батарэі. Тав. Крукаў дастойны ўзнагароджання ордэнам Чырвонай Зоркі.

В.а. камандзіра палка маёр Секанаў 21 ліпеня 1943 г.».

Вось што гаворыцца ў другім:

«Капітан Крукаў В.Дз. на франтах Вялікай Айчыннай вайны два з палавінай гады няспынна. Мае два раненні. Удзельнічаў у наступальных баях палка на 1-м Украінскім фронце са жніўня 1944 г. Камандаваў батарэяй, паказаў выключнае ўменне, мужнасць і адвагу. Батарэя капітана Крукава за час баёў у 1943—1944 гг. знішчыла да 15 кулямётных кропак, дзве самаходныя гарматы, 5 мінамётных батарэй, 4 аўтамашыны з грузамі і звыш 200 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Батарэя капітана Крукава з'яўляецца перадавой у палку па страявой, баявой, палітычнай падрыхтоўцы.

Капітан Крукаў дастойны ўзнагароджання ордэнам Айчыннай вайны II ступені».

15 ліпеня 1944 г. капітан Крукаў Васіль Дзмітрыевіч гераічна загінуў у баі. Прадстаўляючы яго пасмяротна да высокай узнагароды, камандзір палка маёр Ерамееў пісаў ва ўзнагародным лісце:

«Капітан В.Дз.Крукаў 14 ліпеня 1944 г. у раёне Міркоў праявіў сябе смелым і рашучым. Контратакуючы, немцы падыходзілі ўшчыльную да батарэі капітана Крукава, байцы не зварухнуліся і працягвалі весці прамой наводкай знішчальны агонь па праціўніку.

15 ліпеня 1944 г. у раёне сяла Пегіхвосты Валынскай вобласці батарэя тав. Крукава адыграла рашаючую ролю ў адбіцці контратакі пераўзыходзячых сіл праціўніка. Разлікі дзвюх гармат батарэі былі выведзены са строю, немцы насядалі, спрабуючы акружыць батарэю. Тав. Крукаў сам стаў за гармату і прамой наводкай вёў агонь па праціўніку, пакуль не была адбіта атака. У гэтым баі тав. Крукаў загінуў смерцю храбрых.»

Загадам па 3-й гвардзейскай арміі № 131/н ад 6 кастрычніка 1944 г. узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

Усе тры ўзнагароды, якіх капітан Васіль Дзмітрыевіч Крукаў быў удастоены на працягу аднаго года вайны за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі (ордэны Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеней), пры жыцці не былі яму ўручаны.

Толькі ў 1975 г. ордэны Айчыннай вайны I і II ступеней мужнага камандзіра батарэі перададзены ваенкаматам на вечнае захоўванне жонцы Ганне Адамаўне і дачцэ Ніне Васільеўне як памяць аб іх мужу і бацьку.

М.С.Царкоў.

ІВАН АНУФРЫЕВІЧ САБКО

Жыхары Цярухскага сельсавета свята шануюць памяць аб сваім земляку Івану Ануфрыевічу Сабко, які загінуў на палях Айчыннай вайны. Яго імем названа адна з вуліц в. Церуха.

Іван Ануфрыевіч нарадзіўся ў 1914 г. у в. Церуха, у сям'і селяніна. Рос цікавым і дапытлівым хлопчыкам і марыў стаць афіцэрам. Закончыўшы ў 1936 г. Мінскае ваеннае вучылішча, служыў у палку, які дыслацыраваўся ў Полацку. Воінскаму майстэрству вучыў Іван Ануфрыевіч сваіх падначаленых і разам з імі ўдасканальваў свае.

З першых дзён вайны полк, у якім служыў Сабко, уступіў у бой. Вельмі цяжка было на сэрцы ў Івана Ануфрыевіча, калі прыйшлося пакінуць родную Беларусь. Але цвёрдая ўпэўненасць у перамогу надавала сіл маладому лейтэнанту. Камандаван-

Б.С.Шустэр.

не даверыла яму ўзначаліць дывізійную разведку. Адважны камандзір, не ведаючы стомы, не шкадуючы сіл, вадзіў сваіх салдат у тыл ворага, дабываў каштоўныя звесткі, захоплівaў «языкоў». У дывізіі яго называлі «каралём разведкі».

У цяжкія дні абароны Масквы І.А.Сабко стаў камандзірам 360-га гвардзейскага палка, які ваяваў на Калінінскім фронце. Тут ярка раскрыліся яго воінскія здольнасці. Полк з поспехам выконваў загады камандавання. За мужнасць і адвагу яго камандзір І.А. Сабко быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

У адным з наступальных баёў у снежні 1941 г. пад Масквой камандзір палка быў паранены, але да канца бою не пакінуў свайго паста. Пасля шпіталя вучыўся на кароткатэрміновых курсах у Ваеннай акадэміі.

У канцы кастрычніка 1942 г. Сабко быў прызначаны камандзірам 146-га гвардзейскага палка. Студзень 1943 г. — час новых выпрабаванняў. Перад палком і 3-й танкавай арміяй была пастаўлена задача: прарваць эшаланіраваную абарону адборных фашысцкіх войскаў на захад ад Канцяміраўкі і развіць наступленне на Харкаў. Першым пачаць прарыў у раёне в. Міхайлаўка павінен быў полк І.А.Сабко. 8 студзеня 1-ы стралковы батальён пад камандаваннем гвардыі капітана Т.Е.Краўчанкі пачаў разведку боем. Пасля першага поспеху камандзір палка ўвёў у бой астатнія батальёны, забяспечыў тым самым магчымасць перайсці ў наступленне ўсім часцям дывізіі.

Полк пад камандаваннем І.А.Сабко разам з іншымі часцямі за два месяцы зімовага наступлення 1943 г. прынёс вызваленне жыхарам Варонежскай, Белгарадскай і Харкаўскай абласцей. Дзеянні камандзіра былі высока ацэнены, яго ўзнагародзілі ордэнам Суворава III ступені. Але мужнаму камандзіру не давялося дажыць да светлага дня Перамогі: у адным з баёў 6 сакавіка 1943 г. гвардыі маёр І.А.Сабко быў смяротна паранены.

Свята шануюць памяць аб І.А.Сабко яго землякі ў Цярухскім сельсавеце, а таксама жыхары Харкава, дзе ён пахаваны.

ФЁДАР МІТРАФАНАВІЧ ШАРАМЕЦЬЕЎ

У сям'і Шарамецьевых беражліва захоўваецца грамата, якую Фёдар Мітрафанавіч атрымаў ад камандуючага войскамі 1-га Беларускага фронту Г.К.Жукава.

«Красноармейцу Шереметьеву Федору Митрофановичу. Приказом командующего войсками 1-го Белорусского фронта Маршала Советского Союза т. Жукова Г.К. от 30.4.1945 г. № 6, за отличные боевые действия при овладении районом и главным зданием рейхстага всему личному составу вашей части, в том числе и Вам, принимавшему участие в боях, объявляется благодарность».

Гэта яскравае сведчанне мужнасці салдата-земляка на вайне. Ф.М.Шарамецьеў родам з п. Заляддзе Улукаўскага сельсавета. Прайшоў усю вайну ад першага дня да апошняга.

БАРЫС СЯМЁНАВІЧ ШУСТЭР

Актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1934 г. па 1939 г. працаваў дырэктарам Улукаўскага дзіцячага дома. З лістапада 1941 г. Барыс Сямёнавіч у дзеючай арміі, камандзір стралковай роты. Быў чатыры разы паранены. За ратныя подзвігі ўзнагароджаны ордэнамі Аляксандра Неўскага, Чырвонай Зоркі, медалямі «За абарону Сталінграда», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.»

У 1947 г. вярнуўся да мірнай працы. Больш за 20 гадоў працаваў юрыстам на Гомельскім шклозаводзе імя Ламаносава.

Першы таран

Першы таран у небе Запаляр'я здзейсніў наш зямляк, лётчык Іван Місякоў. Ён увайшоў у неўміручасць дваццацігадовым на шосты дзень вайны.

Па кроплях збіралі звесткі аб лейтэнанце Місякове краязнаўцы зябраўскай СШ № 1 пад кіраўніцтвам настаўніка гісторыі В.С.Баранава, старшага навуковага супрацоўніка Гомельскага абласнога краязнаўчага музея М.С.Царкова.

Іван Цітавіч Місякоў нарадзіўся 24.5.1918 г. у в. Рудня-Прыбыткаўская Прыбыткаўскага сельсавета Гомельскага раёна ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння 7 класаў займаўся ў школе фабрычна-заводскага навучання пры Гомельскім паравозарамонтным заводзе. Затым працаваў на тым жа прадпрыемстве. Марыў стаць лётчыкам. Паступіў у Гомельскі аэраклуб. У снежні 1937 г. стаў курсантам Барысаглебскай авіяцыйнай школы імя Чкалава. Пасля заканчэння быў прызначаны камандзірам звяна.

Кароткі, але мужны баявы шлях славутага земляка апісаны ў нарысе М.Царкова «Цаной жыцця», надрукаваным у газеце «Маяк» у 1973 г.

Першае баявое хрышчэнне І.Місякоў атрымаў у баях з белафінамі. У яго службовай характарыстыцы адзначана: «За перыяд баявых дзеянняў на самалёце І-16 зрабіў 38 баявых вылетаў з налётам 53 гадзіны 55 хв. Пры выкананні баявых заданняў на разведку, знішчэнне войскаў праціўніка праявіў сябе як выдатны паветраны баец...» За мужнасць у барацьбе з белафінамі лейтэнант І.Ц.Місякоў 21 мая 1940 г. быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У першы ж дзень Вялікай Айчыннай вайны Іван Місякоў уступіў у паветраны бой з фашысцкім самалётам. Усяго шэсць дзён давялося нашаму земляку змагацца з ворагам, абараняючы паўночныя рубяжы Радзімы. Але гэта былі шэсць дзён подзвігу. Вось што пісалі ва ўзнагародным лісце камандуючы войскам Паўночнага фронту генерал-лейтэнант Папоў, член Ваеннага Савета фронту карпусны камісар Клямянцьеў: «За кароткі перыяд барацьбы з германскім фашызмам тав. Місякоў зрабіў 10 баявых вылетаў, паказаў сябе бясстрашным, мужным лётчыкам-знішчальнікам. Ён узорна выконваў заданні камандавання па паветранай разведцы, штурму наземных войскаў праціўніка, прыкрыццю сваіх бамбардзіроўшчыкаў, знішчыўшы пры атаках да 5 груп пяхоты, некалькі дзесяткаў транспартных аўтамашын праціўніка. У саставе групы ён удзельнічаў у двух паветраных баях з пераўзыходзячымі сіламі праціўніка.

27 чэрвеня 1941 г. у паветраным баі са знішчальнікамі праціўніка яго самалёт атрымаў пашкоджанне. Будучы смелым, адважным, адданым сваёй справе, Місякоў тараніў фашысцкі знішчальнік і пры гэтым загінуў сам. Гэта здарылася непадалёку ад Мурманска, каля пасёлка Мурмашы».

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 23 ліпеня 1941 г. за гэты подзвіг лейтэнант Іван Цітавіч Місякоў быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

Жыхары пасёлка Мурмашы свята ўшаноўваюць памяць аб героі. Адна з вуліц пасёлка носіць яго імя.

Н.А.Гурэвіч.

Неўміручы подзвіг Скавародзіна

СКАВАРОДЗІН Мікалай, нарадзіўся ў в. Раманавічы Улукаўскага сельсавета ў 1919 г. З дзяцінства марыў стаць лётчыкам, скончыў Гомельскі аэраклуб, затым паступіў у Адэскую ваенную школу пілотаў. У маі 1941 г. Мікалай стаў ваенным лётчыкам. А неўзабаве пачалася вайна. Мікалай Скавародзін быў у ліку тых, хто ўжо ў першыя дні вайны ўступіў у жорсткія схваткі з ворагам. Штодзень рабіў па 3—4 баявыя вылеты.

22 жніўня 1941 г. у раёне в. Чэпава Бранскай вобласці звяно цяжка нагружаных бамбардзіроўшчыкаў 38-га авіяпалка вылецела на баявое заданне: разграміць калону варожай пяхоты. Летам вядомым, як заўсёды, быў сяржант М.І.Скавародзін, малады, але ўжо вопытны лётчык. Акрамя Скавародзіна ў экіпажы былі лейтэнант Л.М.Вятлужскіх і стралок-радыст В.П.Чаркашын. Усе былі маладыя і любілі жыццё. Усе з паўслова разумелі адзін ад-

наго. Умела манеўруючы, сяржант Скавародзін прывёў свой самалёт да цэлі. Адна за другой кладуцца ў цэль бомбы. Першая атака аказалася ўдалай. Частымі кулямётнымі чэргамі лётчыкі метка білі ворага. Але хутка фашысты апамяталіся і адкрылі ўраганны агонь. Самалёт загарэўся. Можна было б яшчэ выратавацца, калі б члены экіпажа выкінуліся з парашутамі. Аднак мужныя лётчыкі выбралі іншы шлях. Скавародзін, не змяніўшы курсу, урэзаўся ў самую гушчыню фашысцкай пяхоты. Так загінулі героі.

На подзвіг лётчыкаў адгукнуўся пісьменнік Аляксей Талстой. У газеце «Красная Звезда» ад 12 верасня 1941 г. быў надрукаваны яго нарыс «Бессмяротнасць», дзе аўтар піша: «Успомнім з любоўю і гонарам тры сэрцы, якія перасталі біцца, тры сэрцы, горача аддаўшыя сябе за Радзіму — трох герояў лётчыкаў Мікалая Скавародзіна, Леаніда Вятлужскіх і Васіля Чаркашына».

Дакументы аб подзвігу экіпажа сабраны навуковымі супрацоўнікамі Гомельскага абласнога краязнаўчага музея.

Экіпаж пахаваны ў вёсцы Чэпава, што на Браншчыне.

Н.А.Гурэвіч.

З дзевяці вярнуўся адзін

Бацька памёр рана, а сям'я Кузюкоў была адной з вялікіх у вёсцы Заліп'е. Чацвёра сыноў і дачка клапаціліся аб маці, а яна, хоць і цяжка было, дапамагала ім стаць на ногі.

Усе чацвёра братоў былі дужыя, працавітыя, шчырыя і простыя сярод аднавяскоўцаў, сяброў і родзічаў. Многія, хто іх ведаў, казалі: былі хлопцы, як дубы. Самаму старэйшаму — Мікалаю Міхайлавічу Кузюкову ў пачатку Вялікай Айчыннай ішоў 36-ы год, Гаўрылу было 33, Трафіму — 26, а Івану — 20. Усе яны сталі на абарону Бацькаўшчыны ад фашысцкай нечысці.

І ў росквіце сіл абарвалася жыццё ўсіх чатырох братоў.

На нейкі час пасля вызвалення з'явілася ў маці надзея, што, магчыма, хтосьці з сыноў адгукнецца. Але ніводнай вестачкі яна так і не дачакалася. Не вытрымаўшы вялікага гора, вясной 1944 г. старая памерла. Пасля смерці маці дачка Таццяна пераехала з Урыцкага ў Заліп'е ў бацькоўскую хату, якая зусім апусцела.

Засталася яна адна з траімі малалетнімі дзецьмі на руках. Яе муж Пётр Сямёнавіч Банетаў, які пайшоў на фронт у першыя дні вайны, таксама не вярнуўся дадому. Вясной 1944 г. Таццяна атрымала паведамленне, што яе муж памёр ад цяжкіх ран і пахаваны ў Шацілках (зараз г. Светлагорск). 28 гадоў адпрацавала ў калгасе ўдава-салдатка, будучы інвалідам другой групы па зроку.

Здарылася так, што Таццяна Міхайлаўна Банетава страціла не толькі родных братоў. Не давялося ёй больш убачыцца і з траімі братамі мужа. Усе пяцёра братоў Банетавых з Урыцкага ў вайну сталі абаронцамі Радзімы. Міхаілу было тады 40, Фёдару — 37, за ім па ўзросце ішоў Карп, Пятру споўнілася 28, Лаўрэну — 23. Пашчасціла ўцалець толькі самаму малодшаму. І ў кожнай з чацвярых заўдаveўшых салдатак засталіся без бацькі малалетнія дзеці.

Бязлітасна абышлося ваеннае ліхалецце з дзвюма парадніўшымі сем'ямі, якія не дачакаліся столькіх родных і блізкіх. І не толькі яны.

Пры ўездзе ў вёску Урыцкае з боку Гомеля стаіць велічны помнік жыхарам Урыцкага сельсавета, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На шырокім пастаменце азначаны 295 прозвішчаў. На адной з пліт — прозвішчы трох братоў Крычаўцовых з вёскі Барок.

Яны, выпускнікі Гомельскага музычнага вучылішча, перад самай вайной служылі ў адным танкавым экіпажы на заходняй граніцы. Канстанцін Георгіевіч Крычаўцоў, 1914 года нараджэння, быў старшым сяржантам, а 22-гадовы Елісей — яфрэйтарам. У ліку першых браты сустрэлі фашысцкіх агрэсараў. У няроўным баі пад Беластокам іх танк загарэўся і браты-танкісты загінулі.

У тых смутных радках можна заўважыць яшчэ нямала прозвішчаў родных братоў. Толькі з вёскі Заліп'е набіраецца некалькі. Сярод іх Васіль і Віктар

Жосткіны, Рыгор і Мікалай Бярозкіны, Міхаіл і Дзмітрый Жосткіны.

У ліку загінуўшых не толькі франтавікі, а і мірныя жыхары, якія сталі ахвярамі фашызму. Толькі ў адным невялічкім пасёлку Вясёлае Поле карнікі ў 1943 г. спалілі жывымі 12 мужчын за тое, што ім выпала жыць каля партызанскай зоны. Аднаму з іх, Пятру Сцяпанавічу Сатыраву, удалося выскачыць з агню, калі немцы зачынілі людзей у лазні і падпалілі яе. Ён пабег у напрамку лесу, але фашысцкая куля дагнала яго каля самага хвойніку.

Пасля такой страшэннай трагедыі ніхто з застаўшыхся ў жывых не адважыўся больш знаходзіцца ў пасёлку. І ва Урыцкім сельсавеце на адзін населены пункт з такой прыгожай назвай стала менш.

І.І.Пічукоў.

Грымелі апошнія баі

Калі фашысцкая Германія развязала другую сусветную вайну, рэха яе данеслася і да Далёкага Усходу, дзе на флоце служыў наш зямляк з в. Заліп'е галоўны старшына Васіль Ральнікаў.

На тарпедным катэры Васіль Іванавіч праслужыў 5 гадоў. А ў 1944 г. яго перавялі на ваенна-марскую базу ў Петрапаўлаўск-Камчацкі. Там ён трапіў у каманду «марскога паляўнічага».

— Увесь час, як пачалася Вялікая Айчынная вайна, усе мы прасіліся на фронт, але камандаванне адмаўляла, — нагадаў Васіль Іванавіч, — і вось 9 жніўня 1945 г. у нас адкрыўся свой фронт.

Ваенна-марская база, дзе служыў Ральнікаў, размяшчалася ў зоне Камчацкага абарончага раёна, які ўваходзіў у 2-і Далёкаўсходні фронт. Маракі ўзаемадзейнічалі з сухапутнымі войскамі і авіяцыяй, наносілі імклівыя ўдары па праціўніку. Апрача таго, «марскія паляўнічыя» канваіравалі транспартныя судны з узбраеннем і дэсантамі. Удзельнічаў Васіль Іванавіч і ў высадцы дэсантаў на Курыльскія астравы.

2 верасня 1945 г. Японія вымушана была згадзіцца на безагаворачную капітуляцыю. Другая сусветная вайна скончылася. Настаў доўгачаканы мір. Але В.І.Ральнікаў яшчэ больш года працягваў несці нялёгкую марскую вахту. І толькі ў снежні 1946 г. вярнуўся дадому. За баявыя справы ён ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За перамогу над Японіяй» і іншымі.

І.І.Пічукоў.

...І распісаўся на рэйхстагу

Служыў сяржант Васіль Навумавіч Савостаў у авіяцыйнай часці недалёка ад Мінска. Неўзабаве яго прызначылі камандзірам аддзялення ў батальёне тэхаблугоўвання. Там, на аэрадроме, і заспела яго Вялікая Айчынная вайна.

Цяжкія шляхі адступлення. Авіяполк, у якім служыў Савостаў, апынуўся ў г. Яфрэмава Маскоўскай вобласці.

Тады пад Масквой фарміравалася 3-я асобая знішчальна-супрацьтанкавая артылерыйская брыгада Рэзерву Галоўнага Камандавання (РГК). У красавіку 1942 г. Савостава перавялі ў гэту брыгаду. У 280-м палку 76-мм гармат ён і прайшоў усе астатнія шляхі вайны. У званні старшага сяржанта служыў у палкавой разведцы.

Асабліва горача было летам 1943 г. у бітве на Курскай дузе. Знішчальнікі-артылерысты адбівалі атакі нямецкіх танкаў і самаходных гармат, якія лезлі напралом. І вораг не прайшоў. За баі на ўчастку паміж Арлом і Курскам брыгадзе было прысвоена званне гвардзейскай.

Разведчык Савостаў удзельнічаў у вызваленні Унечы, Клінцоў, Навазыбкава, іншых населеных пунктаў Браншчыны. Разам з воінамі-артылерыстамі ён з хваляваннем ступіў на зямлю роднай Беларусі. Умоўную мяжу полк і брыгада перасеклі ў Веткаўскім раёне. Пасля Веткі артбрыгада ўдзельнічала ў вызваленні Добруша, затым 12 кастрычніка 1943 г. у Навабеліцы. А праз

суткі шлях артылерыстаў з-пад Гомеля, які яшчэ ўтрымлівалі немцы, пралёг у Паўднёвым напрамку. Фарсіравалі Сож і Днепр, вызвалялі Рэчыцу.

Супрацьтанкавую брыгаду кідалі ў розныя месцы. Так было і летам 1944 г., калі артбрыгада ўдзельнічала ў Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён». Потым ішлі баі за вызваленне Польшчы.

Баі на Курскай дузе, за Брэст і Варшаву пакінулі ў біяграфіі В.Н.Савостава асаблівыя адмеціны. Ён двойчы — пад Курскам і Брэстам — быў кантужаны, а пад Варшавай паранены. З гэтымі ж баямі і гарадамі звязаны і яго ўзнагароды — тры ордэны Чырвонай Зоркі.

... Пасля шпіталя зноў у страі, удзельнічаў у штурме Берліна. На чацвёртай калоне рэйхстага наш зямляк гвардыі старшына Савостаў напісаў: «Няхай жывуць беларусы!» і паставіў сваё прозвішча.

Пасля Перамогі яшчэ больш года служыў у Германіі. Там у г. Гале старшына выпадкова ў гарнізонным Доме афіцэраў убачыў стэнд аб баявым шляху брыгады, на якім было адзначана, што пасля заканчэння вайны ў яе асабовым складзе засталося толькі два ветэраны, якія прайшлі ў яе радах увесь шлях з моманту фарміравання пад Масквой. І ўказаны былі прозвішчы, у тым ліку і Савостава. Гэта з трох палкоў! Многія загінулі ў баях, многія пасля лячэння ў шпіталях траплялі ў іншыя часці, на розных этапах прыходзіла новае папаўненне...

Пра слаўны баявы шлях гвардыі старшыны сведчаць, апрача ўпамянутых, два ордэны Айчыннай вайны II ступені, адзін з якіх разведчык атрымаў за Берлін, медаль «За адвагу», іншыя ўзнагароды.

У снежні 1946 г. ён вярнуўся дадому. Пайшоў працаваць слесарам-мантажнікам у Гомельскі рачны порт. А праз два гады ўладкаваўся на торфапрадпрыемства «Бальшавік». Адзінаццаць гадоў быў майстрам паўбрыкетнага цэха. Тут В.Н.Савостаў удастоіўся ордэна Працоўнай славы III ступені.

Пасля афармлення пенсіі «за асобыя заслугі» яшчэ 10 гадоў працаваў на Гомельскім шклозаводзе.

І.І.Пічукоў.

Яны вярнуліся пераможцамі

У баях з гітлераўскімі захопнікамі вызначыліся многія нашы землякі. Яны прайшлі цяжкімі дарогамі Вялікай Айчыннай вайны і ўнеслі важкі ўклад у Вялікую Перамогу над ворагам. Аб подзвігах землякоў — воінаў, партызан і падпольшчыкаў сведчаць шматлікія баявыя ўзнагароды. Напэўна, імёны не ўсіх узнагароджаных тут названы. На жаль, не пра ўсіх захаваліся звесткі. Але кожны з іх, хто названы і не названы, шмат зрабіў для разгрому ворага. Усім ім вялікая і шчырая падзяка ад нас і нашых нашчадкаў за іх ратныя подзвігі ў імя Айчыны.

АЗДЗЕЛІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЗДЗЕЛІНА

АДЗІНЦОЎ Трафім Іванавіч, два медалі «За адвагу», ГАРБАЧОЎ Гардзей Ігнатавіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі; два медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; ДЗЕМЧАНКА Мацвей Ісакавіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; ДЗЯДЗЕНКА Ісак Мітрафанавіч, медаль «За баявыя заслугі»; ЛАПАТАЎ Цімафей Ісакавіч, медаль «За адвагу»; ШЧАРБАТАЎ Фёдар Нікіфаравіч, ордэн Славы III ступені.

ПАСЁЛАК ЗЯЛЁНЫ ГАЙ

САВАЧКІН Аляксандр Яўменавіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу».

ПАСЁЛАК ЗЯЛЁНЫ ВОСТРАЎ

АДЗІНЦОЎ Аляксандр Васільевіч, медалі «За баявыя заслугі», «За адвагу».

ПАСЁЛАК ЗЯЛЁНЫ САД

КІСЯЛЁЎ Мікалай Анісімавіч, сяржант, медаль «За адвагу»; КУРАЧЭНКА Арцём Сцяпанавіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; ПРЫМАК Міхаіл Раманавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; СІЗЫ Міхаіл Яфімавіч, медаль «За адвагу».

ПАСЁЛАК МОЛАДЗЬ

ГРЫБАЎ Васіль Міхайлавіч, медаль «За баявыя заслугі»; ГРЫШАЕЎ Іван Савельевіч, медаль «За адвагу»; КУРАЧЭНКА Дзмітрый Арцёмавіч,

сяржант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

ПАСЁЛАК ПЯТРОЎ

ЛЯВОНАЎ Рыгор Раманавіч, медаль «За адвагу»; МАНЧАНКА Піліп Сафронавіч, медаль «За баявыя заслугі»; САВАЧКІН Аляксандр Ягоравіч, ордэны Славы II і III ступеней, Чырвонай Зоркі.

ВЁСКА РАГІ

АБРАМАЎ Арон Навумавіч, медаль «За адвагу»; КАРНЕЕЎ Майсей Іванавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; КАРАБАНЬКОЎ Дарафей Цімафеевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; КУРАЧЭНКА Дзмітрый Арцёмавіч, ст. сяржант, ордэн Чырвонай Зоркі; КУРАЧЭНКА Дзмітрый Данілавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; СЕРЫКАЎ Іван Пятровіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», два «За баявыя заслугі»; ШКАЛЯР Мікалай Пятровіч, медаль «За баявыя заслугі»; ЯРМОЛЕНКА Пётр Аляксандравіч, медаль «За адвагу».

БАБОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАБОВІЧЫ

АСТАПКІН Васіль Іванавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; БАБІН Дзмітрый Якаўлевіч, радавы, ордэн Славы III ступені, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; БАНДАРЭНКА Пётр Фёдаравіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі; БАНДАРЭНКА Андрэй Андрэевіч, сяржант, медаль «За адвагу»; БАНДАРЭНКА Арсеній Аляксеевіч, медаль «За адвагу»; БЯРНАЦКІ Фядос Гаўрылавіч, мал. сяржант, медаль «За адвагу»; ГРЫШАНКОЎ Раман Ануфрыевіч, медалі «За баявыя заслугі», «За адвагу»; ЗАЙЦАЎ Васіль Іванавіч, медаль «За адвагу»; ЗАЛАТАРОЎ Пётр Аляксеевіч, радавы, медаль «За адвагу»; КЛЮЧНІКАЎ Ілья Аляксандравіч, медаль «За баявыя заслугі»; КРУГЛОЎ Пётр Леанідавіч, медаль «За адвагу»; КРУКАЎ Адам Кірылавіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; КРУПНІКАЎ Уладзімір Сяргеевіч, старшына, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; МАЙСЕЕНКА Аляксандр Аляксеевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; МАЙСЕЕНКА Аляксандр Аляксеевіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; МЕЛЬНІКАЎ Андрэй Трыфанавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; ПІЛЬШЧЫКАЎ Аляксандр Іванавіч, медаль «За адвагу»; ПРАВЕДНЫ Іван Іванавіч, медаль «За баявыя заслугі»; РАМАНЕНКА Іван Піліпавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; СІРОТКІН Сямён Андрэевіч, радавы, медаль «За адвагу»; УДОВЕНКА Іван Маркавіч, яфрэйтар, медаль «За баявыя заслугі; ЦЫКУНОЎ Сяргей Паўлавіч, радавы, медаль «За адвагу»; ШАЛАЎ Іван Васільевіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; ЯЦКОЎ Аляксандр Афанасьевіч, яфрэйтар, медаль «За адвагу».

ВЁСКА ЦЫКУНЫ

ЦАКУНОЎ Васіль Іванавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

БАЛЬШАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

РАБОЧЫ ПАСЁЛАК БАЛЬШАВІК

АГАФОНАЎ Сяргей Іванавіч, лейтэнант, медаль «За баявыя заслугі»; АГЕЙЧЫК Пётр Мікалаевіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; АЛАМПІЕЎ Аляксандр Раманавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; АНАПРЫЕНКА Рыгор Мацвеевіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі; АРХІПЦАЎ Сяргей Майсеевіч, медаль «За адвагу»; АРЦЁМЕНКА Іван Ягоравіч, радавы, медаль «За адвагу»; АРЦІШЭЎСКІ Міхаіл Іванавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; АСЕДАЧ Уладзімір Лаўрэнцьевіч, ст. сяржант, ордэн Чырвонай Зоркі; АТРОШЧАНКА Якаў Арцёмавіч, рад., ордэн Славы III ступені, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; БАРТНОЎСКІ Аркадзій Мікалаевіч, сяржант, медаль «За адвагу»; БЕРАЗНЯЦКІ Васілій Улаевіч, рад., медаль «За адвагу»; БЛОШКІН Сяргей Рыгоравіч, ст. лейтэнант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; БУЛАЎКІН Іван Канстанцінавіч, радавы, медаль «За адвагу»; ГАЎРЫЛЕНКА Сямён Архіпавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; ГЛАДЧАНКА Аляксей Восіпавіч, ст. сяржант, медаль «За адвагу»; ГРЫШАЕЎ Патап Мікалаевіч, лейтэнант, ордэн Чырвонай Зоркі; ГУЦАЎ Іван Рыгоравіч, капітан, медаль «За баявыя заслугі»; ГУЦАЎ Міхаіл Яўхімавіч, мал. сяржант, медаль «За адвагу»; ДЗІЧЫКАЎ Іван Іванавіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За

баявыя заслугі»; ЖАРАЎ Мітрафан Сямёнавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; КАЗІМІРАЎ Рыгор Фядосавіч, радавы, медаль «За адвагу»; КАРПОВІЧ Васілій Маркавіч, радавы, медаль «За адвагу»; КАРПОВІЧ Іван Маркавіч, медаль «За адвагу»; КАСЦЮЧЭНКА Андрэй Савіч, лейтэнант, медаль «За адвагу»; КАЦУБА Міхаіл Іванавіч, медаль «За адвагу»; КАЦЯНКОЎ Несцер Герасімавіч, радавы, медаль «За адвагу»; КІПУКОЎ Міхаіл Маркавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; КЛІМЯНОК Сцяпан Пракопавіч, медаль «За баявыя заслугі»; КУЛАГІН Фёдар Іванавіч, радавы, два медалі «За адвагу»; КУРЫЛІН Анатолій Мацвеевіч, ордэн Айчыннай вайны I ступені, медаль «За адвагу»; ЛАПІЦКІ Уладзімір Фёдаравіч, радавы, медаль «За адвагу»; ЛАПУШКІН Аляксей Мікітавіч, ордэн Славы III ступені; ЛЕБЕДЗЕЎ Сцяпан Мацвеевіч, радавы, медаль «За адвагу»; ЛІТВІНАЎ Рыгор Ільіч, радавы, медаль «За адвагу»; ЛЫСЕНКА Мікалай Пятровіч, ст. лейтэнант, медаль «За адвагу»; ЛЯВОНЕНКА Сцяпан Іванавіч, радавы, ордэны Славы II і III ступеней, МАКСІМАЎЦАЎ Ілья Усцінавіч, ст. сяржант, медаль «За адвагу»; МАРМАЛЮКОЎ Кузьма Піліпавіч, яфрэйтар, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; МОРДЗІЧ Мікалай Архіпавіч, ст. сяржант, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; ПАНІШКО Рыгор Піліпавіч, лейтэнант, ордэны Леніна, Чырвонай Зоркі; ПАРФЁНАЎ Васілій Андрэевіч, радавы, медаль «За адвагу»; ПАШКІН Фёдар Мікітавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; ПЕРХУНОЎ Мітрафан Апанасавіч, медаль «За адвагу»; ПІГУЛЕЎСКІ Сцяпан Цімафеевіч, сяржант, медаль «За баявыя заслугі»; РАКАЎ Яўхім Іванавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; РУДЗЯНКОЎ Дзмітрый Іванавіч, капітан, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; РУДЗЯНОК Яўхім Сцяпанавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; САВАСТАЎ Васілій Навумавіч, ст. сяржант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; САКАЛОЎ Павел Аляксандравіч, ст. лейтэнант, ордэн Чырвонай Зоркі; САЎВА Іван Андрэевіч, сяржант, медаль «За баявыя заслугі»; СІВЯНКОЎ Уладзімір Максімавіч, радавы, ордэны Славы III ступені, Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; СІДАРЭНКА Рыгор Паўлавіч, радавы, ордэн Славы III ступені, СКІДАН Іван Аляксандравіч, сяржант, медаль «За адвагу»; СЫСОЕЎ Іван Сцяпанавіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; ТАЎКАЧОЎ Іван Нікіфаравіч, лейтэнант, ордэн Чырвонай Зоркі; УСЕВІЧ Іван Міхайлавіч, медаль «За баявыя заслугі»; ФАМЕНКА Мікалай Савіч, радавы, ордэн Славы III ступені, ХАДАСАЎ Юзік Маркавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; ХАРЛАНАЎ Міхаіл Дзмітрыевіч, радавы, медаль «За адвагу»; ХЛАБАКОЎ Іван Андрэевіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; ЦАЛКОВІКАЎ Пётр Ільіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; ЧЭПІКАЎ Сямён Ягоравіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; ШАВЫРОЎ Міхаіл Міхайлавіч, радавы, медаль «За адвагу»; ШАЎЦОЎ Порый Ерафеевіч, радавы, медаль «За адвагу»; ШКАЛЯР Якаў Андрэевіч, ст. сяржант, медаль «За адвагу».

ГЛЫБОЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГЛЫБОЦКАЕ

БАРЫСЕНКА Аляксандр Дзмітрыевіч, медаль «За адвагу»; БАРЫСЕНКА Антон Парфір'евіч, ордэн Чырвонага Сцяга, медаль «За адвагу»; ГАРДЗЕНКА Арсеній Іванавіч, ордэны Славы II і III ступеней, «Чырвонай Зоркі»; ДУДАРАЎ Іван Арцёмавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За абарону Сталінграда»; КАЎШАРАЎ Ігнат Яўстратавіч, медаль «За адвагу»; КАЎШАРАЎ Фёдар Васільевіч, мал. сяржант, медаль «За адвагу»; КАРПУШЭНКА Аляксей Аляксандравіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; КУЗЬМЕНКА Трафім Рыгоравіч, медаль «За баявыя заслугі»; КУЗЬМЕНКА Фёдар Восіпавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; КУЗЬМЯНКОЎ Гаўрыла Сцяпанавіч, ордэн Славы III ступені, КУЛІКОЎ Дзмітрый Якаўлевіч, яфрэйтар, медаль «За баявыя заслугі»; КУШНЯРОЎ Дзмітрый Ерамеевіч, сяржант, два медалі «За адвагу»; ЛІТВІНАЎ Мікалай Іванавіч, медаль «За баявыя заслугі»; ЛЯГІНАЎ Іван Антонавіч, ст. сяржант, медаль «За адвагу»; ПАЗНЯКОЎ Міхаіл Якаўлевіч, яфрэйтар, медаль «За адвагу»; РЭДКАКОША Іван

Мікітавіч, медалі «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» II ступені; СМОЛІКАЎ Ціхан Якаўлевіч, ордэн Славы III ступені; ЦІМАШЭНКА Іван Іванавіч, медаль «За баявыя заслугі».

ГРАБАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАСЁЛАК БАШТАН

БРАТАЧКІН Міхаіл Адамавіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі; БУРМІСТРАЎ Рыгор Сямёнавіч, сяржант, медаль «За адвагу»; КАЛЕСНІКАЎ Рыгор Піліпавіч, ст. сяржант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; КРЫГЕР Мікалай Іванавіч, сяржант, медаль «За адвагу»; МЕЗЕНЦАЎ Мікалай Васільевіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; ПАЗНЯКОЎ Фядот Карпавіч, медаль «За баявыя заслугі»; СЦЕШАНКОЎ Павел Канстанцінавіч, медаль «За баявыя заслугі»; ЮРАЎ Сцяпан Захаравіч, старшына, ордэн Славы III ступені, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

ВЁСКА ГРАБАЎКА

АФОНЧАНКА Сцяпан Іосіфавіч, ст. лейтэнант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; АФОНЧАНКА Ягор Панцялеевіч, медаль «За баявыя заслугі»; БАБІЧАЎ Мітрафан Зосімавіч, лейтэнант, ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, медаль «За адвагу»; БАНДАРЭНКА Мікалай Дзмітрыевіч, ст. сяржант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; БАРЫСАВЕЦ Анатолій Антонавіч, радавы, медаль «За адвагу»; БАШЛАКОЎ Васілій Афанасьевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «Партызану Айчыннай вайны» II ступені; БАШЛАКОЎ Мікалай Кузьміч, радавы, медаль «За адвагу»; БАШЛАКОЎ Міхаіл Афанасьевіч, мал. сяржант, медаль «За адвагу»; ВАЛЬЧАНКА Васілій Іванавіч, капітан, ордэн Чырвонай Зоркі; ВАЛЬЧАНКА Міхаіл Іванавіч, радавы, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; ВІЛЬКОТ Вольга Ераменеўна, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; ВОЎК Іван Канстанцінавіч, ст. сяржант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; ВЯРОЎКІН Адам Іванавіч, ст. сяржант, медаль «За баявыя заслугі»; КАВАЛЁЎ Сямён Сцяпанавіч, радавы, медаль «За адвагу»; КАЛЕСНІКАЎ Васілій Кузьміч, радавы, медаль «За адвагу»; КАЛЕСНІКАЎ Сцяпан Яўхімавіч, старшына, медаль «За адвагу»; КАМОЎСКАЯ Екацярына Ісакаўна, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі; КЛЕМЗІКАЎ Мікалай Панцялеевіч, радавы, медаль «За адвагу»; КЛІМЗІКАЎ Васілій Панцялеевіч, медаль «За баявыя заслугі»; КОТАЎ Іван Андрэевіч, ст. сяржант, ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені; КУЗЬМЯНКОЎ Канстанцін Яўхімавіч, ст. сяржант, медаль «За адвагу»; КУЗЬМЯНКОЎ Мікалай Васільевіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; КУЧАРВЕНКА Іван Аляксеевіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За баявыя заслугі»; ЛАКУТКА Іван Іванавіч, яфрэйтар, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; ЛАТЫШОЎ Іван Антонавіч, ордэны Славы II і III ступеней; ЛУКАШОЎ Васілій Міхайлавіч, медаль «За баявыя заслугі»; ІВАНОЎ Васілій Міхайлавіч, яфрэйтар, медаль «За баявыя заслугі»; МАМАНТАЎ Мікалай Мітрафанавіч, ордэн Славы III ступені, медаль «Партызану Айчыннай вайны» II ступені; МАРТЫКАЎ Фрол Іванавіч, медаль «За баявыя заслугі»; МАРЧАНКА Рыгор Васільевіч, медаль «За адвагу»; МАЧЭЧА Васілій Трафімавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; МУЗЫКІН Іван Іванавіч, медаль «За адвагу»; МУЗЫКІН С.Г., два ордэны Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі; ПАЎЛЕНКА Аляксей Цімафеевіч, яфрэйтар, медаль «За адвагу»; РАДЗІВОНАЎ Андрэй Маркавіч, ст. лейтэнант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; САБУРАЎ Аляксандр Андрэевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі», САБУРАЎ Пётр Сяргеевіч, медаль «За адвагу»; САВАСЦЬЯНАЎ Павел Дзмітрыевіч, медаль «За адвагу»; СВІРЫДКОЎ (СВІРЫДАЎ) Барыс Іванавіч, радавы, медаль «За адвагу»; СВІРЫДКОЎ Ягор Іванавіч, медаль «За адвагу»; СУВОРАЎ Адам Георгіевіч, медаль «За адвагу»; ТКАЧОЎ Раман Тарасавіч, радавы, ордэн Славы III ступені, ФЕСЮК Мікалай Трафімавіч, ст. сяржант, медаль «За адвагу»; ЧМЫРОЙ Іван Васільевіч, медаль «За адвагу»; ЮРАЎ Пракоп Захаравіч, медаль «За адвагу».

ПАСЁЛАК ДУБІНА

ВЯРОЎКІН Аляксей Восіпавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; ГЕРАСЕН-

КА Васілій Іванавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; ДЗЮБКІН Дзямід Андрэевіч, медаль «За баявыя заслугі»; КАРАЛЕНКА Пётр Васільевіч, сяржант, ордэн Славы III ступені; КАРЖОЎ Іван Васільевіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; КРАЎЦОЎ Сцяпан Цярэнцьевіч, медаль «За баявыя заслугі»; КУЛЬБЯНКОЎ Мацвей Васільевіч, сяржант, медаль «За баявыя заслугі»; КУШНЯРОЎ Іван Яўціхіевіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; НАВУМЕНКА Павел Фёдаравіч, старшына, медаль «За баявыя заслугі».

ВЁСКА ПЯСОЧНАЯ БУДА

БОНДАР Мікалай Піліпавіч, медаль «За баявыя заслугі»; КАЎБАСА Павел Іванавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; КРАЎЦОЎ Пётр Пятровіч, сяржант, медаль «За адвагу»; КУЛАКОЎ Аляксандр Васільевіч, яфрэйтар, медаль «За адвагу»; ЛАЎРОЎ Іван Канстанцінавіч, медаль «За баявыя заслугі»; ЛУКАШОЎ Васілій Міхайлавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; ПАТАПАЎ Аляксандр Дзмітрыевіч, медаль «За баявыя заслугі»; ПРАТАСАЎ Рыгор Якаўлевіч, медаль «За баявыя заслугі»; РОГАЎ Пётр Трафімавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі», САКАЛОЎ Уладзімір Аляксандравіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; СЕМЯНЧУК Іван Мікалаевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; СКАЧКОЎ Пётр Карпавіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За баявыя заслугі»; СЯРОЎСКІ Аляксей Яўхімавіч, медаль «За баявыя заслугі»; УСЛАСЕНКА Андрэй Іванавіч, медаль «За баявыя заслугі»; ФІЛІМОНЧЫК Леанід Паўлавіч, медаль «За баявыя заслугі»; ФІЛІМОНЧЫК Павел Афанасьевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; ХАРКАСАЎ Іван Рыгоравіч, медаль «За адвагу»; ХОРЫКАЎ Анатолій Дзямідавіч, медаль «За адвагу»; ШАФРАНСКІ Іван Сцяпанавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

ВЁСКА ХУТАРАНКА

АЛЯКСЕЕНКА Кірыла Сямёнавіч, медаль «За адвагу»; ДАРОЖАНКА Іван Пятровіч, медаль «За баявыя заслугі»: КУДЗЯЛЬКО Васілій Тарасавіч, медаль «За адвагу»; МАРЧАНКА Мікалай Аляксеевіч, медаль «За адвагу»; МІКАЛАЕЎ Аляксей Сцяпанавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; МІХАЛЁЎ Аляксей Сцяпанавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; МІХАЛЁЎ Сяргей Міхайлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; ЦІМАФЕЕЎ Дзмітрый Іларыёнавіч, медаль «За баявыя заслугі».

ДАВЫДАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АСАЎЦЫ

КАРНЕЕЎ Дзмітрый Пятровіч, сяржант, медаль «За адвагу».

ВЁСКА ДАВЫДАЎКА

БАНЕТАЎ Лаўрэнцій Сямёнавіч, старшына, медаль За адвагу; БАШКІРАЎ Міхаіл Сафронавіч, радавы, медаль «За адвагу»; БОЛБАС Мікіта Пятровіч, ордэн Чырвонай Зоркі; БОНДАРАЎ Антон Мікалаевіч, радавы, ордэн Славы III ступені; БОНДАРАЎ Сяргей Радзівонавіч, сяржант, медаль «За баявыя заслугі»; ЕРМАКОЎ Мікалай Максімавіч, ст. сяржант, медаль «За адвагу»; ЗАЙКІН Фёдар Раманавіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі; КАНАНЕНКА Васілій Іванавіч, старшына, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; КОЛАСАЎ Сямён Нічыпаравіч, ст. сяржант, ордэн Чырвонай Зоркі; КУЛЯШОЎ Мікалай Пятровіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі; ПІШЧАНОК Савелій Рыгоравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; ФЁДАРАЎ Дзмітрый Кіравіч, мал. сяржант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

ВЁСКА САСНОЎКА

ГОЛДЫШАЎ Рыгор Платонавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; ДУБАДЗЕЛАЎ Васілій Данілавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; ДУБАДЗЕЛАЎ Міхаіл Міхайлавіч, радавы, медаль «За адвагу»; ЛАПАНАЎ Сямён Ягоравіч, радавы, медаль «За адвагу»; ЦАРЫКАЎ Іван Мітрафанавіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; ЦАРЫКАЎ Міхаіл Пятровіч, ст. сяржант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; ЯФРЭМАЎ Фёдар Мікітавіч, радавы, медаль «За адвагу».

ВЁСКА УЗА

БОКАРАЎ Васілій Іванавіч, сяржант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; ВЕРАМЕЕЎ Аляксей Ісакавіч, сяржант, медаль «За адвагу»; ПАНЬКОЎ Канстанцін Георгіевіч, сяржант, ордэн Славы III ступені, медаль «За баявыя заслугі»; ТРЫБЯЛУСТАЎ Ілья Аляксандравіч, медаль «За баявыя заслугі»; ЦЕРАШКОЎ Аўрам Іванавіч, сяржант, медаль «За баявыя заслугі».

ДАЎГАЛЕСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВАСІЛЕВА

КУРЛОВІЧ Іван Нічыпаравіч, капітан, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; САЎЧАНКА Іван Міхайлавіч, медаль «За адвагу»; СТАРАЖЭНКА Цярэнцій Ануфрыевіч, ордэн Славы III ступені; ФАМІН Андрэй Лукіч, медаль «За баявыя заслугі».

ВЁСКА ДАЎГАЛЕССЕ

АНДРЫЕЎСКІ Мікалай Усцінавіч, медаль «За адвагу»; АНТОНЕНКА Іван Дарафеевіч, медаль «За адвагу»; БЯРКОЦКІ Аляксандр Лаўрынавіч, медаль «За адвагу»; ГРЫГАРЭНКА Васілій Афанасьевіч, радавы, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; ГУТАРАЎ Васіль Сцяпанавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; КІРЫЕНКА Мікалай Ісакавіч, медалі «За адвагу», За баявыя заслугі»; ЛЯБЕДКА Аляксандр Іванавіч, медаль «За баявыя заслугі»; НАЛЯГАЧ Мікалай Сямёнавіч, сяржант, медаль «За баявыя заслугі», НОВІКАЎ С.Г., ордэн Чырвонай Зоркі; ПІПЧАНКА Міхаіл Ф., медаль «За адвагу»; ПУГАЧОЎ Якаў Міхайлавіч, медаль «За адвагу»; РУДЗЯНОК Міхаіл Раманавіч, радавы, медаль «За адвагу»; САЛОДКІН Васіль Кузьміч, медаль «За адвагу»; СКУДНІЧКІ Адам Аляксандравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; ХАТКОЎСКІ Іван Арцем'евіч, радавы, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; ЦІМАШЭНКА Ірына Іларыёнаўна, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; ЦЯРЭШЧАНКА Іван Іосіфавіч, радавы, ордэн Айчыннай вайны II ступені, медаль «За адвагу»; ЧАРНЯКОЎ В.Г., два ордэны Чырвонай Зоркі, ШАСТАКОЎ Пётр Іосіфавіч, радавы, медаль «За адвагу»; ШЫЛЕЦ Іван Акімавіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі.

ПАСЁЛАК ДУБАВЕЦ

МЯЖЭВІЧ Міхаіл Адамавіч, медаль «За баявыя заслугі».

ПАСЁЛАК КАРНАЛІН

АБРАМЦАЎ Іван Дзянісавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; АСЫЛАЎ Міхаіл Апанасавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; медаль «За баявыя заслугі»; ДУБАДЗЕЛАЎ Іван Міхайлавіч, сяржант, два медалі «За адвагу»; ГУСАЎ Андрэй Рыгоравіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі».

ПАСЁЛАК МІРНЫ

БАЗЫЛЕЎ Міхаіл Данілавіч, медаль «За баявыя заслугі».

ВЁСКА МІХАЛЬКІ

ГАПОНЕНКА Акім Рыгоравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; КОЦУР Аляксандр Фёдаравіч, радавы, медаль «За адвагу»; КУРАЧОЎ Сцяпан Антонавіч, мал. сяржант, медалі «За баявыя заслугі», «За адвагу»; КУЧМА Іван Данілавіч, радавы, ордэн Славы III ступені; ЛАПІЦКІ Аляксандр Мікалаевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; ЛОЙКА Валянціна Васільеўна, ордэн Чырвонага Сцяга; СІНЮКОЎ Нічыпар Апанасавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; СТАРАВОЙТАЎ Іван Фёдаравіч, сяржант, медаль «За баявыя заслугі»; ТАРАСАЎ Павел Цітавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; УГРУМАЎ Іван Іларыёнавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; УМАТКІН Фрол Лявонавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; ЦЯРЭШЧАНКА Пётр Піліпавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

ПАСЁЛАК МЕЖЫ

КАРБОЎСКІ Мікалай Яўхімавіч, радавы, медаль «За адвагу»; ШНІНА Надзея Піліпаўна, медаль «За баявыя заслугі».

ПАСЁЛАК НЯКРАСАВА

ПІНЧАНКА Міхаіл Піліпавіч, радавы, ордэн Славы III ступені; СТАРАВОЙТАЎ Іван Фёдаравіч, медаль «За баявыя заслугі».

ВЁСКА СТУКАЧОЎКА

БАНДАРЭНКА Аляксандр Васільевіч, медаль «За баявыя заслугі»; НОВІКАЎ Мікалай Аляксандравіч, сяржант, медаль «За адвагу».

ДЗЯТЛАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ДЗЯТЛАВІЧЫ (СТАРЫЯ ДЗЯТЛАВІЧЫ)

АБАКУМЕНКА Міхаіл Іванавіч, радавы, медаль «За адвагу»; АФАНАСЬЕЎ Пётр Несцеравіч, медаль «За баявыя заслугі»; ВОЛКАЎ Аляксей Карпавіч, медаль «За баявыя заслугі»; ВОЛКАЎ Апанас Аксёнавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; ВОЛКАЎ Міхаіл Карпавіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі; ВОСІПАЎ Авакум Герасімавіч, медаль «За адвагу»; ВОСІПАЎ Дзмітрый Герасімавіч, медаль «За адвагу»; ПУГАЧОЎ Рыгор Майсеевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; ГЕРГАЛАЎ Мікалай Уладзіміравіч, медаль «За адвагу»; ГЕРГАЛАЎ Павел Яўменавіч, яфрэйтар, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; ГРАПАЎ Павел Трафімавіч, ст. лейтэнант, медаль «За адвагу»; ГРАПАЎ Уладзімір Якаўлевіч, ордэн Славы III ступені; ГРУШУНОЎ Дзмітрый Міхайлавіч, ордэны Багдана Хмяльніцкага III ступені, Чырвонай Зоркі; КАЛЯДАЎ Пётр Якаўлевіч, радавы, медаль «За адвагу»; КАСЯКОЎ Мікалай Логвінавіч, старшына, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; МАКАЎ Аляксей Міхайлавіч, медаль «За адвагу»; МАКСІМЕНКА..., медаль «За баявыя заслугі»; МІЛЕНЦІЕЎ Канстанцін Іванавіч, гвардыі сяржант, медаль «За адвагу»; САМОЙЛЕНКА Мікалай Фёдаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; САМОЙЛЕНКА Якаў Сяргеевіч, медаль «За баявыя заслугі»; СІЛКОВІЧ Аляксандр Іванавіч, старшына, ордэны Славы II і III ступеней, Чырвонай Зоркі; СІЛКОВІЧ Аляксандр Іванавіч, ордэны Славы II і III ступеней; ЧАРНОЎ Дзмітрый Аляксандравіч, медаль «За баявыя заслугі»; ЧАРНОЎ Канстанцін Пятровіч, гвардыі мал. сяржант, медаль «За баявыя заслугі»; ШЫЦІКАЎ Рыгор Карпавіч, ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

ВЁСКА НОВЫЯ ДЗЯТЛАВІЧЫ

КАЗЛОЎ Тарас Емяльянавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; КЛІМАЎ Міхаіл Кірылавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; КЛІМАЎ Філат Севасцьянавіч, медаль «За баявыя заслугі»; КРЭНГОЛЬД Іван Аляксандравіч, гвардыі ст. сяржант, медаль «За баявыя заслугі»; МАРЧАНКА Іван Яўхімавіч, медаль «За адвагу»; САВАРЫН Васілій Сцяпанавіч, ст. сяржант, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; СЕМЕНЧУКОЎ Ігнат Данілавіч, медаль «За адвагу»; СІЛКОВІЧ Іван Фядотавіч, яфрэйтар, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; СУРЖЫКАЎ Іван Назаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; СУРЖЫКАЎ Фёдар Іванавіч, ордэн Славы III ступені; СУРЖЫКАЎ Цімафей Назаравіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; ЧУБУКОЎ Павел Кірылавіч, лейтэнант, ордэн Чырвонай Зоркі; ШЫРАКАН Іван Аляксеевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; ЮРЧАНКА Іван Дзянісавіч, медаль «За баявыя заслугі».

ВЁСКА ЧКАЛАВА

ВАСІЛЬЧЫКАЎ Рыгор Ягоравіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, «За баявыя заслугі»; ДЗЯДКОЎ Мікалай Цярэнцьевіч, сяржант, медаль «За адвагу»; ЖОЛУДЗЕЎ Фёдар Фёдаравіч, сяржант, два ордэны Чырвонай Зоркі; КАЛЯДАЎ Пётр Якаўлевіч, медаль «За адвагу»; КОТАЎ Сямён Іванавіч, радавы, медаль «За адвагу»; КОТАЎ Якаў Іванавіч, медаль «За баявыя заслугі»; ЛАБАНАЎ Мікалай Адамавіч, медаль «За адвагу»; ЛІТВІНАЎ Пётр Яфрэмавіч, медалі «За баявыя заслугі», «За адвагу»; ІЛЬІЧОЎ Мікалай Міхайлавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; МАРОЗАЎ Іван Іванавіч, медаль «За адвагу»; МАРОЗАЎ Якаў Герасімавіч, медаль «За адвагу»; МАСЬКО Гаўрыла Мікалаевіч, ордэн Чарвонай Зоркі; МЕЛЬНІЧЭНКА Іван Васільевіч, медаль «За баявыя заслугі»; ПЕРАПЛАЎЧАНКА Міхаіл Львовіч, медаль «За адвагу»; СЕРЫКАВА Ганна Цітаўна, медаль «Партызану Айчыннай вайны» I ступені; СНЯЖКО Дзмітрый Яўхімавіч, медаль «За адвагу»; СУХОЦКІ Аляксандр Васільевіч, ст. сяржант, ордэн Славы III ступені, медаль «За баявыя заслугі»; ФЕДАРЦОЎ Васілій Цярэнцьевіч, медаль «За адвагу»; ХАЯРАЎ Іван Рыгоравіч, медаль «За баявыя заслугі»; ЦУКАРАЎ Мікалай Еўдакімавіч, медаль «За адвагу»; ШЫЛЕЦ Пётр Іванавіч, медаль «За баявыя заслугі»; ЮРЧАНКА Мікалай

Дзянісавіч, медаль «За адвагу»; ЯРМАКОЎ Яфрэм Фаміч, радавы, медаль «За адвагу».

ЗЯБРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАСЁЛАК ВАЯВОДА

ДЗЮБЯНКОЎ Мікалай Уласавіч, радавы, медаль «За адвагу»; ДЗЮБЯНКОЎ Піліп Сяргеевіч, сяржант, ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, медаль «За адвагу»; КАРАТКОЎ Міхаіл Рыгоравіч, радавы, медаль «За адвагу»; ПАДШЧАКОЛДЗІН Аляксей Мікалаевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За баявыя заслугі», два «За адвагу»; РАКАЎ Аляксандр Міхайлавіч, ст. лейтэнант, ордэн Чырвонага Сцяга; ХАТУЛЁЎ Васілій Андрэевіч, капітан, ордэны Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі».

ПАСЁЛАК ГРАЗА

БАЗЫЛЕЎ Міхаіл Еўдакімавіч, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; ДАНІЛЬЧАНКА Яўгеній Маркавіч, сяржант, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; КАЖЭЎНІКАЎ Уладзімір Іванавіч, лейтэнант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

ВЁСКА ЗЯБРАЎКА

БАЛЮКОЎ Мікалай Аляксандравіч, радавы, медаль «За адвагу»; БУЛАХАЎ Пётр Яўцехавіч, старшына, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; ГУСЕЙНАВА Ніна Фёдараўна, радавы, медаль «За баявыя заслугі»; ДЗЯТЛАЎ Антон Емяльянавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; КАБЗАРАЎ Рыгор Арцёмавіч, медаль «За адвагу»; КАВАЛЁЎ Іван Карнеевіч, медаль «За баявыя заслугі»; КАНТАРАЎ Васілій Іванавіч, медаль «За баявыя заслугі»; КАСТАЧКА Міхаіл Міхайлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; КІР'ЯНАЎ Мікалай Архіпавіч, ст. лейтэнант, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; КУРЫЛІН Адам Сцяпанавіч, сяржант, медаль «За баявыя заслугі»; МАДЖАРА Мікалай Емяльянавіч, медаль «За баявыя заслугі»; МЕЛЬНІКАЎ Мікалай Акімавіч, ордэны Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені; ФРАЛОЎ Ануфрый Карпавіч, радавы, ордэн Чырвонай Зоркі; ХУДАЛЕЙ Іван Яфрэмавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

ВЁСКА КАНТАКУЗАЎКА

КАРАБЛЁЎ Рыгор Яфімавіч, мал. лейтэнант, медаль «За адвагу»; КРАЎЦОЎ Васілій Міхайлавіч, ст. сяржант, медаль «За баявыя заслугі»; ЛАПАКІН Мікалай Макаравіч, медаль «За баявыя заслугі»; ПАЎЛЕНКА Антон Емяльянавіч, медаль «За адвагу»; ПАЎЛЯНКОЎ Апанас Фадзеевіч, медаль «За баявыя заслугі»; ФЕДАРЦОЎ Пётр Міхайлавіч, ст. сяржант, медаль «За баявыя заслугі».

ВЁСКА КАРАНЁЎКА

АКУЛІЧ Станіслаў Ісакавіч, ордэн Славы III ступені; КАЖАМЯКІН Аляксандр Акімавіч, радавы, ордэн Славы III ступені, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; КРЫВАЛАП Наталля Міхайлаўна, медаль «За баявыя заслугі»;ЛІЗАГУБ Фёдар Паўлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; СІДАРЭНКА Аляксей Елісеевіч, медаль «За адвагу»; СІЗОНЕНКА Васілій Пракопавіч, медаль «За адвагу»; СНАПОК Антон Андрэевіч, медаль «За баявыя заслугі»; ХАХЛОЎ Аляксей Макаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; ЧАЛАЯ Паліна Трафімаўна, сяржант, медаль «За баявыя заслугі».

ПАСЁЛАК ЧЫРВОНАЕ СЕЛІШЧА

БАЛЮКОЎ Мікалай Пятровіч, радавы, два медалі «За адвагу»; ШКАРУБА Тарас Антонавіч, медаль «За адвагу».

КРАСНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БРЫЛЁВА

ВЕРАСАВЫ Васілій Іванавіч, ст. лейтэнант, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; БОНДАР Міхаіл Фролавіч, мал. сяржант, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Славы III ступені, медаль «За адвагу»; ЗАВАДСКІ Аляксандр Фёдаравіч, радавы, медаль «За адвагу»; КАРПЯНКОЎ Васілій Пракопавіч, радавы, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; КІЗІЦКІ Піліп Карнеевіч, мал. сяржант, медаль «За баявыя заслугі»; МАСКАЛЁЎ Аляксандр Харытонавіч, ст. сяржант, медаль «За адвагу»; МІСЕЎ Сцяпан Макаравіч, ордэн Славы III ступені, МЯДЗВЕДЗЕЎ Аляксей Пятровіч, ст. сяржант, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; МЯЛЬЧНЯЕЎ Мікалай Іванавіч, радавы, ордэны Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя

ЛУСКАНАЎ Іван Васільевіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак 29.8.1942.

ЛЫСЯНКОЎ Аляксей Акімавіч, н. у 1909, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЛЮБЫЩЕЎ Фёдар Паўлавіч, н. у 1911, рад., памёр ад ран 11.4.1945 у медсанбаце ва Усходняй Прусіі.

ЛЯВОНАЎ Максім Савельевіч, н. у 1905, сярж., загінуў 20.4.1943.

ЛЯВОНАЎ Цімафей Савельевіч, н. у 1909, рад., памёр ад ран 10.2.1945 у Германіі.

ЛЯСЬКОЎ Міхаіл Карпавіч, н. у 1924, рад., загінуў 17.3.1943, пахаваны ў в. Хлебатава Арлоўскай вобл.

ЛЯНКОЎ Васілій Фёдаравіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак 1.8.1941.

ЛЯНКОЎ Сіла Лявонавіч, н. у 1921, рад., прапаў без вестак у 1944.

МАГІЛЬСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1921, рад., загінуў 23.12.1942, пахаваны ў в. Сафронкава Лычкоўскага р-на Наўгародскай вобл.

МАКАРАНКА Мікіта Мікітавіч, н. у 1915, рад., загінуў 10.12.1942.

МАКАРАЎ Даніла Платонавіч, н. у 1903, рад., прапаў без вестак 24.10.1941.

МАКУШЭНКА Іван Пракопавіч, н. у 1920, рад., памёр у шпіталі, пахаваны у г.п. Наваельня Дзятлавіцкага р-на Гродзенскай вобл.

МАЛЕЦЬКА Кузьма Канстанцінавіч, н. у 1925, рад., прапаў без вестак 27.9.1944 у Польшчы.

МАРГОЛІН Леў Барысавіч, мал. сярж., загінуў 1.5.1945 у Германіі.

МАРОЗАЎ Аляксей Карпавіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у 1944.

МАРТЫНАЎ Стафан Паўлавіч, н. у 1910, рад., загінуў 24.3.1944, пахаваны ў в. Залаец Цярнопальскай вобл.

МАРУСІН Мікалай Міронавіч, н. у 1902, рад., загінуў 30.9.1942, пахаваны ў Сталінградскай вобл.

МАРЫЕНКА Сяргей Андрэевіч, н. у 1923, рад., прапаў без вестак 16.4.1945.

МАТЫЛЁЎ Аляксандр Андрэевіч, н. у 1917, рад., прапаў без вестак 17.2.1943.

МАТЫЛЁЎ Іван Сідаравіч, н. у 1913, рад., прапаў без вестак 1.8.1941.

МАЦВЕЕЎ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1922, лейт., загінуў у палоне 11.1.1943.

МЕЛЬНІКАЎ Аляксей Ігнатавіч, н. у 1921, ст. сярж., загінуў 23.3.1945 у Германіі.

МЕЛЬНІКАЎ Уладзімір Паўлавіч, н. у 1917, рад., прапаў без вестак 3.9.1941.

МІНІН, н. у 1910, рад., загінуў 27.1.1944, пахаваны ў в. Цішкоўка Кіраваградскай вобл.

МІРОНЕНКА Навум Кузьміч, н. у 1906, яфр., загінуў 20.1.1945.

МІХАЛАЧКІН, н. у 1920, рад., прапаў без вестак у 1944.

МІХАЛЬКОЎ Несцер Мінавіч, н. у 1910, рад., прапаў без вестак у 1944.

МІХАЛЬКОЎ Павел Іванавіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1944.

МІХАЛЬКОЎ Піліп Ягоравіч, н. у 1922, сярж., загінуў 21.3.1942, пахаваны ў в. Трагубава.

МІХАЛЬКОЎ Фёдар Мінавіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1944.

МІХАЛЬЧАНКА Павел Сяргеевіч, н. у 1920, рад., прапаў без вестак 9.6.1941.

МЯДЗЕЛЕЦ Сцяпан Л., н. у 1920, рад., загінуў 14.8.1941.

МЯРКУЛАЎ Міхаіл Іванавіч, н. у 1925, рад., загінуў 30.6.1944, пахаваны ў п. Акцябр Магілёўскай вобл.

МЯЦЕНІКАЎ Герасім Пятровіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак 30.11.1944.

МЯШЧАНСКІ Антон Данілавіч, н. у 1913, рад., памёр ад ран, пахаваны ў Варшаўскім ваяв., Польшча.

МЯШЧАНСКІ Міхаіл Шапавалавіч, н. у 1903, рад., памёр ад ран у медсанбаце 14.7.1944, пахаваны ў в. Навасёлкі Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл.

НЕМЦАЎ Іван Васільевіч, рад., прапаў без вестак 28.10.1943.

НІЖНІКАЎ Нічыпар Трафімавіч, н. у 1907, рад., загінуў 1.12.1942, пахаваны ў Ржэўскім р-не Цвярской вобл.

НЯТЫЛЬКІН Мікалай Захаравіч, н. у 1920, рад., прапаў без вестак у 1944.

НЯТЫЛЬКІН Пётр Захаравіч, н. у 1917, ст. сярж., пахаваны ў в. Шалецінка Барадзінскага р-на Смаленскай вобл.

НЯФЁДАЎ Іван Фёдаравіч, н. у 1922, рад., загінуў 31.8.1941.

ПАБЯГАЕЎ Аляксандр Сяргеевіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у 1944.

ПАДАБЕДАЎ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак у 1944.

ПАДАБЕДАЎ Павел Пятровіч, н. у 1915, рад., прапаў без вестак у 1943.

ПАЛОНІКАЎ Іван Сідаравіч, н. у 1897, рад., загінуў 10.8.1944, пахаваны ў Варшаўскім ваяв., Польшча.

ПАНЬШЫН Мікалай Якаўлевіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак 18.12.1941.

ПАПКОЎ Павел Фёдаравіч, н. у 1909, ст. сярж., памёр ад ран 17.3.1945.

ПАРВЕНКА Павел Піліпавіч, н. у 1923, сярж., прапаў без вестак у 1942 пад Сталінградам.

ПАРФЯНЦОЎ Аляксей Рыгоравіч, н. у 1923, рад., прапаў без вестак у 1944.

ПАРФЯНЦОЎ Дзмітрый Васільевіч, н. у 1926, рад., загінуў 16.2.1945 у Германіі.

ПАТАПАЎ Іван Паўлавіч, н. у 1919, рад., прапаў без вестак у 1944.

ПАТАШКОЎ Пётр Анціпавіч, н. у 1903, рад., загінуў 25.11.1943, пахаваны ў в. Буда-Сырская Кармянскага р-на Гомельскай вобл.

ПЕРАПЛАЎЧАНКА Мікіта Сцяпанавіч, н. у 1894, рад., памёр ад ран у шпіталі 17.6.1942, пахаваны ў г. Падольск Маскоўскай вобл.

ПЕЎЛЕЎ Іван Фадзеевіч, н. у 1911, рад., прапаў без вестак у 1944.

ПЕЎЛЕЎ Міхаіл Цімафеевіч, н. у 1923, рад., прапаў без вестак у 1944.

ПІСАРКОЎ Антон Міхайлавіч, н. у 1904, рад., загінуў 19.2.1942 ў в. Сасноўка Парыцкага р-на Палескай вобл.

ПІСАРЭНКА Уладзімір Сямёнавіч, н. у 1925, сярж., загінуў у Германіі 18.4.1945.

ПРАКАПЕНКА Іван Ільіч, н. у 1924, рад., загінуў у Гомельскай вобл. 13.11.1943.

ПРАХАРЭНКА Нічыпар Антонавіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1944.

ПРУДАЎ Сяргей Іванавіч, н. у 1923, рад., загінуў 25.8.1942, пахаваны ў г. Улан-Эргэ, Калмыкія.

ПРЫБУЛАСТАЎ Пётр Сяргеевіч, н. у 1923, рад., загінуў 30.8.1942, пахаваны ў Казельскім р-не Калужскай вобл.

ПРЫХОДЗЬКА Мікалай Цімафеевіч, н. у 1905, рад., прапаў без вестак 30.4.1945.

ПТАШНІКАЎ Пётр Нікадзімавіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак у 1944.

ПУТРОЎ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1926, рад., загінуў ва Усходняй Прусіі.

П'ЯВАЧНІКАЎ Аляксей Данілавіч, н. у 1916, рад., прапаў без вестак 1.12.1943.

ПЯСКОЎСКІ Яўгеній Піліпавіч, н. у 1904, рад., прапаў без вестак 20.12.1941.

ПЯТРЭНКА Піліп Фёдаравіч, н. у 1902, кап., прапаў без вестак у 1941.

РАБКОЎ Цярэнцій Радзівонавіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1944.

РАБУХА Анатолій Андрэевіч, н. у 1922, рад., загінуў 18.8.1943, пахаваны ў п. Мала-Данілаўскі Дзергачоўскага р-на Харкаўскай вобл.

РАБЦАЎ Іван Максімавіч, н. у 1918, рад., прапаў без вестак у 1944.

РАБЧАНКА Леанід Ільіч, н. у 1905, рад., прапаў без вестак у 1944.

РАЖКОЎ Ананій Захаравіч, н. у 1918, рад., прапаў без вестак 30.11.1943.

РАЗУМОЎСКІ Яфім Ісаевіч, рад., загінуў 27.6.1944, пахаваны ў в. Зелянковічы Глускага р-на Магілёўскай вобл.

РАМАНАЎ Гаўрыла Васільевіч, н. у 1898, рад., памёр ад ран 2.12.1943.

РАСТОЛЬНЫ Канстанцін Барысавіч, н. у 1920, рад., прапаў без вестак у 1944.

РУБАМЕЛАК Уладзімір Аляксеевіч, н. у 1921, рад., памёр ад ран у Карэліі 26.4.1942.

РУБАШЫН Ігнацій Антонавіч, н. у 1901, рад., загінуў 4.4.1942, пахаваны ў в. Ножкіна Ржэўскага р-на Цвярской вобл.

РУДЗЕНСКІ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1911,

рад., загінуў 1.8.1942, пахаваны ў в. Пушкары Бельскага р-на Цвярской вобл.

РУДЗЯНКОЎ Аляксей Сямёнавіч, н. у 1919, рад., прапаў без вестак у 1944.

РУСКІ Васілій Максімавіч, н. у 1925, яфр., загінуў 10.10.1943, пахаваны на х. Нова-Сцяпнянскі Запарожскай вобл.

РЫЖОЎ Сямён Антонавіч, н. у 1909, рад., загінуў 20.1.1943, пахаваны ў в. Тураўка Ізноскаўскага р-на Смаленскай вобл.

САВЕНКА Васілій Паўлавіч, н. у 1895, рад., загінуў 22.7.1944, пахаваны ў в. Раселі, Латвія.

САВІЧАЎ Фёдар Кузьміч, н. у 1913, рад., прапаў без вестак у 1944.

САЙКІН Пётр Васільевіч, н. у 1919, рад., прапаў без вестак 18.8.1942.

САЛАМЕЙКА Павел Захаравіч, н. у 1925, рад., загінуў у Польшчы 12.8.1944.

САЛДАТКІН Андрэй Клімавіч, н. у 1911, рад., памёр ад ран 22.6.1944, пахаваны ля в. Вербічна Гужынскага р-на Валынскай вобл.

САЛОХІН Нічыпар Аляксандравіч, н. у 1900, рад., памёр ад ран у Польшчы 30.1.1945.

САМУСЕНКА Леанід Рыгоравіч, н. у 1924, рад., прапаў без вестак у 1944.

САМУСЕНКА Мікалай Свірыдавіч, н. у 1919, рад., прапаў без вестак у 1944.

САМУСЕНКА Рыгор Сямёнавіч, н. у 1898, рад., прапаў без вестак у 1944.

САМУСЕНКА Уладзімір Андрэевіч, н. у 1915, рад., прапаў без вестак 5.2.1945.

САРАКАЛЕТАЎ Іван Андрэевіч, н. у 1904, рад., загінуў 27.2.1942.

САРОКІН Мікалай Іванавіч, н. у 1922, кап., загінуў 21.2.1943, пахаваны ў в. Гарадзішчы, Болхаўскага р-на Арлоўскай вобл.

САРОКІН Рыгор Сямёнавіч, н. у 1917, сярж., загінуў у Арлоўскай вобл. 25.2.1943.

САСАЎ Пётр Яўлампіевіч, н. у 1904, рад., памёр ад ран у Польшчы.

СЕЛЯЗНЁЎ Іван Васільевіч, н. у 1918, рад., прапаў без вестак 23.12.1943.

СЕМЯНЦОЎ Андрэй Іванавіч, н. у 1903, рад., загінуў 17.11.1943.

СЕМЯНЦОЎ Міхаіл Андрэевіч, н. у 1906, рад., прапаў без вестак 23.12.1943.

СІВАЙ Сяргей Несцеравіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1944.

СІДОРКІН Андрэй Мікалаевіч, н. у 1910, рад., прапаў без вестак.

СІДОРКІН Іван Захаравіч, н. у 1900, рад., прапаў без вестак у 1944.

СІДОРКІН Мікалай Іванавіч, н. у 1926, рад., прапаў без вестак у Літве 18.8.1944.

СІМАКОЎ Аляксей Кузьміч, н. у 1918, рад., прапаў без вестак у 1944.

СІМАКОЎ Апанас Купрыянавіч, н. у 1920, рад., прапаў без вестак у 1944.

СІТНІКАЎ Фёдар Ф., н. у 1905, рад., прапаў без вестак 17.12.1942.

СМЕЛЯКОЎ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1905, рад., прапаў без вестак у 1944.

СНАЙКОЎ Мікалай Аляксеевіч, н. у 1917, рад., прапаў без вестак 6.7.1942.

СТАРАВОЙТАЎ Кірыл Максімавіч, н. у 1894, рад., прапаў без вестак у 1943.

СТРУКАЎ Васілій Патапавіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1944.

СТРЫЖАКОЎ Якаў, н. у 1904, загінуў у лагеры Масюкоўшчына ў г. Мінску 6.4.1943.

СУЛІКАЎ Сямён Іванавіч, н. у 1924, ст. сярж., загінуў у Латвіі 3.8.1944.

СЦЕПАНЕНКА Мацвей Васільевіч, н. у 1913, рад., прапаў без вестак у 1944.

СЫРКОЎ Мікалай Майсеевіч, н. у 1920, рад., памёр ад ран 10.1.1945, пахаваны ў г. Капсукас, Літва.

СЯДЗЬКО Яўгеній Пятровіч, ст. сярж., памёр ад ран у Калінінскай вобл. 30.1.1944.

СЯРКОЎ Фёдар Пятровіч, н. у 1925, рад., загінуў 8.9.1944, пахаваны ў Беластоцкім ваявод., Польшча.

СЯРКОЎ Яўгеній Іванавіч, н. у 1921, рад., прапаў без вестак 10.1.1942.

ТАБАКІН Якаў Абрамавіч, н. у 1919, рад., загінуў 3.3.1942, пахаваны ў Хахольскім р-не Варонежскай вобл ля в. Хахол.

ТАКУНОЎ Фёдар Уладзіміравіч, н. у 1925, рад., загінуў 28.10.1944.

ТАРАСЕВІЧ Іван Апанасавіч, н. у 1922, рад., загінуў ва Усходняй Прусіі 27.3.1945.

ТВАРДОЎСКІ Мікалай Піменавіч, н. у 1904, рад., прапаў без вестак у 1944.

ТРАЦЦЯКОЎ Аляксей Георгіевіч, н. у 1902, рад., прапаў без вестак у 1945.

ТРАЦЦЯКОЎ Іван Фёдаравіч, н. у 1921, рад., прапаў без вестак 2.1.1942.

ТРАЯНАЎ Фёдар Сілавіч, н. у 1911, рад., памёр ад ран 3.9.1944, пахаваны ў Беластоцкім ваяв., Польшча.

ТРУБЧАНКА Сяргей Захаравіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1942.

ТУРКОЎ Якаў Аляксеевіч, н. у 1908, рад., загінуў 14.11.1943, пахаваны ў в. Ветхін Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.

УЛАДЗІМІРАЎ Дзмітрый Емяльянавіч, н. у 1894, рад., прапаў без вестак у верасні 1944.

УЛАДЫНЦАЎ Сцяпан Гаўрылавіч, н. у 1906, рад., прапаў без вестак у студзені 1944.

УКЧЭРАЎ Іван Маркавіч, н. у 1917, рад., прапаў без вестак 11.3.1945.

УСАЎ Васілій Іосіфавіч, н. у 1899, рад., прапаў без вестак у 1944.

УСАЎ Іван Васільевіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у 1944.

ФЕДАРЦОЎ Іван Максімавіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак 3.10.1942.

ФЕДАРЦОЎ Якаў Іванавіч, н. у 1917, рад., пахаваны ў п. Марс Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.,

ФЕДАСЕЕНКА Аляксей Якаўлевіч, н. у 1918, рад., пахаваны ў п. Зарэчча Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.

ФЕДАСЕЕНКА Фёдар Фёдаравіч, старш. сярж., прапаў без вестак 5.6.1943.

ФІЛІПАЎ Мікалай Сяргеевіч, н. у 1924, рад., загінуў у Літве 16.8.1944.

ФОЛЬБЕРТ Канстанцін Андрэевіч, н. у 1926, рад., памёр ад ран у Гомельскай вобл., пахаваны ў в. Шацілкі Жлобінскага р-на.

ФУРСЕЕЎ Рыгор Карпавіч, н. у 1892, рад., прапаў без вестак у 1941.

ХАДЗЬКО Апанас Іванавіч, н. у 1910, рад., загінуў 12.11.1943, пахаваны ў в. Рудня-Марымонава Гомельскага р-на.

ХАПХАСАЎ Мікалай Сямёнавіч, н. у 1905, рад., загінуў 8.8.1944, пахаваны ў в. Авэлэс, Латвія.

ХАРХУЛЕЎ Васілій Платонавіч, н. у 1926, рад., памёр ад ран у Латвіі 29.12.1944.

ХВАТАЛАЎ Фёдар Андрэевіч, н. у 1919, рад., загінуў у Гомельскай вобл. 12.11.1943.

ХІЛЬКЕВІЧ Рыгор Раманавіч, н. у 1922, сярж., прапаў без вестак 26.1.1943.

ХІМЧАНКА Іван Фёдаравіч, н. у 1904, рад., загінуў 29.7.1943, пахаваны ў пас. Пралетарый Ленінградскай вобл.

ЦВАЛАЎ Уладзімір Васільевіч, н. у 1907, рад., загінуў 18.11.1943, пахаваны ў в. Міхалькі Гомельскага р-на.

ЦВЯТКОЎ Міхаіл Міронавіч, н. у 1912, рад., памёр ад ран у Польшчы.

ЦІТКОЎ Аляксей Карнеевіч, н. у 1924, рад., загінуў у Польшчы.

ЦІТКОЎ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1922, рад., загінуў у Літве 19.7.1944.

ЦІТОЎ Сяргей Піліпавіч, н. у 1901, рад., загінуў 15.11.1945, пахаваны ў п. Храбы Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.

ЦІТОЎ Фёдар Захаравіч, н. у 1922, рад., загінуў у Смаленскай вобл.

ЦІТОЎ Ціт Паўлавіч, н. у 1905, рад., загінуў 27.11.1942, пахаваны на х. Астахаў Бокаўскага р-на Растоўскай вобл.

ЦЫКУНОЎ Аляксей Кірылавіч, н. у 1909, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЦЫКУНОЎ Дзмітрый Кірылавіч, н. у 1920, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЦЫКУНОЎ Іван Мікітавіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЦЫКУНОЎ Фёдар Кірылавіч, н. у 1914, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЦЯРЭШЧАНКА Трафім Іванавіч, н. у 1904, рад., прапаў без вестак 26.6.1941.

ЧУПАРАЎ Іван Аляксеевіч, н. у 1911, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЧУПАРАЎ Карп Спірыдонавіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЧУРЫШКА Эдуард Пятровіч, н. у 1906, рад., прапаў без вестак 1.8.1941.

ЧУЧВАГА Барыс Іванавіч, н. у 1908, рад., загінуў 29.4.1945, пахаваны ў г. Берлін, Германія.

ЧЫЖОЎ Міхаіл Гаўрылавіч, н. у 1905, рад., загінуў 30.6.1944, пахаваны ў м. Свіслач Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл.

ЧЫЖОЎ Панцеляймон Сільвестравіч, н. у 1906, рад., прапаў без вестак у 1945.

ЧЫКУНОЎ Аляксей Захаравіч, н. у 1895, рад., пахаваны ў Шабекінскім р-не Белгарадскай вобл.

ЧЫКУНОЎ Васілій Рыгоравіч, н. у 1923, рад., загінуў 21.2.1945 ва Усходняй Прусіі.

ЧЫКУНОЎ Яўстафій, н. у 1895, рад., загінуў 13.11.1943.

ЧЫСТОЎ Ілья Іванавіч, н. у 1908, рад., загінуў у Эстоніі.

ШАБАНАЎ Пётр Ціханавіч, н. у 1909, рад., загінуў 7.4.1942.

ШАЛУПАЕЎ Сяргей Яфрэмавіч, н. у 1915, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШАПАВАЛАЎ Ягор Ягоравіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак.

ШАРАЕЎ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1924, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШАРАЕЎ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1924, прапаў без вестак у 1944.

ШАРАЕЎ Ілья Іванавіч, н. у 1909, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШАРАМЕЦЬЕЎ Захар Касьянавіч, н. у 1914, рад., загінуў 27.7.1944.

ШАРАМЕЦЬЕЎ Міхаіл Васільевіч, н. у 1909, рад., прапаў без вестак каля в. Чыркавічы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ШАРАМЕЦЬЕЎ Міхаіл Лявонавіч, н. у 1926, рад., загінуў 25.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

ШАРЫКАЎ Андрэй Пятровіч, н. у 1921, рад, пахаваны ў в. Адрасерэ Нарвскага р-на, Эстонія.

ШМІДАЎ Давыд Іосіфавіч, н. у 1919, ст. лейт., загінуў.

ШПАНЬКОЎ Аляксей Аляксеевіч, н. у 1921, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШПАНЬКОЎ Павел Андрэевіч, н. у 1910, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШУПЛЯКОЎ Барыс Андрэевіч, н. у 1925, рад., загінуў 19.1.1945, пахаваны ў г. Рацэнж Цэханаўскага пав., Польшча.

ШЧАРБАКОЎ Пётр Пятровіч, н. у 1897, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШЧАРБАКОЎ Фёдар Пятровіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак 25.12.1942.

ШЧАРБІН Захар Піліпавіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШЧЫГОРАЎ Васілій Ягоравіч, н. у 1922, мал. сярж., прапаў без вестак 1.10.1942 у г. Сталінград.

ШЧЫРАЎ Васілій Анісімавіч, н. у 1902, рад., загінуў 28.1.1945 у Польшчы.

ШЫЛАЎ Антон Цярэнцьевіч, н. у 1898, рад., загінуў 25.1.1945, пахаваны ў г. Беласток, Польшча.

ЭЦЭНБУРГ Якаў Якаўлевіч, н. у 1918, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЮРАНКОЎ Кузьма Фёдаравіч, н. у 1913, рад., загінуў 17.11.1943, пахаваны каля в. Дзятлавічы Гомельскага р-на.

ЮРАПАЎ Іван Віктаравіч, н. у 1925, рад., загінуў 18.2.1944, пахаваны ў в. Карпавічы Лёзненского р-на Віцебскай вобл.

ЮРЧАНКА Іван Прохаравіч, н. у 1908, рад., загінуў 7.8.1944, пахаваны ў в. Пяроўса Капсукскага р-на, Літва.

ЯКУБАЎ Васілій Дзянісавіч, н. у 1910, рад., прапаў без вестак 2.8.1941.

ЯКУБОВІЧ Лявон Іванавіч, н. у 1912, прапаў без вестак у 1944.

ЯТЧАНКА Аляксандр Ціханавіч, н. у 1918, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЯТЧАНКА Міхаіл Ціханавіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЯТЧАНКА Фёдар Елісеевіч, н. у 1909, рад., загінуў 12.4.1944, пахаваны ў Беластоцкім ваяв., Польшча.

ЯЦКОЎ Васілій Яфімавіч, н. у 1919, ст. сярж., загінуў 12.1.1944, пахаваны ў в. Аджы-Мушкай Крымскай вобл., Украіна.

ЯЦКОЎ Сцяпан Карпавіч, н. у 1904, рад., загінуў 18.11.1943, пахаваны каля в. Хандогі Дубровенскага р-на Віцебскай вобл.

ЯШЭНКА Павел Мікітавіч, н. у 1914, старш., прапаў без вестак у 1944.

Воіны-землякі, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і месца нараджэння якіх дакладна не вызначана

АЛЯКСЕЕЎ Мікалай Іванавіч, н. у 1924, рад., загінуў 15.12.1943, пахаваны ў в. Мормаль Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.

АРХІПЕНКА Аляксандр Аляксандравіч, мал. сярж., прапаў без вестак.

БОКАЎКАЎ Піліп Захаравіч, н. у 1907, рад., загінуў 2.12.1943, пахаваны ў Жлобінскім р-не Гомельскай вобл.

БАЛЮКОЎ Уладзімір Іванавіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у 1944.

БУКАЎЦОЎ Кірыла Пятровіч, рад., прапаў без вестак у 1944.

ВІНАКУРАЎ Аляксандр Пятровіч, н. у 1900, рад., прапаў без вестак 27.1.1945.

ВІШНЯКОЎ Мікалай Паўлавіч, н. у 1917, рад., прапаў без вестак у 1944.

ГРЫШАЧКІН Аляксандр Нічыпаравіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак у 1944.

ГРЫШАЧКІН Уладзімір Іванавіч, н. у 1922, рад., памёр ад ран 14.9.1944, пахаваны ў в. Завады Радзіміраўскага пав. Варшаўскага ваяв., Польшча.

ДЗЮБЯНКОЎ Мікалай Максімавіч, н. у 1904, рад., загінуў 20.12.1942, пахаваны ў в. Ледзіна Карманаўскага р-на Смаленскай вобл.

КАНАВАЛАЎ Якаў Міхайлавіч, н. у 1916, рад., загінуў 8.4.1942, пахаваны ў в. Чурылава Смаленскай вобл.

КАВАЛЁЎ Іван Архіпавіч, рад., загінуў у 1944, пахаваны ў в. Язвін Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

КІР'ЯНАЎ Іван Пятровіч, н. у 1925, рад., загінуў 13.7.1943, пахаваны на ст. Прохараўка Белгарадскай вобл.

КРУПЕНКА Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1923, рад., прапаў без вестак у верасні 1941.

КРУПЕНКА Міхаіл Паўлавіч, н. у 1915, мал. лейт., прапаў без вестак у 1943.

КУРЗАЎ Герасім Фёдаравіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у 1941.

МАЙСЕЕНКА Рыгор Цімафеевіч, н. у 1911, лейт., прапаў без вестак у ліпені 1943.

МАРТЫНЕНКА Мікалай Васільевіч, н. у 1914, старш., прапаў без вестак у 1941.

МАРШАЎ Ілья Аксёнавіч, н. у 1903, рад., прапаў без вестак у 1943.

МАСЛЮКОЎ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1919, рад., загінуў у 1943, пахаваны ў в. Жаробнае Гомельскага р-на.

МІНЧАНКА Ніканор Сямёнавіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1944.

ПАНКОЎ Павел Фёдаравіч, н. у 1909, сярж., прапаў без вестак у 1944.

РАБЧАНКА Уладзімір Фёдаравіч, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

САЛОДКІ Іван Фёдаравіч, н. у 1919, рад., прапаў без вестак у 1944.

САМУСЕЎ Віктар Піліпавіч, н. у 1926, рад., загінуў 3.3.1945 ва Усходняй Прусіі.

СІЛЬЧАНКА Аляксей Міхайлавіч, сярж., прапаў без вестак 2.7.1942.

СКАЧКОЎ Сцяпан Сяргеевіч, н. у 1915, рад., прапаў без вестак у 1944.

УЛАСЕНКА Кірыла Яфрэмавіч, н. у 1902, рад., прапаў без вестак у 1941.

ХРАМЕНКА Трафім Уладзіміравіч, рад., прапаў без вестак у 1942.

* * *

АДАМАЎ Яўхім Васільевіч, н. у 1899, рад., прапаў без вестак у студзені 1944.

Загінуўшыя воіны-землякі, месца нараджэння якіх не вызначана

ГЕРАСІМЧУК Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1926, рад., загінуў 29.1.1945, пахаваны ў Зеленагурскім ваяв., Польшча.

ГУРЧУНОЎ Аляксей Уладзіміравіч, н. у 1904, загінуў 6.9.1942, пахаваны каля в. Сінявіна Мшынскага р-на Ленінградскай вобл.

ЗАЙЦАЎ Іван Апанасавіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак у ліпені 1941.

ЗУБАРАЎ Васіль Ісаевіч, н. у 1894, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

КАЗЛОЎ Іван Сцяпанавіч, рад., памёр 17.10.1942 у палоне.

МЯЖЭЙНІКАЎ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у маі 1944.

САЙКІН Пётр Васільевіч, н. у 1919, рад., прапаў без вестак 21.8.1942.

САЛАГУБАЎ Іван Паўлавіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

ХАМЯКОЎ Лявон Сцяпанавіч, н. у 1904, прапаў без вестак у студзені 1945.

* * *

ГРАЧАЧНЫ Андрэй Іванавіч, н. у 1905, палітрук, прапаў без вестак у 1942.

ГУЛЕВІЧ Аляксандр Кузьміч, н. у 1915, рад., прапаў без вестак.

ГУЛЕВІЧ Емяльян Сямёнавіч, н. у 1897, лейт., прапаў без вестак 29.1.1943.

ГУМЯНЧУК Яфім Іванавіч, мал. лейт., прапаў без вестак 7.10.1941.

КАСЦЮШЭНКА Аляксандр Мяфодзьевіч, н. у 1922, рад., пахаваны ў в. Мікуліна Старыцкага р-на Калінінскай вобл.

ЧВАРАЎ Іван Аляксандравіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

ШКЛЯВЕР Сямён Пінхусавіч, н. у 1906, прапаў без вестак.

ЯРМОЛЬЧЫК Васіль Ціханавіч, н. у 1905, рад., прапаў без вестак.

* * *

БАРАНАЎ Андрэй Гаўрылавіч, н. у 1910, рад., прапаў без вестак у 1944.

БАРАНАЎ Іван Гаўрылавіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак у 1945.

БЯРОЗАЎ-КІЙ Анан Васільевіч, н. у 1918, ст. сярж., прапаў без вестак у 1941.

БЯРЭШЧАНКА Арсеній Тарасавіч, н. у 1925, рад., загінуў у 1943, пахаваны ў с. Чкалава Гомельскага р-на Гомельскай вобл.

ГЕЎРАСЕЎ Яфім Іванавіч, н. у 1905, мал. сярж., прапаў без вестак у 1944.

ДЗЯЖУРНЫ Васілій Фядотавіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак у 1944.

ДУДЗЯНАЎ Іван Айвенавіч, н. у 1899, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЕРЫШАЎ Якаў Яфімавіч, н. у 1925, рад., загінуў у 1945 каля г. Марыенбург, Усходняя Прусія.

ІВАНЧЫК Іван Сяргеевіч, н. у 1920, рад., прапаў без вестак у 1941.

ІВАНЧЫКАЎ Васілій Якаўлевіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1944.

ІГНАЦЬЕЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1902, лейт., загінуў у 1942, пахаваны ў пас. Красны Акцябр Гомельскага р-на.

КАЙДУНОЎ Іван Радзівонавіч, н. у 1909, рад., прапаў без вестак у 1941.

МІХАЛЬЧАНКА Васілій Рыгоравіч, н. у 1909, рад., загінуў 16.10.1943.

ПЯЧЭРНІКАЎ Іван Карлавіч, н. у 1920, рад., прапаў без вестак 22.12.1943.

РУДЗІЙ Сяргей Іванавіч, н. у 1909, рад., прапаў без вестак у 1944.

СІМАКОЎ Рыгор Майсеевіч, н. у 1911, рад., прапаў без вестак у 1944.

ТАТАРАНКА Калінік Рыгоравіч, н. у 1900, рад., прапаў без вестак у 1943.

Адкрыццё мемарыяла загінуўшым воінам у в. Урыцкае 23 кастрычніка 1987 г.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

У МІРНАЙ ПРАЦЫ

Вызваленне, якога так чакала насельніцтва раёна, прыйшло ў лістападзе 1943 г. Яшчэ грымелі баі на беларускай зямлі, а на вызваленай ад нямецка-фашысцкіх акупантаў тэрыторыі пачаліся аднаўленчыя работы. Адразу ж аднавілі сваю работу мясцовыя органы ўлады. Раённы Савет дэпутатаў працоўных узначаліў Белякоў. Дзейнічалі 20 сельскіх Саветаў, на якія ляглі цяжар і адказнасць па аднаўленні гаспадаркі, ліквідацыі вынікаў вайны. На адказную работу накіроўваліся былыя партызаны, падпольшчыкі і франтавікі.

Галоўнай задачай новых кіраўнікоў было арганізаваць работу па будаўніцтве і аднаўленні жылля, каб як мага хутчэй перасяліць людзей з зямлянак у добраўпарадкаваныя дамы, а таксама разгарнуць работу медыцынскіх і асветных устаноў.

Аднаўленчыя работы вяліся ў цяжкіх сацыяльна-эканамічных умовах. Ваенныя дзеянні прывялі да вялікіх матэрыяльных і людскіх страт. За гады вайны на тэрыторыі раёна была разрабавана і знішчана амаль уся калгасная маёмасць.

З 10 277 сялянскіх двароў за вайну спалена 4256. Напрыклад, у Раманавіцкім сельсавеце з 733 дамоў непашкоджанымі засталося 100, у Прыбыткаўскім з 434 — толькі 41, у Дзятлавіцкім з 394 засталося 59 хат. Многія людзі засталіся без прытулку. За гады вайны колькасць жыхароў раёна значна зменшылася. Калі ў 1941 г. пражывала 50 774 чалавекі, то пасля вызвалення засталося 37 323. На прымусовыя работы ў Германію было вывезена 6425 чалавек. За гады акупацыі загінула 525 мірных жыхароў. Людзі знішчаліся самымі жудаснымі спосабамі. Так, на тэрыторыі Раманавіцкага сельсавета ў меліярацыйным рове былі знойдзены 37 трупаў, у тым ліку 10 дзяцей, закапаных жывымі. Многія сем'і ў раёне так і не дачакаліся пасля вайны сваіх родных і блізкіх, якія загінулі, змагаючыся з ворагам у дзеючай арміі, у партызанскіх і ў антыфашысцкіх падпольных фарміраваннях.

Увесь цяжар па аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі Гомельскага раёна ў першыя гады лёг на плечы жанчын, старых і падлеткаў. Недахоп

працаздольнага насельніцтва, асабліва мужчын, адчуваўся вельмі востра. Гэта патрабавала ад усіх вялікіх намаганняў. Паводле дырэктыў савецкіх і партыйных органаў, на адраджэнне гаспадаркі з дзяржаўнага бюджэту выдзяляліся доўгатэрміновыя крэдыты, пастаўляліся лес і іншы будаўнічы матэрыял. На пачатак 1947 г. у раёне былі пабудаваны 2702 жылыя дамы і пераселены з зямлянак 2802 сям'і калгаснікаў. Але ў зямлянках яшчэ заставалася 807 сямей.

Непазнавальны, жудасны малюнак адкрыўся перад вачыма тых, хто ўбачыў в. Пакалюбічы ў лістападзе 1943 г. Усе вытворчыя і культурна-бытавыя пабудовы былі разбураны, згарэла 428 жылых дамоў. Ад калгаснай гаспадаркі засталося ўсяго 3 кані, 5 колаў і 4 плугі.

У цяжкім становішчы знаходзіліся многія населеныя пункты і гаспадаркі раёна. Усяго па Гомельскаму раёну было разбурана 685 пабудоў, якія належалі калгасам і саўгасам. Захавалася толькі 35 свірнаў, 21 канюшня, 28 жывёльных двароў. Паводле звестак, на 10 снежня 1943 г. у раёне налічвалася 1040 коней, 1819 галоў буйной рагатай жывёлы, 67 галоў свіней, 36 галоў авечак. Фактычна трэба было пачынаць усё спачатку, аднаўляць калектыўныя гаспадаркі. Справа ў тым, што ў гады вайны на акупіраванай ворагам тэрыторыі калгасы і саўгасы распаліся і адрадзілася індывідуальная сялянская гаспадарка. Пасля вайны мясцовымі ўладамі вялася актыўная работа па аднаўленні калгасаў. Ужо да 10 снежня 1943 г. дзейнічала 50 калгасаў з 52, якія былі ў раёне ў даваенны час. Як і ў гады калектывізацыі адбываўся працэс абагульнення жывёлы. У дакладной запісцы на імя сакратара Гомельскага абкома КП(б)Б Жыжанкова старшыня райвыканкома Белякоў адзначаў: «Пры абагульненні конскага пагалоўя ў частцы калгасаў з-за адсутнасці кармоў абагульненыя коні аддаваліся групам калгаснікаў у 5 — 10 двароў, якія на конях павінны праводзіць калгасную работу, аказваць дапамогу ў перавозцы Чырвонай Арміі і абслугоўваць свае ўласныя мерапрыемствы».

Адбудоўваліся жывёлагадоўчыя фермы, кузні і майстэрні па рамонту сельскагаспадарчага інвентару, тэхнікі і іншыя вытворчыя памяшканні. Хутка былі адрамантаваны млыны ў вёсках Яроміна, Прудок, Клімаўка і іншых населеных пунктах. Была адноўлена дзейнасць Гомельскай і Навабеліцкай машынна-трактарных станцый. Для іх забеспячэння былі падабраны 22 трактарысты пажылога ўзросту. Каб выправіць складанае становішча з кадрамі, пры МТС былі адкрыты курсы на 65 чалавек па падрыхтоўцы трактарыстаў з ліку вясковай моладзі. Гэта дало магчымасць у некаторай ступені падрыхтавацца да веснавых палявых работ 1944 г. З разліку пасяўных плошчаў 1941 г. у калгасах была распачата работа па закладцы семянных і страхавых калгасных фондаў. Па стану на 10.12.1943 г. у гэтыя фонды было засыпана: пшаніцы — 16 696 цэнтнераў, аўса — 13 264, жыта — 4303, бульбы — 163 780 цэнтнераў.

Неадкладныя меры прымаліся з боку мясцовых улад па арганізацыі здачы насельніцтвам сельскагаспадарчых прадуктаў у фонд Чырвонай Арміі. Дапамогу Чырвонай Арміі для канчатковага разгрому ворага жыхары раёна лічылі сваім пачэсным абавязкам. Толькі 8 сельскіх Саветаў у канцы 1943 г. у фонд перадалі больш за 1 тысячу цэнтнераў збожжа, 5024 цэнтнеры бульбы, 326 цэнтнераў мяса. Але астатнія 12 сельсаветаў раёна не мелі магчымасці аказаць дапамогу арміі. Таму даведзены раёну план па нарыхтоўцы збожжа быў выкананы на 51 працэнт, бульбы — на 60, мяса — на 67, малака — на 2,4 працэнты. Справа ў тым, што на працягу некалькіх месяцаў многія вёскі Бабовіцкага,

Міхалкаўскага, Пакалюбіцкага, Чкалаўскага і іншых сельсаветаў знаходзіліся ў паласе фронту, у паласе жорсткіх баёў па вызваленні Гомеля і раёнаў Гомельшчыны ад фашысцкіх захопнікаў. Сабраць і захаваць ураджай 1943 г. многім жыхарам гэтых населеных пунктаў не ўдалося. Так, напрыклад, з-за ваенных дзеянняў не была выкапана бульба на плошчы ў 810 га. Таму многія жыхары раёна аказаліся ў вельмі цяжкім і бядотным становішчы.

Пакуль ішла вайна, насельніцтва раёна прымала ўдзел у праводзімай кампаніі па падпісцы на аблігацыі дзяржаўных ваенных займаў, якія былі выпушчаны ў 1944 і 1945 гадах. Праводзілася таксама работа па зборы сярод насельніцтва ўласных сродкаў на будаўніцтва танкаў і баявых самалётаў. Была арганізавана шэфская дапамога калгасаў ваенным шпіталям, якія знаходзіліся на тэрыторыі Гомельшчыны і мелі патрэбу ў прадуктах харчавання і паліве.

Пасля вызвалення раённыя ўлады займаліся не толькі вырашэннем арганізацыйных і эканамічных пытанняў, але і шмат увагі ўдзялялі сацыяльным праблемам. Сярод іх асабліва важнае значэнне надавалася арганізацыі медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, у тым яно мела вельмі вострую патрэбу. Ужо да сярэдзіны снежня 1943 г. у раёне працавалі 10 амбулаторый і некалькі фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Паступова аднаўлялі сваю работу ўстановы культуры і народнай адукацыі. Але вельмі востра адчуваўся недахоп спецыялістаў, асабліва настаўнікаў. У першыя часы адсутнічалі школьныя падручнікі, сшыткі, пісьмовыя прылады, не хапала школьных памяшканняў. За гады вайны былі спалены і разбураны 11 школ. Да канца 1943 г. заняткі былі адноўлены ў 41 школе, дзе навучалася 1400 вучняў. Спачатку многія школы размяшчаліся ў памяшканях, якія не адпавядалі санітарным нормам, у той час у школьных будынках знаходзіліся штабы і інтэрнаты вайсковых часцей Чырвонай Арміі, ваенныя шпіталі. Паводле чаго старшыня Гомельскага райвыканкома дакладваў у абком: «Маюцца факты, калі в/часці не лічацца з патрэбамі мясцовага насельніцтва і мясцовай уладай».

Шмат клопату праяўлялася аб аднаўленні работы школ раёна. Амаль усе дзеці школьнага ўзросту ў гады акупацыі не вучыліся. Таму трэба было правесці ўлік дзяцей, якія пражывалі на тэрыторыі раёна, арганізаваць патранаж над дзецьмі-сіротамі. З 8530 дзяцей школьнага ўзросту ў 1945 г. навучаліся 7903 вучні. Працавалі сярэдняя, 14 няпоўных сярэдніх, 48 пачатковых школ. Было ўсяго 326 настаўнікаў, значная іх частка не мела адпаведнай педагагічнай адукацыі. Гэтая акалічнасць, а таксама недахоп школьных памяшканняў, адсутнасць лабараторый і кабінетаў, неабходных наглядных дапаможнікаў і падручнікаў, цяжкія ўмовы жыцця вучняў адмоўна адбіліся на іх вучобе і ведах. Многія з навучэнцаў не маглі адолець школьную праграму. Напрыклад, у 1948 г. на паўторны год навучання пакінута каля 1000 вучняў, быў адкладзены да восені перавод у наступны клас яшчэ 671 школьніка.

Першапачатковыя меры па ліквідацыі вынікаў акупацыі былі сфармуляваны ў пастанове «Аб бліжэйшых задачах Саўнаркома БССР і КП(б) Беларусі» ад 1 студзеня 1944 г. Для патрэб аднаўлення і развіцця гаспадаркі выдаткоўваліся значныя грашовыя сродкі. З розных рэгіёнаў СССР на Гомельшчыну завозілася прамысловае абсталяванне, трактары, аўтамабілі, будаўнічы матэрыял, буйная рагатая жывёла, коні.

Прымаліся захады па забеспячэнні патрэб гаспадарак і насельніцтва раёна ўласнымі будаўнічымі матэрыяламі. Ужо ў 1944 г. пачалі выпускаць пра-

дукцыю цагельныя заводы, шклозавод у в. Касцюкоўка.

Цяжка далася ў 1944 г. працаўнікам вёскі першая пасяўная. Частку зямель увогуле немагчыма было апрацоўваць, асабліва там, дзе праходзілі жорсткія баі. Многія калгасы не мелі ўсяго неабходнага і магчымасцей для правядзення першага веснавога севу. Працавалі ў асноўным жанчыны, не хапала тэхнікі і коней. Таму апрацоўваць зямлю даводзілася ўручную.

У 1944 г. многія гаспадаркі раёна адгукнуліся на заклік працаўнікоў з калгаса «КІМ» Хойніцкага раёна разгарнуць рэспубліканскае сацыялістычнае спаборніцтва за паспяховае правядзенне сельскагаспадарчых работ і атрыманне шырокіх ураджаяў. Па выніках гэтага спаборніцтва ў ліку пераможцаў быў і калгас «Першае мая». У 1945 г. за поспехі ў жывёлагадоўлі пераможцам рэспубліканскага спаборніцтва быў адзначаны калгас «Чырвоны хлебароб», якому ўручылі пераходны Чырвоны Сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Аднак большасць калгасаў у першыя пасляваенныя гады атрымалі даволі нізкія ўраджаі. У параўнанні з даваеннымі гадамі пасяўныя плошчы значна былі скарочаны. Не хапала сельскагаспадарчай тэхнікі. У 1946 г. у раёне было ўсяго 23 трактары. Як і да вайны, усе пытанні палітычнага і гаспадарчага жыцця былі сканцэнтраваны ў руках партыйных органаў, якія кіравалі як Саветамі, так і гаспадарчымі структурамі. Таму з першых дзён вызвалення пачалося фарміраванне партыйнага і дзяржаўнага апарату раёна. На кіруючыя пасады падбіраліся камуністы, у асноўным з ліку былых партызан і дэмабілізаваных. Падрыхтоўка партыйных, савецкіх і камсамольскіх работнікаў пачала ажыццяўляцца ў школе і на трохмесячных курсах, якія дзейнічалі ў Гомелі. У першыя пасляваенныя гады паскорыўся рост партыйных радоў, што дало магчымасць стварыць першічныя партарганізацыі не толькі тэрытарыяльныя, але і ў калгасах, саўгасах, ва ўстановах раёна. У 1948 г. іх было 53, у тым ліку ў калгасах — 23, саўгасах — 3, МТС — 2, ва ўстановах раёна — 17. Яны аб'ядноўвалі 400 членаў і 123 кандыдатаў у члены КП(б). Партарганізацыі ўсклалі на сябе функцыі падбору і расстаноўкі кадраў, кантролю за дзейнасцю Саветаў і грамадскіх арганізацый. Важнае значэнне ў грамадска-палітычным жыцці мелі выбары ў Вярхоўныя Саветы СССР (1946) і БССР (1947), мясцовыя Саветы (1948, 1950). Аднак вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты, роля і дзейнасць саміх Саветаў у большасці былі фармальнымі, тады існаваў сталінскі рэжым, які дамагаўся ад нас паслухмянасці і ўхвалення сваёй палітыкі.

Аднаўлялі сваю дзейнасць і прафсаюзныя арганізацыі. У выніку праведзенай агітацыйнай работы павялічвалася колькасць членаў прафсаюза. Гэта дало магчымасць стварыць у 1950 г. два новыя райкомы прафсаюзаў — работнікаў аховы і здароўя і палітасветустаноў. Усяго ў гэты час налічвалася 2392 члены прафсаюза, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і саўгасах раёна.

Ва ўмовах пасляваеннага жыцця спецыфічнай была і роля камсамольскіх арганізацый, дзейнасць якіх прыпадала ў асноўным на ўдзел юнакоў і дзяўчат у аднаўленні гаспадаркі раёна. Ужо ў 1943 г. былі створаны 38 камсамольскіх арганізацый у калгасах, 2 у МТС і 2 у саўгасах. З 411 зарэгістраваных камсамольцаў бюро райкома пасля разгляду персанальных спраў аднавіла ў радах камсамола 220 чалавек. Былі прыняты ў члены ВЛКСМ 165 чалавек. Райком КПБ трымаў пад пастаянным кантролем заказы па ўмацаванні камсамольскіх арганізацый, неаднара-

зова на пленумах і бюро ўказваў на арганізацыйную слабасць камсамольскіх арганізацый, якія нярэдка былі на грані развалу і недастаткова ўдзялялі ўвагу ідэйна-палітычнаму выхаванню моладзі. Райком камсамола больш увагі ўдзяляў прыёму новых членаў ВЛКСМ. Толькі за 1950 г. 805 юнакоў і дзяўчат сталі камсамольцамі. Раённая арганізацыя налічвала ў гэты час ужо больш за 2300 членаў ВЛКСМ, з іх толькі 194 працавалі непасрэдна ў калгасах.

Дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі працавалі пад кантролем партапарату і дзейнічалі ў інтарэсах камандна-адміністрацыйнай сістэмы. А працаўнікі раёна часта за сімвалічную плату, самаддана, не шкадуючы сіл, аднаўлялі разбураную вайной гаспадарку.

У 1950—1995 гг. у выніку добрай працы вяскоўцаў павялічылася развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, вядучай галіной стала жывёлагадоўля. Па ўказанні партыйных органаў у раёне разгарнулася актыўная работа па канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Асноўным у гэтым напрамку стала стварэнне буйных жывёлагадоўчых ферм. Гэта, у сваю чаргу, патрабавала вялікай увагі развіццю трывалай кармавой базы. Таму ўзнікла неабходнасць у пераглядзе структуры пасяўных плошчаў. У выніку за 1953—1958 гг. пасяўныя плошчы пад кармавымі культурамі павялічыліся ў 1,8 раза і складалі трэцюю частку ўсіх пасяўных плошчаў. У той жа час скараціліся пасевы збожжавых культур. У раёне сталі больш увагі звяртаць на пашырэнні пасеваў тэхнічных культур, у тым ліку бульбы. Значна павысіліся ўраджайнасць і валавы збор, што спрыяла развіццю кармавой базы і росту жывёлагадоўлі. Пагалоўе кароў у грамадскім статку павялічылася за 1953—1957 гг. на 41%, свіней — на 81%, птушкі — на 25%. Разам з тым ішло на спад развіццё авечкагадоўлі. Колькасць авечак у калгасах раёна зменшылася з 7 тысяч у 1955 г. да 4,3 тысячы ў 1962 г. Пленум райкома КПБ, разглядаючы стан развіцця авечкагадоўлі, канстатаваў: «Нармальных умоў утрымання і кармлення авец не ствараецца. Працягвае зніжацца пагалоўе. Не ствараюцца авечкагадоўчыя фермы».

У цэлым у 1950-я гады становішча спраў у сельскай гаспадарцы раёна некалькі палепшылася. Павялічыліся грашовыя даходы калгасаў, выраслі іх вытворчыя фонды, умацавалася матэрыяльная база. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічала тое, што дзяржава спісала запазычанасць з калгасаў і нядоімкі з калгаснікаў па сельскагаспадарчаму падатку, павялічыла капіталаўкладанні на патрэбы сяла. Немалую ролю адыграла і працоўная дысцыпліна. Кіраўніцтва райкома КПБ вельмі строга сачыла за выпрацоўкай калгаснікамі вызначанага мінімуму працадзён. У пачатку 1950-х гадоў каля 20% калгаснікаў не выпрацоўвалі ўстаноўленага мінімуму.

Нельга лічыць, што пятая частка працаздольнага насельніцтва раёна была прагульшчыкамі ці гультаямі. Асноўная прычына — цяжкая ручная праца, якая ў той час пераважала ў гаспадарках. Не ўсе гаспадаркі маглі выкарыстоўваць электраэнергію і механізацыю ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Аднак многія калгаснікі працавалі самаддана, з натхненнем і верай у лепшую будучыню. Для таго, каб дасягнуць даваеннага ўзроўню па ўраджайнасці збожжавых і бульбы, працаўнікам раёна спатрэбілася 14 пасляваенных гадоў. Пагалоўе жывёлы і вытворчасць малака дасягнулі даваеннага ўзроўню за 9, а вытворчасць мяса за 12 гадоў. Па-ранейшаму калгасы адчувалі вострыя недахоп сельскагаспадарчага інвентару, насення, угнаенняў, а таксама працаздольнага насельніцтва, што перашкаджала хутчэйшаму аднаўленню вытворчасці. Аплата працаднямі

не стымулявала добрай працы. Яны фактычна ператвараліся ў форму кантролю працоўнай павіннасці вяскоўцаў.

У 1950—1952 гг. праведзена ўзбуйненне калгасаў. У Гомельскім раёне замест 57 калгасаў было арганізавана 17 буйных гаспадарак. Аднак сялянства нярэдка не было яшчэ псіхалагічна падрыхтавана да гэтай кампаніі, якую ажыццяўлялі партыйныя органы ўсё ж тымі адміністрацыйнымі метадамі. Узбуйненне дробных калгасаў было праведзена без адпаведнай падрыхтоўкі, паспешна. Гэта, у сваю чаргу, не садзейнічала развіццю калгаснай дэмакратыі. Якраз гэта пацвярджала, што дэмакратычныя прынцыпы кіравання калгасамі толькі дэкларавaліся і на практыцы не ажыццяўляліся. У некаторых гаспадарках раёна было вырашана скараціць памеры прысядзібных участкаў калгаснікаў, што таксама не спрыяла ўмацаванню сельскагаспадарчай вытворчасці. Аб памылковасці прынятых рашэнняў сведчыў і той факт, што ў хуткім часе (у 1954) райком вырашыў з двух узбуйненых калгасаў «Камунар» і імя Леніна стварыць 4 калгасы.

У маі 1957 г. у склад Гомельскага раёна быў перададзены Студзёнагуцкі сельсавет з былога Церахоўскага раёна з двума калгасамі, на базе якіх быў створаны саўгас «Сацыялізм». У маі 1962 г. Гомельскі раён быў узбуйнены за кошт чатырох сельскіх і аднаго пасялковага Савета былога Уваравіцкага раёна. У склад раёна ўвайшлі 6 калгасаў і торфапрадпрыемства «Бальшавік». Акрамя таго, у студзені 1964 г. Гомельскаму раёну былі перададзены Шарпілаўскі і Рудня-Марымонаўскі сельсаветы і быў створаны саўгас «Міжрэчча». У 1965 г. раёну была перададзена тэрыторыя 4 сельскіх саветаў з 4 калгасамі і саўгасам «Расвет» былога Церахоўскага раёна.

Менавіта ў сярэдзіне 1960-х гадоў і завяршылася фарміраванне Гомельскага раёна, які аб'ядноўваў 25 сельскіх і адзін пасялковы Савет, 18 калгасаў, 9 саўгасаў, 3 спецыялізаваныя гаспадаркі, у тым ліку птушкафабрыку і конезавод № 59. Тэрыторыя раёна складала амаль 2000 квадратных кіламетраў.

Непасрэдная блізкасць раёна да г. Гомеля паўплывала на развіццё прамысловай вытворчасці. Яе аснова была закладзена яшчэ ў гады першых савецкіх пяцігодак. Тэрыторыя раёна была багатая на сыравінныя рэсурсы: гліну, лес, торф і інш. Таму вялікая ўвага надавалася развіццю вытворчасці па перапрацоўцы мясцовай сыравіны. У першыя пасляваенныя гады кіраўніцтва раёна садзейнічала адраджэнню торфаздабываючай прамысловасці як асноўнай паліўнай базы. Аднавілі сваю работу торфазавод і торфаарцелі. Аднак прымяненне прымітыўнай тэхнікі здабычы і скарачэнне запасаў торфу прымусілі ў 1951 г. прыпыніць дзейнасць арцелі ў Пакалюбічах. У 1954 г. торфамасіў у



Гомельскі шклозавод імя М.В.Ламаносава. (Здымак 1970-х гадоў). Аднавіў сваю работу ў 1943—1945 гг. у г.п. Касцюкоўка Гомельскага раёна (цяпер у межах г. Гомеля).

Давыдаўцы быў перададзены торфаарцелі «Гразкі», дзе здабыча торфу ажыццяўлялася з прымяненнем механічных рэзчыкаў і торфаўкладчыкаў. Значна павялічылася здабыча торфу ў сувязі з перадачай у 1962 г. Гомельскаму раёну торфапрадпрыемства «Бальшавік».

Адразу ж пасля вызвалення раёна ад фашыстаў узнавілі сваю дзейнасць цагельныя заводы. У 1945 г. на базе Асавецкага цагельнага завода быў створаны райпрамкамбінат. Але і ён не мог у поўнай меры забяспечыць патрэбы ў цэгле ў час аднаўленчых работ. Таму было прынята рашэнне аб пачатку будаўніцтва Лапацінскага цагельнага завода, што ў значнай ступені магло забяспечыць патрэбы гаспадарак, а таксама насельніцтва раёна і Гомеля ў будаўнічых матэрыялах. У 1950—1960 гг. становішча з выпускам цэглы ў раёне значна палепшылася, пачалося будаўніцтва школ, бальніц, клубаў, жылля. Толькі ў другой палове 1960-х гадоў на сродкі гаспадарак было ўзведзена 100 дамоў на 275 кватэр, а на сродкі насельніцтва і з дапамогай калгасаў пабудавана 2189 індывідуальных дамоў. Маштабы будаўніцтва на вёсцы з кожным годам пашыраліся. Многія населеныя пункты ў раёне значна змянілі сваё аблічча. Гэтаму спрыяла і сацыяльна-культурнае будаўніцтва. Было ўзведзена 20 школ, 24 клубы і Дамы культуры, 2 бальніцы, 10 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 30 магазінаў, 5 камбінатаў бытавога абслугоўвання, 12 лазняў і шмат іншых пабудоў грамадскага і бытавога прызначэння.

Пашырылася на вёсцы і сфера паслуг. У 1962 г. на тэрыторыі раёна дзейнічала ўсяго 12 дробных швейных майстэрняў. За гады сямігодкі было адкрыта 5 сталовых, чайная, 3 цырульні і 7 майстэрань па пашыву і рамонту адзення і абутку. У 1961 г. пачаў працаваць камбінат бытавога абслугоўвання ў Яроміна. Яго вытворчыя магутнасці пастаянна ўзрасталі, і ў пачатку 1971 г. ён аб'ядноўваў 43 майстэрні, 13 цырульняў, 3 фотаатэлье, майстэрню па рамонту гадзіннікаў. Яны аказвалі насельніцтву звыш 150 відаў бытавых паслуг. Былі пабудаваны тыпавыя дамы быту ў вёсках Пакалюбічы, Прыбыткі, Бабовічы, Урыцкае, Целяшы і ў іншых вёсках раёна. За гады 9-й пяцігодкі (1971—1975) аб'ём паслуг, якія аказваліся насельніцтву, узрос больш як на 75 працэнтаў.

У наступныя гады з боку мясцовых Саветаў удзялялася шмат увагі развіццю сферы паслуг на вёсцы. Асноўны ўпор яны рабілі на вырашэнне такіх сацыяльных пытанняў, як будаўніцтва жылля, дарог, аб'ектаў культурнага і сацыяльнага прызначэння, стварэнне нармальных умоў для працы і вытворчага быту, паляпшэнне грамадскага харчавання, гандлёвага і бытавога абслугоўвання насельніцтва. Гэтаму спрыяла таксама рэалізацыя прынятай у раёне праграмы «Клопат» па далейшаму паляпшэнню абслугоўвання ветэранаў вайны і працы, адзінокіх людзей. У канцы 1980-х гадоў было 35 комплексных прыёмных пунктаў.

У склад камбіната бытавога абслугоўвання ўваходзілі ткацкі, галантарэйны, гарбарны і іншыя цэхі. Гадавы аб'ём бытавых паслуг складаў каля 2,5 мільёна рублёў, а тавараабароту — больш за 53 мільёны рублёў. Да паслуг насельніцтва ў 1992 г. аднасіліся 192 прадпрыемствы гандлю, 68 прадпрыемстваў грамадскага харчавання. З кожным годам павялічваўся продаж насельніцтву легкавых аўтамабіляў, матацыклаў, халадзільнікаў і іншай бытавой тэхнікі. Паспяхова ажыццяўлялася газіфікацыя населеных пунктаў, будаўніцтва мастоў і дарог. Цяпер да ўсіх цэнтральных сядзіб гаспадарак і большасці вёсак раёна ёсць дарогі з палепшаным пакрыццём.

Пашырэнне маштабаў капітальнага

будаўніцтва патрабавала стварэння ў раёне будаўнічых арганізацый. У 1959 г. была арганізавана міжкалгасная будаўнічая арганізацыя (Міжкалгасбуд). З кожным годам узровень індустрыялізацыі і механізацыі будаўніцтва павышаўся. За 1959 — 1970 гг. сіламі Міжкалгасбуда было пабудавана і здадзена ў эксплуатацыю 204 тыпавых вытворчых аб'ектаў, выканана будаўніча-мантажных работ на суму больш за 6 мільёнаў рублёў. У 1990 г. у 6 будаўніча-мантажных арганізацыях раёна працавала 1278 чалавек.

Важнае значэнне для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы калгасаў і саўгасаў мела стварэнне на базе РТС раённага і міжраённага аб'яднанняў «Сельгастэхніка». У іх задачу ўваходзіла аказанне гаспадаркам раёна тэхнічнай дапамогі, ажыццяўленне кантролю за станам тэхнікі, яе выкарыстаннем і рамонтам. Эфектыўна працаваў усе гэтыя гады і Гомельскі мотарамонтны завод (створаны ў 1566 г.), які рамантаваў дызельныя трактарныя рухавікі.

Будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў і жылля для гараджан патрабавалі новых пляцовак для іх узвядзення. Так, у гады сямігодкі на землях Гомельскага раёна былі пабудаваны такія буйныя прадпрыемствы, як «Цэнтраліт», Гомельскі суперфасфатны завод (цяпер хімічны завод). Пазней пабудавана Гомельская ТЭЦ-2. Горад «паглынуў» частку вёсак, якія яшчэ нядаўна былі прыгарадным і знаходзіліся ў складзе і ў межах раёна. Сярод іх вёскі Прудок, Валатава, Мільча, Давыдаўка і іншыя. Іх назвы засталіся толькі ў назвах жылых мікрараёнаў або вуліц Гомеля.

Больш як трэцюю частку тэрыторыі раёна складаюць лясныя масівы. У захаванні лясных угоддзяў важная роля належыць такім прадпрыемствам, як Ленінскі доследны лясгас і Гомельскае вытворчае лесагаспадарчае аб'яднанне. У пасляваенныя гады была праведзена вялікая работа па аднаўленні лясных масіваў, знішчаных у час фашысцкай акупацыі. Страты, нанесеныя лясам Гомельскага раёна, склалі больш за 6,5 тысяч гектараў. Аднак у выніку намаганняў і самаадданай працы лесаводаў толькі за 25 пасляваенных гадоў былі засеяны і засаджаны лесам тэрыторыі плошчай у 12 тысяч гектараў. За гэты ж перыяд было нарыхтавана амаль 1,5 мільёна метраў^3 драўніны як для патрэб народнай гаспадаркі, так і для насельніцтва. Асноўныя працаёмкія працэсы па падрыхтоўцы глебы, пасадцы лесу і яго



У рамонтных майстэрнях саўгаса «Брылёва».

нарыхтоўцы былі механізаваны. Лясгасы арганізавалі цэхі па выпуску тавараў шырокага спажывання. Доследны лясгас з'яўляецца таксама своеасаблівай лабараторыяй Інстытута лесу Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі і адначасова доследна-паказальнай лесагаспадарчай вытворчасцю рэспублікі.

У 1960-я гады пачалося маштабнае асушэнне балот. Для правядзення меліярацыі зямель стваралася магутная вытворчая база, механізаваныя перасоўныя меліярацыйныя калоны (МПМК). Магутная меліярацыйная тэхніка абудзіла наваколлі, распачаліся шырокамаштабныя работы па асваенні забалочаных тэрыторый, хмызнякоў і ператварэнні іх у прыгодныя для земляробства землі. Да канца 1980-х годоў у раёне было асушана больш за 33,5 тысяч гектараў зямель, пабудавана арашальных сістэм на плошчы ў 4,6 тысяч гектараў. Праведзеныя меліярацыйныя работы дабратворна ўплывалі на ўздым сельскагаспадарчай вытворчасці. Калі ў пачатку 1950-х гадоў ураджайнасць збожжавых у раёне складала каля 14 цэнтнераў з гектара, то ў 1988г. яна дасягнула 30,2 цэнтнера, бульбы — 150 і 211 цэнтнераў. У 1992 г. з гектара было атрымана 34,6 цэнтнера збожжавых, а ў калгасах «Бабовіцкі», імя XXII з'езда КПСС, «Лапацінскі» ўраджайнасць дасягнула 40—45 цэнтнераў.

Работа па стварэнні культурных паш і сенажацяў станоўча паўплывала на павышэнне прадукцыйнасці жывёлагадоўлі. У 1989 г. надой на адну карову склаў 3671 кілаграм, у пачатку 1950-х гадоў — 1400 кілаграм. Разам з тым работа, якая праводзілася па меліярацыі зямель, мела сур'ёзныя недахопы. Створаныя меліярацыйныя сістэмы не заўсёды прадугледжвалі двухбаковае воднае рэгуляванне. Дапускаліся таксама адступленні ад праектаў, што прывяло да экалагічных парушэнняў. У засушлівыя гады перасыхалі тарфянікі, падаў узровень вады ў рэках і калодзежах вяскоўцаў, значна абвастрыліся экалагічныя праблемы. Адмоўна сказалася на экалогіі непрадуманасць, нярэдка некампетэнтнасць і ў ажыццяўленні хімізацыі сельскай гаспадаркі. Імкненне мець высокую ўраджайнасць не заўсёды спалучалася з запатрабаваннямі па ахове навакольнага асяроддзя. Вытворчая дзейнасць Гомельскага хімічнага завода таксама стварыла неспрыяльныя ўмовы пражывання людзей, прывяла да росту захворванняў, гібелі акружаючага асяроддзя. 13 млн. тон ядавітых фосфагідаў — адыходаў вытворчасці завода забруджваюць палі, сады і лугі, атручваюць ваду.

Саўгас-камбінат «Сож».

З пераходам да спецыялізацыі і канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці некалькі ажывілася дзейнасць калгасаў і саўгасаў раёна. Непасрэдная іх блізкасць да Гомеля вызначыла задачу па забеспячэнні гараджан садавінай і гароднінай, прадукцыяй жывёлагадоўлі. Важную ролю ў вырашэнні гэтай задачы адыгрывалі спецыялізаваныя гаспадаркі. У снежні 1958 г. на базе двух калгасаў «Камсамол Гомельшчыны» і імя Чапаева быў створаны саўгас «Бярозкі», які спецыялізуецца па вытворчасці гародніны і прадукцыі жывёлагадоўлі. На такой жа вытворчасці спецыялізуецца і саўгас «Брылёва». Гэтыя гаспадаркі не толькі пастаўляюць у гандлёвую сетку свежую садавіну і гародніну, але і перапрацоўваюць яе ва ўласных кансервавых цэхах.

Створана ў 1993 г. на базе Ленінскага доследнага лясгаса Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі (з 1993 г. Інстытут лесу НАН Беларусі). Размешчана ў паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі на тэрыторыі Гомельскага (95,3% плошчы) і часткова Добрушскага (4,7%) адміністрацыйных раёнаў у пас. Каранёўка Гомельскага раёна. Займае плошчу 12,5 тысячы га, у яе склад уваходзяць два лясніцтвы: Каранёўскае і Чонкаўскае. Лясы эксперыментальнай базы адносяцца да Палеска-Прыдняпроўскай геабатанічнай акругі падзоны шыракаліста-хваёвых лясоў. Да 1936 г. лясы ўваходзілі ў склад Ленінскага лесаўчастка Гомельскага леспрамгаса, у 1936 г. арганізавана Ленінскае лясніцтва пры Гомельскім лясгасе. З 1945 г. Ленінскі доследны лясгас пры БелНДІ лясной гаспадаркі, з 1953 г. па 1959 г. — Ленінскае лясніцтва Гомельскага лясгаса, з 1967 г. Ленінская эксперыментальная база БелНДІ лясной гаспадаркі.

Тэрыторыя масіву да нацыяналізацыі дзялілася на дачы Каранёўскую, Каранёўска-фальварковую, Зябраўскую, Шчакатоўскую, Горкі і ўяўляла сабой участкі былых прыватнаўласніцкіх лясоў, у якіх вяліся высечкі спелых і перастойных насаджэнняў.

У 1864 г. была ўладкавана Каранёўская дача са штогадовай лесасекай. У 1870 г. — Зябраўская, у 1904—1905 гг. усе дачы ўладкаваны на манер лесагадоўлі ў Германіі. Да 1914 г. ствараліся штучным шляхам насаджэнні ў Каранёўскай і Шчакатоўскай дачах, якія і цяпер знаходзяцца ў добрым стане.

У праекце арганізацыі лясной гаспадаркі Каранёўскай дачы 1922 г., які захаваўся да гэтага часу, адзначана, што з моманту нацыяналізацыі лясоў вядзенне гаспадаркі пагоршылася: пры адвядзенні лесасек не выконвалася форма, іх напрамак; лесасекі былі захламлены, што садзейнічала зніжэнню натуральнага аднаўлення і стварала неспрыяльныя пажарныя ўмовы. З 1924 г. у насаджэннях праводзіліся высечкі догляду, падсочка насаджэнняў, ствараліся лясныя культуры, г. зн. вядзенне лясной гаспадаркі паступова пачало паляпшацца, з'явіўся дзяржаўны клопат за лес, пра што сведчаць запісы ў матэрыялах лесаўладкавання.

Аднак у лесе пераважала ручная праца. Асноўнымі прыладамі на лесасецы былі двухручная піла, сякера. Конь выкарыстоўваўся як транспартны сродак на тралёўцы і вывазцы драўніны. Асноўнай задачай лясной аховы таго часу было забеспячэнне драўнінай мясцовага насельніцтва. Было б неаб'ектыўна не сказаць добрага слова пра тых, хто жыў і працаваў тут. Адзінокая старожка на лясной паляне, газавая лямпа, натуральная гаспадарка, якая, як правіла, не забяспечвала вялікую сям'ю лесніка, — вось тыповы быт даглядчыкаў лесу таго часу. Жыць і працаваць у гэтых умовах згаджаліся сапраўды энтузіясты, адданыя лесу. Гэта Р.Я.Старавойтаў, І.С.Федарцоў, Е.С.Салодкі, Н.Е.Салодкі, І.Р.Каралёў, В.П.Рудаў, І.Я.Тышчук.

У 1898 г. Каранёўскую лясную дачу аглядаў прафесар лясной таксацыі Пецярбургскага ляснога інстытута Пётр Мікалаевіч Вярэха (1838—1917), пасля чаго былі ўстаноўлены памеры штогадовых высечак па лясной гаспадарцы, якой і прытрымліваліся да чарговага лесаўладкавання.

Заснаванне Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі ў

1930 г. з'явілася важным этапам арганізацыі лясной доследнай справы на тэрыторыі Каранёўскай і Шчакатоўскай дач. У 1930-я гады праводзіліся даследаванні па водаахоўнай ролі лесу, распрацоўцы лесаводчых, тэхналагічных асноў арганізацыі і вядзення лясной гаспадаркі, натуральным аднаўленні высечак, распрацоўцы агратэхнікі вырошчвання пасадачнага матэрыялу і лясных культур, тэхналогіі здабычы жывіцы і хімічнай перапрацоўцы лесу. У гэты перыяд працавалі вучоныя: Ф.Т.Касцюковіч, прафесар І.А.Яхантаў, Ф.П.Маісеенка (яго імем названа вуліца ў Гомелі), І.Д.Юркевіч, А.І.Саўчанка, В.П.Сініцкі, прафесар П.П.Рагавой і іншыя. Вынікі іх даследаванняў увайшлі ў настаўленні, інструкцыі, рэкамендацыі і іншыя дакументы, па якіх вялася і вядзецца лясная гаспадарка ў рэспубліцы.

У 1939 г. афіцыйна адкрыты Ленінскі апорны пункт у пас. Каранёўка, дзе навуковая праца была накіравана на павышэнне прадукцыйнасці насаджэнняў, маладняко ў натуральнага і штучнага паходжання, на лесаахоўныя работы. На тэрыторыі апорнага пункта былі адкрыты метэаралагічная станцыя, сетка грунтовых калодзежаў, ствараліся доследныя аб'екты, звязаныя з профілем работы інстытута. Вялікая Айчынная вайна 1941—1945 гг. спыніла навуковыя распрацоўкі. Пасля арганізацыі Ленінскага доследнага лясгаса ў 1945 г. былі працягнуты навукова-даследчыя работы, накіраваныя на аднаўленне пацярпеўшых у вайну лясоў і павелічэнне іх прадукцыйнасці. На тэрыторыі лясного масіву ў пасляваенныя гады праведзены даследаванні па ацэнцы пашкоджаных лясоў, вывучэнні водаахоўнай ролі лесу, распрацоўцы тыпаў лясных культур для розных умоў. Акрамя таго, тут распрацавана тэхналогія вырошчвання пасадачнага матэрыялу ў гадавальніках і цяпліцах, праведзены даследаванні па вырошчванні хуткарослых гаспадарчых каштоўных пародаў.

У 1948 г. з удзелам І.Д.Юркевіча, А.І.Саўчанкі, А.Ф.Кучынскага ў кв. 166 (былы 149) на плошчы 28 га быў закладзены дэндрарый, у якім створана калекцыя інтрадуцыраваных і мясцовых пародаў дрэў і хмызнякоў; на цяперашні час захавалася каля 100 відаў. У дэндрарыі вывучалася магчымасць росту новых недастаткова праверaных ва ўмовах рэспублікі пародаў, збіралася насенне дрэвавых і хмызняковых пародаў з розных экалагічных умоў для высеву іх у гадавальніку і для далейшага ўкаранення ў лясныя культуры экзотаў. У 1982 г. быў састаўлены праект рэканструкцыі дэндрарыя, у 1984—1987 гг. прыняты меры па рэканструкцыі асобных участкаў дэндрарыя, фарміраванні новых калекцый па сістэматычным прынцыпе, расшырэнні існуючых і стварэнні новых экспазіцый. Аднак, на жаль, праца спынена.

Асаблівае развіццё атрымалі навукова-даследчыя і доследныя работы ў 1960-я гады. Пад кіраўніцтвам акадэміка Ф.М.Харытановіча закладзена мноства доследных аб'ектаў па тэхналогіі стварэння лясных культур ва ўрочышчы Зябраўка: праведзены выпрабаванні і ўкаранёны ў вытворчасць сканструяваныя вядучай лабараторыяй механізацыі ў сістэме Дзяржкамлесу СССР лесапасадачныя машыны ЛМД-1, МЛ-1, тралёвачныя прыстасаванні ТРАЛ-40, ТПР-1, рыхліцель лясны РЛН-50, плуг ПБН-60, плуг-сеялка ПСШ-35, культыватар-рыхліцель ПКРШ-1,5; адпрацавана тэхналогія высечак догляду пад кіраўніцтвам А.М.Кажэўнікава, выкананы комплекс даследаванняў па лясной селекцыі пад кіраўніцтвам кандыдатаў сельскагаспадарчых навук А.І.Саўчанкі, Я.Р.Арленкі, З.С.Паджаравай, створаны селекцыйныя аб'екты доўгатэрміновых назіранняў.

Найбольшую ўдзельную вагу складаюць доследныя аб'екты па лясной селекцыі, недраўнянай прадукцыі, лесазнаўстве і лесаводстве. Гонарам калектыву з'яўляецца лесанасенная база, якая дазволіла з 1975 г. ствараць насаджэнні элітным пасадачным матэрыялам. Упершыню на тэрыторыі базы пад кіраўніцтвам У.Е.Ваўчкова распрацавана тэхналогія плантацыйнага вырошчвання журавіны буйнаплоднай, брусніцы, буякоў, методыка стварэння якіх выкарыстана ў рэспубліцы і за яе межамі ў прамысловых маштабах. На аснове даследаванняў В.І.Фаміной упершыню ў рэспубліцы створана і працуе лабараторыя па вытворчасці інакуляцыі і адпрацавана тэхналогія вырошчвання прыдатных да ежы грыбоў.

Усяго на тэрыторыі Каранёўскай эксперыментальнай базы закладзена 150 дос-

ледных і доследна-вытворчых участкаў, некаторыя з іх з'яўляюцца аб'ектамі назіранняў многія дзесяцігоддзі. Лясгас і яго супрацоўнікі з'яўляліся неаднаразовымі ўдзельнікамі ВДНГ СССР.

У 1983 г. рэканструяваны лясны гадавальнік плошчай 9,7 га, дзе створаны ўмовы для поўнай механізацыі ўсіх працэсаў на аснове вывучаемай агратэхнікі вырошчвання пасадачнага матэрыялу; устаноўлена сістэма паліву. Цяпер у насаджэннях эксперыментальнай базы працягваюцца работы па тэхналогіі вырошчвання пасадачнага матэрыялу на селекцыйнай аснове, стварэнні плантацый 2-га парадку, тэхналогіі правядзення высечак, абнаўленні лесу і іншыя работы, звязаныя з павелічэннем устойлівасці і прадукцыйнасці лясоў, вывучаецца ўплыў антрапагенных фактараў на стан лясных экасістэм. Каранёўская эксперыментальная база аднесена да 1-й групы лясоў, служыць месцам адпачынку насельніцтва абласнога цэнтра і прылягаючых населеных пунктаў.

Сасновыя лесанасаджэнні займаюць 54,6% плошчы, дубовыя — 19,4%, бярозавыя — 11,6%, чорнаальховыя — 10,1%, асінавыя — 3,2%, асянёвыя — 0,6%, яловыя —0,2%, грабавыя — 0,2%, таполевыя —0,1%, маладнякі — 22%, сярэднеўзроставыя — 59%, прыспяваючыя — 12%, спелыя і перастойныя — 7%. Агульны запас дрэвастою 2,78 млн.м^3, сярэдні ўзрост — 63 гады, банітэт — 1,2, паўната —0,73, агульны сярэдні прырост — 48,1 тыс. м^3.

Лесапаркавая зона складае 7,5 тыс. га, або 60,2% агульнай плошчы. Спецыфіка вядзення гаспадаркі заключаецца ў асобных прыёмах фарміравання насаджэнняў, упарадкаванні тэрыторыі, што поўнасцю супадае з яе арыентацыяй з 1963 г. на комплекснае выкарыстанне рэсурсаў: лясная гаспадарка, навукова-даследчыя работы, дрэваапрацоўка і пабочныя карыстанні.

У насаджэннях вядзецца інтэнсіўная гаспадарчая дзейнасць па аднаўленні лясоў, павышэнні іх прадукцыйнасці, узнаўленні ахоўных функцый. Аб'ём лесааднаўленчых высечак, які праводзіцца у лясгасе, адпавядае разліковай лесасецы (сярэднегадавы аб'ём складае 5,5 тыс.м^3).

Найважнейшым лесагаспадарчым мерапрыемствам, накіраваным на вырошчванне гаспадарча-каштоўных насаджэнняў, з'яўляюцца высечкі догляду, якія заключаюцца ў перыядычнай высечцы малапрадукцыйных насаджэнняў.

Штогод высечкі догляду ажыццяўляюцца на плошчы 140 га, догляд за маладнякамі — на плошчы 30 га. Інтэнсіўнасць высечкі, устанаўленне выхаду ліквіднай і дзелавой драўніны робіцца на аснове доследна-вытворчай праверкі, выконваемай супрацоўнікамі інстытута з улікам стану насаджэнняў і фактычнай выбаркі за апошнія гады. Нарыхтаваная ад высечак догляду драўніна выкарыстоўваецца для дрэваапрацоўкі. Высечкі догляду забяспечваюць нармальнае ўзнаўленне лясных рэсурсаў.

У 1981—1988 гг. выканана рэканструкцыя сядзібы эксперыментальнай базы: пабудаваны ніжні склад, цэх пераапрацоўкі, гаражы, уведзена ў дзеянне новае абсталяванне, г.зн. матэрыяльна-тэхнічная база гаспадаркі ўзмацнілася. Тэхнічная ўзброенасць яе адпавядае існуючым патрабаванням і дазваляе павялічыць аб'ём вырабаў на аснове поўнай пераапрацоўкі драўніны. У 1995 г. аб'ём таварнай прадукцыі склаў 4,7 млрд. рублёў, выпускаецца да 20 назваў вырабаў.

На тэрыторыі эксперыментальнай базы ёсць помнік архітэктуры XIX ст. «паляўнічы домік», які нясе сваю гісторыю. Упершыню пра яго ўпамінаецца ў 1864 г. у кантракце на арэнду. Ленінскаму доследнаму лясгасу ён перададзены ў канцы 1960-х гадоў, дзе быў размешчаны цэх па вырабе біялагічных калекцый лясных насякомых (выраблялася 10 відаў), цэх па прасаванні драўніны. Намаганнямі лясгаса ў 1978 г. была пачата рэстаўрацыя помніка адначасова з праектнымі работамі, якія выконваліся навукова-рэстаўрацыйнымі майстэрнямі Міністэрства культуры БССР. У 1983 г. рэстаўрацыя помніка была завершана, у будынку размешчана кантора эксперыментальнай базы. У 1978 г. прыняты меры па разгортванні жыллёвага будаўніцтва, па стане на 1.1.1995 г. эксперыментальная база мае 3,5 тыс. квадратных метраў жылога фонду.

Залаты фонд складаюць людзі, намаганнямі якіх створана комплексная гаспадарка з цудоўнымі традыцыямі пастаяннага правядзення навуковых эксперыментаў і доследна-вытворчай праверкі, укаранення распрацовак інстытута і іх прапаганды. Доўгія гады працавалі і ўнеслі

значны ўклад у развіццё эксперыментальнай базы А.І.Даўгяла, Я.І.Пракапенка, Л.Б.Лейзяровіч, Ф.Я.Камрукоў, А.М.Хахлоў, М.П.Бандарэнка, У.А.Паўленка.

Разам з вучонымі, якія праводзілі навуковыя даследаванні на эксперыментальнай базе раней і цяпер, калектыў доследнай гаспадаркі з годнасцю прадстаўляе прыродную лабараторыю Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

А.В.Цітуленка.

Па рэцэптах аграномаў

Вадкія камбінаваныя ўгнаенні больш эфектыўныя ў параўнанні з грануляванымі. Выкарыстоўваючы вадкія тукасумесі, можна атрымаць ураджай на 10—15 працэнтаў большы, чым ад раздзельнага ўнясення цвёрдых азотна-фосфарна-калійных угнаенняў. Апрача гэтага зніжаюцца эксплуатацыйныя і працоўныя затраты.

На Беларусі няма завода па выпуску вадкіх комплексных угнаенняў, якія з'яўляюцца базавымі для прыгатавання двух- і трохкампанентных растораў і суспензій. Гэту справу ўзяло на сябе навукова-вытворчае прадпрыемства вадкіх угнаенняў, якое знаходзіцца каля в. Заліп'е Урыцкага сельсавета. Раней яно было вядома як Беларускі філіял СКБ «Сельгасаміяк». У студзені 1996 г. прадпрыемству споўнілася 20 гадоў. На дагаворных асновах яно абслугоўвае калгасы і саўгасы не толькі Гомельскага, але і іншых раёнаў вобласці. І ўсё ж у агульным аб'ёме паслуг большая іх доля прыпадае на гаспадаркі Гомельскага раёна. Напрыклад, у 1993 г. з 14,5 тысячы тон вадкіх тукасумесей 8 тысяч тон было ўнесена на палі раёна.

Спецыялісты прадпрыемства распрацавалі і дасканала асвоілі тэхналогію прыгатавання і ўнясення растораў. Тут створана для гэтага добрая база, ёсць тэхнічныя сродкі, стабільныя, вопытныя кадры спецыялістаў і рабочых. У прыватнасці, у в. Яроміна дзейнічае аграхімпункт, дзе ёсць спецыяльная туказмешвальная ўстаноўка амерыканскай вытворчасці. На ёй па рэцэптах аграномаў гаспадарак і гатуюцца вадкія сумесі ў выглядзе трохкампанентных суспензій (азот, фосфар, калій). Тут можна атрымаць тукасумесі любых саставаў, неабходных кожнаму полю ў залежнасці ад агранамічных паказчыкаў і ўраджайнасці плануемай культуры. Магутнасць пункта разлічана на 100 тон растораў за змену. Для транспарціроўкі і ўнясення тукасумесей выкарыстоўваюцца аўтамабільныя і трактарныя цыстэрны ёмістасцю ХТС-80 і МЖТ-10, якія былі пераабсталяваны сваімі сіламі.

Доўгі час базавай гаспадаркай навукова-вытворчага прадпрыемства з'яўляўся калгас імя XXII з'езда КПСС, дзе быў накоплены пэўны вопыт прымянення вадкіх тукасумесей. У 1995 г. вадкія комплексныя ўгнаенні выкарыстоўвалі 15 гаспадарак раёна. Больш за іншых атрымала калектыўна-долевая гаспадарка «Бабовіцкая» (1000 тон). Спецыялісты навукова-вытворчага прадпрыемства і гаспадаркі правялі сумесны дослед на 15 гектарах. Паводле даных галоўнага агранома прадпрыемства Васіля Рыгоравіча Матараса, ячмень на тым участку даў па 34,9 цэнтнера зерня з гектара. Гэта на 5,1 цэнтнера, або на 17 працэнтаў, больш, чым на плошчы, дзе ўносіліся цвёрдыя мінеральныя ўгнаенні. Розніца відавочная. У цэлым жа калектыўна-долевая гаспадарка «Бабовіцкая», нават у неспрыяльным па ўмовах надвор'я годзе, атрымала самы высокі ў раёне ўраджай збожжавых — 31,7 цэнтнера з гектара.

Як сцвярджае дырэктар прадпрыемства Аляксандр Іванавіч Альбах, самыя напружаныя месяцы для аграхімікаў — красавік і верасень. Тэрміны пасяўных работ абмежаваныя, зямля павінна быць запраўлена тукасумесямі без затрымкі. Калектыў заўсёды спраўляецца з адказнымі і неадкладнымі работамі. Гэта вынік таго, што прадпрыемства кожны раз сустракае прыход іх у поўнай і надзейнай гатоўнасці.

Прадпрыемства з улікам трох яго філіялаў на пачатак 1996 г. налічвала 90 чалавек. У тэхналагічным, эксперыментальна-канструктарскім аддзелах, на доследнай вытворчасці і ў іншых падраздзяленнях многія працуюць на працягу доўгіх гадоў. У ліку такіх работнікаў, напрыклад, вадзіцель КамАЗа Аркадзь Нікіцін, трак-

тарысты Дзмітрый Бублін, Станіслаў Вадзюцін, аператар туказмешвальнай устаноўкі Мікалай Дудараў. З першага дня прыйшлі сюды галоўны эканаміст Валянціна Іванаўна Гулевіч, галоўны бухгалтар Таццяна Іванаўна Муравейнікава, вадзіцель аміякавоза Мікалай Якаўлевіч Гаруноў. Да выхаду на пенсію шмат гадоў працаваў спачатку галоўным аграномам, потым намеснікам дырэктара ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны Іосіф Іванавіч Грыб. Першым дырэктарам прадпрыемства быў прызначаны Мікалай Аляксандравіч Кіб, у 1985 г. яго змяніў Аляксандр Іванавіч Альбах, які да гэтага працаваў намеснікам старшыні Гомельскага абласнога аб'яднання «Сельгастэхніка». Тады ж яго намеснікам стаў Аляксей Дзмітрыевіч Кушняроў.

Гэта прадпрыемства, адзінае ў Беларусі, у свой час адносілася да навукова-даследчага, канструктарскага і праектна-тэхналагічнага інстытута вадкіх угнаенняў. Яго ведалі ва ўсім былым СССР. Практычным распрацоўкам спецыялістаў прадпрыемства па выпуску і прымяненні вадкіх тукасумесей прысвячаліся экспазіцыі на ВДНГ СССР. Тэхніка прадпрыемства дэманстравалася на выстаўках у Маскве, Разані, Прыбалтыцы. На цэнтральнай сядзібе каля в. Заліп'е ў чатырохпавярховым будынку размешчаны службы прадпрыемства. Ёсць добра абсталяваныя вучэбныя класы, дзе штогод вядзецца перападрыхтоўка механізатараў і іншых работнікаў, якія працуюць з вадкімі ўгнаеннямі. Побач з гэтым домам на пляцоўцы знаходзілася пастаянная выстаўка тэхнікі, дзе праводзіліся рэспубліканскія і абласныя семінары па вывучэнні навукова-вытворчага вопыту, накопленага аграхімікамі.

Калектыў прадпрыемства выконвае іншыя работы. Напрыклад, па заяўках гаспадарак у майстэрні выраблюцца штангавыя апырсквальнікі для ўнясення ў глебу вадкіх мінеральных тукаў. Ёсць тут і шырокія магчымасці для запраўкі халадзільных установак, якія працуюць на вадкім аміяку.

20-гадовы юбілей прадпрыемства супаў з эканамічнай нестабільнасцю ў рэспубліцы. Галоўныя цяжкасці звязаны з дарагоўляй мінеральных угнаенняў і нізкай плацежаздольнасцю калгасаў і саўгасаў. І ўсё ж калектыў аграхімікаў працуе прыбыткова. Ад іх паслуг — прамая выгада для гаспадарак у выглядзе прыбаўкі ўраджаю на палях. Навукова-вытворчы патэнцыял, набыты гадамі, не страчаны і карыстаецца попытам у земляробаў.

І.І.Пічукоў.

На службе людзям

З гісторыі раёнкі

Газета «Маяк» — орган Гомельскага раённага Савета народных дэпутатаў. Выдаецца на беларускай мове. Заснавана 10.7.1938 г. пад назвай «Сталінскі сцяг». 14.8.1941 г. выданне газеты спынена, узноўлена 15.10.1943 г. Газета асвятляе працу, жыццё, побыт і адпачынак жыхароў раёна, дзейнасць грамадскіх арганізацый, прапагандуе вопыт лепшых гаспадарак і перадавікоў сельскай гаспадаркі, гісторыю раёна. Мае 4 аддзелы: грамадскага жыцця, пісьмаў, масавай работы, сельскай гаспадаркі і радыёінфармацыі. Вядуцца рубрыкі «Перабудова і кадры», «Палітычная і эканамічная адукацыя», «На палях раёна», «Як Вас абслугоўваюць», «Свет Вашых захапленняў». Выходзяць штомесячныя старонкі: «Нашчадкі», «Чалавек і закон», старонка пісем, тэматычная падборка «Аб кнігах і кнігалюбах» і іншыя. У падборцы «На паэтычнай арбіце» перыядычна друкуюцца літаратурныя творы мясцовых аўтараў.

10 ліпеня 1938 г. выйшаў першы нумар Гомельскай раённай газеты «Сталінскі сцяг», надрукаваны на фабрыцы «Палесдрук» тыражом 1500 экзэмпляраў. Размяшчалася рэдакцыя ў Навабеліцы на вуліцы Леніна, 91. Газета з'яўлялася органам Гомельскага РК КП(б)Б.

У падмаскоўным г. Хімкі ў аддзеле газет Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна захаваўся камплект газеты за 1938 г. Гартаючы яе старонкі, як бы зноў пераносішся ў тую далёкую ад нас эпоху. Гэта былі гады завяршэння індустрыялізацыі, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, культурнай рэвалюцыі, гады складанай міжнароднай абстаноўкі. Пра гэта гавораць загалоўкі ў газеце: «На франтах Іспаніі», «Ваенныя дзеянні ў Кітаі», «Японская ваеншчына працягвае свае правакацыі», «Аб

падзеях у раёне возера Хасан», «Палёты германскіх самалётаў над чэхаславацкай тэрыторыяй» і інш.

У канцы 1930-х гадоў узмацніўся культ асобы Сталіна, масавыя беззаконні, рэпрэсіі. Таму і газету назвалі «Сталінскі сцяг», а ў пачатковым абзацы першага перадавога артыкула канстатавалася, што «хутка на палях Гомельскага раёна наступіць гарачая пара — уборка новага сталінскага ўраджаю». У справаздачы аб выступленні дэпутата Вярхоўнага Савета БССР па Урыцкай выбарчай акрузе прыводзяцца такія словы: «Асіныя гнёзды трацкісцка-бухарынскай, буржуазна-нацыяналістычнай фашысцкай погані, япона-германскіх, польскіх шпіёнаў і дыверсантаў выкрыты і знішчаны слаўнай савецкай разведкай, якую ўзначальвае сталінскі нарком Н.І.Яжоў. Наша задача — дапамагчы органам НКУС выкрыць прытаіўшыхся, яшчэ не выкрытых ворагаў, усе сілы накіраваць на ліквідацыю шкодніцтва».

На старонках газеты за 1938 г. паведамлялася пра адкрыццё школ, медпунктаў, МТС і іншае. Так у Навабеліцкай МТС было 17 трактароў, 5 камбайнаў, у раёне 140 жняярак, 114 конных грабель, 102 малатарні. У в. Раманавічы арганізавана школа малапісьменных, дзе навучаліся 42 чалавекі, а калгаснік-стаханавец Восіп Перцаў набыў патэфон і веласіпед.

У гады Вялікай Айчыннай вайны газета не выходзіла. Аднавіўся яе выпуск толькі пасля вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З 29.6.1956 г. газета выходзіла пад назвай «Трыбуна хлебароба», з 22.4.1962 г. — «Маяк».

У 1983 г. газета прымала ўдзел ва Усесаюзным конкурсе перыядычнага друку за лепшую прапаганду і актыўнае садзейнічанне ўкараненню ў народную гаспадарку дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу і перадавога вопыту, што дэманстраваліся на ВДНГ СССР, была ўзнагароджана шасцю дыпломамі, чацвёра яе супрацоўнікаў адзначаны медалямі. У гэтым была заслуга тагачаснага загадчыка сельскагаспадарчага аддзела рэдакцыі Івана Іванавіча Пічукова.

На працягу 60 гадоў у рэдакцыі працавала шмат здольных і таленавітых журналістаў, якія сталі вядомымі як у вобласці так і ў рэспубліцы. Першым яе рэдактарам быў Канстанцін Васільевіч Лапіцкі. Адным з першых пасляваенных рэдактараў быў ветэран вайны Р.Л.Марголін. Рэдактарамі былі Царык, Харошка, Майзлес. У 1960—1980 гг. рэдакцыю ўзначальваў ветэран вайны Іван Паўлавіч Дзямідзенка.

Калектыў рэдакцыі па праве ганарыцца сваімі былымі супрацоўнікамі. Сярод іх — вядомы дзіцячы пісьменнік Іван Сяркоў, галоўны рэдактар В.Логвін, яго першы намеснік С.Савасцееў, намеснік У.Стэльмах, загадчык аддзела С.Балоткін — цяперашнія кіраўнікі абласной газеты «Гомельская праўда», уласныя карэспандэнты рэспубліканскай газеты «Беларуская ніва» М.Ермакоў і беларускага радыё В.Сідорчык, памочнік першага намесніка старшыні аблвыканкома А.Міцкевіч і іншыя. Былая супрацоўніца «Маяка» Н.Ц.Царэнка стала дацэнтам кафедры тэлебачання і радыёвяшчання БДУ, кандыдат мастацтвазнаўства.

Няўмольна бяжыць час. Змянілася многае, але, нягледзячы на ўсе перапетыі жыцця, газета «Маяк» застаецца вернай свайму галоўнаму прызначэнню — служыць людзям, расказваць пра іх радасці і засмучэнні, поспехі і няўдачы.

І.К.Брухавецкі.

За газетным радком

БАБОВІЧЫ — ВЁСКА ЗВЫЧАЙНАЯ

Вёска Бабовічы з кожным годам харашэе і добраўпарадкоўваецца. Тут ёсць усё для хлебаробаў: добрыя дамы, 4 магазіны, майстэрня бытавога абслугоўвання, участковая бальніца, аптэка, сярэдняя школа, бібліятэка, Дом культуры. У сферы культурнага жыцця, выхавання ёсць свае паважаныя людзі. Адна з іх — педагог Лізавета Сямёнаўна Рубанава. Яна прайшла слаўны жыццёвы шлях. Ваявала пад Сталінградам і дайшла да Берліна, за што ўзнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», «За перамогу над Германіяй». Сёння Лізавета Сямёнаўна актыўна ўдзельнічае ў выхаванні падрастаючага пакалення, з'яў-

ляецца дэпутатам сельскага Савета, узначальвае жансавет.

Натхнёна працуюць, культурна, змястоўна адпачываюць працаўнікі вёскі.

Бабовічы — звычайная беларуская вёска, дзе шчасліва жыве чалавек — непасрэдны стваральнік нашай гісторыі.

Гомельская праўда. 1972. 14 чэрвеня.

РАБОТА САВЕТАЎ

У раёне больш за 1000 дэпутатаў Саветаў. З іх непасрэдна на вытворчасці занята звыш 600 чалавек, з іх ліку 50 кіраўнікоў гаспадарак, 78 спецыялістаў сельскай гаспадаркі, 101 механізатар, 118 жывёлаводаў, 137 паляводаў.

Настойлівая арганізатарская работа Саветаў, яго органаў дае станоўчыя вынікі. Гаспадаркі Красненскага сельсавета — калгас «Перамога», саўгас «Брылёва», Гомельская птушкафабрыка — паспяхова выканалі заданні 1974 г. па ўсіх паказчыках.

Маяк. 1975. 29 сакавіка.

ПТУШКАФАБРЫКА «РАССВЕТ»

Птушкафабрыка «Рассвет» утварылася ў студзені 1975 года ў выніку разбуйнення былога саўгаса «Рассвет». Да птушкафабрыкі адышла вёска Пясочная Буда, перададзена 779 га зямлі, у тым ліку 647 га сельскагаспадарчых угоддзяў. Перададзена 7 трактароў, 2 зерневыя камбайны, 3 бартавыя і 3 спецыялізаваныя аўтамашыны, 3 зернесклады, старыя птушнікі, 25 тысяч качак, аўтамабіль МАЗ. На фабрыцы ўступілі ў строй 4 птушнікі для адкорму маладняку, кожны з якіх разлічаны на 10 тысяч галоў, кацельня, ветэрынарны блок, падсобны вытворчы корпус, склад падсцілу, цепла-, электра- і сансеткі. Яшчэ здадзена 12 птушнікаў.

Маяк. 1975. 1 мая.

РАСШЫРАЕЦЦА СФЕРА ПАСЛУГ

Да 1962 г. на тэрыторыі раёна дзейнічалі ўсяго 12 дробных швейных майстэрняў. За гады дзвюх апошніх пяцігодак пабудаваны сельскія дамы быту ў Пакалюбічах, Даўгалессі, Прыбытках, Целяшах, Бабовічах, Старых Цярэшкавічах, Старых Дзятлавічах і іншых вёсках. На сённяшні дзень у раёне налічваецца 30 сельскіх дамоў быту і 22 комплексныя прыёмныя пункты. Расшырыў сферу паслуг і раённы камбінат бытавога абслугоўвання.

За мінулы год на душу насельніцтва аказана паслуг на 6 р. 90 кап.

Маяк. 1975. 31 мая.

ЧЫРВОНЫЯ ЗОРАЧКІ

Прыходзіць вясна і пачынае квітнець зямля. Лёгкімі светла-зялёнымі воблачкамі ахутваюцца бярозы. Паветра ў маі нібы хрустальнае. Прыгажэе вясной вёска Глыбоцкае, прыгажэюць людзі, што жывуць у ёй. Вясной, 31 год назад, да іх, як і да ўсяго народа нашай краіны, прыйшла доўгачаканая перамога ў самай цяжкай вайне. Чырвоныя зорачкі, нібы тыя зорачкі, што на пілотках загінуўшых, успыхвалі на хатах удоў, сірот. Дзве такія зорачкі пламянеюць і на хаце Марыны Аляксееўны Мамруковай. Адна — гэта за мужа Фёдара Аляксеевіча, другая — за Аляксандра, старэйшага з трох яе сыноў. Ён аддаў сваё жыццё за гэты светлы майскі дзень у суровым 1943 годзе.

Сям'я Мамруковых адна з першых уступіла ў калгас. З ім Марына Аляксееўна і звязала сваё жыццё. Пасля вайны цяжка было. Усё трэба было адбудоўваць. Марына Аляксееўна выдзялялася старанасцю. Напэўна, у працы не так чуваць было болю аб загінуўшых. Ёй, старэйшай работніцы, было прысвоена званне заслужанай калгасніцы, а імя яе занесена ў Кнігу працоўнага гонару.

Ёй 72 гады, яна даўно ўжо на пенсіі, але калі асабліва неабходны ў родным калгасе імя Уладзіміра Ільіча рабочыя рукі, яна заўсёды прыходзіць на дапамогу.

На хаце старой жанчыны дзве чырвоныя зоркі — гэта двое, што не вярнуліся з вайны. Але не зламала жанчыну гора, выстаяла. І зараз расказвае ўнукам сваім пра тыя суровыя гады, пра іх дзеда і дзядзьку. А ўнукаў у яе ажно дзевяць. Ёсць ужо і два праўнукі.

Маяк. 1976. 8 мая.

ВЫСОКАЯ АЦЭНКА ПРАЦЫ

Выдатнымі працоўнымі дасягненнямі азнаменавалі другі год дзесятай пяцігодкі працаўнікі Гомельскага раёна.

Хлебаробы сабралі з гектара па 28 цэнтнераў збожжавых культур і зернебабо-

вых, па 162 цэнтнеры бульбы. На 100 гектарах угоддзяў атрымалі 698,4 цэнтнера малака і 146,2 мяса.

Дасягненні раёна атрымалі высокую адзнаку. Раён прызнаны пераможцам Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы, паспяховае выкананне народнагаспадарчага плана 1977 г. і ўзнагароджаны пераходным Чырвоным Сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР.

Гомельская праўда. 1978. 4 сакавіка.

ПРА МІНУЛАЕ І СУЧАСНАЕ МАРКАВІЧ

У Маркавіцкім сельскім Доме культуры Гомельскага раёна адкрыты народны музей. Яго стваралі члены мясцовага калгаса «Чырвоны сцяг», работнікі раённага аддзела культуры і абласнога краязнаўчага музея. Тут прадстаўлены шматлікія экспанаты аб мінулым і сучасным вёскі Маркавічы і навакольных населеных пунктаў, барацьбе іх жыхароў за ўсталяванне савецкай улады. Асаблівую ўвагу прыцягваюць дакументы аб дзейнасці партыйнай і камсамольскай ячэек у першыя гады пасля перамогі Кастрычніка, рабоце валаснога выканаўчага камітэта, рэўкома і іншых арганізацый.

Цікавыя таксама матэрыялы аб калектывізацыі вёскі і многія іншыя.

Гомельская праўда. 1979. 27 студзеня.

ФІЗКУЛЬТУРНА-АЗДАРАЎЛЕНЧАЯ І СПАРТЫЎНАЯ РАБОТА

Папулярнай формай далучэння маладых людзей да заняткаў спортам праз ГПА сталі штогод праводзімыя зімовыя і летнія спартакіяды. За 3 гады ў фіналах гэтых спаборніцтваў прынялі ўдзел 2000 чалавек, з якіх 1500 выканалі спартыўныя разрады па нарматывах ГПА. У раёне падрыхтавана за час існавання комплексу 28 000 значкістаў. За 1973 год падрыхтавана: 1 майстар, 11 кандыдатаў у майстры спорту СССР, 22 першаразраднікі і 6640 спартсменаў масавых разрадаў. Зборныя каманды раёна, якія ўдзельнічалі ў абласных спаборніцтвах, занялі месцы: па лёгкай атлетыцы — першае, па біятлону — трэцяе, валейболу — чацвёртае, лыжных гонках і кросу — пятае, мнагабор'ю ГПА — шостае.

Увайшлі ў традыцыю тэматычныя вечары, прысвечаныя прапагандзе спорту. На такіх вечарах наладжваюцца сустрэчы з вядомымі спартсменамі, паказальныя выступленні, гутаркі і лекцыі, іншыя мерапрыемствы.

Маяк. 1979. 4 кастрычніка.

ПАМАЛАДЗЕЛІ СТАРЫЯ ЦЯРЭШКАВІЧЫ

Вёска будуе жыллё для механізатараў. Спачатку ўзводзіліся двух-, трох і чатырохпавярховыя дамы. Кватэры ў іх утульныя, з прыродным газам і гарачай вадой. Агульная плошча 70,49 м², а жылая — 41,0. Будаўніцтва жылля працягваецца. Адначасова робіцца добраўпарадкаванне вёскі. Цэнтральная вуліца асфальтавана. Сумесна з калектывам Навабеліцкай птушкафабрыкі пабудаваны стадыён з бегавымі дарожкамі, пляцоўкамі для спартыўных гульняў. Будуецца новы Дом культуры.

Гомельская праўда. 1986. 24 ліпеня.

АДКРЫЎСЯ Ў ВЁСЦЫ ХРАМ

У 1992 г. у вёсцы Прыбыткі пачала дзейнічаць царква. Упершыню за апошнія дзесяцігоддзі жыхары Прыбытак і навакольных вёсак атрымалі магчымасць сустрэць старажытныя нашы святы каляды і хрышчэнне, як было заведзена з даўніх часоў, у царкве, дзе адбыліся ўрачыстыя службы. Царква размешчана ў будынку былой участковай бальніцы (а яшчэ раней там знаходзілася земская школа), знешне яна яшчэ мала падобная на храм. Аднак рамонтныя работы працягваюцца, і яна прыме аблічча ў адпаведнасці з канонамі царкоўнай архітэктуры. Унутры ўжо ўсё амаль як было калісьці ў старой царкве. Яна знаходзілася якраз насупраць. Кашчунскі разрабаваная і аддадзеная пад клуб у трыццатыя гады, яна даўно перастала дзейнічаць, а восенню 1943 г. у час баёў з фашыстамі наогул згарэла.

Аднак многія іконы, культавыя прадметы вернікам удалося выратаваць і захаваць да сённяшніх дзён, і зараз яны знаходзяцца там, дзе і павінны быць. Вяскоўцы вярнулі ўсё, што раней належала царкве — іконы: цар-Бог, Пакрова прасвятой Багародзіцы, Мікалая-цудатворца, Івана Хрысціцеля і іншыя. У дзень каляд прыхаджане з пасёлка Ваявода ўрачыста, з царкоўнымі спевамі, прынеслі ікону Казанскай Божай Мацеры.

Пабудаваць царкву дапамаглі саўгасы «Паўднёвы» і «Гомельскі».

Маяк. 1992. 8 лютага.

ВЯСКОВЫ КІНАМЕХАНІК

Кінамеханік Красненскага стацыянара А.В.Картузаў — цікавы субяседнік. Ён ужо больш сарака гадоў займаецца любімай справай. Анатоль Васільевіч падстройваўся пад сваіх гледачоў, паказваў кіно ў зручны час. І людзі былі задаволены. Ён любіць сваю справу душой і сэрцам.

Позна вечарам пачынае дэманстраваць кіно вясковы кінамеханік А.В.Картузаў. Калі людзей прыходзіць больш, ён радуецца, калі менш — засмучваецца. Верыць, што настане той дзень, калі арганізацыі адпачынку людзей будзе ўдзяляцца належная ўвага.

Маяк. 1992. 22 жніўня.

ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОРНЫ КАЛЕКТЫЎ УРЫЦКАГА ДОМА КУЛЬТУРЫ

Гэты калектыў створаны зусім нядаўна, у лістападзе 1992 г. Кіруе ім рэжысёр масавых прадстаўленняў Урыцкага рэгіянальнага цэнтра культуры і адпачынку Р.А.Лянкова.

У саставе новага ансамбля 15 вучняў сёмых — восьмых класаў.

У СДК дзейнічае таксама дзіцячы калектыў, які выконвае сучасныя танцы. У яго саставе ўдвая больш хлопчыкаў і дзяўчынак. З імі займаецца энтузіяст гэтай справы І.Г.Сінякова.

Адначасова працягваецца дзейнасць народнага фальклорнага калектыву «Скарыначка», якая працуе над увасабленнем на сцэне беларускага вясельнага абраду. Трэба, каб людзі памяталі пра быт і звычаі продкаў.

Вядома, не ўсё з таго, што мела месца ў мінулым, можна перанесці ў сучаснае жыццё. Але ведаць аб гэтым — значыць узбагаціць сябе духоўна, яшчэ больш палюбіць родны край.

Маяк. 1993. 6 лютага.

ФАЛЬКЛОРНА-ЭТНАГРАФІЧНЫ КАЛЕКТЫЎ РУДНЯ- МАРЫМОНАЎСКАГА СЕЛЬСКАГА ДОМА КУЛЬТУРЫ

Калектыў мае фальклорны напрамак, аб чым сведчаць і рэпертуар, і нацыянальныя касцюмы ўдзельнікаў самадзейнасці, і выкарыстанне такіх інструментаў, як бубен, свістулькі і г.д.

У гэтым жа пераконвае афармленне сцэны. Яна ўпрыгожана пасцілкамі, рушнікамі і іншымі рэчамі, якія выткалі і вышылі самі артысты-аматары. Яны ж з'яўляюцца гарачымі прыхільнікамі беларускай народнай песні.

Калектыў невялікі, аб'ядноўвае 14 чалавек. Галоўным чынам гэта жанчыны.

Актыўным удзельнікам канцэртаў з'яўляецца вядучая, старшыня прафкома саўгаса Таісія Пятроўна Мялешка.

Маяк. 1993. 8 мая.

ПРАФТЭХВУЧЫЛІШЧА № 185 СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

У верасні 1973 года ў в. Прыбар былі закладзены падмуркі пад першыя будынкі прафтэхвучылішча № 185. Праз два гады тут ужо займаліся дзве групы рабят. Цяпер такіх груп — дзесяткі, у якіх разам з філіялам ПТВ у Церахоўцы Добрушскага раёна вучацца 450 юнакоў і дзяўчат. Яны набываюць спецыяльнасці майстра сельскагаспадарчай вытворчасці, лаборанта хіміка-бактэрыялагічнага аналізу, майстра-плодаагароднінавода і повара, трактарыста-машыніста шырокага профілю і вадзіцеля. За перыяд існавання вучылішча з яго сцен выйшлі звыш 7000 кваліфікаваных работнікаў, якія працуюць у розных кутках Гомельшчыны, а таксама сумежных абласцей Расіі і Украіны.

Пад кіраўніцтвам заслужанага работніка прафтэхадукацыі рэспублікі І.М.Васючэнкі стаў дзейнічаць гурток мастацкай і тэхнічнай творчасці.

Сабраны экспанаты і афармлена экспазіцыя музея «Памяць». Многія яго матэрыялы прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне. Тут сабраны шматлікія экспанаты пра воінаў Савецкай Арміі, партызан і падпольшчыкаў, мірных грамадзян Прыбарскага с/с, якія загінулі ад рук гітлераўцаў, пра ветэранаў, што цяпер у страі.

Прадстаўлены матэрыялы аб мінулым і сучасным прафтэхвучылішча.

Маяк. 1993. 15 мая.

«Помню свой народ...»

З пісьма ў раённую камісію па напісанні кнігі «Памяць»

Я, Садоводова Мария Яковлевна, белоруска, 1935 г. рождения, д. Межи Гомельского р-на, Карнолинского с/сов.

Наша семья до войны проживала в д. Межи. Родители, колхозники колхоза им. М.Горького. В нашей семье проживал брат моего отца Иван. Был он без родителей, молодой, примерно 20 лет, но был инвалидом. Гомельским военкомом был выдан билет о непригодности к службе. В 1941 году отец был призван в Красную Армию, а дяде поручили колхозных коров. Они были где-то укрыты в липовских лесах. Но в 1942 или 1943 г. лагерь был обнаружен. Их поймали. Было их 11 человек и расстреляли. Дядю расстреляли около д.Михальки глубокой осенью. Место расстрела охранялось. Только весной мать ночью с моим старшим братом похоронили. Я это место не помню, а вскоре и умерла мать. Нас осталось 4 детей, старшей Оле было примерно 11 лет. Она окончила 4 класса в Межах. Брат, я и младшая сестра еще в школу не ходили. В 1945 году мы попали в Улуковский д/дом № 20, где и выросли. После 8 кл. я была направлена в г. Ригу. Окончила училище связи и направлена работать в Карело-Финскую республику. Брат проживал на Кубани в станице Бакинской, умер в 1986 г. Сестра Оля строила Сталинградскую ГЭС и живет в г. Волжском. Самая маленькая Нина живет в Нижнем Тагиле. Очень хочется увидеть свою Родину, но не к кому приехать. Так судьба нас, а вернее война, разбросала по всем частям СССР.

Помню свой народ, свой язык, тоскую, иногда плачу, но нет возможности побывать в родных местах. Спасибо вам и простите, что столько написала.

М.Я.Филиппова.

Вызначыліся працай

ГЕРОІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

ВАСІЛЬКОВА Таццяна Вяргееўна, нарадзілася 25.10.1933 г. у в. Янова Веткаўскага раёна. Перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці, Герой Сацыялістычнай Працы (1966). З 1954 г. працавала даяркай, з 1971 г. учотчыцай малочнатаварнай фермы калгаса імя Леніна. Узнагароджана ордэнам Леніна (1958).

Званне Героя прысвоена за поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі.

ЖАЛЯЗНЯК Віталій Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1937 г. у в. Уборкі Лоеўскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1986). У 1955 г. скончыў сярэднюю школу. Працаваў матарыстам на радыёвузле, потым механікам на жывёлагадоўчай ферме, загадчыкам гаража, галоўным інжынерам (1962—1964). З лютага 1964 г. інжынер саўгаса імя Горкага Гомельскага р-на. З 1966 г. старшыня калгаса «Бальшавік». У 1974—1995 гг. узначальваў калгас імя Леніна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі «За працоўную адзнаку». З 30.3.1995 г. старшыня Пакалюбіцкага сельскага Савета. Жыве ў в. Пакалюбічы.

КАВАЛЁВА Марыя Іосіфаўна, нарадзілася 15.6.1905 г. у в. Валатава. Перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці, Герой Сацыялістычнай Працы (1958). З 1930 г. працавала ў калгасе «Чырвоная ніва» (з 1931 г. калгас імя Леніна), потым даяркай, загадчыцай малочнатаварнай фермы, старшынёй калгаса, у 1951—1976 гг. загадчыцай малочнатаварнай фермы. Званне Героя прысвоена за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі.

КАВАЛЁВА Пелагея Нікандраўна, нарадзілася 9.4.1902 г. у в. Заліп'е. Герой Сацыялістычнай Працы (1960). У 1919—1923 гг. працавала настаўніцай пачатковай школы, у 1931—1938 гг. у калгасе імя М.Горкага. У 1938—1941 гг., 1945—1948 гг. намеснік старшыні Гомельскага райвыканкома, у 1950—1952 гг. другі сакратар Гомельскага РК КПБ. У 1952—1964 гг. старшыня калгаса «За Радзіму». Званне Героя прысвоена за поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі і павышэнні вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў.

Т.В.Васількова.

В.І.Жалязняк.

М.І.Кавалёва.

П.Н.Кавалёва.

М.В.Казлова.

А.Г.Каргін.

М.Х.Ш.Качароўскі.

А.Т.Кобрусеў.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1954—1959 гг. Узнагароджана двума ордэнамі Леніна (1958), ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памерла ў 1995 г.

КАЗЛОВА Марыя Васільеўна, нарадзілася 14.5.1922 г. у в. Галавінцы. Герой Сацыялістычнай Працы (1971). Працоўную дзейнасць пачала ў калгасе імя Варашылава. У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны прымала ўдзел у эвакуацыі калгаснага статка, з якім прайшла пешшу ад Гомеля да Курска. У 1946—1977 гг. працавала даяркай у саўгасе «Бярозкі» (потым племзавод «Бярозкі»). За высокія паказчыкі ў працы неаднаразова ўзнагароджвалася медалямі. Званне Героя прысвоена за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1975—1980 гг.

КАРГІН Аляксей Георгіевіч, нарадзіўся 23.2.1924 г. у в. Пуркаева Дубенскага р-на, Мардовія. Партыйны і дзяржаўны дзеяч. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеняў, Чырвонай Зоркі, медалямі. З 1954 г. другі сакратар Гомельскага РК КПБ, з 1959 г. старшыня Гомельскага райвыканкома, з 1960 г. першы сакратар Гомельскага РК КПБ. У 1966—1969 гг. сакратар Гомельскага абкома КПБ. У 1970—1979 гг. галоўны дзяржаўны інспектар па закупках і якасці сельгаспрадуктаў па Гомельскай вобл. Памёр у 1992 г.

КАЧАРОЎСКІ Моўша Хаім Шлёмавіч, нарадзіўся 5.12.1910 г. у г. Хойнікі. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). У 1948—1953 гг. аграном саўгаса «Брылёва», з 1953 г. старшыня калгаса імя Мікаяна (з 1957 г. калгас «Перамога»). З 1976 г. намеснік старшыні калгаса «Перамога», з 1979 г. намеснік старшыні калгаса імя XXII з'езда КПСС. Званне Героя прысвоена за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна (1958), ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1971), медалямі.

КОБРУСЕЎ Аркадзь Тарасавіч, нарадзіўся 24.7.1937 г. у пас. Івашкава Буда-Кашалёўскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1988). У 1963 г.

скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў намеснікам начальніка (з 1965 г.), начальнікам (з 1969 г.) упраўлення сельскай гаспадаркі Гомельскага райвыканкома. З 1979 г. дырэктар саўгаса «Брылёва». Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны».

З клопатам пра людзей

Вырас і выхоўваўся А.Т.Кобрусеў у патомнай хлебаробскай сям'і, дзе спрадвеку ведаюць, што зямля — маці ўсіх багацяў. І не проста ведаюць, а шчыра ёй служаць. Харaство сялянскай працы, яе сапраўдную цану Аркадзь Кобрусеў пазнаваў у бацькі, заслужанага механізатара сельскай гаспадаркі Беларусі, і сястры — агранома. Таму і не было ваганняў у выбары прафесіі — ён, як і яны, вырашыў звязаць свой лёс з сельскагаспадарчай вытворчасцю. Найбольш выразна праявіліся дзелавыя якасці А.Т.Кобрусева ў саўгасе «Брылёва». Гаспадарку гэту ён прыняў у кастрычніку 1979 г. даволі моцнай і эканамічна развітай. І, здавалася, магчымасці для далейшага росту вытворчасці амаль вычарпаны, але Аркадзь Тарасавіч так не лічыў. З часам пад яго кіраўніцтвам прыгарадны саўгас набыў новыя сілы і прыкметна нарошчваў іх. Сёння гаспадарка спецыялізуецца на вытворчасці малака, вырошчванні агародніны і пладоў, мае свой кансервавы завод. Вялікі сад — асаблівы гонар саўгаса. Пры ўдзеле Кобрусева было закладзена 22 гектары маладога саду новымі перспектыўнымі гатункамі. Агароднінныя і пладова-ягадныя кансервы, купажыраваныя сокі, кампоты паступаюць ва ўсе куткі Беларусі, Маскву, Санкт-Пецярбург, Мурманск, інш. рэгіёны Расіі. З кожным годам павялічваецца вытворчасць прадукцыі, расце чысты прыбытак, што дазваляе больш сродкаў выдзяляць на заработную плату і сацыяльныя патрэбы, весці будаўніцтва. Непазнавальна змянілася аблічча саўгаса і яго цэнтральная сядзіба — пасёлак Мічурынскі. Пабудаваны сталовая, маладзёжнае кафэ, сярэдняя школа, двухпавярховы будынак фельчарска-акушэрскага пункта, які ператварыўся ва ўрачэбную амбулаторыю на 100 наведванняў у змену, лазнева-пральны камбінат, рэканструяваны дзіцячы сад з плавальным басейнам. Пабудавана 260 добраўпарадкаваных кватэр з усімі камунальнымі выгодамі. Для паляпшэння ўмоў працы рэканструявана і добраўпарадкавана малочнатаварная ферма, узведзены інжынернатэхнічны комплекс з машынным дваром, тыпавой майстэрняй, Домам механізатара, у якім ёсць вучэбныя класы. Кармацэх, агароднінасховішча з рэгулюемым мікракліматам на 3 тысячы тон, склад мінеральных угнаенняў, павець для сена з актыўным вентыляваннем, цяплічны камбінат пад шкло, які займае 5,2 гектара — усё гэта таксама на рахунку Аркадзя Тарасавіча. Створаны добрыя ўмовы для адпачынку землякоў. Пры сельскім Доме культуры дзейнічаюць гурткі мастацкай самадзейнасці, па ініцыятыве А.Т.Кобрусева створаны хор, якому ў 1984 г. прысвоена званне народны. Пастаянную падтрымку адчуваюць пенсіянеры. Саўгас адпускае ім па зніжаных цэнах малако, агародніну, іншыя прадукты. Саўгас «Брылёва» стаў галоўной гаспадаркай аграфірмы «Вясна». У яе ўваходзяць яшчэ 2 цяплічныя саўгасы і 3 магазіны Гомеля. Генеральным дырэктарам фірмы па сумяшчальніцтву з'яўляецца менавіта А.Т.Кобрусеў, які валодае каштоўным дарам умелага гаспадарання на зямлі.

Прыгожыя брылёўскія сады і ў веснавой квецені, і ў асенняй духмянасці пладоў. І прыгажосць гэта — як узнагарода людзям, якія прысвяцілі сябе нялёгкай хлебаробскай працы.

І.І.Пічукоў.

МОХАРАВА Зінаіда Дзмітрыеўна, нарадзілася ў 1942 г. у в. Навасёлкі Веткаўскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1984).

У 1958—1992 гг. працавала даяркай у саўгасе «Брылёва». Званне Героя прысвоена за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі. Узнагароджана ордэнам Леніна (1977), Залатым медалём «Серп і Молат». Жыла ў в. Бардзіна. Памёрла ў 1995 г.

ПАЛАВІНКА Віктар Паўлавіч, нарадзіўся 19.12.1906 г. у г. Почап Бранскай вобласці. Герой Сацыялістычнай Працы (1958). З рабочых. З 1930 г. на гаспа-

З.Дз.Мохарава.

В.П.Палавінка.

А.А.Паташкін.

Г.С.Сарокіна.

М.П.Хаванскі.

Л.В.Шапавалава.

кома. Званне Героя прысвоена за поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі. На XXI з'ездзе КПБ выбраны кандыдатам у члены ЦК КПБ. На XXII, XXIV з'ездах — членам ЦК КПБ. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1951—1963 гг. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума іншымі ордэнамі і медалямі. Памёр 16.12.1977 г.

ПАТАШКІН Адольф Аляксеевіч, нарадзіўся 6.3.1926 г. у в. Дураўкі Манастыршчанскага раёна Смаленскай вобласці. Герой Сацыялістычнай Працы (1990). Працаваў у Гомельскім і Буда-Кашалёўскім дзіцячых дамах, старшынёй калгаса «Шлях да камунізму» Буда-Кашалёўскага раёна, старшынёй міжкалгасбуда, намеснікам старшыні калгаса «За Радзіму» Гомельскага раёна. З 1964 г. старшыня калгаса імя Урыцкага. Цяпер — намеснік старшыні калгаса. Пры яго кіраўніцтве калгас дасягнуў высокіх паказчыкаў. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

САРОКІНА Ганна Сямёнаўна, нарадзілася 27.12.1913 г. у в. Перасяцінец Брагінскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). 1931—1958 гг. даярка калгаса імя Чапаева, у 1959—1970 гг. даярка саўгаса «Бярозкі» Гомельскага раёна. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена за высокія надоі малака. Узнагароджана ордэнам Леніна, медалём. Памерла 13.3.1970 г.

ХАВАНСКІ Мікалай Пятровіч, нарадзіўся 18.2.1923 г. у в. Стралічава Хойніцкага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). У 1941 г. скончыў Смаленскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Працаваў у Кабардзіна-Балкарыі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1948 г. аграном Рэчыцкага раённага ўпраўлення, з 1950 г. начальнік аддзела Гомельскага абласнога ўпраўлення сельскай гаспадаркі, з сакавіка 1951 г. старшыня калгаса імя XXII з'езда КПСС.

Калгас, які ўзначальваў Мікалай Пятровіч, стаў перадавой гаспадаркай раёна і вобласці. Было пабудавана каля 800 дамоў і 100 грамадскіх збудаванняў. Калгас наведвалі госці з Індыі, Канады, Чэхіі, Славакіі, В'етнама, Польшчы, Германіі і інш. Званне Героя прысвоена за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1963—1967 гг. Узнагароджаны ордэнамі

Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1971), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1958), медалямі. Яго імем названа вуліца ў в. Яроміна. Памёр 14.1.1974 г.

ЦІМАШЭНКА Пётр Паўлавіч, нарадзіўся 18.1.1913 г. у в. Глыбоцкае. Герой Сацыялістычнай Працы (1974). Заслужаны будаўнік БССР (1962). У 1934 г. скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. З 1954 г. кіраўнік будтрэстаў № 78, 12, у 1965—1977 гг. — будтрэста № 17 «Лаўсанбуд» у Магілёве. З 1978 г. дырэктар будаўнічай выстаўкі Дзяржбуда БССР. Званне Героя прысвоена за поспехі ў будаўніцтве Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна. Ганаровы грамадзянін г. Магілёў (1975).

ШАПАВАЛАВА Лідзія Васільеўна, нарадзілася 9.3.1933 г. у пас. Масцішча. Перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці, Герой Сацыялістычнай Працы (1971). З сялян. З 1948 г. палявод, з 1959 г. даярка калгаса «Шлях да камунізму». Званне Героя прысвоена за поєпехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці і выкананні вытворчых планаў. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1967—1971 гг. Узнагароджана ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1973), медалямі.

ЛАЎРЭАТЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БЕЛАРУСІ

БЫРКОЎ Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся ў 1939 г. у в. Царкоўе. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1982). У 1955—1994 гг. працаваў трактарыстам-машыністам калгаса «Шлях да камунізму». Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1986), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1981), «Знак Пашаны» (1973).

КАВАЛЁЎ Міхаіл Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1929 г. у в. Вясёлае Поле. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1978). Працаваў на торфапрадпрыемстве, жывёлаводам у калгасе. У 1975 г. узначаліў звяно аператараў па догляду маладняку. Майстар-жывёлавод 1-га класа. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1977), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971).

ПАЛЕВІКОЎ Іван Фёдаравіч, нарадзіўся 5.10.1929 г. у в. Раманавічы. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Працоўную дзейнасць пачаў у 1948 г. качагарам. У

А.І.Даўгяла.

1949—1954 гг. служыў у Савецкай Арміі. З 1955 г. механік-камбайнер у Навабеліцкай, потым Гомельскай МТС, саўгасе «Бярозкі». Працоўны стаж механізатара складае 40 гадоў. Жыве ў в. Улукаўе.

СЕМЯНЦОВА Ніна Фёдараўна, нарадзілася ў 1940 г. у в. Заляддзе. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі (1986). Працавала даяркай у калгасе «Камсамол Гомельшчыны», саўгасе «Бярозкі». Жыве ў в. Раманавічы.

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ БЕЛАРУСІ

Заслужаныя будаўнікі

РАБЯНОК Уладзімір Данілавіч, нарадзіўся ў 1931 г. у Гомелі ў сям'і будаўнікоў. Заслужаны будаўнік БССР (1972). Рабочую прафесію будаўніка абраў з юнацкіх гадоў. З 1945 г. працуе цесляром у ПМК-94.

ФАМІН Анатоль Еўдакімавіч, нарадзіўся ў 1926 г. у г.п. Ветка ў сям'і будаўнікоў. Заслужаны будаўнік БССР (1981).

З 1960 г. працаваў цесляром у ПМК-94 (раней ПМК-5). Прымаў удзел у будаўніцтве абеліска на мяжы Беларусі з Украінай, фабрыкі «8 Сакавіка», «Спартак», школ у вёсках Зябраўка, Клімаўка, Яроміна, жылых дамоў і інш.

Заслужаныя лесаводы

ДАЎГЯЛА Аляксандр Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1913 г. у Мінскай вобласці. Заслужаны лесавод Беларусі (1970). Скончыў Мінскі лесатэхнічны інстытут. Працаваў начальнікам участка Магілёўскага леспрамгаса, ляснічым Баршчоўскага лясніцтва Рэчыцкага раёна. З 1970 г. — дырэктарам Ленінскага доследнага лясгаса. Удзельнік

П.К.Мацвеенка.

М.М.Палевікоў.

В.Д.Белянкоў.

Ц.Ц.Андрэеў.

Н.А.Банцырава.

В.І.Барысавец.

Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». Памёр у 1989 г.

МАЦВЕЕНКА Павел Кірылавіч, нарадзіўся ў 1914 г. у в. Весялоўка Добрушскага раёна ў сялянскай сям'і. Заслужаны лесавод Беларусі (1966). Скончыў Беларускі лесатэхнічны інстытут (1939). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 г. працаваў дырэктарам Гомельскага лясгаса, з 1967 г. — начальнікам упраўлення лясной гаспадаркі Гомельскай вобласці. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр 31.1.1989 г.

ПАЛЕВІКОЎ Мікалай Мікітавіч, нарадзіўся ў 1916 г. у в. Раманавічы. Заслужаны лесавод Беларусі (1966). Скончыў Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум (1936). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў дырэктарам Маркавіцкага лясніцтва (1949—1965), саўгаса «Сацыялізм» (1965—1967), Гомельскага лясгаса (1967—1978). Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр 9.8.1990 г.

Заслужаныя механізатары

БЕЛЯНКОЎ Віктар Давыдавіч, нарадзіўся ў 1929 г. у в. Краснае. Заслужаны механізатар БССР (1963). Працоўную дзейнасць пачаў у 1943 г. Працаваў грузчыкам, шафёрам, трактарыстам МТС, механізатарам, звеннявым, загадчыкам фермы у калгасах «1 Мая», «Брылёва», «Перамога». Узнагароджаны ордэнам Леніна (1966), медалём «За добрасумленную працу».

ДВАРЭЦКІ Яўген Макаравіч, нарадзіўся ў 1931 г. у в. Галавінцы. Заслужаны механізатар БССР (1963). У 1952 г. скончыў школу механізацыі сельскай гаспадаркі. Працаваў трактарыстам у Навабеліцкай МТС, у саўгасе «Бярозкі» намеснікам брыгадзіра трактарнай брыгады, звеннявым па вырошчванні цукровых буракоў, загадчыкам майстэрань.

Заслужаныя настаўнікі

АНДРЭЕЎ Ціхан Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1912 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Заслужаны настаўнік Беларусі (1968). У 1939 г. скончыў Гомельскі настаўніцкі інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1951 г. працаваў дырэктарам Сеўрукоўскай і Улукаўскай школ. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За баявыя заслугі». Памёр у 1973 г.

БАНЦЫРАВА Ніна Акімаўна, нарадзілася ў 1916 г. Заслужаная настаўніца Беларусі (1964). Працавала загадчыцай Валатоўскай пачатковай школы. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

БАРЫСАВЕЦ Вольга Іванаўна, нарадзілася 20.2.1921 г. у в. Запрудоўка Добрушскага раёна. Заслужаная настаўніца Беларусі (1966). Скончыла Гомельскі настаўніцкі інстытут (1948), Гомельскі

педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава (1959). Працавала настаўніцай пачатковых класаў у г. Асіповічы, настаўніцай рускай мовы і літаратуры Грабаўскай сярэдняй школы (з 1944), намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце. Пад яе кіраўніцтвам плённа працавалі школьны літаратурна-драматычны гурток, клуб маладога воіна, выяўлены імёны загінуўшых выпускнікоў школы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, створаны летапіс школы. Дэлегат Рэспубліканскага з'езда настаўнікаў. Дэпутат раённага Савета. Адказны сакратар Савета ветэранаў Грабаўскага сельсавета. Узнагароджана медалямі.

ДЖАСАВА Юлія Іванаўна, нарадзілася 10.4.1930 г. у г.п. Васілевічы Рэчыцкага раёна ў сялянскай сям'і. Заслужаная настаўніца Беларусі (1966). Скончыла Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава (1954). Працавала настаўніцай біялогіі ў Шарпілаўскай, Заліпскай і Новамільчанскай сярэдніх школах. Дзякуючы добра наладжанай рабоце на школьным вучэбна-доследным участку і палях калгаса «Перамога» Новамільчанская школа 21 год запар была ўдзельніцай ВДНГ СССР.

ЗУБЧЫНСКАЯ Марыя Нічыпараўна, нарадзілася ў 1937 г. у в. Шарпілаўка ў сялянскай сям'і. Заслужаная настаўніца Беларусі (1974). У 1960 г. скончыла Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава. Працавала настаўніцай біялогіі ў Пакалюбіцкай сярэдняй школе. Памерла 28.12.1993.

КАВАЛЬЧУК Ева Апанасаўна, нарадзілася ў 1924 г. у в. Пыхань Веткаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Заслужаная настаўніца Беларусі (1968). Скончыла Гомельскі настаўніцкі інстытут (1946), Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава (1962). Працавала настаўніцай матэматыкі Торфзаводскай сярэдняй школы. Дэлегат Рэспубліканскага з'езда настаўнікаў (1968).

КАЦОРА Ніна Васільеўна, нарадзілася ў 1932 г. у Ленінградзе ў сям'і ваеннаслужачага. Заслужаная настаўніца Беларусі (1971). У 1967 г. скончыла Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава па спецыяльнасці «Педагогіка і методыка пачатковай адукацыі». Працавала ў Шарпілаўскай

Ю.І.Джасава.

М.Н.Зубчынская.

Е.А.Кавальчук.

Н.В.Кацора.

сярэдняй школе старшай піянерважатай, настаўніцай пачатковых класаў (з 1957).

КУЗНЯЦОВА Анастасія Епіфанаўна, нарадзілася ў 1926 г. у в. Мільча. Заслужаная настаўніца Беларусі (1968). Скончыла Гомельскі педагагічны тэхнікум (1946), Мазырскі педагагічны інстытут імя Н.К.Крупскай (1972). Працавала настаўніцай пачатковых класаў на Брэстчыне (з 1946), у Лешчынецкай і Навамільчанскай (з 1950) школах Гомельскага раёна. Узнагароджана значком «Выдатнік народнай асветы» (1957).

МАЛАХАВА Ксенія Сямёнаўна, нарадзілася 8.4.1919 г. у в. Пакалюбічы ў сялянскай сям'і. Заслужаная настаўніца Беларусі (1967). Скончыла Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава (1955). Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў роднай школе. Узначальвала групу «Пошук», што ўстанавіла імёны воінаў, якія загінулі пры абароне і вызваленні в. Пакалюбічы. Адна з арганізатараў музея гісторыі школы. Кіравала раённым метадычным аб'яднаннем настаўнікаў рускай мовы і літаратуры. Памерла ў 1997 г.

С.Ц.Пігулеўскі.

М.Ц.Рыжанкова.

Л.І.Скварцова.

Т.П.Філіпенка.

А.А.Шаўко (у цэнтры) сярод выпускнікоў Пакалюбіцкай сямігодкі. 1934 г.

МАРОЗАВА Таццяна Рыгораўна, нарадзілася у 1924 г. у пас. Бардзіна. Заслужаная настаўніца Беларусі. Скончыла Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава (1944). Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Яромінскай сярэдняй школе. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга (1966).

ПАЎЛАВА Ганна Мікалаеўна, нарадзілася ў 1935 г. у в. Жытанежжа Буда-Кашалёўскага раёна ў сялянскай сям'і. Заслужаная настаўніца Беларусі (1978). Скончыла Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава (1970). Працавала старшай піянерважатай, настаўніцай пачатковых класаў у Маладзечанскім раёне, з 1959 г. у Торфзаводскай школе. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» (1976).

ПІГУЛЕЎСКІ Сцяпан Цімафеевіч, нарадзіўся 4.8.1922 г. у в. Навасёлкі Петрыкаўскага раёна ў сям'і настаўніка. Заслужаны настаўнік Беларусі (1970). Скончыў Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў настаўнікам, намеснікам дырэктара Торфзаводскай школы (1945—1958), дырэктарам Рудзянецкай і Узаўскай школ Буда-Кашалёўскага раёна (1961—1982), кіраўніком атрада «Пошук» Касцюкоўскага СПТВ-179 (1983—1991). З'яўляўся навуковым карэспандэнтам навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы Беларусі (1972—1980).

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Кастрычніцкай рэвалюцыі, медалямі. Старшыня Савета ветэранаў вайны і працы р.п.Бальшавік.

РЫЖАНКОВА Марыя Ціханаўна, нарадзілася 23.10.1919 г. у в.Стаўбун Веткаўскага раёна. Працавала завучам Брылёўскай няпоўнай сярэдняй школы. Званне заслужанага настаўніка атрымала ў 1965 г.

СКВАРЦОВА Людміла Іосіфаўна, нарадзілася ў 1914 г. у в. Астрагляды Брагінскага раёна ў сям'і настаўніка. Заслужаная настаўніца Беларусі (1967). Скончыла Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава. Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры Уваравіцкай сярэдняй школы Буда-Кашалёўскага раёна (з 1952), Торфзаводскай сярэдняй школы (з 1960).

ТУНЯКОЎ Іван Гаўрылавіч, нарадзіўся 15.5.1916 г. у в. Кавалёўка Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Заслужаны настаўнік Беларусі (1968). Скончыў Гомельскі настаўніцкі інстытут (1941), Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава (1947). Удзельнік Буда-Кашалёўскай падпольнай групы (1942–1943). Працаваў дырэктарам Яромінскай (1945–1955), Торфзаводскай (1955–1985) сярэдніх школ, настаўнікам гісторыі. Аўтар кнігі «Арганізацыя вучэбна-выхаваўчай працы ў школе» (1970).

А.А.Літвінюк.

Я.А.Руманоўскі.

ФІЛІПЕНКА Таццяна Пятроўна, нарадзілася 23.9.1927 г. у п. Калініна. Заслужаная настаўніца Беларусі (1970). Скончыла Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава (1950). Працавала настаўніцай хіміі і біялогіі ў Гомелі, Чалябінску, Цярухскай сярэдняй школе, інспектарам Гомельскага райана. Дэпутат раённага Савета народных дэпутатаў. Узнагароджана медалём, значком «Выдатнік народнай асветы». Памерла ў 1984 г.

ШАЎКО Аляксандра Антонаўна, нарадзілася ў 1896 г. у г. Гомелі. Заслужаная настаўніца Беларусі (1939). Скончыла настаўніцкія курсы (1914), Настаўніцкі інстытут (1938). Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў Пакалюбіцкай школе. Узнагароджана ордэнамі Леніна (1949), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1939). Памерла ў 1985 г.

Заслужаныя настаўнікі прафесійна-тэхнічнай адукацыі

ВАСПУКОЎ Віктар Кузьміч, нарадзіўся ў в. Зябраўка. Заслужаны настаўнік прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларусі. Скончыў Гомельскі аўтадарожны тэхнікум (1950), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1955). З 1963 г. працуе ў Гомельскім СПТВ-34. Аўтар дапаможнікаў: «Механізацыя жывёлагадоўчых ферм» (1972), «Кінетычныя схемы сельскагаспадарчых машын» (1981), «Механізацыя ферм і жывёлагадоўчых комплексаў» (1993), «Механізацыя вытворчых працэсаў у жывёлагадоўлі» (1993).

ВЕРАШЧАГІН Яўген Іванавіч, нарадзіўся ў 1930 г. у г. Гомелі. Заслужаны настаўнік прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларусі (1967). Скончыў Гомельскі аўтадарожны тэхнікум (1947), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1956). Працаваў дырэктарам Лельчыцкага СПТВ-40, Акцябрскага СПТВ-41, намеснікам дырэктара, дырэктарам Гомельскага СПТВ-34.

ПЕРАПЛЁТЧЫКАЎ Мордух Гіршавіч, нарадзіўся ў 1918 г. у г. Гомелі. Заслужаны настаўнік прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларусі (1965). Скончыў Ленінградскі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (1940). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў выкладчыкам, намеснікам дырэктара Гомельскага СПТВ-34. Узнагароджаны медалём «За абарону Каўказа».

РЫМАРАЎ Георгій Іванавіч, нарадзіўся ў 1930 г. у г. Жлобін. Заслужаны настаўнік прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларусі (1974). Скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (1970). Працаваў майстрам, выкладчыкам Гомельскага СПТВ-34.

Заслужаныя работнікі культуры

КАЛАЧОВА Антаніна Пракопаўна, нарадзілася ў 1924 г. у г. Сухумі. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1975). Скончыла Саратаўскі юрыдычны інстытут. Працавала дзяржаўным арбітрам Гомельскай вобласці, дырэктарам Яромінскага Дома культуры (з 1959).

ЛІТВІНЮК Анастасія Авакумаўна, нарадзілася ў 1919 г. у в. ПетрашоўкаВаладарскага раёна Кіеўскай вобласці. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1972). Скончыла Уманскі педагагічны тэхнікум (1938), Кіеўскі педагагічны інстытут (1950). Працавала настаўніцай Зябраўскай, дырэктарам Навамільчанскай сярэдніх школ. Узнагароджана медалямі.

РУМАНОЎСКІ Якаў Аронавіч, нарадзіўся ў 1923 г. у г. Рэчыца. Заслужаны работнік культуры БССР. Удзельнік

Б.В.Венядзіктаў.

Н.І.Мілановіч.

У.В.Рудзянок.

Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў на Гомельскім заводзе імя С.М.Кірава, загадчыкам аддзела культуры Гомельскага райвыканкома. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Працоўнай Славы III ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1993 г.

Заслужаныя работнікі сельскай гаспадаркі

ВЕНЯДЗІКТАЎ Барыс Венядзіктавіч, нарадзіўся 14.12.1930 г. у Іванаўскай вобласці. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1973). Скончыў Іванаўскі сельскагаспадарчы інстытут (1954). Працаваў галоўным заатэхнікам конезавода № 56, Гомельскага абласнога трэста саўгасаў, галоўным аграномам Гомельскага вытворчага ўпраўлення сельскай гаспадаркі.

Дэпутат раённага Савета. Узнагароджаны двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі «За доблесную працу», «За працоўную адзнаку».

ГЕРАСІМАЎ Іван Іванавіч, нарадзіўся 16.10.1921 г. у в. Рубеж Буда-Кашалёўскага раёна. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1975). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у калгасе «1 Мая» загадчыкам майстэрні, майстрам, слесарам. Узнагароджаны шасцю баявымі ордэнамі, у тым ліку двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума Чырвонай Зоркі. Жыве ў в. Цярэнічы.

КАРПЕНКА Пётр Ягоравіч, нарадзіўся ў 1918 г. у Навабеліцы. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў галоўным ветэрынарным урачом саўгаса «Бярозкі».

КЛЮЧЫНСКІ Іван Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1927 г. у в. Рудня-Барталамеёўская Чачэрскага раёна. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1986). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў начальнікам аддзялення сувязі Чачэрскага раёна, аператарам жывёлагадоўчага комплексу калгаса імя Урыцкага (з 1976). Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Дружбы народаў, медалём «За баявыя заслугі». Жыве ў в. Урыцкае.

МІЛАНОВІЧ Нэлі Іоваўна, нарадзілася 22.9.1937 г. у г. Гомель. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь (1993). Скончыла Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут (1960). Працавала аграномам у Брэсцкай вобласці, брыгадзірам, аграномам, галоўным аграномам саўгаса «Брылёва». Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» (1986).

РУДЗЯНОК Уладзімір Васільевіч, нарадзіўся 8.1.1935 г. у г. Гомель. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь (1996). Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1959). Працаваў галоўным заатэхнікам у Мінскім раёне, дырэктарам Гомельскай птушкафабрыкі (з 1967). Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

СКАМАРОХАВА Надзея Самуілаўна, нарадзілася ў 1928 г. у в. Пакалюбічы. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. Працавала ў родным калгасе імя Леніна даяркай, аператарам машыннага даення. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

ЧЫКУНОВА Таццяна Міхайлаўна, нарадзілася ў 1946 г. у в. Раманавічы. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1973). Працуе брыгадзірам малочна-таварнай фермы ў родным калгасе.

ШЧЭРБІНА Марыя Емяльянаўна, нарадзілася ў в. Заляддзе. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1986). Працавала даяркай саўгаса «Бярозкі».

І.Г.Паляшчук.

Заслужаны ўрач

ПАЛЯШЧУК Іван Георгіевіч, нарадзіўся ў 1896 г. у в. Скробава Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Заслужаны ўрач Беларусі (1958). Скончыў Мінскі медыцынскі інстытут (1933). Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Працаваў загадчыкам бальніцы, галоўным урачом бальніцы р.п. Бальшавік. Узнагароджаны шматлікімі баявымі ордэнамі і медалямі. Памёр у 1969 г.

Сад Палешчука

Цудоўны сад раскінуўся каля бальніцы рабочага пасёлка Бальшавік. Пад яблынямі і грушамі радуе вока шматкаляровы дыван з зеляніны і кветак.

А пасадзіў гэты сад на пустэчы яшчэ да заканчэння будаўніцтва бальніцы ў 1961 г. загадчык бальніцы Іван Георгіевіч Паляшчук. Сам намеціў месцы для пасадкі дрэў, сам пачаў капаць ямы пад саджанцы, угнойваў, даглядаў. Побач з ім працавалі і ўрачы, і медсёстры, і нянечкі. Вырас сад. Дорыць людзям плады, прыгажосць і чыстае паветра, нясе здароў'е. І называюць гэты сад у пасёлку садам Палешчука.

Шмат добрых успамінаў пакінуў пра сябе І.Г.Паляшчук. Клікалі яго да хворых і ўдзень, і ўночы. З медыцынскай сумкай цераз плячо адмерваў ён многія кіламетры ў любое надвор'е.

Нарадзіўся Іван Георгіевіч у сялянскай сям'і. Пасля заканчэння пачатковай школы дапамагаў бацькам па гаспадарцы, працаваў на розных работах па найму. Удзельнічаў у 1917 г. у Кастрычніцкай рэвалюцыі. Служыў санітарным інструктарам на Заходнім фронце ў конным корпусе Гая. З 1924 г. пасля заканчэння фельчарска-акушэрскай школы працаваў у шпіталі № 25 і ў 1-й савецкай бальніцы г. Мінска.

У 1928 г. паступіў вучыцца ў Мінскі медыцынскі інстытут, пасля заканчэння якога працаваў загадчыкам медыцынскага пункта, загадчыкам бальніцы ў пасёлку Бальшавік.

З 1939 г. ён урач перасоўнага ваеннага шпіталя ў час вызвалення Чырвонай Арміяй Заходняй Беларусі. З лістапада 1939 г. да 15 сакавіка 1940 г. лячыў параненых у палявых умовах на савецка-фінляндскай вайне, потым быў урачом стацыянарнага ваеннага шпіталя. У 1941—1945 гг. — ваенны ўрач у войсках пры паходзе Чырвонай Арміі ў Паўночны Іран, у шпіталях пад Новарасійскам, пры фарсіраванні Керчанскага праліва, у час вызвалення Крыма, начальнік шпіталя на 2-м Беларускім фронце. Даводзілася і са зброяй у руках абараняць параненых салдат і афіцэраў. Паранены і кантужаны на фронце. Узнагароджаны шматлікімі баявымі ордэнамі і медалямі.

Пасля вайны вярнуўся ў пасёлак Бальшавік, узначаліў бальніцу, пашырыў яе, прыбудаваў дзіцячую і радзільную палаты.

У 1962 г. уступіў у строй новы двухпавярховы будынак бальніцы. Будаўніцтву і аснашчэнню яе шмат сілы і энергіі аддаў галоўны ўрач У.Г.Паляшчук. Памёр Іван Георгіевіч у 1969 г., але сад, пасаджаны ім, працягвае жыццё і дорыць людзям радасць.

С.Ц.Пігулеўскі.

Падрыхтавала Т.А.Карасік.

Ганаровы грамадзянін горада Ленінграда

Цікавым быў лёс у Аляксея Дзянісавіча Чахоўскага (1919—1986). Нарадзіўся ён у в. Яроміна ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння школы захацеў стаць танкістам. Паступіў у Кіеўскае танкавае вучылішча, якое закончыў напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. А. Чахоўскі прайшоў усю вайну. Мужна змагаўся пад Ленінградам. Двойчы гарэў у танку. Удзельнічаў у вызваленні Ленінграда. Вайну закончыў у Германіі. У родную вёску вярнуўся з баявымі ўзнагародамі: ордэнам Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і двума медалямі «За баявыя заслугі». Да канца дзён жыў і працаваў у родным калгасе. Быў жаданым госцем у школе. Ганаровы грамадзянін г. Ленінграда.

Яны ўзнагароджаны

ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

АЛЯКСАНДРАВА Ганна Рыгораўна, свінарка калгаса «Перамога» (1958).

АНІСІМАВА Ганна Якаўлеўна, заатэхнік калгаса «Перамога» (1958).

АНЦІПАЎ Міхаіл Рыгоравіч, старшыня калгаса «Шлях да камунізму» (1975).

БАБУШКІНА Валянціна Ігнатаўна, даярка калгаса «Перамога» (1973).

БЕЛЯНКОЎ Віктар Давыдавіч, гл. *Заслужаныя механізатары.*

БЕРАСТНЕЎ Іван Акімавіч, трактарыст-машыніст калгаса імя XXII з'езда КПСС (1971).

БОКАРАВА Вера Барысаўна, даярка калгаса «Перамога» (1971).

ВАСІЛЕНКА Ганна Фёдараўна, даярка саўгаса «Бярозкі» (1971).

ВАСІЛЬКОВА Таццяна Вяргееўна, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

ВІЛЯГА Сямён Лазаравіч, загадчык падсобнай гаспадаркі саўгаса «Брылёва» (1947).

ВОІНАВА Ніна Іванаўна, даярка калгаса «1 Мая» (1986).

ГАЛАЎНЁВА Любоў Мяфодзьеўна, даярка калгаса імя XXII з'езда КПСС (1973).

ГАРОХАВА Настасся Фамінічна, даярка калгаса «Перамога» (1958).

ГАРЭЛІКАВА Вольга Аляксандраўна, даярка конезавода № 59 (1973).

ГУРСКІ Пётр Рыгоравіч, галоўны інжынер калгаса «Шлях да камунізму» (1973).

ДЗЕМЧАНКА Аляксей Мікалаевіч, першы сакратар Гомельскага сельскага райкома КП(б)Б (1949).

ДЗЕРАВЯНКА Пётр Апанасавіч, начальнік Гомельскага раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі (1966).

ЕЎТУХОЎ Іван Прохаравіч, звеннявы конезавода № 59 (1966).

ЖАЛЯЗНЯК Віталій Ігнатавіч, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

ЗАЛЕЎСКІ Дзмітрый Піліпавіч, брыгадзір калгаса «Перамога».

ЗУБАРАЎ Якаў Іванавіч, дырэктар Яромінскай сярэдняй школы (1960).

ІВАНОЎ Міхаіл Апанасавіч, загадчык свінатаварнай фермы калгаса «Перамога» (1958).

КАВАЛЁВА Пелагея Нікандраўна, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

КАВАЛЁЎ Міхаіл Аляксеевіч, гл. *Лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Беларусі.*

КАЗАКЕВІЧ Аляксандр Іванавіч, трактарыст калгаса «Перамога» (1973).

КАЗАКОВА Любоў Мікалаеўна, свінарка калгаса «Шлях да камунізму» (1973).

КАРАЛЁВА Антаніна Мацвееўна, брыгадзір калгаса імя XXII з'езда КПСС (1966).

КАРАЦЕЕЎ Васіль Іовіч, дырэктар саўгаса «Бярозкі» (1975).

А. Дз. Чахоўскі.

КАСТРАМА Васіль Авяр'янавіч, старшыня Гомельскага сельскага райвыканкома (1958).

КАЧАРОЎСКІ Моўша Хаім Шлёмавіч, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

КІРЫШЧАНКА Аляксей Фёдаравіч, брыгадзір калгаса імя Леніна (1966).

КОБАВА Еўдакія Кандратаўна, даярка саўгаса «Брылёва» (1958).

КОБРУСЕЎ Аркадзь Тарасавіч, дырэктар саўгаса «Брылёва» (1982).

КОЗЫРАЎ Емяльян Яўстафіевіч, старшыня калгаса імя Леніна (1958).

КОЎЗІК Ніна Раманаўна, даярка, брыгадзір калгаса «Перамога» (1960).

КУЗУБАЎ Фёдар Давыдавіч, старшыня калгаса імя Леніна (1966).

КУЗЬМЯНЦОВА Любоў Пракопаўна, брыгадзір калгаса імя XXII з'езда КПСС (1966).

КУЛІКОЎ Іван Васільевіч, старшыня калгаса «1 Мая» (1949).

КУРЫКІН Іван Іванавіч, загадчык фермы калгаса «Чырвоны сцяг» (1977).

ЛІСОЎСКІ Міхаіл Дзмітрыевіч, дырэктар Гомельскай МТС (1958).

ЛЯМЦАВА Ганна Захараўна, звеннявая калгаса «Чырвоны шлях», атрымала ўраджай махоркі 50,1 ц з гектара на плошчы 3 га (1950).

МАГОНАВА Алена Пятроўна, даярка саўгаса конезавода № 59 (1958).

МАРСІКАЎ Піліп Цітавіч, сакратар Гомельскага РК КПБ (1973).

МАХАВІКОЎ Пётр Сазонавіч, звеняявы калгаса «1 Мая» (1982).

МІНАЎ Павел Іосіфавіч, трактарыст калгаса «1 Мая» (1977).

МОХАРАВА Зінаіда Дзмітрыеўна, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

МУРАЎЁВА-СУПРАНЁНАК Ганна Васільеўна, настаўніца глыбоцкай сярэдняй школы № 2 (1949).

ПАГАРЦАЎ Фёдар Апанасавіч, брыгадзір конезавода № 59 (1973).

ПАЛАВІНКА Віктар Паўлавіч, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

ПАЛЕВІКОЎ Іван Фёдаравіч, трактарыст саўгаса «Бярозкі» (1971).

ПАТАШКІН Адольф Аляксеевіч, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

ПЛЕСКАЯ Вольга Цітаўна, дырэктар Заліпскай сямігадовай школы (1949).

ПРАСАЎ Пракоп Сцяпанавіч, дырэктар і настаўнік Старацярэшкаўскай школы (1949).

САЗОНЕНКА Рыгор Васільевіч, настаўнік Яромінскай сярэдняй школы (1949).

СЕМЯНЦОВА Вольга Паўлаўна, брыгадзір калгаса імя XXII з'езда КПСС (1973).

СЛЕСАР Уладзімір Міхайлавіч, старшыня калгаса «Перамога» (1986).

СТРОКАВА Ганна Якаўлеўна, старшыня калгаса «Чырвонагвардзеец» (1958).

СЫРЦОВА Варвара Фадзееўна, брыгадзір калгаса імя Леніна (1966).

ТАЛКАЧОЎ Фёдар Іванавіч, шафёр «Сельгастэхнікі» (1973).

ХАВАНСКІ Мікалай Пятровіч, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

ХРАМІНА Ганна Фадзееўна, цялятніца калгаса імя Сталіна (1960).

ЧАРНЯК Рыгор Дзмітрыевіч, старшыня Гомельскага райвыканкома (1977).

ШАПАВАЛАВА Лідзія Васільеўна, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

ШАЎКО Аляксандра Антонаўна, гл. *Заслужаныя настаўнікі.*

ШЧАРБІНА Марыя Емяльянаўна, даярка племзавода «Бярозкі» (1983).

ШЫЦІКАЎ Іван Сцяпанавіч, трактарыст калгаса імя Леніна (1986).

ЯКІМАЎ Сяргей Пятровіч, дырэктар саўгаса «Бярозкі» (1966).

ОРДЭНАМ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

АНІСІМАВА Ганна Якаўлеўна, галоўны заатэхнік калгаса «Перамога» (1973).

АЎРАМЕНКА Аляксандра Сцяпанаўна, цялятніца саўгаса імя Някрасава (1971).

БАБУШКІНА Валянціна Ігнатаўна, даярка калгаса «Перамога» (1971).

БЫРКОЎ Міхаіл Іванавіч, гл. *Лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Беларусі.*

ВАСІЛЕНКА Ганна Фёдараўна, даярка саўгаса «Перамога» (1971).

ВОІНАВА Ніна Іванаўна, даярка калгаса «1 Мая» (1981).

ГАЛАЎНЁВА Любоў Мяфодзьеўна, даярка калгаса імя XXII з'езда КПСС (1971).

ГАМЗЮКОЎ Мікалай Антонавіч, трактарыст саўгаса «Сацыялізм» (1971).

ГЕРАСЕНКА Аляксандр Анісімавіч, старшыня калгаса імя Ільіча (1971).

ЕЎТУХОЎ Іван Прохаравіч, трактарыст конезавода № 59 (1973).

ЖОСТКІНА Вольга Сямёнаўна, даярка калгаса імя Урыцкага (1971).

КАЗАКОВА Любоў Мікалаеўна, даярка калгаса «Шлях да камунізму» (1986).

КАЗЛОВА Марыя Васільеўна, даярка саўгаса «Бярозкі» (1973).

КАМЕНЕВА Марыя Мікалаеўна, птушніца Гомельскай птушкафабрыкі (1973).

КАЧАРОЎСКІ Моўша Хаім Шлёмавіч, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

КРЫЎЧАНКА Сямён Пракопавіч, трактарыст калгаса імя Суворава (1971).

КУЗУБАЎ Фёдар Давыдавіч, старшыня калгаса імя Леніна (1971).

МІНАЎ Павел Іосіфавіч, трактарыст калгаса «1 Мая» (1971).

МОХАРАВА Зінаіда Дзмітрыеўна, даярка саўгаса «Брылёва» (1973).

МУШПАКОЎ Іван Іванавіч, трактарыст калгаса «Чырвоная плошча» (1973).

МЯДЗВЕДЗЕВА Настасся Ільінічна, даярка калгаса «За Радзіму» (1971).

ПАЛЯКОЎ Аляксандр Паўлавіч, трактарыст калгаса імя Леніна (1982).

ПІГУЛЕЎСКІ Сцяпан Цімафеевіч, гл. *Заслужаныя настаўнікі.*

ПРАХАРЭНКА Ганна Сазонаўна, даярка калгаса «Бальшавік» (1971).

РАТАБЫЛЬСКІ Уладзімір Міхайлавіч, старшыня калгаса «Камуніст» (1977).

РОМША Рыгор Андрэевіч, камбайнер калгаса імя XXII з'езда КПСС (1977).

РУДЗЯНОК Уладзімір Васільевіч, гл. *Заслужаныя работнікі сельскай гаспадаркі.*

СТАРАДУБЕЦ Павел Мяфодзьевіч, дырэктар саўгаса «Брылёва» (1977).

СЫРЦОВА Варвара Фадзееўна, брыгадзір калгаса імя Леніна (1973).

ТУРАСАВА Любоў Дзмітрыеўна, цялятніца калгаса імя Леніна (1973).

УДАВЕНКА Фелікс Максімавіч, даглядчык жывёлы калгаса «Перамога» (1977).

ХАВАНСКІ Мікалай Пятровіч, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

ЧАРНЯК Рыгор Дзмітрыевіч, старшыня райвыканкома (1973).

ШАКЛАНАЎ Аляксей Навумавіч, трактарыст калгаса «Бальшавік» (1975).

ШАЛЯСТУН Любоў Фёдараўна, даярка саўгаса «Мірны» (1975).

ШАПАВАЛАВА Лідзія Васільеўна, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

АНДРЭЙЧЫК Настасся Іванаўна, калгасніца калгаса імя Урыцкага (1986).

АСАДЧАЯ Ганна Сцяпанаўна, даярка саўгаса «Сацыялізм» (1977).

АСВЕЦІНСКАЯ Наталля Гаўрылаўна, настаўніца пачатковых класаў касцюковіцкай сярэдняй школы № 13 (1949).

АТРОШЧАНКА Іван Якаўлевіч, брыгадзір калгаса імя Урыцкага (1972).

БАБУШКІНА Валянціна Ігнатаўна, даярка калгаса «Шлях да камунізму» (1981).

БАГДАНАЎ Аляксандр Аляксеевіч, звеннявы калгаса імя XXII з'езда КПСС (1972).

БАЛОНІКАЎ Пётр Дзмітрыевіч, галоўны аграном калгаса «Шлях да камунізму» (1978).

БАЛОЦІНА Вера Мікалаеўна, даярка калгаса «Чырвоны сцяг» (1966).

БАНЦЫРАВА Ніна Акімаўна, гл. *Заслужаныя настаўнікі.*

БАРАБАНАЎ Пётр Васільевіч, трактарыст калгаса імя Леніна (1973).

БАРАБАНЦАВА Тамара Васільеўна, калгас імя Леніна (1966).

БАРАВІКОЎ Рыгор Аляксандравіч, старшыня калгаса імя Калініна (1966).

БАРАДЗІНА Валянціна Ігнатаўна, даярка калгаса «Перамога» (1971).

БАРКОВА Ніна Мікітаўна, звеннявая саўгаса «Брылёва» (1973).

БЫРКОЎ Міхаіл Іванавіч, гл. *Лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Беларусі.*

БАРЫСАГЛЕБСКІ Марк Васільевіч, газаэлектразваршчык перасоўна-механізаванай калоны Гомельскага раённага аб'яднання «Сельгастэхніка» (1971).

БЕЛАРУСАЎ Альберт Пятровіч, дырэктар саўгаса «Гомельская агароднінная фабрыка» (1971).

БОНДАРАВА Марыя Фёдараўна, даярка калгаса «Перамога» (1958).

БУДНІКАВА Марыя Фёдараўна, калгасніца калгаса імя Урыцкага (1973).

БУДНІКАЎ Якаў Аўрамавіч, даглядчык жывёлы калгаса імя Урыцкага (1966).

БУЛЬКО Ядвіга Вікенцьеўна, даярка саўгаса «Брылёва» (1973).

БЯЛАНАЎ Валянцін Андрэевіч, трактарыст калгаса імя Урыцкага (1986).

ВАЙЦЮК Надзея Ігнатаўна, птушніца Гомельскай птушкафабрыкі (1973).

ВІННІКАЎ Мікалай Іванавіч, брыгадзір калгаса імя Суворава, атрымаў ураджай карэнняў кок-сагызу з аднагадовых плантацый 45,8 ц з га на плошчы 8 га (1951).

ВОІНАВА Ніна Іванаўна, даярка калгаса «1 Мая» (1973).

ВОСПУКАЎ Анатоль Аляксеевіч, загадчык малочнатаварнай фермы «Бярозкі» (1973).

ГАРНЫ Мікалай Філатавіч, трактарыст саўгаса імя Някрасава (1971).

ГАРУШКІНА Ефрасіння Аляксееўна, даярка калгаса імя Урыцкага (1973).

ГАРЭЛІКАВА Вольга Аляксандраўна, даярка конезавода № 59 (1966).

ГАЎРЫЛЕНКА Аляксандра Фёдараўна, звеннявая калгаса імя Сталіна, атрымала ўраджай карэнняў кок-сагызу з аднагадовых плантацый 49,2 ц з га на плошчы 2 га (1952).

ГАЎРЫЛЕНКА Віктар Дзмітрыевіч, брыгадзір калгаса імя XXII з'езда КПСС (1977).

ГЕРАСЕНКА Аляксандр Анісімавіч, старшыня калгаса імя Уладзіміра Ільіча (1971).

ГАРМАШ Валянцін Захаравіч, галоўны заатэхнік калгаса «Бярозкі» (1975).

ГРЫЦКОВА Раіса Міхайлаўна, даярка зверасаўгаса «Мірны» (1986).

ГРЫЦКОЎ Васіль Фёдаравіч, брыгадзір саўгаса «Мірны» (1975).

ДАНІЛКОЎ Пётр Емяльянавіч, трактарыст-машыніст конезавода № 59 (1971).

ДЗЮБІН Захар Аркадзьевіч, трактарыст калгаса імя Леніна (1966).

ДЗЮБІН Рыгор Іванавіч, трактарыст калгаса імя Леніна (1973).

ДОНЮШКІН Іван Васільевіч, калгаснік калгаса «Перамога» (1966).

ДУБАДЗЕЛАВА Настасся Васільеўна, брыгадзір калгаса «Перамога» (1971).

ЕМЯЛЬЯНЧЫКАВА Лукер'я Іванаўна, калгасніца калгаса «Чырвоны шлях», вызначылася ў звяне, на ўчастку якога атрыманы ўраджай махоркі 50,1 ц з га на плошчы 3 га (1950).

ЕРАФЕЕНКА Надзея Піліпаўна, даярка саўгаса «Бярозкі» (1975).

ЖАЛЯЗНЯК Віталій Ігнатавіч, старшыня калгаса імя Леніна (1981).

ЖАРОВЕНЬ Міхаіл Пятровіч, галоўны аграном калгаса імя Урыцкага (1971).

ЖАРЫКАЎ Міхаіл Дзмітрыевіч, старшыня калгаса «1 Мая» (1973).

ЖОСТКІНА Алена Іванаўна, даярка вучгаса № 34 (1973).

ЖУКАВА Раіса Юр'еўна, брыгадзір саўгаса «Сацыялізм» (1971).

ЗАХАРЭНКА Пётр Ільіч, галоўны ветэрынарны ўрач саўгаса «Брылёва» (1973).

ЗАЯЦ Павел Іванавіч, старшыня калгаса «Чырвонагвардзеец» (1976).

ІВАНОЎ Уладзімір Аляксандравіч, дырэктар завода «Гомельскі» № 59 (1972).

ІШЧАНКА Анатоль Майсеевіч, дырэктар Гомельскага маторарамонтнага завода (1986).

КАБКОЎ Васіль Іванавіч, загадчык малочнатаварнай фермы калгаса «Перамога» (1958).

КАВАЛЕНКА Аляксандр Якаўлевіч, дырэктар конезавода № 59 (1966).

КАВАЛЁВА Пелагея Нікандраўна, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

КАВАЛЁЎ Мікалай Нічыпаравіч, начальнік Гомельскага міжраённага ўпраўлення асушальных і арашальных сістэм (1977).

КАВАЛЁЎ Міхаіл Аляксеевіч, гл. *Лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Беларусі.*

КАВАЛЬЧУК Віктар Мікітавіч, трактарыст Беліцкага аддзялення сельгастэхнікі (1973).

КАЗАКОЎ Сямён Дарафеевіч, брыгадзір калгаса «Чырвоная плошча» (1973).

КАЗІМІРАЎ Аляксей Кірылавіч, трактарыст саўгаса «Сацыялізм» (1986).

КАЗУБАНАВА Кацярына Пятроўна, звеннявая калгаса імя Сталіна, атрымала ўраджай карэнняў кок-сагызу з аднагадовых плантацый 54,1 ц з гектара на плошчы 2,3 га (1952).

КАМАРОЎ Іван Рыгоравіч, брыгадзір саўгаса «Сацыялізм» (1977).

КАНЫГІНА Тамара Васільеўна, брыгадзір калгаса імя Урыцкага (1971).

КАРАЦЕЕЎ Васіль Іовіч, дырэктар саўгаса «Бярозкі» (1971).

КАРЛОЎСКІ Пётр Максімавіч, дырэктар Навабеліцкай птушкафабрыкі (1975).

КАРПЕНКА Ніна Васільеўна, рабочая саўгаса «Навабеліцкі» (1975).

КАСЬЯНАВА Надзея Андрэеўна, даярка калгаса «Перамога» (1958).

КАЧАН Пётр Ціханавіч, шафёр конезавода № 59 (1975).

КАЧАРОЎСКІ Моўша Хаім Шлёмавіч, старшыня калгаса «Перамога» (1973).

КАДУБА Марыя Мікалаеўна, даярка вучгаса СПТВ № 19 (1975).

КЛІМАВА Надзея Трафімаўна, свінарка саўгаса імя Жданава (1971).

КЛІМКОВА Ніна Аляксандраўна, галоўны аграном саўгаса «Брылёва» (1975).

КЛІМОВІЧ Мікалай Апанасавіч, загадчык малочнатаварнай фермы калгаса «Іскра» (1958).

КЛІМОВІЧ Міхаіл Парфёнавіч, трактарыст саўгаса «Навабеліцкі» (1977).

КОБРУСЕЎ Аркадзь Тарасавіч, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі Гомельскага раёна (1971).

КОЗЫРАВА Таццяна Раманаўна, даярка калгаса «Чырвоная плошча» (1977).

КОКАТАВА Ніна Максімаўна, аператар комплексу калгаса імя Урыцкага (1986).

КОКАТАЎ Аляксандр Пятровіч, трактарыст калгаса імя Леніна (1972).

КОЛАСАЎ Аляксей Паўлавіч, трактарыст калгаса «Камуніст» (1971).

КОРШУНАЎ Віктар Трафімавіч, звеннявы калгаса імя XXII з'езда КПСС (1971).

КРАЎЦОВА Ніна Васільеўна, даярка саўгаса «Брылёва» (1983).

КРАЎЦОЎ Мікалай Васільевіч, брыгадзір калгаса імя Леніна, атрымаў ураджай карэнняў кок-сагызу з аднагадовых плантацый 52,2 ц з гектара на плошчы 4 га (1951).

КРАЎЧАНКА Пётр Васільевіч, старшыня калгаса імя Суворава (1978).

КРУМКАЧОЎ Аляксандр Міхайлавіч, майстар-наладчык саўгаса «Бярозкі» (1972).

КУЗНЯЦОЎ Дзмітрый Васільевіч, дырэктар саўгаса «Сацыялізм» (1966).

КУЗУБАЎ Фёдар Давыдавіч, старшыня калгаса імя Леніна (1973).

КУЗЬМЯНЦОВА Любоў Пракопаўна, брыгадзір калгаса імя XXII з'езда КПСС (1973).

КУШНЯРОЎ Дзмітрый Рыгоравіч, трактарыст калгаса імя Уладзіміра Ільіча (1977).

КУШНЯРОЎ Міхаіл Міхайлавіч, трактарыст калгаса «Чырвоная плошча» (1972).

ЛАЗАРАВА Валянціна Хрысаўна, галоўны заатэхнік саўгаса «Бярозкі» (1966).

ЛАЗОЎСКІ Іосіф Яфімавіч, трактарыст калгаса «1 Мая» (1973).

ЛАПАНАВА Ніна Сямёнаўна, даярка калгаса «Перамога» (1977).

ЛАПАТАЎ Уладзімір Аксёнавіч, трактарыст калгаса імя Кірава (1971).

ЛАРКІНА Аляксандра Іванаўна, даярка калгаса імя Леніна (1973).

ЛЕШГАВА Еўдакія Іосіфаўна, даярка саўгаса «Брылёва» (1973).

ЛУШГАЕЎ Мікалай Паўлавіч, дырэктар Касцюкоўскага міжраённага прадпрыемства па вытворча-тэхнічнаму абслугоўванні аграпрамысловага комплексу (1986).

ЛЫЖАНКОЎ Анатолій Георгіевіч, трактарыст саўгаса «Міжрэчча» (1975).

ЛЯХНО Міхаіл Сафатавіч, трактарыст калгаса «Перамога» (1977).

МАЁРАЎ Дзмітрый Сямёнавіч, трактарыст саўгаса імя Някрасава (1971).

МАЗУРЭНКА Андрэй Іванавіч, шафёр калгаса «Бальшавік» (1973).

МАЙСЕЕВА Алена Пятроўна, даярка саўгаса «Брылёва» (1977).

МАРОЗАВА Таццяна Рыгораўна, гл. *Заслужаныя настаўнікі.*

МАРОЗАЎ Міхаіл Кузьміч, трактарыст калгаса «Чырвоны маяк» (1972).

МАРСІКАЎ Піліп Цітавіч, сакратар Гомельскага сельскага райкома КП(б)Б (1971).

МАСЛЮКОВА Надзея Міхайлаўна, звеннявая калгаса імя Уладзіміра Ільіча (1972).

МАХАВІКОЎ Іван Пятровіч, брыгадзір калгаса «1 Мая» (1973).

МАХАВІКОЎ Пётр Сазонавіч, трактарыст калгаса «1 Мая» (1972).

МАХАЎЦОВА Любоў Паўлаўна, даярка калгаса імя XXII з'езда КПСС (1973).

МАЦВЕЕНКА Павел Кірылавіч, гл. *Заслужаныя лесаводы.*

МЕЛЕХ Аляксандр Савіч, брыгадзір саўгаса «Бярозкі» (1966).

МІСЬКО Любоў Іванаўна, даярка саўгаса імя Някрасава (1975).

МУЗЫКІН Сцяпан Георгіевіч, старшыня калгаса «Чырвонагвардзеец» (1966).

МУРАШКІНА Анастасія Міхайлаўна, цялятніца калгаса імя XXII з'езда КПСС (1977).

МУРЫН Аляксандр Міхайлавіч, трактарыст калгаса імя Урыцкага (1973).

НАБІВАНЦАЎ Пётр Андрэевіч, трактарыст калгаса імя Урыцкага (1986).

НАПРЭЕЎ Анатоль Лявонцьевіч, сакратар Гомельскага райкома КПБ (1977).

НЕПША Мікалай Мікалаевіч, аграном калгаса «1 Мая» (1971).

НЕПША Яўгенія Цімафееўна, брыгадзір калгаса «1 Мая» (1977).

ПАДВОЙСКАЯ Вольга Фёдараўна, даярка саўгаса імя Горкага (1973).

ПАДГОРНАЯ Агафія Піменаўна, даярка конезавода № 59 (1966).

ПАДЛЯТАЕВА Марыя Міхайлаўна, галоўны заатэхнік Гомельскай МТС (1958).

ПАДОЛЬСКАЯ Надзея Емяльянаўна, цялятніца калгаса «Чырвоная плошча» (1971).

ПАДЦЕРАБКОЦ Аляксей Пятровіч, старшыня выканкома Пакалюбіцкага сельскага Савета дэпутатаў працоўных (1971).

ПАЗНЯКОЎ Пётр Сямёнавіч, лесаруб-бензапільшчык Гомельскага вытворча-паказальнага лясгаса (1971).

ПАЛЕВІКОЎ Мікалай Мікітавіч, гл. *Заслужаныя лесаводы.*

ПАЛЕЙ Еўдакія Рыгораўна, даярка калгаса імя Леніна (1958).

ПАЛЯКОЎ Аляксандр Паўлавіч, трактарыст калгаса імя Леніна (1975).

ПАТАПКОЎ Рыгор Іванавіч, трактарыст саўгаса «Навабеліцкі» (1973).

ПАТАШКІН Адольф Аляксеевіч, старшыня калгаса імя Урыцкага (1971).

ПАЎЛАВА Вера Аляксандраўна, даярка калгаса «Перамога» (1973).

ПЕСНЯ Мацвей Фёдаравіч, галоўны аграном калгаса імя Урыцкага (1986).

ПЛЕСКІ Барыс Васільевіч, шафёр саўгаса «Бярозкі» (1973).

ПЛЕШКУНОВА Вольга Яфрэмаўна, звеннявая калгаса імя Суворава, атрымала ўраджай карэнняў кок-сагызу з аднагадовых плантацый 46,1 ц з гектара на плошчы 4 га (1951).

ПОМАЗАВА Ганна Ермалаеўна, даярка саўгаса «Брылёва» (1973).

ПРАЦЬКО Леакадзія Мікалаеўна, даярка калгаса «Перамога» (1986).

ПРЫХОДЗЬКА Зінаіда Цімафееўна, даярка калгаса «Перамога» (1958).

РАДЗЬКОВА Яўгенія Максімаўна, цялятніца калгаса «Бальшавік» (1973).

РАТАБЫЛЬСКІ Уладзімір Міхайлавіч, старшыня калгаса «Камуніст» (1973).

РУДЗЯНКОЎ Фёдар Кузьміч, трактарыст калгаса імя Суворава (1973).

РУДЗЯНОК Уладзімір Васільевіч, гл. *Заслужаныя работнікі сельскай гаспадаркі.*

РУДЭНКА Уладзімір Васільевіч, дырэктар Гомельскай птушкафабрыкі (1975).

РУМАНОЎСКІ Якаў Аронавіч, гл. *Заслужаныя работнікі культуры.*

РУСАКОВА Вольга Емяльянаўна, даярка саўгаса «Рассвет» (1971).

САВІЦКАЯ Марыя Міхайлаўна, даярка саўгаса «Бярозкі» (1973).

САЛАНКОЎ Васіль Лаўрэнцьевіч, брыгадзір саўгаса «Бярозкі» (1966).

САЛЫГА Праскоўя Фёдараўна, птушніца калгаса імя Леніна (1958).

САМАНЧУК Іван Лукіч, кіраўнік аддзела саўгаса «Сацыялізм» (1966).

САМУСЕНКА Аляксандр Пятровіч, брыгадзір саўгаса «Гомельскі» (1977).

САТЫРАВА Дар'я Фролаўна, даярка саўгаса «Міжрэчча» (1966).

САТЫРАЎ Васіль Пятровіч, загадчык фермы буйной рагатай жывёлы калгаса імя Урыцкага (1966).

САЎЧАНКА Міхаіл Сяргеевіч, трактарыст калгаса «Бальшавік» (1973).

СВІРЫДАВА Марыя Мікітаўна, звеннявая калгаса «1 Мая» (1975).

СЕВЯРЫНАВА Пелагея Савельеўна, калгасніца калгаса імя Леніна (1975).

СЕВЯРЫНАЎ Аляксей Самсонавіч, галоўны аграном калгаса імя Леніна (1971).

СЕЛІВАНАЎ Іван Захаравіч, шафёр саўгаса «Сацыялізм» (1972).

СЕМЯНЦОВА Вольга Паўлаўна, брыгадзір калгаса імя XXII з'езда КПСС (1971).

СЕРАНКОВА Таццяна Апанасаўна, звеннявая калгаса імя Суворава, атрымала ўраджай карэнняў кок-сагызу з аднагадовых плантацый 45,5 ц з гектара на плошчы 4 га (1952).

СЕРГІЕНКА Іван Ільіч, вадзіцель аўтамабіля калгаса «Чырвоны сцяг» (1977).

СІМАНОВІЧ Мікалай Аляксандравіч, старшыня калгаса «За Радзіму» (1986).

СІМАНЧУК Іван Лукіч, кіраўнік аддзялення саўгаса «Сацыялізм» (1966).

СІМАНЧУК Міхаіл Фёдаравіч, шафёр саўгаса «Сацыялізм» (1973).

СІРОТКІН Сямён Андрэевіч, брыгадзір калгаса «Камуніст» (1973).

СКАМАРОХАВА Надзея Самуілаўна, аператар машыннага даення калгаса імя Леніна (1983).

СЛЕСАР Уладзімір Міхайлавіч, старшыня калгаса «Перамога» (1981).

СОІЧ Іван Пятровіч, слесар калгаса «Чырвоны маяк» (1973).

СТАРАВОЙТАЎ Васіль Іванавіч, дырэктар саўгаса «Брылёва» (1966).

СТАРАВОЙТАЎ Іван Кузьміч, брыгадзір саўгаса «Навабеліцкі» (1971).

СТАРАВОЙТАЎ Іван Фёдаравіч, скотнік саўгаса імя Горкага (1971).

СТАРАДУБЕЦ Павел Мяфодзьевіч, дырэктар саўгаса «Брылёва» (1971).

СТРОКАВА Ганна Якаўлеўна, калгасніца калгаса «Чырвонагвардзеец», забяспечыла атрыманне ўраджаю жыта па 21 ц з гектара на плошчы 12 га (1950).

СУДАКОЎ Аляксандр Міхайлавіч, скотнік саўгаса «Міжрэчча» (1952).

СЦЕПЧАНКА Віталій Антонавіч, брыгадзір саўгаса «Бярозкі» (1966).

СЫЧОЎ Рыгор Сяргеевіч, трактарыст саўгаса імя Жданава (1973).

СЯМКОЎСКІ Аляксандр Патапавіч, калгаснік калгаса імя Леніна, атрымаў ураджай карэнняў кок-сагызу з аднагадовых плантацый 46,4 ц з гектара на плошчы 12 га (1952).

ТАЛКАЧОЎ Іван Ціханавіч, калгаснік імя Леніна, атрымаў ураджай карэнняў кок-сагызу з аднагадовых плантацый 46,4 ц з гектара на плошчы 12 га (1952).

УДОВЕНКА Фелікс Максімавіч, скотнік калгаса «Перамога» (1973).

ХАВАНСКІ Мікалай Пятровіч, гл. *Героі Сацыялістычнай Працы.*

ХАРАНЕНКА Мікалай Кірэевіч, дырэктар саўгаса «Паўднёвы» (1982).

ХІМАКОВА Ганна Фёдараўна, даярка калгаса «Камуніст» (1973).

ЦАРЫКАВА Зінаіда Сцяпанаўна, даярка калгаса «За Радзіму» (1958).

ЦІМАФЕЕВА Валянціна Нічыпараўна, птушніца калгаса «Рассвет» (1975).

ЦІМАШКОВА Таццяна Іванаўна, даярка калгаса «Шлях да камунізму» (1973).

ЦІМАШЭНКА Іван Васільевіч, трактарыст Гомельскай птушкафабрыкі (1973).

ЦЫБУЛЬСКІ Эдуард Іванавіч, брыгадзір саўгаса «Бярозкі» (1966).

ЦЫТРЫКАЎ Іван Макаравіч, трактарыст саўгаса «Брылёва» (1971).

ЦЯРЭШЧАНКА Пётр Міхайлавіч, трактарыст саўгаса «Мірны» (1973).

ЧАЙКОЎ Павел Рыгоравіч, брыгадзір калгаса імя XXII з'езда КПСС (1973).

ЧАРНЯК Рыгор Дзмітрыевіч, старшыня райвыканкома (1971).

ЧАЮКОЎ Мікалай Сяргеевіч, трактарыст калгаса «Чырвоны сцяг» (1975).

ЧУГУЛІНА Раіса Іванаўна, даярка, зараз заатэхнік саўгаса «Брылёва» (1986).

ЧУЙКОВА Лізавета Васільеўна, калгасніца калгаса «Шлях сацыялізму», вызначылася ў звяне, атрымала ўраджай жыта 27,62 ц з гектара на плошчы 8 га (1948).

ЧУЙКОЎ Іван Аляксандравіч, трактарыст племзавода «Бярозкі» (1986).

ЧУХНОЎ Павел Аляксандравіч, брыгадзір конезавода № 59 (1966).

ШАБАНАВА Праскоўя Кузьмінічна, калгасніца калгаса імя XXII з'езда КПСС (1966).

ШАКЛАНАЎ Аляксей Навумавіч, трактарыст калгаса «Бальшавік» (1972).

ШАЛЯСТУН Любоў Фёдараўна, даярка саўгаса «Мірны» (1971).

ШАПАРАВА Зінаіда Сямёнаўна, калгасніца калгаса імя Урыцкага (1973).

ШАРАЕЎ Уладзімір Васільевіч, трактарыст саўгаса «Бярозкі» (1973).

ШАРАНОВІЧ Надзея Гаўрылаўна, загадчыца малочнатаварнай фермы саўгаса імя Някрасава (1973).

ШАЎКО Аляксандра Антонаўна, гл. *Заслужаныя настаўнікі.*

ШРЭМАЎ Рыгор Васільевіч, старшыня Пакалюбіцкага сельсавета (1973).

ШУТАВА Любоў Іванаўна, калгасніца калгаса імя Леніна (1996).

ШУТАВА Марыя Клімаўна, даярка калгаса імя Леніна (1977).

ШЧАРБІНА Марыя Емяльянаўна, даярка саўгаса «Бярозкі» (1973).

ШЭХТМАН Аляксандр Веньямінавіч, галоўны аграном калгаса імя XXII з'езда КПСС (1973).

ЯВОНЕНКА Сяргей Іванавіч, дырэктар саўгаса «Навабеліцкі» (1978).

ЯНКОЎСКАЯ Эмілія Станіславаўна, даярка саўгаса «Брылёва» (1958).

ЯНЧАНКА Фёкла Трафімаўна, даярка калгаса імя Леніна (1958).

ЯСКЕВІЧ Ганна Пятроўна, даярка калгаса «Шлях да камунізму» (1973).

Імі ганарацца землякі

ВУЧОНЫЯ

АБРАМАЎ Сямён Сямёнавіч, нарадзіўся 7.11.1938 г. у в. Глыбоцкае. Беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі. Доктар ветэрынарных навук (1987). Прафесар (1988). У 1960 г. скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут. Працуе ў Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Даследуе фізіятэрапеўтычныя метады лячэння і прафілактыкі хвароб жывёл ва ўмовах Беларусі. Адзін з аўтараў кніг: «Незаразные болезни молодняка» (1989), «Справочник по болезням сельскохозяйственных животных» (1990), «Тлумачальны слоўнік-даведнік па ветэрынарыі і заатэхніі» (1992), «Выращивание и болезни собак» (1993).

БАШЛАКОВА Еўдакія Карпаўна, нарадзілася 12.3.1925 г. у в. Грабаўка. Кандыдат эканамічных навук (1971). Дацэнт (1979). У 1956 г. скончыла Гомельскі пединстытут. Працавала ў Беларускім універсітэце інжынераў чыгуначнага транспарту. Аўтар 12 навуковых работ. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені і трыма медалямі.

ВІШНЕЎСКАЯ Кацярына Яфімаўна, нарадзілася 25.12.1930 г. у в. Старая Беліца. Беларускі вучоны ў галіне анкагінекалогіі. Доктар медыцынскіх навук (1985), прафесар (1990). Правадзейны член Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў (1995). У 1955 г. скончыла Віцебскі медыцынскі інстытут. З 1960 г. працуе ў Беларускім навукова-даследчым інстытуце анкалогіі і медыцынскай радыялогіі. Аўтар навуковых прац па метадах дыягностыкі, хірургіі, камбінаванага і прамянёвага лячэння злаякасных наваўтварэнняў геніталіяў.

ГАРАЕЎ Алег Паўлавіч, нарадзіўся 25.3.1941 г. у в. Краснае. Кандыдат тэхнічных навук (1981). Дацэнт (1984). У 1963 г. скончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту. З 1969 г. працуе ў Беларускім універсітэце інжынераў чыгуначнага транспарту. Аўтар 40 навуковых прац, у тым ліку па праблемах масы і хуткасці грузавых цягнікоў.

ГОРЛЕНКА Валянціна Парфенаўна, нарадзілася 20.6.1948 г. у в. Шарпілаўка. Кандыдат педагагічных навук (1981). Дацэнт. У 1975 г. скончыла Гомельскі дзяржаўны універсітэт. Аўтар звыш 60 навуковых прац.

ЖАДАН Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся 1.1.1950 г. у в. Клімаўка. Кандыдат фізіка-матэматычных навук (1983). У 1972 г. скончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт. Працуе загадчыкам кафедры.

КАНАНОВІЧ Канстанцін Юльянавіч, нарадзіўся 8.12.1872 г. у в. Грабаўка. Беларускі вучоны ў галіне санітарыі і эпідэміялогіі, урач-оталарынголаг. У 1899 г. скончыў Кіеўскі універсітэт. Працаваў у Гомельскім павеце, Гомелі,

В.П.Горленка.

М.І.Жадан.

К.Ю.Канановіч.

В.С.Каржоў.

У.Н.Сідарцоў.

С.І.Сокарава.

М.І.Старавойтаў.

Магілёве. У 1922 г. арганізаваў першую ў СССР Гомельскую санітарна-эпідэміялагічную станцыю. Удзельнік першай сусветнай вайны, Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі. Аўтар шэрагу навуковых прац, у тым ліку: «Земско-врачебная организация Могилевской губернии и ее деятельность за 1905 год» (1907), «Санитарно-эпидемиологическая организация Гомельской губернии и ее деятельность за 1924 год» (1925), «Предупреждай болезни носа, горла и уха» (1930). Памёр 15.3.1954 г.

Выдатны ўрач-гуманіст

Сваю працоўную дзейнасць Канстанцін Юльянавіч пачаў у лютым 1890 г. у якасці сельскага ўрача ў м. Уваравічы Гомельскага павета. Пад яго кіраўніцтвам была пабудавана бальніца. Наступныя чатыры гады да чэрвеня 1906 г. Канстанцін Юльянавіч загадваў урачэбным участкам Сенненскага павета. У далейшым уся ўрачэбная дзейнасць яго праходзіла ў Магілёве. Вялікі вопыт практычнай работы сельскага ўрача-арганізатара і выканаўцы лячэбна-прафілактычных мерапрыемстваў дазволіў Канановічу ў чэрвені 1906 г. заняць пасаду ўрача пры земскай управе. Тут праявіўся яго талент урача і схільнасць да навуковых вывадаў і абагульненняў. Пачатак спецыялізацыі па хірургіі і оталарынгалагічных хваробах адносіцца да часу знаходжання ў навуковых камандзіроўках у г. Пецярбург (1906—1907). Увесь свой вольны час урач-наватар аддае практыцы оталарынголага ў лячэбніцы Александрыйскай абшчыны сясцёр міласэрнасці ў Магілёве. У 1907 г. ён стаў ініцыятарам першага з'езда ўрачоў. Вынікам гэтай работы было санітарна-статыстычнае даследаванне аб земскай урачэбнай арганізацыі Магілёўскай губерні. Для Канстанціна Юльянавіча як урача і грамадзяніна характэрна любоў да чалавека. У 1910 г. ён самаддана, з рызыкай для жыцця кіраваў барацьбой з эпідэміяй халеры ў Магілёўскай губерні. За гэтую дзейнасць быў узнагароджаны.

У маі 1911 г. займаў пасаду гарадскога санітарнага ўрача. У ліпені 1914 г. быў прызваны ў армію.

З 1919 г. загадваў санітарна-эпідэміялагічным аддзелам Гомельскага павета. У 1922 г. арганізаваў і ўзначаліў першую ў СССР санітарна-эпідэміялагічную станцыю, па ўзору якой былі створаны аналагічныя станцыі ў іншых гарадах СССР і Беларусі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Канстанцін Юльянавіч, нягледзячы на свой узрост, добраахвотна ідзе на фронт урачом-кансультантам эвакашпіталя.

Яго пяру належаць больш як 50 надрукаваных прац па арганізацыі аховы здароўя і санітарна-эпідэміялагічнай справы. Урад высока ацаніў яго шматгадовую працу на ніве аховы здароўя, за што ўзнагародзіў ордэнам Леніна і многімі медалямі.

Н.А. Гурэвіч.

КАРЖОЎ Васіль Сяргеевіч, нарадзіўся 4.3.1950 г. у в. Макаўе. Кандыдат эканамічных навук. Дацэнт. У 1978 г. скончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт. Аўтар звыш 50 навуковых прац.

СІДАРЦОЎ Уладзімір Нічыпаравіч, нарадзіўся 9.11.1935 г. у в. Клімаўка. Доктар гістарычных навук (1988). Прафесар. У 1958 г. скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. З 1966 г. працуе ў БДУ. Аўтар

каля 90 навуковых прац. Пад яго кіраўніцтвам упершыню на Беларусі пакладзены новы напрамак гістарычнай навукі — гістарычная інфарматыка.

СОКАРАВА Станіслава Іванаўна, нарадзілася 25.5.1950 г. у в. Шарпілаўка. Кандыдат філалагічных навук (1982). Дацэнт (1988). У 1972 г. скончыла Мінскі інстытут замежных моў. З 1972 г. працуе ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце. Аўтар звыш 30 навуковых прац.

СТАРАВОЙТАЎ Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся 3.11.1951 г. у пас. Арленск. Кандыдат гістарычных навук (1980). Дацэнт (1988). У 1974 г. скончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт. З 1977 г. працуе ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце, з 1993 г. — дэкан гісторыка-юрыдычнага факультэта. Аўтар звыш 20 навуковых прац.

ФІЛІПЦОЎ Уладзімір Фёдаравіч, нарадзіўся 26.6.1937 г. у в. Раманавічы. Кандыдат фізіка-матэматычных навук. Дацэнт. У 1963 г. скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. З 1969 г. працуе ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце. Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў.

ХАРЛАМАЎ Іван Фёдаравіч, нарадзіўся 30.6.1920 г. у в. Шарпілаўка ў сялянскай сям'і. Беларускі вучоны ў галіне педагогікі. Доктар педагагічных навук (1972). Прафесар (1974). Член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук (1974). Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1995). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1952 г. скончыў Гомельскі пединстытут. Працаваў настаўнікам, дырэктарам Карпаўскай сямігодкі Лоеўскага раёна, загадчыкам Лоеўскага райана, дырэктарам Шарпілаўскай сярэдняй школы. З 1955 г. выкладчык, дацэнт, прарэктар Гомельскага пединстытута. З 1969 г. — загадчык кафедры педагогікі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтар звыш 200 навуковых і навукова-метадычных прац, у тым ліку выданняў «Теория нравственного воспитания» (1972), «Как активизировать учение школьников» (1975), «Нравственное воспитание школьников» (1983), «Педагогика. Учебное пособие для студентов пединститутов и университетов» (1974) і іншых. Узнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны 2-й ступені, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і васьмю медалямі.

У.Ф.Філіпцоў.

І.Ф.Харламаў.

Г.В.Штыхаў.

ШТЫХАЎ Георгій Васільевіч, нарадзіўся 14.7.1927 г. у в. Старая Беліца. Беларускі археолаг і гісторык. Доктар гістарычных навук (1983). Прафесар (1989). Старшыня Беларускага нацыянальнага камітэта славянскай археалогіі (1996).

У 1956 г. скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працаваў настаўнікам гісторыі ў Лоеўскім раёне. З 1962 г. працуе ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, з 1993 г. — загадчык аддзела археалогіі і гісторыі Полацкай зямлі.

Навуковыя інтарэсы звязаны з вывучэннем сярэдневяковых старажытнасцей цэнтральнай і паўночнай Беларусі. Правёў шырокае вывучэнне Віцебска, Заслаўя, Лагойска, Лукомля, Мінска, Полацка. Раскапаў звыш 300 курганоў Полацкай зямлі, у тым ліку правёў раскопкі паселішча на р. Менка, вызначыў гарадзішча старажытнага Барысава.

За актыўны ўдзел у выданні «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларусі (1990).

Аўтар больш за 220 навуковых і навукова-папулярных прац, у тым ліку такіх выданняў, як «Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и эпохи феодализма» (1971), «Древний Полоцк IX—XIII вв.» (1975), «Города Полоцкой земли (IX—XIII вв.)» (1978), «Ажываюць сівыя стагоддзі» (1982), «Крывічы» (1992), «Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да канца XIII ст.» (1994). Па гісторыі Беларусі падрыхтаваў і выдаў некалькі падручнікаў для школ.

Нястомны даследчык старажытнасці

Ужо ў маладосці Г.В.Штыхаў захапіўся мінуўшчынай роднага краю, удзельнічаў у археалагічных раскопках, якія праводзілі на Гомельшчыне маскоўскія археолагі. Пазней працаваў настаўнікам гісторыі ў школе Лоеўскага раёна, а ў 1959 г. паступіў у аспірантуру Інстытута гісторыі па спецыяльнасці «Археалогія». Цікавыя і разнастайныя матэрыялы, атрыманыя за восем палявых сезонаў раскопак у самым старажытным беларускім горадзе, дазволілі падрыхтаваць і ў 1965 г. абараніць кандыдацкую дысертацыю «Старажытны Полацк IX—XIII стст.», а ў 1975 г., выкарыстаўшы звесткі летапісаў і іншых пісьмовых крыніц, выдаць першую манаграфію аб Полацку, у якой разгледжаны таксама пытанні полацкай дзяржаўнасці, падкрэслена роля веча (сходу палачан) у жыцці горада.

Далейшыя шматгадовыя даследаванні ў Віцебску, Лукомлі, Заслаўі, Лагойску, Барысаве прынеслі новыя здабыткі для паглыблення ведаў аб гандлёва-рамесніцкіх пасадах, аб развіцці трывалых сувязей гарадоў з іх акругамі, аб занятках і культуры гараджан славутага княства. Навуковы аналіз багатых калекцый, комплекснае іх вывучэнне былі пакладзены ў аснову і чарговай манаграфіі, і ў паспяхова абароненую ў 1983 г. доктарскую дысертацыю «Гарады Полацкай зямлі IX—XIII стст.». З 1983 г. па 1991 г. Г.В.Штыхаў узначальваў археалагічныя працы ў Мінску на месцы будаўніцтва станцыі метро «Няміга», дзе магутнасць культурнага пласта дасягала 7—8 метраў. Атрыманы новыя даныя аб планіроўцы сярэдневяковага горада, яго абарончых збудаваннях, арыгінальнай вежападобнай браме з дубовых бярвенняў, дрэнажнай сістэме для добраўпарадкавання вуліц і інш. Георгій Васільевіч — паслядоўны прыхільнік гіпотэзы, што ў IX—X ст. першапачатковы Менск размяшчаўся на берагах прытока Пцічы рэчкі Мень (Менкі), ад якой і атрымаў сваю назву.

У сувязі з дыскусіяй аб часе рассялення славян на тэрыторыі Беларусі Г.В.Штыхаў паставіў задачу вызначыць этнічнае асяроддзе, у якім узнікалі гарады Полацкай зямлі, прасачыць стадыі фарміравання заходняй галіны крывічоў — палачан. Для гэтай мэты вучоны сістэматычна на працягу 30 гадоў праводзіў археалагічныя раскопкі курганных могільнікаў у Віцебскай і Мінскай абласцях. Па выніках вывучэння 300 курганоў з 29 пунктаў даследчык прыйшоў да высновы: у этнагенетычным працэсе фарміравання крывічоў-палачан было тры стадыі. Да першай адносяцца археалагічныя помнікі банцараўскай культуры і культуры доўгіх курганоў паўночнай Беларусі VI—VII стагоддзяў. Другая стадыя ахоплівае VIII—IX ст. і характарызуецца больш інтэнсіўным пранікненнем славян у асяроддзе мясцовых плямён. Трэцяя — адносіцца да X—XI ст., калі на тэрыторыі Беларусі значна павялічылася колькасць усходнеславянскага (крывіцка-дрыгавіцкага) насельніцтва. Вось тады славяне і сталі асноўным насельніцтвам краю. Гэта мае вялікае значэнне для разумення працэсу фарміравання беларускай народнасці.

М. Гурын.

Навіны Акадэміі навук Беларусі. 1997. № 28.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ДЗЕЯЧЫ

КЛІМАЎ Іван Фролавіч, нарадзіўся 10.9.1903 г. у в. Касцюкоўка. Дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партызанскага руху ў Мінскай і Вілейскай абласцях у Вялікую Айчынную вайну. З 1916 г. працаваў на чыгуначным і водным транспарце ў Старых Дарогах, Слуцку, Гомелі. З 1923 г. на камсамольскай і партыйнай рабоце. З 1940 г. першы сакратар Вілейскага абкома КПБ. У 1943—1944 гг. — першы сакратар Вілейскага падпольнага абкома КПБ. З 1944 г. першы сакратар Вілейскага, Маладзечанскага,

Баранавіцкага абкомаў партыі. З 1962 г. намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР. У 1968—1974 гг. намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Адзін з аўтараў кнігі «Партызаны Віцебшчыны» (1970). Памёр 9.10.1991 г.

МАЗУРАЎ Кірыла Трафімавіч, нарадзіўся 7.4.1914 г. ў в. Прыбыткаўская Рудня. Дзяржаўны і палітычны дзеяч. Герой Сацыялістычнай Працы (1974).

У 1933 г. скончыў Гомельскі аўтадарожны тэхнікум, у 1947 г. — Вышэйшую партыйную школу пры ЦК ВКП(б). Працаваў тэхнікам, начальнікам Камарынскага раённага дарожнага аддзела (1933—1939), загадчыкам аддзела Гомельскага абкома (з 1939), сакратаром Гомельскага гаркома ЛКСМБ (з 1940). У Вялікую Айчынную вайну на фронце, з 1942 г. на акупіраванай тэрыторыі Беларусі са спецзаданнем. Як прадстаўнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху знаходзіўся ў партызанскіх злучэннях Мінскай, Палескай, Пінскай, Баранавіцкай і Брэсцкай абласцей.

З 1943 г. другі, першы сакратар ЦК ЛКСМБ, у апараце ЦК КПБ. З 1956 г. першы сакратар ЦК КПБ. У 1965—1978 гг. першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР. Член ЦК КПБ (1949—1966), член ЦК КПСС (1956—1981), член Палітбюро ЦК КПСС (1966—1978). Старшыня Усесаюзнага Савета ветэранаў вайны і працы (1986—1989). Аўтар кнігі ўспамінаў «Незабываемае» (1984, 1987). Памёр 19.12.1989 г.

І.Ф.Клімаў.

К.Т.Мазураў.

Мае вытокі

Родился я в апреле 1914 года в деревне Рудня, что в 10 километрах юго-восточнее Гомеля. Чисто крестьянских дворов в ней было мало. Главы большинства семей считались так называемыми рабочими-крестьянами. Почти в каждом хозяйстве имелся небольшой участок — два-три гектара. Но земли отличались малым плодородием, поэтому мужчины или постоянно работали в Гомеле, или нанимались на сезон, уезжали в Донбасс добывать уголь, убирать хлеба, строить дома.

Дед рассказывал, что наша деревня не случайно называется Рудня. В далекие времена здесь, на берегу реки, стояла рудница — мастерская по выплавке металла и производству железных изделий. Он утверждал, что наши предки пришли сюда с Урала и поселились в лесах еще при Петре Первом. Было ли то правдой — трудно сказать, хотя многие земляки отличаются от окрестных жителей своими русскими фамилиями: Пыталевы, Кирьяновы, Хартасовы, Барановы, Кауровы.

Семья, в которой прошло мое детство, была большой. В пятистенке проживали вместе 16 душ — дед Иван Лавренович, бабка Василиса, их сыновья Трофим, Родион, Сергей со своими женами и детьми, Антон, Никита, дочь Марина. У моего отца с матерью нас было шестеро: четверо мальчиков и две девочки. Я — младший. Дед и все его сыновья, кроме Никиты, работали в Гомеле в железнодорожных мастерских. В начале первой мировой войны Родиона и Сергея мобилизовали в солдаты.

Дед был грамотный и любил книги. Читал главным образом религиозно-философские сочинения Л.Н.Толстого, считал себя его последователем и даже внешне старался походить на великого писателя. Одевался в длинную белую рубаху, подпоясанную шнурком, черные шаровары и сапоги. На голове — шляпа.

Я любил деда, и он уделял мне много внимания, рассказывал разные поучительные истории. Однако на воспитании моем и моих братьев и сестер решающим образом сказалось влияние отца.

Он, на мой взгляд, был незаурядной личностью. Трофим Иванович — один из тех, способности которых в силу социальных условий не могли полностью проявиться и пойти на пользу обществу. Помоему, он обладал талантом воспитателя. Помнится отец добрым, но строгим и к себе и к людям. Не верил в Бога, не пил спиртного, не выносил сквернословия и

пошлости. Даже своей внешностью сразу располагал к себе — среднего роста, широкоплечий, сильный, открытый взгляд, лицо энергичное, русая с проседью широкая борода, одет всегда аккуратно в косоворотку с витым пояском под черным пиджаком, темные брюки, заправленные в сапоги. Так одевались тогда мастеровые. Люди к нему тянулись, приходили за советом, делились своими бедами. В семье у нас не было ссор. Отец никого из детей не наказывал, даже не ругал. Взглянет, бывало, на провинившегося укоризненно — достаточно, каждый из нас готов был после этого хоть сквозь землю провалиться. Так он влиял на всех и все боялись навлечь на себя неудовольствие этого человека. Окончив только церковноприходскую школу, отец постоянно занимался самообразованием, регулярно читал газеты и иллюстрированные журналы (выписывал журнал «Нива»). После революции заинтересовался работами В.И.Ленина. Ему помогал разбираться в политике, трудах Владимира Ильича дядя Родион, который окончил двухклассное городское училище и возвратился с войны большевиком.

Отец слыл мастером на все руки. В мастерских работал столяром. Умел ставить срубы, накрывать крышу, класть русские печи, чинить ведра и сельскохозяйственный инвентарь. Дома всегда что-то делал, выполняя заказы односельчан.

Моя мать Агафья Акимовна — простая, очень добрая женщина. После изнурительной работы в поле постоянно хлопотала по хозяйству и вечно заботилась о нас, детях, да еще о нищих и обездоленных, которых в ту пору много бродило по деревням.

Дядя Родион после революции вернулся на Гомельский паровозоремонтный завод и вскоре с семьей переселился в город. Дядя Сергей пропал на империалистической войне без вести. Его семья уехала к своим родным. Дядя Антон вернулся с фронта без ноги. После он мастерил по заказам односельчан различную утварь, да вскоре заболел чахоткой и умер.

В 1918 году во время оккупации наших мест войсками кайзеровской Германии начали создаваться партизанские отряды. В районе Сновска сформировался отряд Н.А.Щорса, выросший потом в дивизию. В него вступил дядя Никита, а мой брат Тимофей — в продотряд.

Мне едва исполнилось четыре года, когда весной 1918 года в Рудню пришли немцы. Детские впечатления, как известно, нередко сохраняются на всю жизнь. Вот и в моей памяти остались усатые, красные, толстые физиономии в касках с шишаками. У нас оккупанты забрали свинью и тут же во дворе ее освежевали. Мать плакала. Она запихивала детишек в погреб, а мы не хотели залезать туда и все глазели на невиданных пришельцев. Вскоре они убрались. Теперь через деревню часто проходили части Красной Армии.

Гомель и окружающие его районы в первые годы Советской власти были прифронтовыми. После немецких оккупантов этим губернским городом и важным железнодорожным узлом пытались овладеть петлюровцы, белогвардейцы-деникинцы, войска буржуазно-помещичьей Польши, но врагам этого сделать не удалось. Однажды летом 1919 года в Рудню прибыл кавалерийский полк Красной Армии. В нашем дворе разместился его штаб. Запомнился командир — ладный, весь в ремнях. Его ординарец подсадил меня в седло на огромного коня, и я со страхом, но и с гордостью проехал по улице до колодца на виду у всех ребятишек.

Когда окончилась гражданская война, я уже кое-что понимал. Видел, как трудно мы жили.

В стране, истекавшей кровью, мобилизовавшей все силы на разгром интервентов и внутренней контрреволюции, была разруха и голод. Особенно трудно приходилось рабочим семьям. Не миновали лишения и нашу семью. Хлеб мать пекла пополам с мякиной. Жмыхи, которые доставали на маслозаводе и которые называли макухой, считались деликатесом. Мать из них и муки приготавливала похлебку — «кулагу», после употребления которой все мы страдали животами. Не было соли и керосина. Дом освещала обычно коптилка со шнурком, пропитанным салом.

В железнодорожных мастерских, где трудились дети и отец, работы сократились, и дед, к неудовольствию моего отца, решил, что он как старший в семье должен теперь заняться сельским хозяйством. За счет конфискованных у помещика зе-

мель наша семья получила 6 десятин. Дядя Никита, вернувшись с фронта, стал помогать моему отцу. Старший же мой брат Тимофей некоторое время работал в мастерских мер и весов. Однажды он увез меня в город. Первые впечатления о поездке поездом, о вокзале, о самих мастерских, которые размещались в каком-то темном сарае, и о ночлеге там рядом с братом, прямо на полу, остались в моем детском воображении как необыкновенные приключения. После долгих и безрезультатных поисков постоянной работы Тимофей уехал искать счастья в Сибирь. Добрался до Барнаула, где проживали братья деда, обзавелся семьей да так и застрял там. В годы Великой Отечественной войны в составе одной из сибирских дивизий участвовал в прорыве блокады Ленинграда и погиб.

Несмотря на лишения, которые мне пришлось перенести в детстве, недолгое пребывание в деревне осталось в памяти как лучший период жизни.

Наша деревня раскинулась на высоком берегу небольшой речки Уть. Немноговодная и спокойная, с кристально чистой водой, она, извиваясь и петляя, ласкала берега. За речкой — луга, а за деревней — сосновый бор, где сельчане собирали грибы и ягоды.

На мое воспитание благотворно влияла природа. Незабываемы прогулки в величественные дубравы, на душистые пойменные луга. Навсегда запомнились прозрачные, голубые рассветы, наполненные пением птиц, и тихие вечера с их золотыми закатами. Особенно любил слушать на рассвете кукушку и удода.

Вспоминаются поездки в ночное, когда мы, малыши, с восторгом и трепетом слушали у костра интересные, хотя порой и малоправдоподобные рассказы взрослых.

... Рудня стояла на старинном, так называемом екатерининском шляху, связывавшем Петербург с Одессой. Он представлял собой обычную грунтовую дорогу, но широкую, на всем протяжении усаженную с обеих сторон березами. Ездила ли царица Екатерина по этому пути, никто в деревне не знал, но зато (особенно после гражданской войны) тянулись по нему обозы украинских «чумаков», возивших в Гомель и другие северные города, в том числе и в Питер, соль и богатые дары своей земли. Украинцы часто останавливались на ночлег в домах односельчан, расплачиваясь за услуги продуктами. Эти заработки являлись большим подспорьем для деревенской бедноты. Моих земляков кормила не столько земля, сколько различные заработки на стороне. Тем, у кого было много ребятишек, приходилось особенно туго.

Проезжавшие украинцы привозили с собой не только дары своей богатой земли, но и песни, интересные рассказы, а иногда и литературу. Не случайно в Рудне звучали украинский говор и украинские песни.

В деревне дружил со своими сверстниками Лешей Пыталевым, Сашей Кирьяновым, Мишей Кауровым, Тимой Хархасовым, Тимой Барановым. Вместе пасли гусей, ездили в ночное, играли в «чижика» и в лапту, вместе совершали набеги на сады и огороды соседей, за что не раз получали выволочку. Позднее жизнь разбросала нас. Я уехал в город. Мои друзья продолжали жить и учиться в деревне, где в 1924 году уже открылась семилетняя школа.

Обучаясь в городской школе, я приезжал на летние каникулы домой и помогал отцу и старшим братьям в крестьянской работе — пас скот, пахал, косил траву, убирал хлеб. Наше хозяйство считалось середняцким. Мы имели корову и лошадь, а также шесть десятин земли.

В деревне почти ежедневно проходили собрания, беседы в избе-читальне, а то и митинги. Часто приезжали шефы — рабочие из города. Общественная жизнь тогда повсеместно бурлила.

В годы восстановительного периода, когда начала возрождаться промышленность молодой Советской республики, и в годы нэпа мои братья Семен, Василий и сестра Софья работали на строительстве железной и шоссейной дорог Гомель — Чернигов. После завершения строительства перешли на предприятия города. Отец с матерью продолжали трудиться в своем хозяйстве. Отец, кроме того, подрабатывал у односельчан — кому крышу накроет, кому сруб поставит, мебель сколотит. Так и жили — не богато, но и не голодно.

З кнігі: Мазуров К.Т. Незабываемое. Мн., 1984.

М.З.Башлакоў.

ТВОРЦЫ

БАШЛАКОЎ Міхаіл Захаравіч (Міхась Башлакоў), нарадзіўся 27.4.1951 г. у пас. Станцыя Церуха (цяпер пас. Баштан) у сям'і чыгуначніка. Беларускі паэт. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Скончыў Грабаўскую сярэднюю школу (1968), гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта (1973). Працаваў настаўнікам Нісімкавіцкай сярэдняй школы Чачэрскага раёна (1973—1974), Цеменіцкай сярэдняй школы на Браншчыне (1974—1975), Пракопаўскай васьмігадовай школы Гомельскага раёна (1975—1978), намеснікам дырэктара гэтай жа школы. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў школах г. Гомеля (1978—1985). Працаваў карэспандэнтам-арганізатарам Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі па Гомельскай вобласці (1985—1990). З 1991 г. вядучы рэдактар, з 1996 г. галоўны метадыст арганізацыйна-метадычнага цэнтра па выданні гісторыка-дакументальных Хронік Памяці Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Удзельнік ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Першыя вершы надрукаваў у гомельскай раённай газеце «Маяк» (1968). Аўтар кніг паэзіі «Касавіца» (1979), «Начны паром» (1987), «Дні мае залатыя» (1993), «Лілея на цёмнай вадзе» (паэма, 1994). На некаторыя вершы паэта напісаны музычныя творы, у тым ліку кантаты «Радзіма надзей і трывог» і «Дні мае залатыя».

З паэзіі Міхася Башлакова

Матчыны грыбы перабіраю,
Што прывезла сёння з Церухі.
І здаецца, зноў я адчуваю
Прэлы пах імшэлае страхі.

Бачу асцярожны след ласіны
У світальным восеньскім бары.
І прычулася, што зноў асіну
Падгрызлі над рэчкаю бабры.

Помню, як мурзатыя да пятак
Смажылі ля поля каласкі.
... Яшчэ спалі за туманам хаты,
А ўжо нас гукалі цягнікі.

Ад усіх забаў сваіх дзіцячых
Спадарожным поездам уцёк.
І у спешцы я забыў удачу,
І забыў са шчасцем вузялок.

Вось чаму цяпер перабіраю
З хваляваннем матчыны грыбы.
Усё здаецца, што між іх спаткаю
Шумныя дзіцячыя гады...

* * *

Сыну Андрэю

Завечарэла. Дымкай зацягнула.
Чакаю я цягнік на Церуху.
Жыццё, як хуткі поезд, прамільгнула...
Калі і як? Паверыць не магу.

Што я паспеў на гэтым свеце белым?
Дзесятак вершаў нейкіх напісаў?
Чаму ж так рана сёння звечарэла?
Шчыміць душа... і просіцца сляза.

Ссамотнеў я па дарагіх мясцінах.
Я на радзіме так даўно не быў.
Спынюся каля роднае хаціны.
Я помню ўсё. Нічога не забыў.

Я помню дні маленства залатыя,
Пах бульбы і цяпло начных кастроў...
Мурожнымі сцяжынамі ляснымі
Блукае рэха даўніх тых гадоў.

І хоць ніхто мяне там не чакае.
І хоць чужы агеньчык там гарыць.
У Церуху да бэзавага мая
Асенні мой цягнік загрукаціць...

КАСАВІЦА

Нас разбудзіць на дымным світанку
Дробны-дробны стук малатка.
Клепле маці касу каля ганка.
Ходзіць бойка па клёпе рука.

Маці, нібы каса-дзевятуха,
Купін бачыла шмат на вяку.
Выпраўляе кляпун лапатуху.
Зычным рэхам разносіцца стук.

І ў суседзяў злева і справа
Зазвіняць, запяюць малаткі.
Упадуць сёння першыя травы
Пад касой ля туманнай ракі.

Касавіца.
Чаканае свята.
Выйдзе Чэрвень з касцамі на луг.
Малады, у настроі прыўзнятым.
Размахнецца —
захопіць аж дух.

Луг расквеціцца фарбамі хустак,
Гучнай песняй акоціць прастор.
Водар сена, настоены густа,
Важным панам заедзе у двор.

Клепле маці касу ...
Касавіца.
Малаткі ўсё гамоняць званчэй.
Самы сон...
Нам ніколькі ж не спіцца:
Пакуляцца б у сене хутчэй...

І няўцям мне тады было з братам,
Калі двор сенам радасна пах,
Што матуля нам гэтае свята
Носіць ношкамі на плячах.

НАВАБЕЛІЦА

Мне прыснілася зноў Навабеліца
І на вуліцы Сонечнай дом,
Дзе вясной цвет вішнёвы мяцеліцца
За маім адзінокім акном.

Дзе на лавачцы вечарам познім
Маці доўга з суседкай сядзіць,
Дзе апоўначы поўня над пожняй
І за соснамі бакен гарыць.

Мне прыснілася ціхая раніца,
За ракой салаўі ў лазняках.
Я паеду дамоў...
Там туманіцца
Пад старымі бярозамі шлях.

П.Н.Гаўрыленка.

Там за хатамі пасвяцца коні,
Там у жыце цвітуць васількі.
На гулянках там хрыпнуць гармоні,
І співаюцца мужыкі...

Там гарачыя спелыя дзеўкі:
Млеюць грудзі тугой цецівой.
Нібы стрэлы, саскі пад сукенкай,
Ружаватыя над белізной...

Там зара над заснежаным полем
На паўнеба гарыць за сялом.
І мой сон адклікаецца болем,
І мой боль адклікаецца сном...

ВАСЮК Тамара Іванаўна, нарадзілася 6.7.1952 г. у в. Хатаранка. Беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У 1977 г. скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. З 1992 г. выкладае ў Беларускім універсітэце культуры. Працуе ў кераміцы. Аўтар медалёў «Гусоўскі», «Драздовіч» (абодва 1975), дэкаратыўных кампазіцый «Белая» (1981), «Дзяды» (1982), дэкаратыўнай маскі «Пінская шляхта» (1983), скульптур «Чаканне», «Вандроўнік», «Дабрыня», «Лесавік», «Вадзянік», «Дамавік» (усе 1984—1986), «Барбара Радзівіл» (1992), «Радзівіл Чорны» (1993), дэкаратыўных ваз «Свянцянскае зелле», «Ахвярнік», «Вечар», «Краявід» (усе 1988—1990).

ГАЎРЫЛЕНКА Павел Нікіфаравіч, нарадзіўся 28.2.1902 г. у в. Касцюкоўка ў сялянскай сям'і. Беларускі мастак. У 1930 г. скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1956—1961 гг. старшыня Саюза мастакоў Беларусі. Працаваў у жывапісе. Аўтар карцін: «Ваколіца. Касцюкоўка» (1935), «Домік маці» (1935), «Гарадскі краявід» (1936), «Партызаны на Палессі»

(1942), «Сакавік» (1945), «Халодны дзень» (1945), «Пераправа» (1946), «Алея ў садзе» (1949), «Малацьба» (1950), «На партызанскім аэрадроме» (1950), «Ідзе эшалон» (1957), «Вясна» (1958), «Мокры луг» (1960) і іншых. Памёр 4.2.1961 г.

Жыццёвасць вобразаў

Вялікая і дружная сям'я, якая ніяк не магла выбіцца з галечы, праца на бацькавай гаспадарцы ў роднай вёсцы — вось як праходзіла дзяцінства будучага жывапісца.

Ён быў яшчэ падлеткам, калі пачалася Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя. У 1922 г. юнак уступіў у камсамол, а праз год, па мабілізацыі Гомельскага павятовага камітэта камсамола, пайшоў служыць у Чырвоную Армію. І камсамол, і служба ў арміі памаглі яму духоўна загартавацца, абудзілі прагу да актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, імкненне да набыцця ведаў.

Яшчэ ў дзяцінстве Павел праяўляў здольнасць да малявання. Аднаго разу хлопчык надумаў пакпіць са свайго багамольнага дзядзькі і, намаляваўшы вясковую прыгажуню, павесіў у куце сярод старых абразоў.

Сур'ёзна захапляцца маляваннем малады Гаўрыленка пачаў тады, калі служыў у Чырвонай Арміі. Ён удзельнічаў у выстаўцы чырвонаармейскага мастацтва ў Смаленску і атрымаў за свае малюнкі ўзнагароду — імянны гадзіннік. У 1926 г., калі скончыўся тэрмін вайсковай службы, Павел Гаўрыленка паехаў у Віцебск і паступіў вучыцца ў мастацкі тэхнікум.

Віцебскі тэхнікум з'яўляўся ў тыя гады асноўным цэнтрам падрыхтоўкі беларускіх мастакоў. У той час у ім выкладалі выхаванцы Пецярбургскай акадэміі мастацтваў М.А.Керзін, В.В.Волкаў, М.Г.Эндэ і іншыя...

У 1930 г. П.Н.Гаўрыленка скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум і пераехаў у Мінск. Тут пачалася яго актыўная творчая і грамадская дзейнасць. Ён далучыўся да рэвалюцыйнай арганізацыі мастакоў Беларусі (РАМБ), створанай у 1929 г. У РАМБ уваходзілі скульптары А.М.Бразер і А.В.Грубе, жывапісцы І.О.Ахрэмчык, А.Г.Касталянскі і іншыя.

У 1931 г. П.Н.Гаўрыленка быў абраны адказным сакратаром РАМБа.

На IV Усебеларускай мастацкай выстаўцы экспанаваліся дзве карціны Паўла Нікіфаравіча — «Брыгада за працай у калгасе» (1931), «Разгрузка элеватара» (1930) і два малюнкі — «Шклабуд» і «Аршанскі элеватар» (1931). Гэтыя творы не захаваліся.

На V Усебеларускай мастацкай выстаўцы (1932) экспануюцца новыя палотны П.Н.Гаўрыленкі «Пуск завода» (1932), «На будаўніцтве» (1931), «У разведцы» (1932) і некалькі малюнкаў. Да нас дайшла толькі фотарэпрадукцыя з карціны «На будаўніцтве».

На выстаўцы беларускага мастацтва ў Маскве ў 1935 г. экспанавалася яго карціна «Элеватар», пейзаж Мінска і аўтапартрэт.

П.Гаўрыленка.
На партызанскім аэрадроме.
1950.

Мастак шмат працуе, каб спалучыць канкрэтнасць паказу з неабходнай цэласнасцю. Эцюды, зробленыя ў трыццатыя гады, сведчаць, што мастак паступова набліжаўся да паспяховага вырашэння гэтай задачы. Некаторыя з эцюдаў захаваліся: пейзажы Касцюкоўкі («Ваколіца», 1935; «Домік маці», 1935) і «Гарадскі краявід» (1936).

«Ваколіца» і «Домік маці» — гэта дакладныя закончаныя пейзажы мясцін, дзе прайшло маленства мастака. У іх відаць імкненне перадаць самыя асноўныя і пастаянныя ўражанні. Ці піша ён вясковую хату, куды неаднойчы прыязджаў пагасціць да маці, ці купы дрэў, качаны капусты на агародзе або вясковую ваколіцу, Павел Нікіфаравіч знаходзіць непарыўную сувязь усіх элементаў формы, усіх асноўных колераў.

22 чэрвеня 1941 г. пачалася Вялікая Айчынная вайна. З першых дзён яе Павел Нікіфаравіч знаходзіўся ў радах Савецкай Арміі. У 1942 г. урад БССР адклікае Гаўрыленку ў Маскву, дзе ён назначаецца начальнікам аддзела выяўленчага мастацтва Упраўлення па справах мастацтва.

Многа энергіі аддае Павел Нікіфаравіч, каб наладзіць сувязь з беларускімі мастакамі, якія знаходзіліся на фронце, ваявалі ў партызанскіх атрадах ці былі эвакуіраваны ў тыл.

На выстаўцы, арганізаванай у Маскве ў гонар 25-годдзя БССР (1944), выступіў вялікі і згуртаваны калектыў беларускіх жывапісцаў, скульптараў, графікаў. На ёй былі прадстаўлены творы, прысланыя з многіх гарадоў Савецкага Саюза, з розных франтоў і партызанскіх атрадаў. І ў гэтым вялікая заслуга П.Н.Гаўрыленкі.

І ў час вайны, і ў першыя гады пасля яе сканчэння Павел Нікіфаравіч працуе над графічнымі і жывапіснымі творамі, прысвечанымі гераічнай барацьбе савецкага народа з фашысцкімі захопнікамі. У 1942 г. ён напісаў эскіз «Прарыў нямецкай абароны», экспанаваны на выстаўцы ў Новасібірску. У 1943 г. мастак стварае графічную кампазіцыю «Вяртанне партызан з аперацыі» (пяро, туш), а потым паўтарае яе ў карціне «Партызаны на Палессі» (1944).

У 1946 г. П.Н.Гаўрыленка піша карціну «Пераправа (фарсіраванне ракі)». Нечым яна нагадвае кампазіцыю «Вяртанне партызан з аперацыі». Тут зноў намаляваны лясісты бераг, далей на вадзе відаць плыты з воінскімі падраздзяленнямі, якія фарсіруюць раку. У цэнтры знаходзяцца дзве фігуры — жанчына-партызанка і баец у плашч-палатцы з аўтаматам у руках.

Неўзабаве П.Н.Гаўрыленка піша карціну «На партызанскім аэрадроме» (1948). Сюжэт яе просты. На лясной паляне партызаны сустракаюць лётчыка з Вялікай зямлі, які даставіў ім вайсковае забеспячэнне.

Адначасова з творамі аб Вялікай Айчыннай вайне П.Н.Гаўрыленка піша некалькі карцін, прысвечаных пасляваеннай Беларусі. Гэта — «З зямлянак у новыя дамы» (1947), «Збор яблык» (1949), «Шклозавод» (1949). Уважліва адлюстроўвае ў іх мастак мірнае жыццё беларускай вёскі, нанава адбудаваных заводаў, нараджэнне якіх ён паказаў некалі ў сваіх першых палотнах.

У 1951—1954 гг. П.Н.Гаўрыленка амаль не піша вялікіх тэматычных кампазіцый. Эцюдныя матэрыялы гэтага перыяду з'яўляюцца як бы падрыхтоўчай

П.Гаўрыленка. Ідзе эшалон. 1957.

А.С.Грачанікаў.

работай да значных кампазіцыйных твораў, прысвечаных мірнай працы. Ён працуе галоўным мастаком па афармленню новага павільёна Беларускай ССР на Усесаюзнай выстаўцы сельскай гаспадаркі (цяпер Выстаўка дасягненняў народнай гаспадаркі) у Маскве.

У 1957 г. П.Н.Гаўрыленка піша невялікія палотны «На будоўлі» і «Украіна новага Мінска». На іх паказаны чыстыя ўтульныя дамы, дзе-нідзе над новымі будынкамі ўзвышаецца вежавы кран. Лініі, якімі акрэслены контуры дамоў і кран, скакойныя і выразныя, а фарбы палотнаў — светлыя і радасныя. Тут усё перадаецца больш канкрэтна, дакладна, чым у карцінах на гэтую ж тэму, зробленых у трыццатыя гады. Карціны гэтыя свежыя, без залішняй сухасці. У іх адлюстраваны не толькі працэс працы, яе тэмп і напружанне, а і вынік — паказана, як праца робіць жыццё людзей радасным, шчаслівым.

Яшчэ больш яркае, паэтычна-цэласнае ўспрыманне рэчаіснасці знайшло выяўленне ў карціне «Ідзе эшалон» (1957), якая экспанавалася на Усесаюзнай юбілейнай выстаўцы, прысвечанай 40-годдзю Кастрычніка. ...Летні сонечны пейзаж; на сенажаці, стракатай ад кветак, дзеці глядзяць услед цягніку з платформамі, які вязе новыя трактары і аўтамашыны. У простай сцэне сучаснае Савецкай Беларусі пераклікаецца з будучым, з заўтрашнім днём краіны. Карціна, магчыма, залішне квяцістая, але разам з тым вясёлая шматколернасць робіць яе неяк па-дзіцячаму радаснай і яснай, у адпаведнасці з яе сюжэтам.

Апошняя работа мастака «На рыштаваннях» — складаная кампазіцыя, прысвечаная працоўным будням Беларусі. Яна задумана як своеасаблівая жывапіская паэма аб невычарпальных жыццёвых і творчых сілах народа.

Але закончыць карціну мастаку не давялося.

4 лютага 1961 г. пасля працяглай хваробы Павел Нікіфаравіч Гаўрыленка памёр.

З кнігі: Аладава А. Павел Нікіфаравіч Гаўрыленка. Мн., 1963.

ГРАЧАНІКАЎ Анатоль Сямёнавіч, нарадзіўся 8.9.1938 г. у в. Шарпілаўка ў сям'і служачага. Беларускі паэт. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1960 г. скончыў Гомельскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, у 1969 г. — Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Працаваў на рамонтна-механічным заводзе (1960—1962), намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Гомельскага абкома камсамола (1962—1965), першым сакратаром Гомельскага гаркома камсамола (1965—1967), загадчыкам аддзела літаратуры газеты «Літаратура і мастацтва» (1969—1971), намеснікам старшыні праўлення СП Беларусі (1971—1976), галоўным рэдактарам часопіса «Вясёлка» (1976—1978), часопіса «Бярозка» (1978—1982), часопіса «Маладосць» (1982—1991).

Аўтар зборнікаў паэзіі: «Магістраль» (1964), «Круглая плошча» (1971), «Грыбная пара» (1973), «Начная змена» (1975), «Дрэва на выспе» (1977), «Калі далёка ты» (1979), «Палессе» (1983), «Верасень» (1984), «Я вас люблю» (1986), «Жнівень-45» (1990). Выдаў некалькі кніжак для дзяцей.

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1974), Дзяржаўнай прэміі БССР (1984). Памёр 7.3.1991 г.

З вершаў Анатоля Грачанікава

Шарпілаўка цячэ ў жыццё, як Сож,
Свае ў яе віры і перакаты.
Апоўначы на сцішаныя хаты
Мядзведзіца схіляе зорны кош.
І ў першароднай цішыні наўкол
Я слухаю, прысеўшы на калоды,
Як вечнасць, асядаючы на дол,
Быцця зямнога запаўняе соты.
Гудуць у небе зоры, быццам восы,
Нябесная дыміцца сенажаць.
Нібы застагаваныя пакосы,

Над лесам хмары сонныя ляжаць.
А вёска спіць. Бязгрэшна. Ціхамірна.
Ад бальшакоў задымленых узбоч.
На ўсё жыццё запрэжаная ў свірны,
Перапаўзае жнівеньскую ноч.
Сапе смактухай успацелай глеба.
Прарэзваецца досвітку смуга.
Не трэба вёсцы дакучаць, не трэба.
Яна сама разбудзіць пастуха.

* * *

Дняпро і Сож. Міжрэчча.
Зараснікі парэчак.
Царства ласінае, салаўінае.
Звонкае лета шыпшыннае.
Ціхі прытулак язёў і самоў...
...Зноўку хачу дамоў.
Там, паміж Гомелем — Кіевам,
Над Сожам крылы ускінула
І кліча мяне, нібы кнігаўка,
Вёска мая — Шарпілаўка.
Стоміцца сэрца, здарожыцца,
Ды ноччу і днём трывожыцца:
Як там бацькі і родзічы,
Дубровы і курганы?
Жыву, іх усюды помнячы,
Ці помняць мяне яны?

ЕЛІСЕЕЎ Леанід Аляксеевіч, нарадзіўся 2.1.1938 г. у Навабеліцы. Беларускі мастак. У 1967 г. скончыў Арлоўскі педінстытут. Працуе ў жывапісе. Аўтар работ: «Цішыня» (1983), «Баравікі» (1983), «Чэрвеньскі матыў» (1989), «Мой родны кут» (1989), «Лясное возера» (1990), «Навала» (1996) і інш.

ЕЎТУХОЎ Уладзімір Аляксеевіч, нарадзіўся 25.1.1948 г. у п. Вішанскі. Беларускі мастак. У 1974 г. скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працуе ў манументальна-дэкаратыўным мастацтве і жывапісе. Аўтар манументальна-дэкаратыўных работ: «Поры года» (1974, Мазыр), «Маладыя» (1975, Гомель), «Юнацтва» (1975, Гомель), «Людзі ў белых халатах» (1977, Гомель), «Братам Лізюковым» (1977, Гомель), «Зямля партызанская» (1982, Гомель), «Народжаныя рэвалюцыяй» (1983, Гомель), «Вячэрняя песня» (1985, Гомель), «У добры шлях» (1983, Рагачоў) і жывапісных: «Пейзаж» (1976), «Дождж» (1977), «Таёжны гай» (1977), «У родны край» (1980), «Дзяўчынка з кветкай» (1981), «Сыны Беларусі» (1983) і іншых.

ЖЫХАРАЎ Віктар Канстанцінавіч, нарадзіўся 17.11.1940 г. у в. Новая Мільча. Беларускі мастак. У 1958 г. скончыў Гомельскую студыю выяўленчага мастацтва, а затым Алма-Аціпскае мастацкае вучылішча (1961). Працуе ў жанры пейзажу. Аўтар работ: «Вяртанне вясны», «Блакітны дзень», «Стажкі», «Восень», «Зіма ў Мільчы», «На зямлі чарнобыльскай», «Падняпроўе» і іншых.

ЛУК'ЯНЕНКА Пётр Дзмітрыевіч, нарадзіўся 26.6.1950 г. у г.п. Касцюкоўка. Беларускі мастак. У 1980 г. скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працуе ў жывапісе. Удзельнік рэспубліканскіх, усесаюзных і замежных выстаў. Аўтар работ: «Нацюрморт з лямпай» (1980), «Настальгія» (1982), «Крым» (1985), «Нацюрморт цяжкіх ваенных гадоў» (1985), «Нацюрморт з рабінай» (1986), «Стары млын» (1986) і іншых.

ЛЯШКЕВІЧ Валерый Віктаравіч, нарадзіўся ў 1950 г. у в. Чкалава. Беларускі мастак. Вучыўся ў Яраслаўскім і Бранскім мастацкім вучылішчах (1974—1983), наведваў клас малюнка Акадэміі мастацтваў у Ленінградзе (1985—1987). Працуе ў графіцы. Персанальныя выстаўкі работ прайшлі ў г. Жыздра Калужскай вобласці (1983) і ў Гомелі (1994). Аўтар работ: «Двухлікі Янус», «Экалогія», «Партрэт жанчыны», «Партрэт мужчыны» і іншыя.

МАЖЭЙКА Аляксандр Васільевіч, нарадзіўся ў 1931 г. у в. Вясёлае Поле ў сям'і настаўніка. Беларускі літаратуразнавец і перакладчык. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працаваў у інстытуце літаратуры імя Я.Купалы НАН Беларусі, газеце «Літаратура і мастацтва», выдавецтве «Народная асвета».

Аўтар публікацый пра чэшска-славацка-беларускія літаратурныя сувязі. Перакладае з чэшскай, славацкай, польскай і балгарскай моў. Пераклаў з польскай мовы творы М.Дамброўскай, Т.Новака, З.Жакевіч, з чэшскай Я.Гашака і іншыя.

МАІСЕЕНКА Алег Раманавіч, нарадзіўся 25.5.1939 г. у в. Цярэнічы ў сям'і настаўнікаў. Скончыў Баранавіцкае тэхнічнае вучылішча, Гомельскі педінстытут імя В.П.Чкалава (1966). Працаваў на камсамольскай, партыйнай і савецкай рабоце. Цяпер — начальнік упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкома.

Т.В.Мельчанка.

Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь (1996).

Аўтар зборніка паэзіі «Дарогі памяці» (1989).

З вершаў Алега Маісеенкі

ЦЯРЭНІЧЫ
Між прывольных палёў,
Дзе Узы берагі
Яблынь белаю кіпенню пеняцца,
У сусвеце плыве
Мой куток дарагі —
Мая ціхая вёска Цярэнічы.
Тут дзяцінства маё
Басанож адышло.
Тут каханне спазнаў
Я юначае.
Тут мужнеў,
Тут упэўнена стаў на крыло,
Ў шлях жыццёвы пайшоў
Маім лёсам прызначаны.
Што пакінуў цябе,
Ты даруй мне, прабач...
Мая ж памяць трымае
Былога карціны —
У жытнёвых палях
Перапёлчыны плач,
У асеннюю ноч
Сумны крык жураўліны.
Гвалт гракоў
На узнятае плугам раллі,
Туманы,
Што над чыстымі водамі сцелюцца...
Над ракой, на масту
Тут заядла вялі
Рэй музыкі з Аздзеліна, Старае Беліцы...
Я садамі у мроях
Брыду наўпрасткі,
У антонавак пах
Слодыч памяці будзіць...
Я люблю вас бясконца,
Мае землякі,
Працавітыя,
Шчырыя, добрыя людзі!
Дзе б ні быў я —
У маёй ты душы назаўжды
Ціхім сумам у сэрцы гарэнячы.
Ў снах і яве прыходжу я зноўку сюды,
Сэрцу мілы куток мой — Цярэнічы.

МЕЛЬЧАНКА Таіса Васільеўна, нарадзілася 15.10.1947 г. у в. Маркавічы ў сялянскай сям'і. Беларуская паэтэса. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1970 г. скончыла Гомельскі дзяржаўны універсітэт. Працавала настаўніцай у школах г. Гомеля. Выкладала родную мову і літаратуру.

Аўтар зборнікаў паэзіі «Вясковая песня» (1984), «Бацькоўскі дом» (1989), «Званок у верасень» (1992), «Каласы болю» (1994), «Добры знак» (1997).

З вершаў Таісы Мельчанка

Дадому сцежкі палявыя клічуць,
А выбрацца ніяк жа не магу.
Мне б часу у каго на дзень пазычыць,
Ніколі не застануся ў даўгу.

Пагляд мой гасне без малюнкаў дзіўных,
А вір турбот зацягвае сіло.
Ратуй мяне, ратуй мяне, Радзіма,
Схавай пад сваё цёплае крыло.

Адчуць мне дай часцінкаю народа,
Яго напеўнай мовы і душы.
Я з Маркавіч, з-пад Гомеля я родам.
На стужках рэк аб гэтым напішы.

У маёй песні не сарвецца голас —
Яна умее родны край любіць.
Ты песціла яе, як сонца колас,
І нельга нас з табою разлучыць.

СЭНС ЖЫЦЦЯ
Імчыць цягнік мяне дадому,
Спяваюць рэкі ў такт хадзе.
Сумуе сэрца па святому —
Па бацьку, маці, па куце.
Дымок над вуліцай вясковай
Нясе мне роднае цяпло.
Злятаюць з вуснаў тыя словы,
Якімі мовіці сяло.
Як жаўрука трымае неба
Зычлівай песняю вясны,

Так і мяне вось гэта глеба —
Прадзедаўскія карані.
Здаецца, сёння тут маўкліва,
Нібы ўсе вымерлі даўно.
Ды не! Прыпеўка пабудзіла
Задзірыстасцю ўсё сяло.
Мне люба дожджыка гаворка
І перламутр сырой травы.
І нат свавольніца-вясёлка,
Што вынырнула з-за гары.
Яна вады набрала з рэчкі
І выплеснула на лугі.
Аж прасвятлеў рамонкаў венчык
І край бясконца дарагі.
Так ашчаслівіла прырода,
Што зноўку бачу сэнс жыцця.
Як добра, што я з вёскі родам
І з ёю ў хвілі адкрыцця.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў 1938 г. у в. Шарпілаўка. Беларускі паэт. У 1961 г. скончыў Гомельскі педінстытут імя В.П.Чкалава. Працаваў качагарам, настаўнікам, рабочым.

Аўтар паэзіі «Паром» (1979).

З вершаў Івана Мядзведзева

ЦЕРУХА

За Церухой — смароды пах,
Гусцеюць цені ад ляшчыны,
Ляціць за сад, за гай, за шлях
Бесперапынны шум плаціны.

І хоць вядомы ён здаўна
Ўвесь свет ад краю і да краю,
Па-свойму ўсё-такі яна
І ненавідзіць, і кахае.

Ці на радзінах, ці ў гасцях
Сваё спявае і танцуе.
Там гарадскі уклад жыцця
На сельскім коніку гарцуе.

А толькі знічка прамільгне,
Нібыта ўсплеск душы сірочай,
Яна працяжна уздыхне
Скрозь сон трывожны сярод ночы.

Якія змены прынясе
Ёй новы дзень?
Адно бясспрэчна:
Стагоддзі вёсцы Церусе
Стаяць над Церухою-рэчкай.

І.І.Мядзведзеў.

ПАРОМШЧЫК

Я адзін, як заўжды, на світанні
Выйду з хаты насустрач зары,
Хоць ніхто не назначыў спаткання
І не скора прыедуць сябры.

Адвяжу хісткі човен пад ліпай,
Сож асветлены пераплыву
Там, дзе золак вясёлку рассыпаў,
Плашч вясёла шпурну на траву.

Не пляткар, не ліхвяр я, не ўзломшчык,
Чужых думак не злодзей, не рвач.
Толькі песні ў душы.
Гэй, паромшчык!
Па парваным канаце не пла[illegible]

Раздзялі лепш са мной адзіноту,
І цыгарку, і чарку, як брат.
Будзе дзень, пойдзе ўсё, як па нотах,
Прывязуць табе новы канат.

НІСКІ Георгій Рыгоравіч, нарадзіўся 21.1.1903 г. у Навабеліцы. Беларускі і рускі жывапісец і графік. Маляваць пачаў з дзяцінства. Вучыўся ў Гомельскай студыі імя Урубеля (1919—1921). У 1921 г. паступіў у Вышэйшыя мастацка-тэхнічныя майстэрні ў Маскве, а затым у Вышэйшы мастацка-тэхнічны інстытут, які закончыў у 1930 г.

Аўтар вядомых работ «Восень» (1932), «На абарону Масквы» (1941), «Беларускі пейзаж» (1947), «Верхняя Волга» (1949), «Вясёлка» (1950), «Падмаскоўе» і іншых. У 1958 г. ён быў абраны правадзейным членам Акадэміі мастацтваў СССР. У 1965 г. яму прысвоена ганаровае званне «Народны мастак РСФСР». Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1947 і 1951). Памёр у 1987 г.

Паэзія жывапісу

Летом 1934 года знаменитый французский художник Альбер Марке побывал в Советском Союзе. Когда его спросили, кто из московских художников ему больше всех понравился, он ответил: «Я очень полюбил работу молодого Нисского, его пейзаж «Осень».

Как разглядел Марке в огромном московском калейдоскопе эту картину, размером чуть больше развернутой школьной тетради?

Очевидно, французского мастера очаровали душевность и необычайно острое чувство современности, наполнившее это полотно, его взволновало биение сердца неизвестного ему художника.

...По горячим от солнца рельсам, по пыльным путям узловой станции Новобелицкая носится ватага босых мальчишек. Один из самых озорных малышей, русый, весь в веснушках, Жорка Нисский, сын станционного фельдшера. Он живет в маленьком домике, всего в ста метрах от железной дороги.

Узловую окружал сосновый бор и заросшие лозой болота. Мальчишка рос на воле — весь мир принадлежал ему. И звонкие лесные ручьи, и ленивая река Сож, и даже таинственное озеро, по которому ходили плоты, — все было в его владениях. Но самым дорогим в его царстве была железная дорога с паровозами, водокачкой, семафорами.

Малыш любил рисовать паровозы. Все было хорошо, пока дело не доходило до колес. Тут шло криво, косо, и поезда упрямо стояли на месте. Юный художник частенько ревел от досады. Но однажды он взял подсвечник с круглой подставкой, обвел ее карандашом, и поезд сразу покатил быстрее ветра.

Каникулы. Жорка ни минуты не сидит дома. Спозаранку он убегает в лес, купается с ребятами в речке, потом спешит на станцию. Надо успеть забраться на «кукушку» к знакомому машинисту, под завистливые взоры друзей дать гудок и, замирая от счастья, укатить из Новобелицкой и мчаться куда-то далеко-далеко. Он приходил домой поздно, весь перемазанный мазутом, часто со сбитыми руками, порой в синяках.

Каникулы кончились. Теперь каждое утро Жора надевал красивую фуражку, брал ранец и, благославляемый сияющей матерью, шел в школу. Он проходил двадцать шагов до изгороди и нырял в кусты. А через мгновенье, перемахнув через забор, он уже был на чердаке родного дома, где его ждали холст, кисти и купленные на сэкономленные от завтраков деньги краски фирмы «Гюнтер Вагнер»...

В 1921 году Георгий Нисский приезжает в Москву и поступает во ВХУТЕМАС.

Много написано о дерзких и восторженных вхутемасовцах, об их учителях, о бесконечных спорах и дискуссиях.

Ребята любили спорт. Они занимались легкой атлетикой, играли в волейбол. Волейболисты ВХУТЕМАСа держали первенство Москвы. В сборной команде одним из лучших игроков был Георгий Нисский.

...Нисский — поэт. Его видение мира глубоко лирично. Взволнованно, прочувствованно, он по-особому, по-своему воспринимает жизнь во всех ее проявлениях. И в гуще событий, и в самых мелких штрихах будней художник осмысливает все остро и точно. Он очень мало пишет с натуры, но зато много видит. Живописец ежедневно, ежеминутно снова открывает мир, мир своей мечты.

Новобелицкая. Погожие дни лета 1932 года. Мастер приезжает погостить к родителям, отдохнуть, пописать. Он встает рано утром.

Только что взошло солнце и заискрился, засверкал сад, покрытый росой. Поют птицы, кругом благодать неописуемая.

Он уходит в дальний глухой бор послушать шум сосен и голоса птиц, потом бредет к речке и долго-долго глядит, как ветер высоко в небе гоняет облака. Он встречает школьных товарищей, снова ездит на маневровой «кукушке» и снова приходит домой поздно вечером, весь перемазанный, усталый и счастливый.

Вскоре Нисский обретает то состояние душевной наполненности, которое так необходимо для творчества поэтам и художникам.

Пейзаж «Осень» он написал дома, сидя на завалинке, по впечатлению, без этюдов. Отец любил сидеть поблизости, молча поглядывая на работу сына. Так родился этот маленький холст, пленивший Марке.

В середине тридцатых годов Нисского увлекает тема моря. Он пишет несколько картин, создавших ему известность. В это

же время в его мастерской рождаются десятки маленьких эскизов, носящих в себе планы новых картин, новых решений. Впереди были намечены выставки, поездки. Но жизнь рассудила иначе.

...Октябрь 1941 года. Москва.

Танки идут на запад. На них в белых полушубках солдаты с суровыми, обветренными лицами. В Колонном зале Дома Союзов проходят митинги ополченцев. Небо Москвы гудит от разрывов зенитных снарядов. Тревоги следуют одна за другой...

Георгий Нисский стоит у обочины Ленинградского шоссе и глядит на поток танков, рвущихся на запад.

Он продрог, уже давно стемнело, но он не может уйти, оторваться от этой грозной картины.

«Я этюдов не писал, — вспоминает Нисский. — Я только чувствовал и смотрел, а потом убегал в мастерскую рисовать и компоновать. А вещь написал, сам не замечая... в два дня».

В тяжелые дни обороны Москвы Нисский за пятьдесят часов создает эпическое полотно «На защиту Москвы».

Критики иногда упрекали художника за «быстроту» писания картин. Им, очевидно, было невдомек, какой глубокий духовный процесс предварял окончательный «творческий залп» мастера.

В феврале 1942 года Дейнека и Нисский едут в действующую армию, в район Юхнова. Враг разгромлен, отброшен от Москвы.

Нисский ведет фронтовой дневник.

«Только бы верно понять сердцем. На глаза надежды больше. Видят уже правильно...

...Отбирать только главное... Остальное, литературно досказывающее, убирать, убирать, уверенно, безжалостно».

...Отгремела гроза. Но еще бродят в тревожном небе косматые махины туч, еще темен край неба, где порой у самого горизонта полыхают зарницы. Солнце прорвало свинцовую граду облаков и зажгло в напоенном влагой воздухе радугу — предвестницу окончания ненастья. Ослепительно сверкают ажурные фермы моста, перекинутого через канал. Нарушая тишину, весело гудит теплоход, по-деловому рассекая гладь вод. Пейзаж «Радуга» написан Нисским в 1950 году.

В послевоенные годы художник много работал. Он создал десятки пейзажей, в которых нашла отражение радость ощущения мира. Они пронизаны солнцем...

Искусство Георгия Нисского молодое. Его полотна лаконичны, но за внешней строгостью и сдержанностью — горячее сердце художника.

З кнігі: Долгополов И.В. Певцы Родины. М., 1981.

ПАКАТАШКІН Валянцін Пятровіч, нарадзіўся 1.10.1940 г. у Навабеліцы. Беларускі мастак. Брат мастака Я.Пакаташкіна. Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (1963), Віцебскі педінстытут (1974). Больш за 30 гадоў з'яўляецца кіраўніком народнай студыі выяўленчага мастацтва Абласнога цэнтра дзіцячай творчасці. Заслужаны настаўнік Беларусі. Працуе ў жывапісе. Аўтар работ: «Піёны» (1961), «Паўночная вёска» (1971), «Гарадскі пейзаж» (1973), «Зямля Палеская» (1978), «Першы снег» (1981), «Час цвіцення» (1987), «Валатаўская царква» (1990), «Разліў ракі» (1992), «Вячэрні звон» (1993) і іншых.

ПАКАТАШКІН Яўген Пятровіч, нарадзіўся 12.4.1937 г. у Навабеліцы ў сям'і рабочага. Беларускі мастак. Бацька Пётр Рыгоравіч родам з в. Пясочная Буда. У 1960 г. скончыў Мінскае мастацкае вучылішча. Працаваў у асноўным у графіцы. Аўтар работ: «Аэрадром» (1964), «Вайна і жыццё» (1964), «Новае Палессе» (1970), «Прыпяць» (1980), «Мазыршчына» (1982), «У родныя мясціны» (1984) і іншых. Памёр 5.3.1994 г.

Слова пра сябра

Аб жыцці Яўгена Пятровіча можна меркаваць па яго творах, колькасці і якасці іх экспазіцый, дзецях і ўнуках, сябрах і шматлікіх вучнях. Пакаташкін — мастак-графік і валодаў графічнымі тэхналогіямі дасканала. Лінагравюра і афорт, які сам па сабе мае мноства варыяцый, акварэль і пастэль, а таксама яго любімыя ў апошнія гады творчасці тэмпера і гуаш. Пейзажы, напісаныя ў аркуш, сёння ўпрыгожваюць шматлікія музеі і галерэі, установы культуры, школы і дзіцячыя сады, бальніцы і паліклінікі. Усё пералічыць, бадай, немагчыма. Выставы, на якіх экспанаваліся творы Яўгена Пятровіча, праходзілі на

Ф.Ф.Пятрэнка.

Беларусі, у былым СССР, Германіі, Італіі, Францыі, Японіі, ЗША, на Кубе.

З ім было добра і неяк па-хатняму ўтульна. Сапраўды, таленавітыя людзі заўсёды з'яўляюцца прыцягненнем для ўсіх. Ён вельмі любіў распавядаць аб сваіх вандроўках і прыгодах. І заўсёды вакол яго былі слухачы. А яшчэ ён валодаў дзівосным пачуццём справядлівасці. Да яго за дапамогай ішлі калегі-мастакі: і маладыя, і масцітыя. Ён заўсёды дапамагаў, заўсёды быў лідэрам...

Г.В.Говар.

ПАПСУЕЎ Уладзімір Нікіфаравіч, нарадзіўся 10.10.1924 г. у в. Бабовічы. Беларускі скульптар. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1996 г. скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працуе ў жанры станковай і манументальнай скульптуры. Аўтар кампазіцый «Механізатары» (1957), «На прывале» (1958), «Маладагвардзейцы Гомеля. Клятва» (1960), «Няскораная» (1961), «Ураджай» (1963), «Рэйкавая вайна» (1964), «Дэкрэт аб зямлі» (1967), «Салдаты рэвалюцыі» (1969), «1905 год» (1970), а таксама помнікаў ахвярам фашызму (в. Загалле Любанскага р-на (1964), г. Докшыцы (1968), воінам Савецкай Арміі і беларускім партызанам (в. Лучнікі Слуцкага р-на (1970), в. Корань Лагойскага р-на (1980), г.п. Уваравічы Буда-Кашалёўскага (1983).

ПЯТРЭНКА Фёдар Фёдаравіч, нарадзіўся 8.3.1914 у в. Прыбыткі ў сялянскай сям'і. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1960). Арганізатар і кіраўнік Прыбыткаўскага народнага хору (1934—1981).

У 1936 г. скончыў Гомельскі педагагічны тэхнікум. Працаваў настаўнікам пачатковых класаў у роднай вёсцы.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Памёр 27.11.1991 г.

Настаўнік, мастак, чалавек

Імя Фёдара Фёдаравіча Пятрэнкі як заснавальніка і кіраўніка славутага Прыбыткаўскага народнага хору ў свой час было шырока вядома не толькі на Гомельшчыне, але і на ўсёй Беларусі і ў Савецкім Саюзе.

Мне пашчасціла амаль 20 гадоў працаваць разам з ім у школе, прымаць удзел у грамадскім жыцці сяла і нават спяваць у хоры настаўнікаў, якім кіраваў Ф.Ф.Пятрэнка.

Для мяне, маладой настаўніцы, выпускніцы Гомельскага педагагічнага інстытута, ён стаў першым дарадчыкам у няпростай справе навучання і выхавання моладзі, а голоўнае — прыкладам самаадданай працы на карысць людзям. Гэта быў сапраўдны вясковы інтэлігент з рукамі селяніна, сэрцам патрыёта, душою мастака.

Ф.Ф.Пятрэнка нарадзіўся 8 сакавіка 1914 г. у в. Прыбыткі ў сялянскай сям'і. Усё сваё няпростае, але яркае жыццё пражыў у роднай вёсцы, пакінуўшы прыкметны след у гісторыі сваёй малой радзімы, у душах аднавяскоўцаў.

Скончыўшы ў 1931 г. сямігадовую школу, Пятрэнка пачаў працаваць у роднай вёсцы настаўнікам пачатковых класаў. Вучыўся завочна ў Гомельскім педагагічным тэхнікуме, які скончыў у 1936 г. У пачатку 1940 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію і накіраваны ў пяхотна-кулямётнае вучылішча.

Вайна застала маладога лейтэнанта, камандзіра ўзвода, на маршы ў напрамку Заходняй Украіны, куды рухалася дывізія для ўдзелу ў летніх вучэннях. Пад горадам Луцкам, у адным з першых баёў, Пятрэнка быў цяжка паранены і ў непрытомнасці трапіў у палон. Амаль чатыры самыя цяжкія гады жыцця — знявагі, холад, голад! Мяняліся лагеры на чужой зямлі, слабела цела, але жыла вера ў перамогу. Ворагам не ўдалося зламаць дух воіна-патрыёта: ён застаўся верным сынам сваёй Бацькаўшчыны, роднай Беларусі. З палону яго вызвалілі амерыканцы. Пасля Перамогі яго перадалі Савецкаму камандаванню. Пасля спецправеркі Пятрэнка

дэмабілізаваўся і вярнуўся дадому, да любімай працы ў школе в. Прыбыткі. Тут і працаваў да выхаду на пенсію ў 1972 г. Педагагічны стаж майстра — 45 гадоў. Фёдар Фёдаравіч не проста вучыў дзяцей чытаць і пісаць, ён адкрываў перад імі свет цудоўнага, свет музыкі, вучыў спяваць і разумець песні.

Ні ў якой навучальнай установе не вывучаў гэты самародны талент нотную грамату, гісторыю музыкі. Песні — гэта яго душа. А тэорыю ён вывучыў самастойна. Адзіным музычным інструментам, якім валодаў мастак, была балалайка. Але як валодаў! Быў Пятрэнка ў школе — спявалі ўсе, і вучні, і настаўнікі. Чатыры хары існавала. Святы спеваў засталіся традыцыйнымі і па сённяшні дзень.

Яшчэ ў 1943 г., працуючы ў школе, малады настаўнік арганізаваў на вёсцы самадзейны харавы калектыў. Пасля працы збіраліся ў хатах, у невялікім школьным будынку юнакі і дзяўчаты і рэпеціравалі песні, якія ідуць з глыбінь народных.

З першых жа сваіх выступленняў Прыбыткаўскія самадзейныя артысты заваявалі сімпатыі гледачоў, павагу і аўтарытэт. Адметнымі рысамі хору былі высокае выканаўчае майстэрства, змястоўны рэпертуар. У 1935 г. хор быў запрошаны ў Мінск, дзе выступіў з цікавай праграмай перад удзельнікамі нарады перадавікоў калгаснага сялянства, а потым — на адкрыцці опернага тэатра.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны і вяртання кіраўніка работа хора была адноўлена, але з амаль новым складам. З 1952 г. Прыбыткаўскі хор — актыўны ўдзельнік аглядаў мастацкай самадзейнасці ў раёне, вобласці, рэспубліцы. За поспехі ў развіцці самадзейнасці Ф.Ф.Пятрэнку ў 1960 г. было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры БССР». А праз два гады Прыбыткаўскі народны хор атрымаў званне народнага.

З новымі цікавымі праграмамі калектыў з вялікім поспехам выступаў на шматлікіх сцэнах Гомеля, Мінска, Масквы, па радыё і тэлебачанні. Рэпертуар складалі ў асноўным беларускія, рускія, украінскія народныя песні. Яны выконваліся на прафесійным узроўні. Высокую ацэнку хору далі ў свой час беларускі кампазітар Ігар Лучанок, хормайстар хору імя Пятніцкага Уладзімір Сігалаў.

П.А.Русаў.

У поспехах калектыву — талент, незвычайная адданасць песні, нястомная творчая праца яго кіраўніка — Ф.Ф.Пятрэнкі, пра якога памяць жыве і сёння.

Т.А.Карасік.

РУДКОЎСКІ Аляксандр Рыгоравіч, нарадзіўся 30.10.1943 г. у в. Даўгалессе. Беларускі спявак (лірычны тэнар). Заслужаны артыст Беларусі (1975). У 1971 г. скончыў Маскоўскую кансерваторыю. З 1971 г. саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі, з 1986 г. — Дзяржаўнага народнага аркестра імя І.І.Жыновіча. Выканаў партыі Ленскага («Яўгеній Анегін» П.Чайкоўскага), юродзівага («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Берандзея («Снягурачка» М.Рымскага-Корсакава), Дона Атавіо («Дон Жуан» В.А.Моцарта), Альмавівы («Севільскі цырульнік» Дж. Расіні), Альфрэда («Травіята» Дж. Вердзі), Фауста («Фауст» Ш. Гуно) і іншыя. Лаўрэат міжнародных конкурсаў у Маскве (1970) і Барселоне (Іспанія, 1975).

РУСАЎ Пётр Аляксандравіч, нарадзіўся 10.7.1947 г. у в. Прыбар у сям'і ваеннаслужачага. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут імя М.Горкага (1974). Працаваў у школе настаўнікам. З 1981 г. вядучы археолаг Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытута. Праводзіў археалагічныя раскопкі ў Мінску, Полацку, Дзятлаве і Крэве. Абследаваў археалагічныя помнікі Гомельскага раёна (1982). Вядомы і як беларускі бард. Аўтар кніг: «Деревянные сооружения Менска XIII—XVII вв.» (1992), «Спатканыя ў дарозе» (1996), зборніка песень на вершы В. Шымука «Зецельская старонка» (1997).

І.К.Сяркоў.

СЯРКОЎ Іван Кірэевіч, нарадзіўся 4.1.1929 г. у в. Пакалюбічы ў сялянскай сям'і. Беларускі пісьменнік. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1952 г. скончыў артылерыйскае вучылішча, у 1962 г. — Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працаваў у гомельскай раённай газеце «Маяк» (1955—1960), старшым рэдактарам, галоўным рэдактарам Гомельскай абласной студыі тэлебачання (1960—1989). Адначасова быў сакратаром Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі (1977—1989).

Аўтар вядомых аповесцей для дзяцей «Мы з Санькам у тыле ворага» (1968), «Мы — хлопцы жывучыя» (1970), «Мы з Санькам — артылерысты» (1989), сцэнарыя тэлевізійнага мастацкага фільма «Мы — хлопцы жывучыя» (пастаўлены ў 1974 г.).

ШКЛЯРАВА Ніна Нікіфараўна, нарадзілася ў 1947 г. у в. Пракопаўка ў сялянскай сям'і. Беларуская паэтэса. У 1971 г. скончыла Гомельскі дзяржаўны універсітэт. Працавала карэспандэнтам гомельскай раённай газеты «Маяк», інструктарам Гомельскага райкома ЛКСМБ, настаўніцай, рэдактарам Гомельскай студыі тэлебачання. Жыве ў г. Ржэў Цвярской вобласці.

Аўтар зборнікаў паэзіі «Мая вёска» (1971), «Міг і вечнасць» (1979).

З вершаў Ніны Шкляравай

МАЯ ВЁСКА

Дзе ты, дзе ты, мая вёска
На зямным вялікім шары?
Ты, як з кветачкі пялёстак,
Загубілася ў абшары.

Але я знайду заўсёды,
Нібы ўзор твой вышываны,
І гусіныя чароды,
І блакітныя туманы.

Я зайду ў алешнік ліпкі,
Пафарбую рот малінай.
Там растуць малыя ліпкі
За красуняю рабінай...

Запляту бярозам косы,
Уплятy рамонкі-кветкі...
І прамень заўважу босы,
Зіхатлівы за палеткам...

І заўважаць мае вочы,
Ты, бы матчынай рукою,
Ахінулася з паўночы
Цёплай рэчкай Церухою.

Лёс дзявочы — мая вёска!..
На зямным вялікім шары.
Ты, як з кветачкі пялёстак,
Не згубілася ў абшары.

Падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

Звязаны лёсам з гомельскай зямлёй

РУСКІ ПАЭТ ДЗМІТРЫЙ КАВАЛЁЎ

Вядомы рускі паэт Дзмітрый Міхайлавіч Кавалёў (1915—1977) нарадзіўся ў г. Ветка ў сям'і каваля. Але так здарылася, што яго жыццё вельмі цесна звязана з гомельскай зямлёй. Жыў і вучыўся на рабфаку ў Навабеліцы. Пасля заканчэння вучобы (1939) працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Раманавіцкай сярэдняй школе. Пасля вайны, якую ён прайшоў ад пачатку да канца, жыў у Мінску і Маскве, але вельмі часта прыязджаў у Навабеліцу, дзе доўгі час жыла яго старэнькая маці. Пры гэтым заўсёды заходзіў у раённую газету «Маяк», не раз прымаў удзел у пасяджэннях літаб'яднання, даваў парады маладым літаратарам. Аўтар шматлікіх кніг паэзіі.

Перакладаў на рускую мову творы беларускіх пісьменнікаў, у тым ліку пераклаў кнігу А.Грачанікава «Зоркі і курганы» і раман І.Мележа «Подых навальніцы».

З паэзіі Дзмітрыя Кавалёва

РОДОСЛОВНАЯ

Мать русская, отец мой белорус.
Я вновь,
Как в Киевской Руси, един,
Как та вода, что пьем,
Хлеб — что едим,
Как тот, что держит кровлю,
Цельный брус.
Усобицы, полон татарский злой,
Кровь и предательство,
Бесчестие и грязь —
Все было.
Но копился под золой
Чистейший жар,
Врагам не покорясь...
Прапрадед матери, кляня раскол,
Ушел в леса и голоден, и гол.
Пшеницу вырастил для калача,
Осев, обжился — был и двор, и кол.
И речь сберег: чиста, как из ключа.
И друг ему — плененный им карел,
С ним партизанил, войско шведов бил,
Чай по-московски, дуя в блюдце, пил.
И Пугачева предок мой пригрел...
А дед отца — фамилию нам дал,
Что прозвищем была: все — ковали.
А мать с отцом — не сводни их свели,
Где от садов весной земля бела.
Сошлись,
Всех предрассудков сбросив груз.
Озолотила свадьбу их листва...
Мать русская, отец мой белорус —
Я не Иван, не помнящий родства!
Гордились родословными князья,
Бояре и дворяне: из корней!..
Наш род и благородней и древней.
И в нем державный труд Руси всея!
Купель моя!
Зарницы Кобзаря,
Бунт Аввакума
И Купалы клич...
И породнивший целый мир Ильич...
По ранней рани — Волга, как заря.

* * *

Осень хмурая смотрит в окошко.
На лугах пожелтела трава.
Намывает гостей наша кошка,
Видно, к празднику — дню Покрова.
Или, может, к Николе, к престолу.
Увозили отца до сих пор...
А теперь к нам гостей на Николу
Понаедет — телег полон двор...
Дед Волчок привезет мне гостинца,
Желтогрудую — весело с ней,
Как затенькает в клетке синица...
Все мы ждем не дождемся саней...
Прокати нас, зима, по морозу,
В сено, в розвальни нас усади...
По ракитнику, по верболозу —
Сколько разных чудес впереди...

* * *

И счастлив я,
Что вырос на границе
России, Украины, Беларуси,
Что у меня друзья, сябры и друзи,
Свет васильков, калин, берез в кринице.
И триязычные в газетах рубрики.
И общие у стада пастухи.
И одного колхоза петухи
На посевную будят три республики.
И как три брата —
Гомель, Брянск, Чернигов.
Лес партизанский — и конца не видно.
И мати родная, и ненько ридна,
И мать родная...
Сколько лиц и ликов!..
Славутич Днепр с его живой водою.
Огульный шлях — большак через плотину.
Ярило старину блюдет едину.
И новь одна
под красною звездою.
Через свое
любой народ понятен,
Как свет берез,
калин и верб в кринице.
Я счастлив,
что такими все границы
Увидит солнце дружества без пятен.

БЕЛАРУСКІ МАСТАК ВІКТАР КАЗАЧЭНКА

Віктар Фёдаравіч Казачэнка нарадзіўся 1.5.1918 г. у г. Гомель. Бацькі родам з в. Старыя Дзятлавічы, дзе і прайшло дзяцінства мастака. Вучыўся ў мастацкіх студыях у Б. Звінагродскага і А. Шаўчэнкі ў Гомелі (1935—1940), Гомельскім педінстытуце (1939—1941). Працаваў пераважна ў жанры пейзажу. Аўтар карцін «Восень» (1957), «Гарадскі пейзаж» (1960), «Рэчыцкі край» (1969), «Паводкі» (1982) і іншых. Шмат пісаў у ваколіцах Старых Дзятлавіч. Памёр 27.2.1998 г.

Ю.С.Фатнеў.

Выдатны жывапісец

Віктар Фёдаравіч Казачэнка — жывапісец з вялікай літары. Так адчуваць усе магчымыя і немагчымыя спалучэнні каляровых адценняў, а потым адчутае і прапушчанае праз душу і розум увасобіць на палатне мог толькі ён.

Ёсць і былі, вядома, майстры такога ж узроўню, але іх адзінкі. Віктар Фёдаравіч ніколі не ставіў аўтограф на сваіх карцінах, але яго працы заўсёды адрозніш ад іншых па жывапісе, каларыце, вышыні майстэрства і асабістага колераадчування. У яго пейзажах ёсць паветра і матэрыяльнасць. Кожнае дрэўца жыве і вабіць сваёй пяшчотай. Неба заўжды празрыстае і вельмі глыбокае, з нейкім пачуццём касмічнай бясконцасці. Вада таксама мае сваю глыбіню і адлюстраванне асяроддзя. Усё здаецца жывым, а не замерлым. Гэта і ёсць праца сапраўднага жывапісца. Гэта накшталт цудоўнай музыкі, якая гучыць і малюе ў самасвядомасці слухачоў адчутае вялікім маэстра.

В.Ф.Казачэнка не толькі выдатны пейзажыст, але і партрэтыст. Ён мог умела стварыць вобраз, перадаць характар і стан душы чалавека.

Творы Віктара Фёдаравіча знаходзяцца ў шматлікіх музеях і галерэях, а таксама ва ўласных калекцыях як на Радзіме, так і за мяжой.

Г.В.Говар.

РУСКІ ПІСЬМЕННІК ЮРЫЙ ФАТНЕЎ

Вядомы рускі паэт і празаік Юрый Сяргеевіч Фатнеў нарадзіўся 10.2.1938 г. у с. Акімаўка Краснашчокаўскага раёна Алтайскага края ў сям'і ваеннаслужачага.

У час Вялікай Айчыннай вайны жыў у в. Старыя Дзятлавічы. З гэтай вёскай у паэта звязана нямала прыемных і цёплых успамінаў. Жывучы пасля вайны ў розных месцах былога СССР (на Міншчыне, у Казахстане, Нальчыку, Гомелі, Бранску, Гатчыне), паэт часта наведваўся ў Старыя Дзятлавічы. Тут ён напісаў шмат вершаў пра дарагія сэрцу мясціны. У 1967–1974 гг. кіраваў літаратурным аб'яднаннем пры гомельскай раённай газеце «Маяк». З 1990 г. жыве ў Гомелі.

Аўтар кніг паэзіі, якія выйшлі ў Алма-Аце, Мінску, Маскве, Туле, Гомелі: «Любимое», «Общий вагон», «Глаза не умеют молчать», «Поет рожок у Сожа», «Лирика», «День прозренья», «Лунный час», «Костер на пристани», «Птицы ночи», а таксама рамана «Кумиры творяху», што надрукаваны ў часопісе «Палессе» (1997).

З паэзіі Юрыя Фатнева

КОСТЕР НА ПРИСТАНИ
Горит костер на дальней пристани
У Старых Дятлович моих.
Опять туман роится искрами.
А Сож под кручею притих.

О чем мальчишки незнакомые
Сейчас толкуют у костра?
Ждут катер вечером из Гомеля
Или рыбачат до утра?

Я так хотел бы с ними рядышком
Таскать картошку из золы.
И различать — белеют ландыши
У дубняка из-под полы.

Узнать в тумане голос матери,
Бежать по ландышам на зов.
Но нет нигде такого катера,
Чтобы причалил к детству вновь.

Ждать больше некого и нечего
У колыбельных дремных вод.
Никто меня туманным вечером
По имени не назовет!

Так почему же взглядом пристальным
Хочу увидеть хоть на миг:
Горит костер на дальней пристани
У Старых Дятлович моих?

СТАРЫЕ ДЯТЛОВИЧИ
Там озеро закатом короновано.
На кронах сосен карканье ворон.
Пастух, сквозь лес бредущий за коровами,
Покрикивает, жарко озарен.

Кора как будто излучает зарево,
Которое охватит бор вот-вот.
И память снова в Дятловичи Старые
За стадом утомившимся бредет.

Как все знакомо: вербы, палисадники...
На лавках бабки. Разговор их тих.
Они, известно, уважают праздники —
И вышитые фартуки на них.

У кленов ждет меня автобус гомельский.
Нет, не поеду. К Сеньке загляну.
Лунища ночью, словно детства проблески
Прихлынут к запотевшему окну.

И я увижу домик с красной крышею
У озера дремотного Глушца.
Почудится, ненайденные рыжики
Заманчиво запахнут у лица.

Шепчу я жизни что-то благодарное,
И вспомнить мне в скитаньях хорошо,
Что у меня есть Дятловичи Старые,
Хоть нет порой копейки за душой.

* * *
Не прояснится небо деревеньки.
В осеннем сене стынут лета сны.
Лесной туман теснится в сени Сеньки,
Тасуя сонно запахи сосны.

Свет синий-синий осеняет листья,
Струясь на вербу из оконных сот.
И кружевные тени штор слюдистых
Прильнули на скамейку у ворот.

В сарае Лыска промычит невнятно,
Потрется кот о ногу в темноте.
Петух желает ночи мне приятной,
Устроившись удобно на шесте.

Как хорошо, что брать не нужно визы
В сосновый край моих ребячьих лет.

Наверно, смотрит Сенька телевизор
Иль разбирает на полу мопед.

Стихи Якуба Коласа бормочет,
В сегодняшних поэтах не силен.
У печки Маша, как всегда, хлопочет,
Храня в углу ухваты всех времен.

А бабушка Сафрониха на блюдце
Льет молоко, забрызгав нос коту.
Дверь распахну — расспросы вмиг начнутся.
О Дятловичах что-нибудь прочту.

О том, как я люблю свою сторонку,
Да редко в ней бываю наяву.
И, повертев в руках мою книжонку,
Спокойно спросит Сенька, как живу.

Ах, как живу? Ответить мне непросто.
Длиннее годы, чем кукушкин счет.
И, спохватившись, что пора спать гостю,
Хозяин свет потушит и уйдет.

Но прояснится скоро тьма густая,
И окунусь я мигом в годы те,
Где мама солнце в небо поднимает
На золотой колодезной бадье...

* * *
Где бродит лось с лосихою
У светлых-светлых вод,
Задумчивая, тихая
Моя любовь живет.

К лицу зеленый свитер ей,
Листва родных берез.
От ясных глаз еще темней
Цыганский цвет волос.

Мы с ней не разлучаемся
На долгий-долгий срок.
В автобусе встречаемся
С ней каждый вечерок.

Но я открыть не смею рот,
Она — в глаза взглянуть.
В Сосновке девушка сойдет,
Мне — в Дятловичи путь.

Вот так с любовью тихою
Мы ездим целый год.
...Уже давно с лосихою
Лосенок воду пьет.

І.П.Шамякін.

НАРОДНЫ ПІСЬМЕННІК БЕЛАРУСІ ІВАН ШАМЯКІН

Народны пісьменнік Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і БССР, аўтар шырокавядомых раманаў і аповесцей Іван Пятровіч Шамякін сваім лёсам вельмі цесна звязаны з гомельскай зямлёй. Бацька Пятро Мінавіч быў лесніком і жыў з сям'ёй у леснічоўках ля вёсак Пракопаўка, Краўцоўка, Церуха. Тут прайшло дзяцінства і юнацтва будучага пісьменніка. Іван Пятровіч вучыўся ў Краўцоўскай і Цярухскай школах. Скончыў Макаўскую сямігодку. Аб тых гадах ён апавядае ў сваёй кнізе «Карэнні і галіны» (1968). Пасля ж вайны І.П.Шамякін працаваў настаўнікам у Пракопаўскай школе (1945—1948). Тут жа быў напісаны і першы раман «Глыбокая плынь» (1949), які прынёс яму шырокую вядомасць.

Старонкі ўспамінаў

Ці я перажыў той час, калі хочацца ўспамінаць маленства, юнацтва, ці яшчэ не дажыў да таго? Мне даўно хацелася нешта напісаць пра сваё лясное дзяцінства. Але адчуваю, не магу, чагось не хапае. А можа, перашкаджае такі шэдэўр, як «Новая зямля»? У апісанні жыцця лесніка, няхай сабе і савецкага перыяду, нельга не паўтарыць Коласа. Але лепш не напішаш. Гэта унікальны твор, магчыма, адзіны ў гэтым родзе ў сусветнай літаратуры, «На растанях» — слабей. Хоць, здавалася б, проза дае большыя магчымасці для бытавой эпічнасці.

Маё маленства і юнацтва неяк вельмі ж аддаліліся. Занадта не падобна жыццё дзяцей маіх, унукаў на жыццё сына лесніка і нават тагачаснага студэнта.

Ва ўзросце 30—40 гадоў я жыў сваім мінулым. З нецярпеннем чакаў паездкі на Гомельшчыну. Кожны раз наведваў сядзібу леснічоўкі пад Краўцоўкай, хоць застаўся з вайны там адзін калодзеж. Але якімі роднымі былі лес навакольны, поле гутнецкае, краўцоўскае! Я паказаў іх дзецям, як нешта дзівоснае, казачнае...

У хуткім часе... бацьку перавялі пад Краўцоўку. Мясціна гэтая прыйшлася бацькам даспадобы. Ды і нам, дзецям, таксама. Леснічоўка стаяла на паўдарозе паміж Студзёнай Гутай і Дзікалаўкай, на шляху з Дабранкі ў Гомель. Але бліжэй была Краўцоўка, трохі ў баку ад шляху. Адна вуліца гэтага даволі вялікага сяла, якую называлі Аднабочкай, хоць заселены былі два яе бакі, падступала амаль жа да лесу.

Урочышча называлася Кляцянкай. Тут, у Кляцянцы, дзе мы пражылі поўныя пяць гадоў, прайшло свядомае маленства, бадай, самае шчаслівае, калі пазнаецца свет і пачынаеш задумвацца над з'явамі прыроды, над паводзінамі людзей. Тут я пачаў пасвіць кароў. Навучыўся чытаць. Навучыўся, дарэчы, надзіва хутка. Бацька прывёз буквар, паказаў літары. Не вельмі ўмеў нават раскрыць тайну складання літар, гукаў у словы. Але я сам дайшоў да гэтага. І вельмі здзівіў маці, бацьку, суседніх леснікоў, калі месяцы праз два-тры, не ходзячы яшчэ ў школу, прачытаў ім тэкст, не з буквара, з нейкай іншай кнігі лепш, чым чыталі некаторыя з іх. А маці мая ўвогуле была непісьменная, пазней я навучыў яе распісвацца і з цяжкасцю прачытаць па буквары, да большага яна не дайшла.

У першым класе школы, куды я пайшоў на дзевятым годзе жыцця, мне не было чаго рабіць побач з вясковымі хлапчукамі і дзяўчаткамі, большасці з якіх вельмі туга давалася тайна чытання, арыфметыкі. Часта замест задання першага класа я паспяхова выконваў заданне трэцяга класа, вучні якога сядзелі побач, правей, займаючы другі рад парт. Вяла класы адна настаўніца — Валянціна Андрэеўна Рабцава. Яна вучыла мяне да пятага класа. Я любіў сваю настаўніцу. Мне здавалася, што жыве яна зусім іншым жыццём, чым усе навакольныя людзі. Жыццё гэтае вабіла мяне. Вельмі хацелася падгледзець яго, пазнаць. Парадак, чысціня ў яе кватэры моцна ўражвалі. Я паспрабаваў наводзіць такі парадак дома,

але з гэтага нічога не атрымалася, за падобнае новаўвядзенне добра ўляцела ад бацькі.

І там, у Кляцянцы, «кульгавы чорт», як бацьку завочна называлі вяскоўцы, выконваў свае леснічоўскія абавязкі гэтак жа старанна.

Да калектывізацыі лес там кралі бязлітасна, асабліва зімой. Вёскі навокал бедныя, зямля пясчаная. Іншага заробку блізка не было. У далёкія гарады, у Данбас, з гэтых вёсак не заведзена было ездзіць. З Кармы ездзілі больш. Ці, напрыклад, з Грабаўкі, да якой усяго шэсць вёрст праз лес, там — славутыя муляры, цесляры; грабаўцы будавалі першы маўзалей Леніна.

Са Студзёнай Гутай клопатаў было менш, тыя секлі ў іншых абходах. А дзікалаўцы (самыя зацятыя парубшчыкі), краўцоўцы і нават гарнастаеўцы (суседняя ўкраінская вёска) — бацькава «кліентура». Людзей нельга асуджаць. Адзіны іх заробак на соль, запалкі, на аршын-другі «чартакожу» дзецям на штаны, на сшыткі, на хустку жонцы быў з воза ўкрадзеных у лесе і прададзеных дабранскім яўрэям дроў. У кожнага былі свае спажыўцы.

...Улетку 1933 года бацьку раптам назначылі ва ўрочышча Воленка ў самы далёкі ад лясніцтва абход.

Воленка была райскім кутком зямлі. Невялікі квадрат старога лесу (гектараў сто), пераважна лісцевы — дуб, граб, клён, алешына, бяроза. Пасярод лесу, паміж дубоў, невялікая паляна з хатай лесніка: тут была звычайная хата, не кардон, не «стража», што будаваліся яшчэ да рэвалюцыі ў лясах князя Паскевіча па адным праекце. Вакол — палі і калгаснае драбналессе. Бліжэйшыя вёскі — Пракопаўка і Займішча. Але Займішча было ўбаку. На шляху — Пракопаўка з былой панскай сядзібай, з прыгожым паркам, з рэчкай Церухой, якая тады, да асушэння балот, заўсёды была паўнаводнай, рыбнай, асабліва многа лавілі ракаў; цяпер Церуха ля Пракопаўкі — канаўка, толькі каля Церухі яна яшчэ рэчка, хоць і абмялелая. Воленка падабалася мне, юнаму паэту. Бацьку ж яна зусім не здавалася раем. Бацька скардзіўся: «Во ўгадзілі старому лесніку, інваліду, за службу маю». Справа ў тым, што абход тут быў самы цяжкі. Сама Воленка — нейкая чвэрць абходу, а тры чвэрці — Гардуноўшчына. Аддзелена гэтае ўрочышча ад леснічоўкі полем, добрыя вярсты тры было да асноўнай часткі абходу. А цягнулася Гардуноўшчына вёрст на восем пад самыя Гардуны, трохі не да Насовіч. Лес там — сасновы маладняк. З ім было нямала клопатаў: санітарная прачыстка, высечка прасек паміж кварталамі, якія ў маладняку зарасталі штогод. Але найбольшы страх для лесніка — пажары. Бацька са страхам чакаў лета. У сухмень кідаў любую сваю работу, начаваў і дняваў там, у Гардуноўшчыне. Касьба, жніво, малацьба цалкам лажылася на матчыны плечы. Добра, што мы падраслі і памагалі ёй, асабліва Павел, дужы хлопец, вышэйшы за мяне ростам, больш здатны да фізічнай працы.

Бацькі далі мне права выбару: застацца ў Кармянскай школе ці хадзіць у сёмы клас у Макаўе, за сем кіламетраў. Я выбраў Макаўе, гэтак палюбіў Воленку, Пракопаўку. Адлегласць не палохала. І я не пралічыўся. Апошні школьны год, бадай, быў самы яркі, шчаслівы, багаты на добрае сяброўства, рамантычныя захапленні.

Хадзіў я ў школу, як ніколі, акуратна. Дзень у дзень. Ніякіх прагулаў. Калі бацька спрабаваў запрэгчы ў работу — пратэставаў даволі рашуча. Але, здаецца, і бацька пачаў патроху разумець, што гэта адказна — выпускны клас. Непісьменная маці заўсёды добра разумела, што вучоба — не гульня, а вельмі нялёгкая работа. Яна заўсёды была за тое, каб я ішоў у школу, а не на прачыстку сасняку ці капаць бульбу. Увосень гэта была самая працяглая і цяжкая работа. «Самі выкапаем, — казала маці. — А хвойнік твой пачакае, не гарыць». Думаю, што мая апантанасць у вучобе пакарыла і бацьку. Сем вёрст туды, сем назад, шэсць урокаў, гурткі, а пасля — выкананне хатніх заданняў, сядзеў над кнігамі да поўначы. Тут газы для мяне не шкадавалі, палі колькі хочаш.

Асенні дождж, слата, гразь, зімовыя завеі, снежныя заносы, вясенняя паводка — нічога мяне не страшыла, не спыняла. Я ішоў у школу, як на свята. Сапраўды гэта было штодзённае свята. Не толькі сама вучоба. Уся атмасфера, педагагічны калектыў, разумны дырэктар Кірушчанка, шумны, вясёлы, але добры, не тое што пануры аднавокі Букініч. Настаўнікі любілі мяне, і я любіў іх. Беларускую мову і літаратуру

выкладала Яўгенія Кузьмінічна Анціпава. Думаю, што менавіта яна навучыла мяне сапраўднай беларускай мове, мове Купалы і Коласа, у канцы года я пісаў самыя лепшыя сачыненні, без адзінай памылкі. І літаратуру яна выкладала неяк зусім інакш, чым рабілі гэта другія настаўнікі, — з нейкім асаблівым набліжэннем да жыцця. Расказвала пра Коласа, Самуйлёнка, Лынькова, Галавача, Глебку, як пра знаёмых простых людзей, што жывуць не на Алімпе — на зямлі, побач з намі і ўсё ведаюць пра наша жыццё. Гэта было адкрыццё, якое перавярнула ўяўленне маё пра пісьменнікаў і творы.

...У саўгас прыехаў Старшыня ЦВК БССР Чарвякоў. Саўгас спецыялізаваўся на вырошчванні трусоў. Вырашылася мясная праблема. Дарэчы, праз год, калі Чарвякова не стала, трусіная ферма была закрыта як шкодніцкае пачынанне.

Нас адпусцілі з урокаў, і мы чатыры вярсты ляцелі на крыллях, каб пабачыць такога высокага госця.

Кіраўнікі саўгаса хацелі прагнаць малых — Чарвякоў дазволіў, каб мы хадзілі следам. Пасля я быў ашаломлены: хлопцы, не вучні, рабочыя, укралі з машыны яго шапку.

Але самае цікавае адбылося, калі госць ад'язджаў. Рабіў у саўгасе трактарыст Дзяніс Баранаў, асілак, падковы гнуў. І ён пажартаваў: калі госці селі ў машыну і шафёр завёў матор, Дзяніс падняў «эмку» ззаду, адарваў колы ад зямлі. Шафёр газуе, колы круцяцца, як шалёныя, а машына не рухаецца. Рабочыя рагочуць. Чарвякоў зразумеў, што нешта ўтварылі, вылез з машыны. Хтось са спалоханых кіраўнікоў яму сказаў, што здарылася. Як хораша ён смяяўся! І вельмі хацеў паглядзець на гэтага трактарыста, але Дзяніс нырнуў у натоўп і схаваўся ў парку.

Магчыма, што эпізод гэты не ўсплыў бы з дна памяці, але нядаўна я сустрэўся з Дзянісам, старым ужо чалавекам, інвалідам вайны.

Дзмітрый Міхлееў здымаў фільм пра мяне — да майго юбілею. Паехалі ў Пракопаўку, дзе я жыў у школьныя гады і настаўнічаў пасля вайны. Напярэдадні здымалі ў Церусе. Быў сонечны марозны лютаўскі дзень, усё іскрылася вакол. А ўначы разгулялася завіруха. Круціла ўвесь дзень. Свету белага не відаць было. Ад Калініна да Пракопаўкі, праз Грабаўку, Маркавічы, Чарацянку, напарадзе нашых машын ішоў грэйдэр, чысціў дарогу.

Здымаць было нельга, хоць і спрабавалі. Але людзям паведамілі, людзі чакалі. Чакалі, безумоўна, з нецярпеннем: большасць мае былыя вучні. Сустрэча была цёплая, але хутчэй не як з пісьменнікам, а як з дэпутатам, са старшынёй Вярхоўнага Савета: многа просьбаў, скаргаў, якія раздражнялі сакратара РК Г.С.Шведаву, бо я тут жа звяртаўся да яе. Трэба было вырашыць пытанні і з рэйсам аўтобуса, і з падвозам школьнікаў, і з палівам, і з будаўніцтвам школы (школай я займаюся да гэтага часу; школу пабудуюць!), і з цэглай на рамонт печаў (праблема, якая асабліва абурыла, бо побач, у Будзішчы, за тры кіламетры, — раённы цагельны завод, а цэглу не прадаюць), і з многім іншым, усяго ўжо і не помню.

Пасля старшыня калгаса запрасіў да сябе на вячэру. Ішла дванаццатая гадзіна ночы. Завіруха не сціхала. І раптам адчыняюцца дзверы і ўвальваецца заснежаны чалавек. Асілкам ён не выглядаў. Я не пазнаў яго: пасля вайны, калі я рабіў настаўнікам, Дзяніс прадаўжаў служыць у арміі. Атрымалася так, што ён даведаўся аб маім прыездзе толькі пасля сустрэчы, калі вярнуліся з клуба школьнікі. Не вытрымаў — пайшоў за два кіламетры з Займішча ў такую непагадзь. Прыйшоў Дзяніс з гармонікам і, калі выпіў, іграў у мой гонар франтавыя песні.

...Старасць — гэта калі знікае ці ва ўсякім разе зніжаецца, прытупляецца паэтычнае ўспрыняцце свету — прыроды, людзей, кахання, перастаюць хваляваць успаміны маленства, юнацтва. Парадаксальна, што ўспаміны гэтыя ўсплываюць часцей, чым у 30—40 гадоў, але цяпер яны зусім іншай якасці — рацыянальныя, філасофскі разважлівыя і ў большасці выпадкаў не прыводзяць да эмацыянальнага ўзрушэння. Я пісаў ужо, з якой усхваляванасцю прыязджаў у мясціны свайго маленства ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе — гадоў да сарака. Мяне цягнула і ў Кляцянку, дзе пачалося свядомае маленства, тое, што запомнілася, і ў Краўцоўку, дзе вучыўся ў першых класах школы. З незвычайным хваляваннем хадзіў па лясных дарогах, дзе, здавалася, яшчэ быў знаёмы кожны корань, аб які

збіваў босыя ногі, з асалодай купаўся ў Церусе каля Пыхані, менавіта там, у лесе, было асабліва прыемна акунуцца ў сцюдзёную ваду, халодная яна там была ў самую вялікую спёку, бо рэчку абступалі вольхі. У Пракопаўку цягнула, дзе рабіў настаўнікам. І ў Карму, дзе нарадзіўся...

І вось зноў наведаў родныя мясціны. Усклаў кветкі на магілы бацькі, маці, Галі, яны пахаваны побач. Сумна зрабілася не ад таго, што іх няма, — ад думкі, што і ўласнае жыццё праляцела і набліжаецца да фінішу...

З кнігі: Шамякін І. Карэнні і галіны. Партрэты настаўнікаў, сяброў, бацькоў, сваякоў, штрыхі аўтапартрэта. Мн., 1986.

Падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

Яны былі на гомельскай зямлі

КАРНЕЙ ЧУКОЎСКІ

Вядомы перакладчык, літаратуразнавец і дзіцячы пісьменнік Карней Іванавіч Чукоўскі (1882—1969) неаднаразова бываў на беларускай зямлі і, у прыватнасці, на Гомельшчыне. Упершыню ён прыехаў сюды ў красавіку 1913 г. з чытаннем лекцый пра А.Уайльда. У тыя гады ён быў добра вядомы перш за ўсё як перакладчык твораў амерыканскага паэта У. Уітмена на рускую мову.

АЛЯКСАНДР БЛОК

Вялікі рускі паэт Аляксандр Аляксандравіч Блок (1880—1921) у канцы ліпеня 1916 г. быў прызваны на ваенную службу. Яго залічылі табельшчыкам у 13-ю інжынерна-будаўнічую дружыну Саюза земстваў і гарадоў, створаную ў пачатку вайны ў дапамогу фронту. Дружына размяшчалася ў прыфрантавой паласе на Палессі (на тэрыторыі сучасных Лунінецкага і Пінскага раёнаў) і займалася збудаваннем запасных абарончых пазіцый.

Паэт выехаў з Пецярбурга 26 ліпеня 1916 г. этапным цягніком праз Оршу — Гомель да вузлавой станцыі Лунінец. Побач быў фронт. Гучала кананада. Пінск і Баранавічы былі заняты немцамі. Аэрапланы непрыяцеля бамбілі станцыю і чыгуначны мост. У сваіх пісьмах да маці паэт дэталёва апісаў сваё жыццё на беларускім Палессі. У канцы верасня 1916 г. А.Блок гэтым жа шляхам праз Гомель — Оршу выехаў на пабыўку ў Пецярбург, дзе прабыў да лістапада, а затым зноў вярнуўся да месца службы. У чацвёрты раз А.Блок ехаў праз Гомельшчыну 30 сакавіка 1917 г. Напярадзе былі рэвалюцыя, грамадзянская вайна, разруха, голад і апошнія трагічныя чатыры гады жыцця паэта.

АЛЯКСЕЙ ТАЛСТОЙ

Вядомы рускі пісьменнік Аляксей Мікалаевіч Талстой (1882—1945) у канцы студзеня 1917 г. у якасці ваеннага карэспандэнта газеты «Русские ведомости» прыбыў цягніком на Заходні фронт у раён Лунінца. Тут, у Парахонску, на палескай зямлі 29 студзеня адбылася яго сустрэча з А.Блокам. А ноччу ён выехаў праз Гомель на Мінск.

МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

Вялікі беларусі паэт Максім Адамавіч Багдановіч (1891—1917) у пачатку сакавіка 1917 г. выехаў з Мінска на лячэнне ў Ялту. Яшчэ стаяла зіма. Было холадна. За акном лютавала завея. За Гомелем снежныя заносы затрымалі цягнік на цэлыя тры дні. У Сімферопаль М.Багдановіч прыехаў толькі праз сем дзён. Гэта была апошняя вандроўка паэта і апошняя дарога праз Беларусь. 25 мая 1917 г. ён памёр у Ялце.

ІВАН БУНІН

Вялікі рускі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Іван Аляксеевіч Бунін (1870—1953) у чэрвені 1918 г. назаўсёды пакінуў Маскву. Час быў вельмі складаны, і шлях у Адэсу пралёг праз Оршу — Жлобін — Мінск — Гомель. У Мінск І.А.Бунін прыбыў 9 чэрвеня. У гэты ж дзень выехаў цягніком у Гомель. Было вельмі цесна. Разам з Іванам Аляксеевічам і Верай Мікалаеўнай, жонкай пісьменніка, у купэ было яшчэ восем афіцэраў польскага легіёна з усімі сваімі рэчамі. У Гомелі пісьменнік блукаў над Сожам, зайшоў у пустуючы палац князя Паскевіча. Ад Гомеля да Кіева плылі на параходзе. У сваім дзённіку Вера Мікалаеўна занатавала: «...Сядзім на палубе. Як добра. Лёгкі ветрык, сонца... Але Ян доўга не дазваляе быць

на паветры, і зараз мы п'ём піва і ядзім вельмі смачна сала. Ён павесялеў. Шмат размаўляе... Сёмая гадзіна, мы недзе стаім. Пасля навальніцы ў паветры разлілася прыемная прахалода. Адчуваем моцную стомленасць і вельмі рады, што плывём на параходзе...». І.А.Бунін глядзеў на Сож, на шырокую пойму, на Чонскі манастыр, што ўзвышаўся на крутым беразе ракі, і ціха радаваўся ў душы прыгажосці і спакою ў прыродзе. А потым былі Кіеў, Адэса. У лютым 1920 г. пісьменнік назаўсёды пакінуў родную зямлю.

УЛАДЗІМІР МАЯКОЎСКІ

Вялікі рускі паэт Уладзімір Уладзіміравіч Маякоўскі (1893—1930) пачаў свае выступленні ў гарадах краіны яшчэ ў снежні 1913 года. У студзені 1914 г. паэт праязджаў праз Гомельшчыну, едучы з Кіева ў Мінск. У 1925 г. і 1926 г. ён таксама праязджаў па гомельскай чыгунцы, а ў 1924 г. паэт выступаў у Гомелі перад чытачамі.

ПАЎЛЮК ТРУС

Вядомы беларускі паэт Паўлюк Трус (1904—1929) прыехаў у Гомель у пачатку ліпеня 1927 г., адразу пасля заканчэння Мінскага беларускага педагагічнага тэхнікума. Ён працаваў у газеце «Новая вёска», якая ў хуткім часе была рэарганізавана ў газету «Палеская праўда». Рэдакцыя газеты размяшчалася на вул. Кааператыўнай, дом 4 (цяпер Інтэрнацыянальная). Жыў паэт спачатку ў 4-м Рэвалюцыйным завулку, затым на вул. Песіна. П.Трус часта выступаў у Гомелі, ездзіў на сустрэчы з чытачамі ў Рэчыцу, Буда-Кашалёўскі і Уваравіцкі раёны. Пісьменнік Раман Сабаленка, які ў той час вучыўся ў Гомельскім педтэхнікуме, успамінае, як яны з П.Трусам блукалі па гомельскіх ваколіцах і аднойчы забрылі ў госці да цыганоў, чые шатры і кібіткі размяшчаліся каля в. Якубоўка. Роўна год жыў паэт на Гомельшчыне. У пачатку ліпеня 1928 г. ён паехаў у Мінск паступаць у Беларускі дзяржаўны універсітэт.

ЯНКА КУПАЛА

Народны паэт Беларусі Янка Купала (1882—1942) быў на Гомельшчыне тройчы: у снежні 1927 г., лютым 1930 г. і красавіку 1936 г. У 1936 г. паэт выступаў на літаратурным вечары ў Палацы чыгуначнікаў, чытаў свае вершы і паэму «Над ракой Арэсай». Пабыў у парку, музеі, Петрапаўлаўскім саборы, блукаў над Сожам. Наведаў дом адпачынку «Чонкі».

ЯКУБ КОЛАС

Народны паэт Беларусі Якуб Колас (1882—1956) быў на Гомельшчыне неаднойчы. Упершыню Я.Колас прыехаў у Гомель у 1931 г. Тут у гэты час знаходзіўся на гастролях Беларускі другі драматычны тэатр (Віцебск) і Я.Колас чытаў калектыву тэатра сваю новую драму. 16.9.1934 г. пісьменнік выступіў на сходзе партыйнага і камсамольскага актыву, а таксама пабываў на Добрушскай папяровай фабрыцы. 28.10.1936 г. ён сустракаўся з грамадскасцю горада, а 4.5.1936 г. прысутнічаў на пастаноўцы сваёй п'есы «Вайна вайне». У сакавіку — красавіку 1944 г. пісьменнік жыў у Навабеліцы на кватэры П.К.Панамарэнкі, выступаў з прамовай на 6-й сесіі Вярхоўнага Савета БССР. На гэтай жа сесіі быў абраны намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета. Тут жа, у Навабеліцы, быў напісаны ім артыкул «На руінах Гомеля», які быў надрукаваны ў газеце «Савецкая Беларусь» 31.3.1944 г.

ІЛЬЯ ЭРЭНБУРГ

Вядомы рускі пісьменнік Ілья Рыгоравіч Эрэнбург (1891—1967), будучы ваенным карэспандэнтам газет «Правда» і «Красная звезда», пісаў пра вызваленне Гомельскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і, у прыватнасці, пра зверскую акцыю карнікаў 1943 г. у в. Церуха, калі сорак два мірныя жыхары былі спалены жывымі.

ПЯТРУСЬ БРОЎКА

Народны паэт Беларусі Пётр Усцінавіч Броўка (1905—1980) неаднойчы прыязджаў на Гомельшчыну. Упершыню быў у 1927 г. у складзе пісьменніцкай брыгады. 28.6.1944 г. прымаў удзел у вечары, прысвечаным памяці Я.Купалы. Вечар праходзіў у Навабеліцы, дзе ў той час знаходзіўся ўрад Беларусі.

У 1970 г. П.Броўка быў вылучаны кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР ад Гомельскай сельскай акругі. 29 мая 1970 г. у Яромінскім Доме культуры адбыўся перадвыбарчы сход грамадскасці раёна, на якім выступіў паэт.

ЯЎГЕН ЕЎТУШЭНКА

Вядомы рускі паэт Яўген Аляксандравіч Еўтушэнка (н. у 1933) у паэме «Мама и нейтронная бомба» расказаў пра сустрэчу з раднёй, якая жыве на Гомельшчыне. У вершы «Лучше одиночества» паэт занатаваў сваю паездку ў цягніку «Калінкавічы — Гомель».

На Гомельшчыне таксама былі ў розны час, сустракаліся з чытачамі, выступалі на літаратурных вечарах у працоўных калектывах, навучальных установах, асяродках культуры дамах адпачынку і санаторыях-прафілакторыях рускія пісьменнікі Лідзія Вакулоўская, Пётр Валкадаеў, Іосіф Васілеўскі, Сяргей Красікаў, Мікалай Кругавых, Уладзімір Кудзінаў, Сяргей Масіяш, Юрый Прокушаў, Валянцін Сарокін, Браніслаў Спрынчан, Віктар Трасцянскі, Віктар Трыхманенка, Гаўрыіл Шутэнка, Святлана Яўсеева, украінскія Барыс Алейнік, Мікола Вінграноўскі, Дзмітро Іваноў, Станіслаў Рэп'ях, беларускія Алесь Адамовіч, Вячаслаў Адамчык, Святлана Алексіевіч, Алесь Асіпенка, Анатоль Астрэйка, Мікола Аўрамчык, Алесь Бажко, Раіса Баравікова, Рыгор Барадулін, Янка Брыль, Генадзь Бураўкін, Васіль Быкаў, Антон Бялевіч, Эдуард Валасевіч, Алена Васілевіч, Вера Вярба, Анатоль Вярцінскі, Сцяпан Гаўрусёў, Пятро Глебка, Сяргей Законнікаў, Віктар Казько, Віктар Карамазаў, Аляксей Карпюк, Анатоль Клышка, Рыгор Кобец, Анатоль Кудравец, Валянціна Куляшова, Уладзімір Ліпскі, Еўдакія Лось, Андрэй Макаёнак, Алесь Махнач, Іван Мележ, Валянцін Мыслівец, Іван Навуменка, Яраслаў Пархута, Леанід Прокша, Пятро Прыходзька, Аляксей Пысін, Адам Русак, Алесь Савіцкі, Барыс Сачанка, Ян Скрыган, Міхась Скрыпка, Алесь Ставер, Міхась Стральцоў, Максім Танк, Уладзімір Федасеенка, Мікола Хведаровіч, Іван Чыгрынаў, Іван Шальманаў, Уладзімір Шахавец, Алесь Шашкоў, Станіслаў Шушкевіч, Віктар Шымук, Васіль Якавенка, Яўгенія Янішчыц і іншыя.

М.З.Башлакоў.

Ваеннаслужачыя — ураджэнцы Гомельскага раёна, якія загінулі ў час праходжання службы ў Савецкай Арміі ў пасляваенны перыяд (1945—1992)

АТРОШЧЫК Мікалай Лявонавіч, нарадзіўся ў 1972, радавы, загінуў 19.5.1992, пахаваны ў саўгасе «Брылёва».

БАРТНОЎСКІ Аляксандр Аляксандравіч, нарадзіўся 1.1.1950, мал. сяржант, загінуў 29.12.1970.

ГАРДЗІЕНКА Васіль Васільевіч, нарадзіўся 14.5.1940, сяржант, загінуў 15.3.1966, пахаваны ў г. Сяміпалацінск.

ГАРОХАЎ Аляксандр Дзмітрыевіч, нарадзіўся 16.7.1964, загінуў 22.6.1984.

ГРАЧАНЫ Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся ў 1951, прапаршчык, загінуў 5.4.1988, пахаваны ў в. Прыбыткі.

ГУЗЯНКОЎ Аляксандр Піліпавіч, нарадзіўся 12.2.1961, радавы, загінуў 5.7.1979, пахаваны ў пас. Бальшавік.

ЗАГОРСКІ Яўген Кузьміч, нарадзіўся 11.2.1938, радавы, памёр 3.6.1959 ад ран у шпіталі, пахаваны ў г. Эберсвальд.

КАВАЛЁЎ Павел Іванавіч, нарадзіўся 10.1.1941, яфрэйтар, загінуў 30.7.1964.

КАВАЛЬКОЎ Уладзімір Паўлавіч, нарадзіўся ў 1954, прапаршчык, загінуў 16.11.1991, пахаваны ў в. Клімаўка.

ЛАЗАРАЎ Аляксандр Станіслававіч, нарадзіўся 2.5.1974, радавы, памёр 11.2.1993, пахаваны ў в. Касцюкоўка.

ЛЕТАШКОЎ Юрый Уладзіміравіч, нарадзіўся 20.5.1969, сяржант, загінуў 15.3.1989, пахаваны ў в. Пакалюбічы.

МАРОЗАЎ Аляксандр Уладзіміравіч, нарадзіўся ў 1964, радавы, загінуў 26.7.1985, пахаваны ў г. Арэнбург.

МАСКАЛЁЎ Леанід Міхайлавіч, нарадзіўся 15.1.1943, радавы, загінуў 17.7.1964, пахаваны ў Казахстане.

НЕМЦАЎ Пётр Сяргеевіч, нарадзіўся 12.7.1969, радавы, загінуў 7.10.1988, пахаваны ў в. Новая Буда.

А.М.Храмцоў.

І.А.Капота.

У.С.Старавойтаў.

НЕСЦЯРЭНКА Алег Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1954, загінуў у 1974.

ПАКАТАШКІН Іван Васільевіч, нарадзіўся 9.1.1960, радавы, загінуў 5.7.1979, пахаваны ў в. Краўцоўка.

ПРАТАСЕНКА Аляксандр Міхайлавіч, нарадзіўся 10.2.1958, радавы, загінуў 11.1.1977, пахаваны ў пас. Бальшавік.

РАЖКОЎ Павел Леанідавіч, нарадзіўся 14.5.1976, радавы, загінуў, пахаваны ў в. Лапаціна.

САВАСТОЎ Яўген Васільевіч, нарадзіўся ў 1948, радавы, загінуў 25.5.1972, пахаваны ў пас. Першамайск Веткаўскага раёна.

СТАРАВОЙТАЎ Уладзімір Сямёнавіч, нарадзіўся 27.1.1954, прапаршчык, загінуў 18.6.1986, пахаваны ў в. Клімаўка.

ХРАМЦОЎ Аляксандр Мікалаевіч, нарадзіўся 26.3.1969, лейтэнант, памёр 10.1.1990, пахаваны ў в. Цярэшкавічы.

Загінулі ў Афганістане

КАПОТА Ігар Аляксеевіч, нарадзіўся 9.7.1965 г. у в. Прыбыткі. Беларус. Маці, Вера Фёдараўна, аператар Гомельскай нафтабазы, бацька, Аляксей Лявонавіч, механік механізаванай дыстанцыі. У 1980 г. Ігар скончыў 8 класаў Зябраўскай сярэдняй школы, у 1983 г. — гомельскае ПТВ № 22. Працаваў машыністам вежавых кранаў. У маі 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію Гомельскім ГВК. Служыў у Афганістане. Малодшы сяржант І.А.Капота 27.9.1985 г. быў цяжка паранены і памёр ад ран. Пахаваны ў в. Прыбыткі. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

... У той дзень група байцоў вярталася з задання і нарвалася на душманаў. Завязаўся бой. Ігар быў цяжка паранены ў галаву. Верталёт не змог прабіцца да іх пад абстрэлам. Толькі ўвечары прыйшла дапамога, але ўжо было позна...

З пісьма камандавання вайсковай часці бацькам І.А.Капоты

С чувством большого горя и скорби сообщаем Вам о гибели Вашего сына, Капота Игоря Алексеевича. За время прохождения службы в нашей части Игорь заслужил высокие слова благодарности за выполнение своего воинского долга... Игорь был мужественным и исполнительным воином, до конца добросовестно исполнивший свой долг перед Родиной. Своим трудом он завоевал любовь и уважение своих товарищей по службе и командиров...

Командир войсковой части *Г.Быков*
Заместитель командира части *В.Петрухин*

СТАРАВОЙТАЎ Уладзімір Сямёнавіч, нарадзіўся 27.11.1954 г. у в. Клімаўка. Беларус. Маці, Дар'я Емяльянаўна, пенсіянерка, жыве ў в. Клімаўка, бацька, Сямён Іванавіч, памёр. З 1986 г. служыў у Афганістане. Авіямеханік прапаршчык У.С.Старавойтаў загінуў 18.6.1986 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў в. Клімаўка. У У.С.Старавойтава расце дачка Наташа, якая жыве разам з маці Алай Уладзіміраўнай.

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ
Помнікі архітэктуры

ГРАБАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВЁСКА ГРАБАЎКА, ПАРК

У 2-й палавіне 19 ст. у некаторых невялікіх сядзібах ствараліпарк. Быў закладзены і парк уздоўж невысокай рачной тэрасы на поўнач ад вёскі Грабаўка. Утрыманне парку, напэўна, не патрабавала вялікіх намаганняў, аднак разам з прыемнасцю ён прыносіў і карысць, бо большую частку тут займаў фруктовы сад. Яблыні былі пасаджаны ўздоўж цэнтральнай ліпавай алеі, якая падзяляла парк на заходнюю і ўсходнюю часткі. Ліпы ўтваралі высокія зялёныя калідоры шырынёй у пяць метраў. Садзілі ліпы даволі прывольна, на адлегласці трох метраў адна ад адной. Уязная алея вяла цераз дамбу да аднапавярховага драўлянага сядзібнага дома, які, на жаль, загінуў — згарэў 17 мая 1982 г. Вакол дома быў маляўнічы куточак пейзажнага парку з салітэрамі і групамі дрэў, што ствараліпрыгажосць і ўтульнасць надае парку рака Грабаўка. Недалёка ад сядзібнага дома насыпаны рамантычны курган. Узбуджае рамантычныя ўспаміны ў парку, навявае таямнічасць напаўразбураны падземны склеп каля дарогі, надмагільны камень з чорнага лабрадарыту, на якім засталіся толькі лічбы: «1864 — 1893», астатнія сцёр час.

ГЛЫБОЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВЁСКА ГЛЫБОЦКАЕ, ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ

Як сведчаць архіўныя матэрыялы за 1867 г. «Церковь построена в 1849 году крестьянином села Глубоцкое Карпом Луцковым. Здание деревянное на каменном фундаменте с таковою же колокольней, крыто железом. При сей церкви положено: священник, дьяк, пономарь и просвирня... Священник Никодим Алексеев Волотовский, сын дьячка... Дьячок Иван Титович Федоров, сын дьяконский». (НАРБ. Ф. 2938. Воп. 1. Спр. За. Ведамасць за 1867 год.)

Наступны дакумент аб справах Глыбоцкай царквы звяртае ўвагу:

«Земли при сей церкви, кроме трех десятин, подаренных под церковь князем Паскевичем-Эриванским около 3 десятин. Сенокоса от прихожан нет... Церковный староста Иосиф Григорьевич Борисенко.

В библиотеке церкви духовно нравственных содержания книг и брошюр состоит 101 экземпляр.

Священник Павел Михайлович Воскресенский, протоиерейский сын. Псаломщик дьякон Даниил Петрович Андруцкий». (НАРБ. Ф. 2938. Воп. 1. Спр. 7. Ведамасць за 1885 год.)

Як бачна з чарговай захаваўшайся ведамасці, з 1907 г. святаром царквы быў

Грабаўскі парк.

Мікалай Паўлавіч Васкрасенскі. (НАРБ. Ведамасць за 1908 год.) Назіраецца пераемнасць ад бацькі да сына і ў блізкіх да царкоўных спраў прыхаджан: калі ў 1867 г. царкоўны староста Іосіф Рыгоравіч Барысенка, дык у 1910 г. Нічыпар Іосіфавіч Барысенка. Цікавую карціну маёмасці царквы і яе тагачасную ацэнку дае ведамасць за 1910 г.:

«Рождество-Богородицкая церковь построена в 1849 году крестьянином села Глубоцкого Карпом Леоновым Луцковым.

В 1881 году вновь перестроена на средства церковные, общественные и пожертвования. Здание деревянное на каменном фундаменте с таковою же колокольней. Утварь посредственная, а именно: на Святом Престоле облачений два, крест серебрянный вызолоченный и медный тоже вызолоченный, Евангелие в медном бронзовом окладе. Дарохранительница медная посеребряная. На Св. жертвеннике: Дискос, Потир, Звездица, Ложица, ковшик с малым блюдцем серебряные, вызолоченные. Сосуд для освещения хлебов и водосвятная чаша медная. Священнических облачений: пять риз, три из них с полным прибором, набедренник, воздухов и покровцев три перемены.

При сей церкви положено: Священник и Псаломщик.

Земли при сей церкви усадебной 4 десятины 420 кв. сажен, земли пахотной 21 десятина 1571 кв. сажен и сенокосов 10 десят 668 кв. сажен. Итого 36 дес. 277 кв. сажен. Землею пользуется сам причт...

Дома для священнослужителей имеются: у священника дом казенный, построенный в 1900 году, надворные строения церковные. У псаломщика дом тоже казенный, построенный в 1908 г., кроме того, надворные строения собственные.

На содержания причта из Гомельского уездного казначейства отпускается 621 рубль в год».

На сённяшні час царква вельмі ў добрым стане, клапатліва падтрымліваецца. Звяртае ўвагу значная колькасць абразоў старога пісьма ў разных драўляных абкладах, з чаканкай па ляўкасе, шыццём бісерам.

Царква будавалася ў цэнтральнай частцы вёсцы, што надавала ёй асаблівую значнасць і прыгажосць.

У плане царква сіметрычная, нагадвае крыж. Да асноўнага аб'ёму прылягаюць крылы трансепта і бабінца. Над бабінцам узвышаецца званіца (васьмярык на чацверыку), завершаная невялічкім васьмігранным шатровым дахам. Асноўны аб'ём квадратны ў плане, з высокім васьмігранным барабанам і купалам. Такія ж купалы з крыжамі на васьмерыках узвышаюцца над алтарным і бакавымі фасадамі. Значную ролю ў аздабленні будынка іграюць прамавугольныя вокны на званіцы і асноўнага аб'ёму, а таксама з ліштвамі ніжняга паверха. Сцены будынка ашаляваны гарызантальна, у аздабленні выкарыстаны пілястры, прафіляваныя карнізы, тонкія разныя паясы. Гісторыю царквы, яе дойлідства вывучае і расказвае мясцовы свяшчэннік — протаіерэй Пётр Філіпавіч Марозаў у царкве з 1960 г. Па словах П.Ф.Марозава, дагэтуль жыве ў вёсцы паданне, што пабудаваў царкву заможны селянін Карп Лявонавіч Луцкоў. Знайшоўшы ў архівах матэрыялы пра даўніну царквы, П.Ф.Марозаў прадоўжыў запіс гісторыі яе існавання: «С постройки церкви... богослужения шли в оной беспрерывно, кроме того часа, когда началась новая полоса сильнейших гонений на православную церковь и верующих. В начале коллективизации, с организаций в дер. Глубоцкое колхоза «Пески», по требованию местных ретивых партийцев и руководства колхоза, а также при поддержке районных властей было принято решение церковь закрыть. По закрытию

церкви и кощунственному свержению крестов с храма и колоколов со звонницы, местные прихожанки разобрали большую часть икон и пр. по домам. Эти благочестивые люди сберегли все священные вещи, и после открытия храма вернули все в оный. Разрушен храм не был. В нем устроили сначала зерносклад, а позже — клуб».

З якім разуменнем справы, расказвае айцец П.Ф.Марозаў, зроблена царква, «як дзяды нашы рабілі». Кладка сцен — «брус на брус», без імху, каб «больш захоўвалася», купал — «вырубка з дрэва», падлога захавалася «родная», з часоў стварэння, дошкі таўшчынёй 7 см. Шкло аконнае «было, як у лямпах, тонкае, устаўленае без цвікоў — так замазка добра трымала». Ды і цвікі ў царкве былі самаробкі. Пры аднаўленні царквы, па словах айца Пятра, фрагменты старых роспісаў купала, што засталіся да той пары, былі зафарбаваны. Роспіс барабана і купала асноўнага аб'ёму гадоў дзесяць назад нанава выкананы ленінградскімі мастакамі.

Царква дзейнічае, і святар П.Ф.Марозаў імкнецца да духоўнага адраджэння аднавяскоўцаў.

Царква Раства Багародзіцы.

ГЛЫБОЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВЁСКА ГЛЫБОЦКАЕ, ЦАРКОЎНАПРЫХОДСКАЯ ШКОЛА

Як паказваюць царкоўныя ведамасці, з пачатку свайго існавання царква ў вёсцы Глыбоцкае мела прамыя адносіны да выхавання і адукацыі сялян. Сын дзячка, святар Нікадзім Аляксееў Валатоўскі, займаў пасаду настаўніка пры адкрытым ў 1867 г. сельскім вучылішчы. (НАРБ. Ф. 2938. Воп. 1. Спр. 3а. Ведамасць за 1867 год.) У 1903 г. у вёсцы Глыбоцкае быў пабудаваны будынак спецыяльна для царкоўнапрыходскай школы. Настаўнікам у той час працаваў Данііл Іаанавіч Каваленка, навучаліся 33 дзяўчынкі і 51 хлопчык. (НАРБ. Ф. 1938. Воп. 1. Спр. 1. Ведамасць за 1910 год.) Царкоўнапрыходская школа знаходзілася нападалёку ад царквы. Будынак школы быў драўляны, аднапавярховы. Недалёка ад месца, дзе была школа, захаваліся рэшткі другога драўлянага збудавання (зруб без даху), які, магчыма, выкарыстоўваўся як жыллё для служачых пры школе.

ГЛЫБОЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВЁСКА ГЛЫБОЦКАЕ, ЗЕМСКАЯ ШКОЛА

На заходняй ускраіне вёскі знаходзіцца будынак земскай школы. У названай царкоўнай ведамасці за 1910 г. гаворыцца, што ў 1903 г. у земскай школе навучалася 17 дзяўчынак, 35 хлопчыкаў. Настаўнікам быў Іван Мікалаевчі Шэўмерг (?). Школа пабудавана ў канцы 19 ст. з цэглы, будынак аднапавярховы, крыты вальмавым дахам, прамавугольны ў плане. Галоўны фасад мае цэнтральны рызаліт, які ўпрыгожаны ступеньчатым атыкам. Будынак падноўлены ў апошнія гады, у сувязі з гэтым атык прыдбаў больш спрошчаныя формы. Лучковыя праёмы вялікіх акон закладзены цэглай. Цяпер гэты будынак выкарыстоўваецца для гаспадарчых патрэб.

МАРКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВЁСКА ГАДЗІЧАВА, ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА

У цэнтры вёскі Гадзічава ў 2-й палавіне 19 ст. узняўся вялікі цагельны будынак царквы ў стылі класіцызму. Асноўны аб'ём прарэзаны з восевымі ўваходамі з галоўнага і бакавых фасадаў. Уваходы вылучаны аднолькавымі чатырохкалоннымі порцікамі. Дах царквы ступеньчаты, завершаны шматгранным шатром. Сцены атынкаваныя, прарэзаныя аконнымі лучковымі праёмамі ў два ярусы. Ліштвы ніжняга паверха — з замковымі камянямі. Па ўсім перыметры будынка праходзяць пояс і карніз. Цэнтральная зала царквы мае плоскую драўляную столь, якая апіраецца на 4 слупы. Да царквы прымыкаюць памяшканні прытвора, прыдзела, якія маюць самастойныя ўваходы, і памяшканне апсіды, у якой вылучаны невялікія рызніцы па баках. Царква дзейнічае. Будынак з'яўляецца помнікам рэспубліканскага значэння.

ЧОНКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВЁСКА СЕЎРУКІ, ПАШТОВАЯ СТАНЦЫЯ

Сухапутныя шляхі Беларусі развіваліся здаўна, набываючы ў кожны гістарычны час свае асаблівасці. «Ваши дороги, как сады!» — захаплялася беларускімі дарогамі Кацярына II. Аляксандр I у сваім «высочайшем указе» 1819 г. адзначыў: «Белорусские дороги оставить в настоящем их виде, стараясь только исправить оныя, где нужно будет починками и посадкою новых деревьев, дабы аллеи всегда находились в порядке». (Сардаров А.С. История и архитектура дорог Белоруссии. Мн., 1978. С. 37.) Трэба сказаць, што значны росквіт будаўніцтва дарог на Беларусі набыло пасля далучэння да Расіі. Тут адбыўся выключны для Расійскай дзяржавы «...прыклад комплекснага дарожнага будаўніцтва ў беларускіх губернях, які ў многім садзейнічаў гаспадарчаму развіццю гарадоў, іх тавараабмену з суседнімі губернямі... Ініцыятыва мадэрнізацыі інфраструктуры краю і заслуга яе рэалізацыі належалі З.Г.Чарнышову». (Слюнькова И.Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII — середины XIX в. Мн., 1992. С. 96.) Менавіта ў той час важнае значэнне набыла і дарога Пецярбург — Кіеў, пазней Пецярбург — Адэса, на якой, у трох кіламетрах ад вёскі Сеўрукі, стаіць паштовая станцыя, пабудаваная ў другой палавіне 19 ст. Паштовыя станцыі яшчэ пры Пятры I у пачатку 18 ст. былі заснаваны на многіх беларускіх дарогах. З цягам часу іх становіцца болей, выпрацоўваецца станцыйны комплекс пабудоў са спецыфічным іх размяшчэннем. Традыцыйна размешчаны і пабудовы паштовай станцыі Сеўрукі. Цэнтральнае месца займае аднапавярховы будынак дома, які выходзіць фасадам на шашу. Прамавугольны, цагляны, з двума ўваходнымі тамбурамі з абодвух фасадаў, напэўна, дабудаваны пазней да асноўнага аб'ёму. Пра цяпло дома нагадвае грунтоўны, самавіты комін над вальмавым дахам. У тыя часы неяк не прынята было нават просты будынак рабіць без усялякіх архітэктурных выяў, без таго, што завецца архітэктурнай мовай, — вось і прарэзалі з галоўнага фасада лучковыя вокны, зрабілі цагляныя ліштвы, упрыгожылі франтоны ступеньчатым цагляным узорам. А.С.Сардараў у кнізе «История и архитектура дорог Белоруссии» піша пра паштовую станцыю Сеўрукі: «В особую группу можно выделить станционные дома на участке шоссе Петербург — Киев близ Гомеля... на 893-м километре современной магистрали Ленинград — Киев. Здесь эклектичная их архитектура уже, очевидно, ближе к позднейшим исканиям 60—70-х гг. XIX в.» (с. 50—51). Сапраўды, будынак выкананы з выкарыстаннем прыёмаў так званай цаглянай архітэктуры, якая бліжэй да канца XIX ст. і характэрна дойлідству правінцыі. У той жа манеры, што і дом, выкананы дзве стайні, якія размешчаны на поўдзень і на поўнач ад яго. Стайні каркаснай канструкцыі — з цаглянымі слупамі і драўлянымі сценамі паміж імі. Стайні часткова дабудаваны ў наш час, нанава зроблены і плот, які разам з імі ўтварае вялікі прамавугольны двор з традыцыйным калодзежам у цэнтры. Пасля Вялікай Айчыннай вайны на былой паштовай станцыі размешчаны дарожны ўчастак.

СТАРАБЕЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВЁСКА СТАРАЯ БЕЛІЦА, МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА

Знаходзіцца царква ў цэнтры вёскі. Розныя крыніцы называюць розныя часы яе пабудовы. С.Г.Багласаў у Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі па Гомельскай вобласці датуе пабудову 1-й палавінай 18 ст. (с. 141). У выданні «Архітэктура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік» ён жа ўдакладняе: «...пабудавана ў 1710» (с. 458). У «Календаре для духовенства Могилевской епархии на 1899 годъ» зазначана: «...постр. 1777 г.; деревян.; прих. об. п. 2317; церк. земли 36 д.» (с. 88). Блізкі да гэтай лічбы даследчык Ю.А.Якімовіч: «царква Мікалая ў Старой Беліцы Гомельскага раёна (70-я гады XVIII ст.). (Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVII—XIX стст. Мн., 1978. С. 119—120.) Ю.А.Якімовіч разглядае Старабеліцкую Мікалаеўскую царкву як своеасаблівы прыклад у развіцці трохзрубных трохверхавых цэркваў: «Царква...мае адназаломныя васьмерыковыя вярхі, аднак яны нагадваюць больш дэкаратыўныя вянчанні і не змяняюць прынцыпова восевай кампазіцыі храма. Своеасаблівасць царквы ў тым, што бабінец і алтар вырашаны гранёнымі зрубамі, што стварае сіметрычны план» (с. 120). Такім чынам, храм мае восевую кампазіцыю, складаецца з трох зрубаў, якія даюць трохчасткавы інтэр'ер. Бабінец і алтар, што прыбудаваны з усходу і захаду да асноўнага квадратнага ў плане аб'ёму, — пяцігранныя. Усе тры аб'ёмы ўвянчаны двух'яруснымі вярхамі — «васьмярык на васьмерыку» — і завершаны барочнымі галовамі. Да першапачатковай кампазіцыі прыбудаваны цэнтральны і бакавыя тамбуры. Вокны прамавугольнай і рамбавіднай формы, высока размешчаныя. Складзеныя з брусоў сцены царквы ў гады Вялікай Айчыннай вайны вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі. Па словах святара, Сакалоўскага Уладзіміра Карнілавіча, частка царкоўных абразоў пасля закрыцця храма была схавана жыхарамі вёскі, а потым вернута ў царкву. Так, Анціпава Пелагея Васільеўна выратавала адзін з лепшых абразоў — Божай Маці «Траяручыцы». Зараз у храме абразы вельмі розныя па мастацкай каштоўнасці — побач з рэпрадукцыямі на паперы можна ўбачыць самабытнае старажытнае пісьмо.

СТАРАБЕЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВЁСКА СТАРАЯ БЕЛІЦА, СЯДЗІБА

Яны павінны былі развітацца. Так склаўся лёс, які мацнейшы за пачуцці... І ўсё гэта было для іх, абодвух, у апошні раз. Змяркалася. Затухала над паркам кволае святло. Ветрык вызвоньваў сумную мелодыю на абледзянелых пад вечар галінках дрэў. Сумам і холадам патыхала ад вялізных валуноў каля закінутай у далечыні саду веранды.

— А вось камяні застануцца тут і ніколі нікому пра нас не раскажуць, — сказала яна.

— Так, — сказаў ён, — камяні застануцца тут, толькі яны панясуць у будучыню тваё імя, Памэлка...

Было такое, ці не — цяжка сказаць. Але ж: «Памэлка Бэжлова 1858 сакавік 18-е», — чытаем мы на вечным камяні, што ляжыць каля рамантычнага курганнага насыпу ў былым панскім парку вёскі Старая Беліца. Тут мроіцца гісторыя былога кахання. Яе згубіў час, а людзі згубілі і сам напамін аб тым, даўнім жыцці ў гэтых мясцінах...

Праз зараснік крапівы, як скрозь лес, прадзіраемся мы, каб убачыць, дзе тут, у закінутым парку, яшчэ два гады таму стаяў панскі сядзібны дом, пабудаваны з дрэва ў 1796 годзе. Быў ён як рэдкі помнік эпохі рамантызму, занесены ў кнігу беларускіх скарбаў «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», апісаны, сфатаграфаваны. Вось гэта толькі і засталося. Зруйнавалі і панскі дом, і рэдкасныя гаспадарчыя пабудовы, што ўтваралі разам непаўторны комплекс... Ці сыходзіць у небыццё чалавечая памяць? Мо, гэта сёння і сапраўды не патрэбна нікому? Ды не! Вось вядзе ж нас, кінуўшы справы, праз жыгучы зараснік Забалотнікава Марыя Давыдаўна, што працавала ў старым доме, калі была тут школа. Расказвае са слязамі ў голасе, як у 1950-я гады зламалі другі паверх: «... а лес жа які быў харошы!..

Свята-Пакроўская царква ў в. Галавінцы.

застаўлялі на дровы піліць...» У кнізе «Збор помнікаў...» гэты боль адлюстраваны лаканічнай фразай: «Рэканструяваны ў 1950-я гады». А потым — знішчылі зусім, як і не было. «А вось жа, вось тут уваход быў... во шкандары драўляныя, гнілыя, а то ўсё разабралі па кірпічыку». Слухаеш, глядзіш — і ў адчай уплятаецца надзея: жывуць пачуцці людскія да сваёй зямлі! І яшчэ цудоўнага чалавека мы сустрэлі ў Старой Беліцы — Жарын Віктар Фёдаравіч — усё ведае, расказвае пра сядзібу, водзіць па ўспамінах парку, дзе часам толькі адзіночныя дрэвы нагадваюць пра харaство былых алей... У канцы 18 стагоддзя ўзнік парк, як рэгулярны, потым, са зменай уяўленняў і густаў, пераўтварыўся ў пейзажны. У парку Старой Беліцы «новая планировка накладывалась на прежнюю, почти растворяла ее», — піша А.Т.Федарук у кнізе «Садово-парковое искусство Белоруссии» (Мн., 1989. С. 94). Толькі вакол сядзібнага дома «парадная часть сохранила регулярное симметрично-осевое решение» (там жа, с. 110). Вернемся на хвіліну ў мінулае, калі існавала панская сядзіба... Шапацяць старыя ліпы, бы вартавыя, абходзяць яны вялікі парк, дзе стаіць стары-стары панскі дом — выцягнуты, накрыты двухсхільным дахам з вальмамі на тарцах. Высокія прамавугольныя вокны, ліштвы. Праз парадны ўваход можна трапіць у вялізную залу, дзе на сценах — партрэты продкаў, гучыць музыка і пахне кветкамі. Гаспадар Міхаіл Солтан быў рамантык. Таму і надпісы на паркавых камянях. «После трудов — отдохновение», — выбіта на адным з іх. Пэўна, ён разумеў прыгажосць працы, у памесці да таго імкнуўся. Па баках залы ў доме былі пакоі для працы, адпачынку, роздуму. А ў тарцовых частках дома знаходзіліся памяшканні для прыслугі з асобнымі ўваходамі. З гаспадарчых пабудоў доўга захоўваўся ў Старой Беліцы свіран, пабудаваны ў сярэдзіне 19 ст. у стылі ампір. Сцены галоўнага і бакавых фасадаў былі складзены з бру-

Успенская царква ў в. Чарацянка.

соў, а дваровага — з бярвён. Будынак меў сіметрычную кампазіцыю. Двухсхільны дах навісаў над галоўным фасадам, а ў вялікай нішы адкрываўся ўваход. Унутры былі 3 вялікія і 2 маленькія адсекі з самастойнымі ўваходамі. Аздоблены быў свіран калонамі з дарычнымі капітэлямі, пілястрамі, паўцыркульнымі праёмамі — дзіўныя жылі тады людзі! А сядзібе нанесла ж адбіліся. На месцы алтара ўзнікла прыбудова для клуба, а потым і кінабудка, качагарка, дабудаваны крылы трансепта, прыгожыя паўцыркульныя вокны зменены на прамавугольныя. Страчана званіца ў 6—7 званоў, як кажуць у вёсцы: «Былі велічэзныя званы. Калі скідалі, дык яны напалавіну ў зямлю ўлезлі». Яшчэ прыгожы крыжова-купальны будынак можна ўбачыць на здымку 1960-х гадоў з сямейнага архіва М.У.Валатоўскага, можна параўнаць яго з існуючым... Над высокім пагоркам, над лукавінай ракі Іпуць здалёк бачна драўляная царква. І неяк ненатуральна ўзнялася цыбулепадобная галава знявечанага храма. Аднак адраджэнне яго магчыма!

канавана было адчуць на сабе змену ўяўленняў аб прыгажосці не толькі пры класіцызме ды рамантызме, але і ў наш час. Згінуў помнік, але засталася памяць у разумных і добрых сэрцах, засталося пачуццё, што не на пустым месцы, а ў шэрагу пакаленняў ідзе жыццё кожнага з нас.

УЛУКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВЁСКА ГАЛАВІНЦЫ, ЦАРКВА

Мясцовыя жыхары кажуць: «Царква спакон веку тут была... а святарамі былі Валатоўскія, яшчэ прадзед іх служыў». Нашчадак Валатоўскіх, Мікалай Уладзіміравіч, разважае: «Прадзед, святар Нікадзім, пахаваны быў каля царквы, а калі ў 1900-я гады будынак пашыраўся, магіла апынулася ўнутры. Такім чынам, у 2-й палавіне 19 ст. царква ўжо існавала». Пры савецкай уладзе святарам царквы не шчасціла. У 1920-я гады святара арыштавалі, спынілі службы. У другі раз закрылі царкву ў 1937 г., айца Валатоўскага Васіля Нікадзімавіча забралі. Пры нямецкай акупацыі царкву адкрылі, а недзе ў канцы 1950 — пачатку 1960-х гадоў закрылі зноў. На архітэктуры будынка ўсе гэтыя зменлівасці лёсу вядомы ж адбіліся. На месцы алтара ўзнікла прыбудова для клуба, а потым і кінабудка, качагарка, дабудаваны крылы трансепта, прыгожыя паўцыркульныя вокны зменены на прамавугольныя. Страчана званіца ў 6—7 званоў, як кажуць у вёсцы: «Былі велічэзныя званы. Калі скідалі, дык яны напалавіну ў зямлю ўлезлі». Яшчэ прыгожы крыжова-купальны будынак можна ўбачыць на здымку 1960-х гадоў з сямейнага архіва М.У.Валатоўскага, можна параўнаць яго з існуючым... Над высокім пагоркам, над лукавінай ракі Іпуць здалёк бачна драўляная царква. І неяк ненатуральна ўзнялася цыбулепадобная галава знявечанага храма. Аднак адраджэнне яго магчыма!

ЦЯРЭШКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВЁСКА ВЫСОКАЯ ГРЫВА

У вёсцы знаходзяцца рэшткі насаджэнняў былога парку, якія ўяўляюць сабой дэндралагічную каштоўнасць і могуць быць выкарыстаны ў якасці матачнікаў.

ЧАРАЦЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВЁСКА ЧАРАЦЯНКА, УСПЕНСКАЯ ЦАРКВА

У 1865—1868 гг. царква пабудавана з цэглы на паўночнай ускраіне вёскі. Кампазіцыя крыжова-купальная. Апсіда прамавугольная. Вежа-званіца прамавугольная ў плане, два верхнія ярусы квадратныя, са зрэзанымі вугламі, завершаны цыбулепадобным купалам. Над сяродкрыжжам узвышаецца васьмігранны светлавы барабан з цыбулепадобным купалам. У агульным абліччы храма значную дэкаратыўную ролю іграюць высокія паўцыркульныя аконныя праёмы.

Крыніцы:

Архітэктура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1993.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць. Мн., 1985.

Сардаров А.С. История и архитектура дорог Белоруссии. Мн., 1978.

Слюнькова И.Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII — середины XIX в. Мн., 1992.

Федорук А.Т. Старинные парки Белоруссии. Мн., 1985.

Федорук А.Т. Садово-парковое искусство Белоруссии. Мн., 1989.

Якімовіч Ю.А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся: XVII—XIX стст. Мн., 1978.

Календарь для духовенства Могилевской епархии на 1899 годъ. Годъ первый. Могилевъ, 1899.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 2938. Воп. 1. Спр. 1, 3а, 7. Ведамасці за 1867, 1885, 1908, 1910 гг.

Вёска Цагельня

Калі ўзнімаем погляд угору, вандруючы па цэнтральных гарадскіх вуліцах, — то можам убачыць цагляныя карункі старых дамоў, якія імкнуцца да неба. І тады тут, паміж небам і зямлёй, хапае нас за крылцы душы і цягне на спатканне няўрымслівая асоба — гісторыя. З 2-й палавіны 19 ст. мноства цагляных узораў адзначыла гарады правінцый. «Цагляны стыль» — рацыянальная ідэя ўпрыгожвання дамоў той жа цэглай, з якой іх будуюць. Багатыя ўладальнікі дамоў не скупіліся адзін перад адным траціць грошы на шыкоўнасць узораў. І доўга перажывалі потым дамы папрокі ў безгустоўнай раскошы. А сёння мы бачым, што яны ўпрыгожваюць горад, без іх не адчуеш смак даўніны. Пэўна ў кожнага з гэтых беленых, фарбаваных у шмат слаёў старых прыгажуноў існуе свая гісторыя, якая губляецца ў часе, але ўсё ж такі зрэдку даходзіць да нас паданнем. Жыве такое паданне і ў вёсцы Цагельня, а падараваў яго нам Павел Пятровіч Юхневіч. Да яго ў свой час дайшло ад дзеда Захаркі — Захара Тарасавіча Цярэшчанкі, ды яшчэ ад Данілы Машука — аднавяскоўца былога шафёра князя Фёдара Іванавіча Паскевіча, сына знакамітага фельдмаршала...

Было, кажуць, у Фёдара Паскевіча такое захапленне: па вёсках на сваім аўтамабілі раз'язджаць ды прыгожых дзяўчын выглядаць. Ні для каго ж не было таямніцай, што погляды ў яго з жонкай, Ірынай Іванаўнай, на жыццё былі не зусім аднолькавыя, і справы яе дабрачынныя Фёдар Іванавіч, хоць і падтрымліваў, але ж без асаблівай апантанасці. Дык вось, катаецца гэтак Паскевіч на машыне па наваколлях, прыродай любуецца, а як прыгожую дзяўчыну каля крыніцы заўважыць — адразу ж, бо чалавек ён выхаваны, вядро вады прыгажуні асабіста да хаты паднясе. А там і на працу якую прапануе ўладкаваць... Калі ж народзіцца сын — дае яму прозвішча Лявіцкі, самі разумееце чаму. Вось такі Лявіцкі і жыў у Цагельні. Бацька даў яму адукацыю ў Пецярбургскім лесатэхнічным інстытуце, зямлю ў Цагельні — аж, кажуць, да Чонак і да Клёнак. У Цагельні той Лявіцкі цагельны заводзік пабудаваў і са сваёй цэглы шыкоўны дом «цаглянага стылю» ў Гомелі на Савецкай (тагачаснай Румянцаўскай) вуліцы пабудаваў, дзе і жыў пастаянна. А яшчэ ў Цагельні на 18 гектарах пасадзіў рэдкасны сад на 1800 дрэў. Раскошная садавіна і за мяжу вывозілася, і ў Гомелі, у знаёмым кожнаму гамяльчаніну «цагляным доме», дзе крама «Дары прыроды», прадавалася. Адразу ж пасля рэвалюцыі бальшавікі Лявіцкага забралі, ды нешта праз паўгода і выпусцілі. У 1918 годзе сваёй смерцю памёр. А дрэвы таго саду Павел Пятровіч Юхневіч яшчэ і на свае вочы бачыў, і, будучы чалавекам вайсковым і дакладным, падлічыў — 500 захавалася да пачатку 1970-х гадоў. Некалькі дрэў і цяпер век дажываюць. Вось так. Калі і не ўсе паданні захапляюча прыгожыя і паэтычныя, дык усё ж такі усе — прыцягальныя, бо і сам чалавек далёкі ад вяршынь дасканаласці.

В.М.Лямцава-Канасевіч.

Лясны домік

Сярод задуменнай мелодыі фарбаў Каранёўскага лесу нечаканым і моцным акордам гучыць чырвона-белы колер сядзібнага «паляўнічага доміка». Здаля, скрозь сілуэты старых дрэў, ён вабіць мудрагелістасцю, складанымі контурамі дахаў, адмысловасцю фігурных комінаў.

Упершыню аб існаванні «паляўнічага доміка», ці, як завуць яго мясцовыя жыхары, «краснага дома», на паўднёвай ускраіне вёскі Каранёўка, паведамляецца ў 1864 г. у кантракце на арэнду Каранёўскага фальварка ў Ф.І.Паскевіча гомельскім 2-й гільдыі купцом Аляксеем Іванавічам Яндоўскім (спр. 492, л. 1). Тут адзначаецца, што «бывшая винокурня, обращенная въ охоничий домъ», застаецца ў поўным распараджэнні ўладальніка маёнтка.

«Смета на постройку въ Кореневкъ Охотничьего дома», складзеная 5 студзеня 1864 г. сведчыць, што перабудова бровара ў дом пачалася ў 1863 – 1864 гг. Спіс работ, азначаны ў «смеце», надта цікавы, бо дае магчымасць уявіць асаблівасці

памяшкання і яго дакладнае прызначэнне: «А. Нижний этажъ. I. Земляныя работы. 1. вынуть въ нижнемъ этаже земли и мусору... в псарнъ и конюшнъ съ сараемъ... для устройства черныхъ половъ. 2. 17,77 кв. с. глинянаго пола въ псарнъ... 17,33 кв. с. досчатаго пола въ конюшнъ и сараъ... 34,0 кв.с. шелевочной чистой подшивки потолка на польский [манер] въ конюшнъ, сараъ и псарнъ... Руская печь длиною 2 $^{3}/_{4}$, ширин. 2 арш. и при ней очагъ съ 2 Котлами... 1 очагъ обложенный израсцами съ чугунною плитою и пирожною печью въ буфетъ... 2,52 кв.с. выложить квадратными кафлями полъ въ передней [гончарными плитами]... 2,33 куб. с. заложить нынъ существующия двери и окна. Материалы. Кирпичъ съ незначительною добавкою новаго, найденъ изъ разломаныхъ стънъ, если не употреблять новый, то Гомельскаго маломернаго идетъ до 4,200 на 1 куб. с. кладки... 5,8 кв. саж. окраски клъевой дикимъ цвътомъ передней и буфета (спр. 610, л. 1—13).

Работы па перабудове бровара ў «паляўнічы дом» працягваліся ў 1865—1866 гг. Аб гэтым гаворыцца ў «Ведомостях о новых постройках по замку и гор. Гомелю». Тут згадваюцца прозвішчы майстроў, выкананыя імі работы, і такім чынам мы маем дадатковыя звесткі пра інтэр'ер, вонкавы выгляд будынка, яго асяроддзе: «Столяру Гауптману и Алтерману за сделание и настилку 64 кафель... паркета — 238 руб. Гауптману за сделание 4-х больших и 2-х меньших готических рам — 76 руб. ...за маленькие ворота, мостик на дороге при доме и 2 скамейки» (спр. 611, л. 1—27).

Рэальнае жыццё «паляўнічага дома» тых часоў паўстае за радкамі «Инструкции для смотрителя охотничьего домика в Кореневке и инструкции для егермейстера», складзеных у 1882 г.: «Обязанности смотрителя охотничьего домика в Кореневке заключаются в следующем: держать в совершенной чистоте охотничью залу и находящуюся в ней мебель и декоративные вещи... держать в соответствующем порядке принадлежащие к домику садовые и парковые заложения, а именно: прочищать дорожки, обрезать деревья и кустарники, высаживать новые... надзирать за охотничьими собаками...». Егермайстар Каранёўскага ўчастка абавязаны: «знать общее состояние всей дичи по Гомельскому имению, разыскивать её, производить охоту...» (спр. 1092, л. 1—4).

Якую мэблю і дэкаратыўныя рэчы належала трымаць у абсалютнай чысціні ў паляўнічай зале, мы знаходзім у «Описи имущества Гомельского замка и охотничьего дома» 1913—1915 гг.: «... герб Светлейшего Князя, писанный краской на жести, 2 канделябра бронзовых, на 4 свечи каждый, 2 канделябра роговых, на 3 свечи каждый, люстра висячая из папье-маше, покрыта коричневой краской, на 48 свечей, часы стенные в футляре красного дерева, 6 занавесок оконных, зелёных, 2 головы бизона, 2 — буйвола, 1 — медвежья; чучела: тигра, бобра, барсука, куниц, орла, дрохв и глухаря; 20 рогов разной величины, шкаф буфетный, красного дерева, большой, шкаф красного дерева длинный, низкий, диван красного дерева, обитый ситцем. Стол обеденный, круглый, раздвижной, о 18 ножках, красного дерева ...столы ломберные, малые, мраморные и красного дерева, кресла и стулья; посуда столовая фарфоровая и стеклянная...» (спр. 870, л. 82—84).

У 1920—1940-я гады мэбля, свяцільнікі, чучалы і іншыя рэчы, што знаходзіліся ў інтэр'ерах, а разам з тым і самыя інтэр'еры, унутраныя перагародкі, дах былі страчаны. Засталася толькі каробка будынка былога бровара з пераробкамі 1860-х гадоў.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны будынак выкарыстоўвалі пад жыллё, тут знаходзілася лабараторыя па ахове лесу Беларускага інстытута лясной гаспадаркі. У канцы 1960-х гадоў памяшканне было перададзена Ленінскаму вопытнаму лясгасу Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі, тут быў цэх па вырабе калекцый лясных насякомых. У «красным доме» знаходзіўся і цэх па прасаванні драўніны, дзе ўпершыню на Гомельшчыне інстытутам механікі металапалімерных сістэм праводзіліся работы па выкарыстанні кампазіцыйных лакаў і драўніны ў прамысловасці.

З 1983 г. у будынку размешчана кантора Каранёўскай эксперыментальнай базы Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

У 1978 г. па ініцыятыве і намаганнямі

дырэктара лясгаса Тытуленка Алы Васільеўны была распачата рэстаўрацыя «краснага дома». Адначасова з рэстаўрацыйнымі работамі спецыяльныя навукова-рэстаўрацыйныя вытворчыя майстэрні Міністэрства культуры БССР рыхтавалі праект рэстаўрацыі помніка. Аўтар праекта — Рашатко Міхаіл Іванавіч. Рэстаўрацыя была завершана ў 1984 г. У ёй прымалі ўдзел мясцовыя майстры. Сталярныя работы выконваў Кір'янаў Барыс Міхайлавіч з Зябраўкі.

Першапачатковая анфіладная планіроўка інтэр'ера адноўлена не была. Праект прадугледжваў рэстаўрацыю цаглянай кладкі сцен, карнізаў і комінаў чырвонай глінянай цэглай, аднаўленне і ўмацаванне рустаў і ляпных налічнікаў, аднаўленне эркера на ўсходнім фасадзе, замест існаваўшага балкона. У адпаведнасці з праектам на месцы крайняга левага акна 1-га паверха правай часткі ўсходняга фасада зроблены дзверы і крыты ганак, як было на чарцяжах 1861 г. і аб чым сведчыла перамычка. На паўднёвым фасадзе дома рэстаўрыраваны балкон і дзвярны праём на месцы цэнтральнага акна 2-га паверха.

Будынак двухпавярховы, прамавугольны ў плане, з цэнтральным рызалітам, які значна ўзвышаецца над бакавымі аб'ёмамі. Рызаліт крыты асобным двухсхільным дахам. Франтон галоўнага фасада ўпрыгожаны трохлопасцевай аркадай, у цэнтральнай частцы якой першапачаткова знаходзіўся фамільны герб Паскевічаў. Вуглы рызаліту дэкарыраваны рустам, афарбаваным у белы колер. Пластыку аб'ёму рызаліту ўзбагачае эркер, які падтрымліваецца металічнымі кранштэйнамі XIX ст. Вокны 2-га паверха рызаліту маюць значна большы памер, чым астатнія, апраўлены складанымі ліштвамі, аздоблены валютамі. Значны дэкаратыўны эфект дае і крывалінейнае завяршэнне праёмаў іншых акон, падкрэсленае веерападобным радам кладкі цэглы. Рамантычныя асацыяцыі выклікаюць кацістыя і ромбападобныя пераплёты акон. У дэкаратыўны строй будынка ўваходзяць пабеленыя прафіляваныя цягі па перыметры, паміж 1-м і 2-м паверхамі. Як самастойныя архітэктурныя формы ўзвышаюцца над домам сіметрычна размешчаныя на даху рызаліту вялікія коміны. Раней у вялікай зале на другім паверсе знаходзіліся каміны.

Ужо на карце наваколляў Гомеля 1838 г. (спр. 243, л. 1) зафіксавана планіроўка сядзібы: абапал «паляўнічага дома» працягнуліся чатыры алеі. Перад галоўным фасадам — штучная сажалка прамавугольнай формы, у якой б'юць крыніцы. Тут заўсёды вадзілася многа рыбы, ёсць яна і цяпер. Сажалка падтрымліваецца ў добрым стане, некалькі разоў у апошнія гады праводзілася яе чыстка. У былыя часы сажалку з невялікім вадасховішчам за домам злучаў канал, цераз які быў перакінуты пешаходны масток.

З балкона дома, у бок лесу, была бачна алея старых ліп, якія, на жаль, не вытрымалі моцных парываў ветру летам 1994 г. і загінулі. Вяла алея ў «звярынец», менавіта там і адбываліся паляванні. Мясцовыя жыхары назву «звярынец» выкарыстоўваюць дагэтуль. Так званы «малы звярынец» знаходзіўся да чыгункі, а за ёй быў «вялікі звярынец». Як сведчыць «Отчет по устройству Кореневской лесной дачи за 1909 год» (спр. 1982, л. 1—4), дзічы было многа, асабліва дзікіх коз. Былі і ласі. Цяпер сюды толькі зрэдку завітваюць казулі. А вось з расліннага багацця ў Каранёўскай сядзібе захаваліся рэдкія пароды дрэў і кустарнікаў: сасна веймутава, лістоўніцы, піхта бальзамічная, кедр сібірскі, дуб чырвоны, розныя віды клёнаў, катальпа бігноніепадобная, птэлея трохлістая, магонія, а таксама пасадкі сасны пачатку XX ст.

В.М.Лямцава-Канасевіч.

Крыніцы:

1. Эскізны праект рэстаўрацыі і прыстасавання. Кніга 2, ч. 1. Мн., 1981 (Міністэрства культуры БССР, спецыяльныя навукова-рэстаўрацыйныя вытворчыя майстэрні. Аўтар праекта М.І.Рашатко).

2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3013. Воп. 1.

3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць. Мн., 1985.

Традыцыйнае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Гомельскага раёна

Жывуць у Гомельскім раёне старадаўнія традыцыі народнага ўмельства. Дагэтуль радуюць майстэртвам разьбяры па дрэве, ткачыхі, вышывальшчыцы, плятуць прыгожыя і зручныя ў побыце рэчы з саломы, лазы. У кожнай вёсцы ёсць свае знакамітыя, паважаныя ўсімі майстры. Імёны некаторых з іх вядомыя на ўвесь раён. Яны пастаянныя ўдзельнікі розных выставак — раённых, абласных, рэспубліканскіх. Дэманструюцца лепшыя творы народных умельцаў Гомельскага раёна і за межамі Беларусі, узнагароджваюцца дыпломамі, граматамі, прызамі.

Сталыя майстры вучаць свайму майстэрству моладзь, каб не згасалі тыя традыцыі, што надаюць адметнасць жыццю, выяўляюць найпрыгажэйшыя якасці чалавечай душы. Аб'ядноўвае майстроў розных вёсак Гомельскага раёна створаны пры раённым аддзеле культуры клуб народнай творчасці «Крыніца». Пасяджэнні клуба, дзе майстры паказваюць свае творы, дзеляцца думкамі, натхняюць прысутных, заахвочваюць моладзь паспрабаваць свае здольнасці, далучыцца да творцаў прыгажосці, дакрануцца да спадчынных каранёў.

Часта пасяджэнні клуба «Крыніца» наладжваюцца непасрэдна ў тых вёсках, дзе жывуць і працуюць лепшыя раённыя майстры.

У вёсцы Каранёўка жыве Ірына Журкевіч, маладая яшчэ майстрыха. Нарадзілася яна ў 1969 г. Сама навучылася вышываць, а потым асвоіла і тэхніку пляцення з саломкі розных бытавых рэчаў, сувеніраў, навучылася рабіць пано з саломкі. Творы Ірыны Журкевіч прымалі на фабрыку мастацкіх вырабаў.

Знакамітая адметнай творчасцю вёска Краўцоўка. У 1954 г. нарадзілася тут Чапурная Надзея Іванаўна. Скончыла яна вясковую дзесяцігодку, а потым — Магілёўскае культасветвучылішча. Зараз працуе Надзея Іванаўна ў роднай вёсцы загадчыцай Навагуцкага рэгіянальнага цэнтра. Жаночы клуб «Васіліса» аб'ядноўвае 20 майстрых. Сарцавінай клуба з'яўляюцца жанчыны сталага ўзросту, але цягнуцца да творчай працы і маладыя, выказваюць цікавасць вучні мясцовай школы. Віды мастацтва, у якіх працуюць майстрыхі, для вёскі традыцыйныя. Гэта ткацтва, вышыўка крыжам, гладдзю, насцілам, вязанне кручком і спіцамі. Асабліва каштоўнымі і цікавымі застаюцца традыцыйныя віды мастацтва — ручнікі, фіранкі, дываны, абрусы, посцілкі, навалачкі, прасціны. Выдатныя работы ў Ларчык Вольгі Сямёнаўны, 1930 г.н. Адметныя атрымліваюцца ў яе вышываныя прасціны, фіранкі, упрыгожаныя гладдзю, сакавітых колераў ручнікі. Да гэтых вышываных рэчаў вяжа яна ўзорыстыя карункі на спіцах. Можа працаваць Вольга Сямёнаўна і на ткацкім станку, што ёсць у яе хаце. Але любіць яна больш вышываныя крыжам дываны з цэнтрычным, геаметрычным раслінным арнаментам. Сцешанок Таццяна Міхееўна, 1932 г.н., захапляецца ткацтвам, вышываннем.

Плецены з лубу кораб для захоўвання зерня. Пачатак XX ст., Гомельскі раён. З фондаў абласнога краязнаўчага музея.

Любіць Таццяна Міхееўна яркія посцілкі: чырвоныя, ружовыя, сакавітыя зялёныя колеры спалучаюцца ў рэчах і падкрэсліваюць святочнасць і самабытнасць. Посцілкі Таццяны Міхееўны выкананы «ў ніты», выкарыстоўваецца геаметрычны, рапортны арнаменты: ідуць па чырвоным колеры поля разеткі з дробных геаметрычных фігур у каляровых прамавульніках. А яшчэ аддае майстрыха перавагу фрызападобным узорам, што таксама складаюцца з геаметрычнага расліннага арнаменту.

З больш маладых майстрых Краўцоўкі вядома за вясковымі межамі Вольга Якаўлеўна Кулікова, 1945 г.н. Ткацтвам і вязаннем у Краўцоўцы займалася яшчэ яе маці, з 2-га класа заахвоцілася і дзяўчынка, навучылася вышываць гладдзю. Дагэтуль дэманструе яна пры выпадках свае яркія, гучныя, шматкаляровыя рэчы, якія вышыты гладдзю, — ручнікі, навалачкі. Паспрабавала свае здольнасці Вольга Якаўлеўна і ў распаўсюджаным у вёсцы майстэрстве — у вырабе дываноў. І тут уражваюць гучныя сакавітыя фарбы яе вырабаў. Тэхніка вышываных дываноў — просты крыж. Захапляе Вольгу Якаўлеўну вязанне карункаў, магчымасць надаць ім аб'ём. Вяжа яна сурвэткі, вазачкі.

У вёсцы Цагельня Прыбыткаўскага сельсавета працуе загадчыцай сельскага клуба Пшаніцына Яўгенія Іосіфаўна. Шмат часу яна аддае захапленню народнай творчасцю. Узначальвае Яўгенія Іосіфаўна аматарскае аб'яднанне «Руплівы гаспадар». Сама ж яна добра вышывае, вяжа кручком, спіцамі, дэманструе сваё ўмельства на вясковых выстаўках, у раёне, вобласці. Лепшай майстрыхай аб'яднання лічыцца Круковіч Марыя Іванаўна, інжынер па тэхніцы бяспекі калгаса «Паўднёвы». Цудоўныя рэчы стварае яна ў тэхніцы ткацтва, вышыўкі, вязання, макрамэ, сярод іх — і традыцыйныя абрусы, і посцілкі.

Майстрыха з пасёлка Ваявода — Лебедзева Валянціна Аляксееўна — зараз ужо на пенсіі. Вязаць навучылася з 12 гадоў, з 14 — вышывае. Дагэтуль не кідае майстрыха любімую справу, кажа, што нараджае яна «радасць у душы», «дапамагае ўсё жыццё ў цяжкі час». Рэчы, якія вышыла Валянціна Аляксееўна, вабяць вытанчаным густам. Уражвае, калі яна робіць далікатныя рэчы, як, напрыклад, набор насовак з карункамі, якія вышыты па вуглах вяночкамі кветак блакітнага, ружовага, жоўтага колеру.

Майстрыха Пугачова Марыя Міхайлаўна аддае сваю творчасць вёсцы Даўгалессе. Працавала яна тут, у вёсцы, і настаўніцай, і загадчыцай дзіцячага садка. А майстэрства было заўсёды з ёй, захапляла тых, што былі побач. Прыйшло майстэрства з далёкага дзяцінства, ад маці. «Было ў мяне шасцёра братоў, — кажа Марыя Міхайлаўна, — вось маці тчэ за кроснамі, а ледзь адвернецца па гаспадарцы — дзеці хутчэй за кросны, самі ткаць вучацца». Вышыванне таксама палюбілася ўсім. Марыя Міхайлаўна першую накідку на падушку вышыла ў чацвёртым класе, братам на вяселле вышыванне дарыла. «Люблю — і усё!» — кажа яна пра сваё захапленне.

Адна з даўнейшых удзельніц клуба «Крынічка» — Чатырка Вольга Фролаўна з вёскі Пясочная Буда — заслужаная настаўніца Беларусі. Добра ўмее яна ткаць, вышываe, вяжа. Ручнікі-набожнікі, посцілкі, дываны, якія яна стварае, радуюць вока, грэюць душу.

Калі вясковы клуб узначальвае чалавек, здольны на творчасць, вакол яго збіраюцца аднадумцы, што ўмеюць цаніць, паважаць майстэрства. Тут набіраюць моц традыцыйныя віды мастацтва. Вось і вёсцы Даўгалессе пашанцавала, бо дырэктарам вясковага Дома культуры працуе ткачыха, вышывальшчыца, майстрыха вязання кручком і спіцамі — Падвойская Ала Генадзьеўна, якая закончыла Магілёўскае культасветвучылішча.

Вядомая майстрыха ў вёсцы Даўгалессе — Пугачова Ганна Мікалаеўна. Пераняла яна ўмельства ад сваёй маці. Вышывае прыгожыя ручнікі, падзоры, вяжа карункавыя вазы з рэльефнымі ўзорамі, аздабляе бялюткія ўзоры карункаў гучнымі акцэнтамі чырвонага, зялёнага колеру.

А вось у вёсцы Грабаўка ёсць свая дынастыя: Свірыдзенка. Старэйшая з іх — Башлакова Марыя Іванаўна — ткачыха, вышывальшчыца. Вядомы вяскоўцам яе арнаментальныя вышыванні, сюжэтныя дываны, як, напрыклад, дыван «Лебедзі», што вышыты крыжам. Дачка Марыі Іванаўны Свірыдзенка, Валянціна Яфімаўна, таксама любіць вышываць дываны

па вядомых сюжэтах: «Тройка», «Алень», але стварае і прыгожыя арнаментальныя рэчы. Вяжа спіцамі і яе дачка Кацярына, што вучыцца ў 6-м класе, спрабуе яна і вышываць.

Чатыры гады займаецца разьбой па дрэве Варажун Уладзімір Мікалаевіч з вёскі Новая Гута, які працуе электрагазазваршчыкам саўгаса-камбіната «Сож». Некалі ўбачыў ён у Бярэзінскім запаведніку разныя дзверы. «За душу узяло», — кажа. Ад захаплення прыгажосцю зрабіў ён крок і да асабістай творчасці. Рэжа Уладзімір Мікалаевіч звычайныя бытавыя рэчы — хлебніцы, сальнічкі, карцы. Выяўляюцца ў гэтых творах якасці, што здаўна характарызавалі творчасць беларускіх разьбяроў — выразная пластыка, скульптурнасць формы, сціпласць разнога ўпрыгожання. Дапамагае разьбяру ў працы песня. Ён — удзельнік народнага хору вёскі Новая Гута.

Клуб «Крыніца» ахоплівае каля 30 чалавек. А ўсяго ў Гомельскім раёне больш за 100 майстроў. Таленавітыя людзі жывуць у кожнай вёсцы. Вясковыя клубы, а то і мясцовыя музеі дэманструюць іх творы, каб любаваліся аднавяскоўцы, дзівіліся прыезджыя госці, не забывала пра спадчыну моладзь.

Народная творчасць Гомельскага раёна

Вусная народная творчасць Гомельскага раёна захоўвае традыцыйную аснову агульнабеларускага фальклору, але выяўляе і спецыфічныя рэгіянальныя адметнасці. Блізкасць да горада адбілася на песеннай культуры мясцовых жыхароў. У параўнанні з фальклорна-этнаграфічнымі традыцыямі іншых раёнаў Палесся тут больш бедным выглядае стан іх бытавання. Але тым не менш у памяці найбольш сталых інфарматараў захаваліся унікальныя звесткі аб некаторых абрадах і звычаях мінулага, у якіх адлюстраваліся светапогляд чалавека, яго практычны жыццёвы вопыт, быт, адносіны да працы і прыроды, комплекс маральна-этычных і эстэтычных уяўленняў.

Калі ў цэлым ахарактарызаваць жанравы склад вуснай народнай творчасці Гомельскага раёна, то варта адзначыць, што тут бытуюць амаль усе яе віды. Праўда, назіраецца нераўнамернасць іх распаўсюджвання на тэрыторыі раёна ў колькасных адносінах і ў межах каляндарных цыклаў.

Нельга не ўспомніць сёння з вялікай удзячнасцю нашых фальклярыстаў-збіральнікаў Еўдакіма Раманава, Зінаіду Радчанка, якія ў XIX ст. распачалі высакародную справу вывучэння народнай спадчыны Гомельшчыны, у тым ліку і Гомельскага раёна.

На тэрыторыі Гомельскага раёна надзвычай багата прадстаўлена каляндарна-абрадавая паэзія, у тым ліку і яе зімовы цыкл. Некаторыя каляндарныя абрады і песні надзвычай устойліва захоўваюцца ў быце жыхароў, хоць і бытуюць у трансфармаваным выглядзе і маюць сённяшні гульнёва-забаўляльны характар. Паводле звестак, атрыманых ад інфарматараў з вёсак Дуянаўка, Чкалава, Цераха, Бабовічы, Прыбар, Маркавічы, Зябраўка, Целяшы, Краўцоўка, Прыбыткі і інш., на Каляды адбываліся святочныя шэсці з казой, ролю якой выконваў вясёлы хлопец. Звычайна павадыр казы стукаў у акно і пытаўся ў гаспадароў: «Пан гаспадар, ці дазволіце казу ў хату прывесці ды песню праспяваці?» У адказ гучала: «Заходзьце!» Першым уваходзіў павадыр з «казой», а за ім усе астатнія ўдзельнікі калядавання, пераапранутыя ў маскі ваўка, мядзведзя, цыгана, чорта і інш. «Каза» станавілася пасярод хаты, а павадыр працягваў дыялог з гаспадарамі: «Добры вечар таму, хто ў гэтым даму, а ў гэтым даму добры гаспадар. Дазвольце вас з Новым годам павіншаваць, шчасця, долі і добрага ўраджаю пажадаць і песню праспяваць». Атрымаўшы дазвол, калядоўшчыкі пачыналі спяваць, «каза» ж выконвала рытуальны танец, пасля заканчэння якога прыкідвалася мёртвай. Яе ажыўлялі, штурхалі, падымалі і прасілі не паміраць. «Каза» падымалася і кланялася гаспадарам (в. Чкалава).

Тэатралізаваны абрад ваджэння казы мае міфалагічную аснову і звязаны з ідэяй паміранння прыроды зімой і яе ўваскрашэння вясной. Паводле народных уяўленняў, каза — істота, здольная паўплываць на ўраджайнасць, узмацніць урадлівасць зямлі. Невыпадкова ў песні гаворыцца:

Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць.
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.
Дзе каза хвастом,
Там жыта кустом,
Дзе каза нагой,
Там жыта капой.
Дзе каза бывае,
Там шчасце вітае.

Зафіксаваны і этнаграфічныя звесткі пра звычай хадзіць на каляды з пераапрананнем у «мядзведзя». Паводле ўспамінаў жыхаркі в. Маркавічы В.К.Гарленка, 1911 г.н., «адзін хлопец апранаецца ў вывернуты кажух, падвязваецца аборкамі, а другі апранаецца як стары чалавек. Яны з гуртам людзей пачынаюць хадзіць па хатах. Заходзячы ў кожную хату, «дзед» кажа: «А ну-ка, Мішка-Ваныч, як бабушка ў печцы бліны пячот». Тут «мядзведзь» пачынае ці вілкамі, ці якой-небудзь палкай варочаць у печы, пры гэтым разбіваючы ўсе гаршкі».

Як сведчаць фактычныя матэрыялы, калядны комплекс на тэрыторыі Гомельскага раёна не быў абмежаваны толькі абрадам «ваджэння казы». Напрыклад, у в. Старая Беліца і Цераха адбывалася на Каляды і абходнае шэсце са «звяздой». Па словах жыхаркі в. Старая Беліца Г.К.Рыкавай, 1920 г.н., «з фанеры рабілі многаканечную звязду. Да кожнага канца звязды прымацоўвалі палачкі, якія абкручвалі рознакаляровымі паперкамі. Да палачак прывязвалі кісціцы з нітак. У сярэдзіну звязды прымацоўвалі ікону Божай Маці».

У памяці жыхароў вёсак Гомельскага раёна яшчэ і сёння захоўваецца звычай клікаць мароз на вячэру з мэтай забяспечыць захаванасць усходаў ад замаразкаў. Напрыклад, на першую посную куццю рытуал запрашэння марозу суправаджаўся наступнымі словамі:

Мароз, Мароз, хадзі куццю есці.
Ды ўлетку не бывай,
Цвятоў не збівай,
А то будзе табе ўюга,
Жалезная пуга.
(в. Прыбыткі)

У аснове гэтага рытуалу ляжаць уяўленні пра магутнасць нябожчыкаў, якія, па народных вераваннях, маглі ўздзейнічаць на жыццё і гаспадарку чалавека.

У вечар перад Новым годам на другую куццю, багатую, шчодрую, мясную, адбывалася шчадраванне, калі па хатах хадзілі хлопцы і дзяўчаты з прыгожай, апранутай па-святочнаму дзяўчынай, «шчодрай», і спявалі песні, атрымлівалі падарункі.

Пад час шчадравання гаспадыня разбівае гарбузы, выбірае семкі, кладзе на падаконнік ці комінак, каб потым іх пасадзіць у маі — чэрвені, або з печы кідае, калі прыходзілі шчадроўнікі. Здзяйснялі такія магічныя дзеянні, каб у будучым атрымаць добры ўраджай. У якасці падарункаў шчадроўнікі атрымлівалі хлеб, сала, грачанікі (вёскі Бабовічы, Дуянаўка).

Калядныя і шчадроўныя абрады суправаджаліся песнямі, якія ўражваюць паўнатой захавання сюжэтаў, перапляценнем язычніцкіх элементаў з хрысціянскімі. У цэнтры калядных песень, адрасаваных гаспадару, гаспадыні, дачцэ, сыну, — клопаты земляроба-селяніна аб будучых сяўбе, ураджаі. Асноўны ідэйны сэнс калядных песень — пажаданне гаспадару і гаспадыні шчасця і здароўя, добрага ўраджаю, прыплоду ў гаспадарцы, услаўленне іх дбайнасці і працавітасці, мудрасці і ўвішнасці...

Нельга не адзначыць, што арганічную частку народнай культуры жыхароў Гомельскага раёна складае калядная варажба, вядомая і ў іншых рэгіёнах Беларусі. Гэта надзвычай паэтычная старонка жыцця нашых далёкіх продкаў, для якіх варажба была надзеяй, імкненнем зазірнуць у будучае, адчуць сваё яднанне з прыродай, усцешыць свае рамантычныя летуценні. У якіх бы вёсках Гомельскага раёна мы не закраналі гэтага пытання ў гутарках са старымі людзьмі, усюды атрымлівалі шматлікія звесткі па каляднай варажбе, асабліва любоўнай, што адбывалася на другую куццю. Прывядзём некаторыя прыклады мясцовай навагодняй варажбы:

1. Вечарам трэба было ісці на сметнік і абсыпацца канапелькамі, а ў гэты час трэба было гаварыць такія словы: «Святы Андрэй, канапелькі сею, дай, Божа, знаці, з кім мне іх збіраці». Пасля гэтага ісці ў хату і класціся спаць, ні з кім не размаўляць. Хто прысніцца, за таго і замуж пойдзеш (в. Чкалава).